**ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ**
**Кафедра філасофіі**

**Р.Д.Грудніцкі**

# ФІЛАСОФІЯ

# КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ

**Для студэнтаў усіх спецыяльнасцей**

**НАВАПОЛАЦК**
**2005**

## ЗМЕСТ

**Уводзіны**
**Частка I. Праграма курса лекцый па філасофіі**
**Частка II. Канспект лекцый па філасофіі**
**Раздзел I. Філасофія ў сістэме культуры**
**Тэма 1. Філасофія як феномен культуры**
**Тэма 2. Гістарычныя тыпы класічнай філасофіі**
**Тэма 3. Посткласічная філасофія: тэмы і праблемы**
**Тэма 4. Філасофія і нацыянальная свядомасць**
**Слоўнік асноўных тэрмінаў да 1 раздзела**
**Раздзел II. Філасофскія праблемы быцця**
**Тэма 5. Метафізіка і анталогія**
**Тэма 6. Філасофія прыроды**
**Тэма 7. Чалавек як фундаментальная праблема філасофіі**
**Тэма 8. Праблема свядомасці ў філасофіі**
**Тэма 9. Пазнанне як прадмет філасофскага аналіза**
**Тэма 10. Сацыяльная філасофія**
**Тэма 11. Філасофія культуры**
**Слоўнік асноўных тэрмінаў да 2 раздзела**
**Заключэнне**

# У В О Д З І Н Ы

“Мы маем права ва ўсе часы бачыць найвысакароднейшую задачу філасофіі ў тым, што яна фарміруе самасвядомасць культурнага жыцця, якое развіваецца... Менавіта таму значэнне філасофскіх сістэм у рэшце рэшт заключаецца не ў зменлівых формулах паняццяў, а ў тым сэнсе жыцця, якое знаходзіць у іх сваё адлюстраванне”, – пісаў В.Віндэльбанд. Словы гэтыя паказваюць практычную значнасць філасофіі ў жыцці чалавека. У дадатак да прафесійных ведаў, навыкаў, эрудыцыі, што так неабходныя для рашэння канкрэтных задач, кожны з нас мае патрэбу ў чымсьці большым. Каб разумець жыццё ва ўсёй яго складанасці, гэта значыць, каб жыць свядома, мала прафесійнага ды паўсядзённага досведу. Неабходна ўсведамляць мэты нашых учынкаў, сваё месца ў свеце, сэнс нашага жыцця. Гэта тым больш важна ў эпохі радыкальных праўтварэнняў, калі разбураюцца альбо пераадольваюцца традыцыйныя каштоўнасці, якія надавалі жыццю сэнс і значэнне, калі губляюцца маякі, што не давалі нам збіцца з дарогі праўды і веры, дарогі чалавечнасці. У гэтых умовах асабліва востра паўстае патрэбнасць у светаўяўленчых арыенцірах, у філасофскай рэфлексіі. І чакаем мы ад філасофіі арыенціраў і каштоўнасцей вечных, непадуладных будзёнасці, здольных узвышацца над часовымі інтарэсамі і памкненнямі. А менавіта філасофія даследуе фундаментальныя асновы быцця чалавека ў свеце, на выяўленне якіх скіраваны знакамітыя кантаўскія пытанні: што я магу ведаць? што я павінен рабіць? на што я магу спадзявацца? Дваццатае стагоддзе гэтыя пытанні ператварыла ў праблему. Праблему жыцця, праблему чалавечай існасці. І менавіта Кант лепш, чым хто іншы, вызначыў значнасць і значэнне філасофіі ў жыцці чалавека: калі і ёсць навука, вартая таго, каб яе вывучаць, дык гэта філасофія, якая паказвае чалавеку, што і як ён павінен рабіць, каб стаць чалавекам.

Ёсць і іншы, больш вузкі аспект уплыву філасофіі на жыццё. Яна пашырае кругагляд, фарміруе здольнасць крытычнага стаўлення да рэчаіснасці. Але найперш філасофія, надаючы сістэмнасць светаўяўленчым арыенцірам, задае спосаб бачання свету, абумоўлівае выбар напрамкаў дзейнасці, у тым ліку і навуковай, і гэтым папярэджвае поспех і ўзмацняе сацыяльную вартасць вынікаў гэтай дзейнасці.

Тым больш узрастае роля і значэнне філасофіі на сучасным этапе развіцця грамадства, які паставіў перад чалавецтвам прынцыпова новыя задачы і запатрабаваў прынцыпова новых спосабаў іх вырашэння. Працэсы глабалізацыі разбураюць нацыянальную, эканамічную і культурную, абмежаванасць, задаюць агульную мадэль развіцця, схемы дзейнасці і патрабуюць уніфікацыі адукацыйных сістэм. Вельмі актуальнай становіцца праблема рэфармавання і вышэйшай школы, мэтай якога з’яўляецца больш поўнае задавальненне адукацыйных патрэб насельніцтва і забеспячэнне

рынка працы кваліфікаванымі спецыялістамі. Масавізацыя вышэйшай адукацыі, надзвычайная складанасць вытворчых і сацыяльных працэсаў патрабуюць ад чалавека такіх якасцей, як навык самастойнага крытычнага мыслення, валоданне метадамі прыняцця кіраўнічых рашэнняў, здольнасць павышаць сваю кваліфікацыю сістэматычнай адукацыяй праз усё жыццё. А гэта, у сваю чаргу, патрабуе распрацоўкі і ўкаранення ў навучальны працэс новых адукацыйных тэхналогій, інавацыйных па самой сваёй сутнасці, тэхналогій, якія радыкальна мяняюць традыцыйныя формы ўзаемаадносін выкладчыка і студэнта. Студэнт з пасіўнага аб'екта навучання ператвараецца ў актыўнага суб'екта пазнавальнай дзейнасці, які значную частку выкладаемых курсаў засвойвае самастойна.

З улікам гэтай акалічнасці і распрацаваны вучэбна-метадычны комплекс па курсу "Філасофія". У яго аснову пакладзены метадычныя і арганізацыйныя прынцыпы аналагічнай распрацоўкі, выкананай аўтарскім калектывам Беларускага дзяржаўнага універсітэта пад кіраўніцтвам доктара філасофскіх навук, прафесара Зелянкова А.І. Стрыжнявым элементам вучэбна-метадычнага комплекса з'яўляецца праграма базавага курса "Філасофія", якая адпавядае патрабаванням дзяржаўнага адукацыйнага стандарта.

У адпаведнасці з праграмай і на яе аснове распрацаваны канспект лекцый па філасофіі. Асаблівая ўвага тут надаецца выяўленню логікі гістарычнага развіцця філасофіі і змястоўнага выкладання галоўных праблем курса. Расстаноўка акцэнтаў у праграме абумоўлена тым, што, словамі А.Ф.Лосева, "...толькі з дапамогай гісторыі філасофіі людзі змаглі зразумець, як выпрацоўваліся катэгорыі і формы тэарэтычнага мыслення, метады засваення рэчаіснасці думкай, метадалагічная культура". З другога ж боку, разумеючы складанасць і аб'ёмнасць гісторыка-філасофскага матэрыяла, аўтар вучэбна-метадычнага комплекса ставіць задачу азначэння асноўных паняццяў і катэгорый і фарміравання на гэтай падставе здольнасці прымяняць паняційна-катэгарыяльны апарат філасофіі не толькі для аналіза ўласна філасофскіх праблем, але і сацыяльнай практыкі.

Значнае месца ў вучэбна-метадычным комплексе адводзіцца самастойнай рабоце студэнтаў. З гэтай мэтай распрацаваны планы семінарскіх заняткаў, практыкумы і калоквіумы, круглыя сталы і тэмы дыскусій па галоўных праблемах курса філасофіі. Студэнтам прапануюцца тэмы рэфератаў, філасофскіх сачыненняў і дакладаў, па кожнай тэме прыводзіцца спіс навейшай філасофскай літаратуры.

Яшчэ адным структурным элементам вучэбна-метадычнага комплекса з'яўляюцца тэставыя заданні, якія ахопліваюць усе асноўныя і найбольш важныя пытанні курса і якія могуць выкарыстоўвацца як для кантроля ведаў, гэтак і для самастойнай работы студэнтаў.

З гэтай жа мэтай у вучэбна-метадычны комплекс уводзяцца заданні для кантралюемай самастойнай работы студэнтаў, выдзяляюцца праблемныя аспекты курса, усё гэта забяспечваецца спісам дадатковай літаратуры, якая дапаможа выпрацаваць аўтарскую інтэрпрэтацыю гэтых праблем і самастойнасць разважанняў.

Заключны раздзел вучэбна-метадычнага комплекса ўтрымлівае правільныя адказы на тэсты па курсу філасофіі.

**Тэматычны план курса “Філасофія”**
(90 гадзін)

| Змест курса | Лекцыі | Семінары | Усяго |
|---|---|---|---|
| **Раздзел I. Філасофія ў сістэме культуры** | | | |
| Тэма 1. Філасофія як феномен культуры. | 4 | 2 | 6 |
| Тэма 2.Гістарычныя тыпы класічнай філасофіі | 12 | 6 | 18 |
| Тэма 3. Асноўныя стратэгіі развіцця посткласічнай заходняй філасофіі | 4 | 2 | 6 |
| Тэма 4. Філасофія і нацыянальная свядомасць | 8 | 4 | 12 |
| **Раздзел II. Філасофскія праблемы быцця** | | | |
| Тэма 5.Метафізіка і анталогія | 4 | 4 | 8 |
| Тэма 6.Філасофія прыроды | 2 | 2 | 4 |
| Тэма 7.Чалавек як фундаментальная праблема філасофіі | 2 | 2 | 4 |
| Тэма 8.Праблема свядомасці ў філасофіі | 4 | 4 | 8 |
| Тэма 9.Пазнанне як прадмет філасофскага аналіза | 6 | 4 | 10 |
| Тэма 10.Сацыяльная філасофія | 4 | 4 | 8 |
| Тэма 11.Філасофія культуры | 4 | 2 | 6 |
| Усяго | 54 | 36 | 90 |

## Частка I. ПРАГРАМА КУРСА ЛЕКЦЫЙ ПА ФІЛАСОФІІ

### *Раздзел I* . Філасофія ў сістэме культуры

### Тэма I. ФІЛАСОФІЯ ЯК ФЕНОМЕН КУЛЬТУРЫ

***Мэта вывучэння тэмы: засвоіць і асэнсаваць прычыны і ўмовы фарміравання філасофіі, яе структуру і статус у сучаснай культуры***

Сацыякультурныя перадумовы ўзнікнення і развіцця філасофіі, яе сувязь з гістарычнымі формамі сацыяльнай практыкі. Праблема генезіса філасофіі. Асноўныя канцэпцыі паходжання філасофіі. Сувязь філасофіі і

светапогляду, параўнальны аналіз гістарычных форм духоўнага засваення свету. Міф, рэлігія, філасофія, навука, іх месца і роля ў культуры.

Адметнасць філасофскіх праблем і спосабаў іх вырашэння. Гістарычная дынаміка праблемнага поля філасофіі. Антрапалагічная скіраванасць філасофіі. Філасофія як рацыянальна-тэарэтычны тып светапогляду, прыкметы філасофскай рацыянальнасці. Філасофія як самасвядомасць культуры і любоў да мудрасці. Прадмет філасофіі, эвалюцыя поглядаў на яго. Сувязь праблемнага поля філасофіі з гістарычнымі формамі сацыяльнай практыкі. Вытокі філасофскага плюралізма.

Філасофскі светапогляд і яго формы: перадумовы фарміравання і гістарычная дынаміка. Статус і роля філасофіі ў сучаснай культуры, функцыі філасофіі.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі:змястоўна і функцыянальна тэмы з'яўляецца ўводнай, яна прызначана раскрыць а)сацыякультурныя перадумовы ўзнікнення і развіцця філасофіі; б)сувязь філасофіі са светапоглядам, з аднаго боку, і з сацыяльнай практыкай – з другога; в)прадмет філасофскага даследавання ў яго гістарычнай дынаміцы;г)што мы можам ведаць пра філасофію і навошта нам гэтыя веды.*

***Змест тэмы.***

- *Ключавая праблема: як магчыма і для чаго патрэбна філасофія?*
- *Вядучая ідэя:філасофія – гэта тэарэтычная форма асэнсавання прысутнасці чалавека ў свеце, спосаб духоўнага самавызначэння чалавека ў культуры.*

## Тэма 2.ГІСТАРЫЧНЫЯ ТЫПЫ КЛАСІЧНАЙ ФІЛАСОФІІ

***Мэта вывучэння тэмы: выявіць логіку развіцця філасофскіх ідэй у гістарычным працэсе, асэнсаваць механізмы сувязі і ўзаемаўплыву філасофскіх ідэй і гістарычных тыпаў сацыяльнай практыкі.***

Адметнасць старажытнаўсходніх цывілізацый, асаблівасці іх культурных традыцый і ўплыў апошніх на формы і спосабы філасофствавання ў краінах Старажытнага Усходу. Рэлігійна-міфалагічны характар старажытнаіндыйскай філасофіі, яе асноўныя школы. Рэлігійна-этычная скіраванасць старажытнакітайскай філасофіі, яе месца ў старажытнаўсходняй культуры.

Антычная філасофія, яе вытокі і гістарычная эвалюцыя. Логіка развіцця антычнай натурфіласофіі. Антрапалагічныя пошукі перыяду высокай класікі. Філасофія элінізма. Антычная спадчына і яе месца ў еўрапейскай гісторыка-філасофскай традыцыі.

Сярэдневяковая філасофія як тэарэтычнае абгрунтаванне монатэістычнага светапогляду. Галоўныя максімы сярэдневяковай філасофіі, праблема яе перыядызацыі. Тварэнне сярэдневяковай

філасофскай парадыгмы ў патрыстыцы. Трансфармацыі сярэдневяковай культуры і іх адлюстраванне ў схаластыцы.

Філасофія эпохі Адраджэння: адметнасць і кола праблем. Сацыяльна-палітычныя ідэалы эпохі Адраджэння. Месца філасофіі Адраджэння ў агульнаеўрапейскім гісторыка-філасофскім працэсе.

Сацыякультурная абумоўленасць, змест і напрамкі развіцця новаеўрапейскай філасофіі. Эмпірызм і рацыяналізм у філасофіі Новага Часу. Змяненне сацыяльнага статусу навукі і яе філасофскае асэнсаванне. Новы светапогляд і яго канстанты. Філасофія Асветы: чалавек, грамадства, розум.

Сацыякультурныя передумовы і тэарэтычныя крыніцы нямецкай класічнай філасофіі. Абгрунтаванне гістарычнасці прыроды і чалавека ў трансцэндэнтальнай філасофіі. Нямецкі аб’ектыўны ідэалізм як завяршэнне філасофскай класікі. Нямецкая філасофія пасля Гегеля: крызіс класічных філасофскіх традыцый і пошук новых парадыгмаў.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі:ключавая тэма першага раздзела і асноўная тэма курса, менавіта яна павінна даць адказы на пытанні: а) чаму людзі розных эпох філасофствавалі;б)чаму яны філасофствалі так, а не інакш; в)якія наступствы мела гэтае філасофстваванне.*

***Змест тэмы.***

- *Ключавая праблема: якімі фундаментальнымі рысамі характарызуецца гісторыка-філасофскі працэс?*
- *Вядучая ідэя: філасофія – гэта імкненне зразумець вытокі недасканаласці чалавечага свету і сэнс людскога жыцця дзеля вызвалення чалавека і ліквідацыі людскіх пакутаў.*

## Тэма 3. АСНОЎНЫЯ СТРАТЭГІІ РАЗВІЦЦЯ ПОСТКЛАСІЧНАЙ ЗАХОДНЯЙ ФІЛАСОФІІ

***Мэта вывучэння тэмы: выявіць шляхі трансфармацыі класічнай філасофскай традыцыі і механізмы фарміравання новага вобраза чалавека ў посткласічнай філасофіі.***

Крызіс класічнай культуры і яго асэнсаванне ў посткласічнай філасофіі. Традыцыйныя ўстаноўкі ў еўрапейскай класічнай філасофіі ў кантэксце новай сацыякультурнай сітуацыі другой паловы XIX–XX стагоддзяў. Вытокі крызіса класічнай філасофіі. Асноўныя напрамкі пераасэнсавання і пераўтварэння традыцыйных установак філасофскай класікі ў посткласічнай філасофіі.

Пераасэнсаванне зместу і ролі навукі ў грамадстве, пошукі новай рацыянальнасці. Аналітычная праграма сучаснай філасофіі. Светаўяўленчыя і метадалагічныя ўстаноўкі пазітывізма. Неапазітывізм і вобраз новай навукі. Гнасеалагічныя і метадалагічныя пошукі

неапазітывізма. Постпазітывісцкая канцэпцыя будовы і развіцця навуковай тэорыі.

Экзістэнцыяльна-фенаменалагічная праграма сучаснай філасофіі. Фенаменалагічная філасофія, яе праблемы і спосабы іх вырашэння. Экзістэнцыялізм як філасофія “разгубленага розуму”. Рэлятывізацыя культуры ў экзістэнцыялізме і абгрунтаванне разнастайнасці спосабаў прысутнасці чалавека ў свеце.

Рэлігійная праграма ў філасофіі XX стагоддзя. Рэлігійна-філасофскія сістэмы канфесійнага і агульнахрысціянскага характару. Неатамізм, яго праблемы і задачы. Адметныя рысы пратэстанцкай тэалогіі.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі: тэма завяршае разгляд гісторыка-філасофскага працэса і дапамагае асэнсаваць харктар перамен, якія адбыліся ў грамадстве цягам XX стагоддзя і якія патрабуюць новых духоўных парадыгмаў.*

***Змест тэмы***

- *Ключавая праблема: як суадносяцца паміж сабой класічная філасофія і посткласічнае філасофскае мысленне і да якіх наступстваў прывяло пераасэнсаванне класічнай спадчыны?*
- *Вядучая ідэя: плюралізм сучаснай філасофскай думкі з’яўляецца адлюстраваннем і абгрунтаваннем шматзначнасці чалавека і разнастайнасці спосабаў яго прысутнасці ў свеце.*

## Тэма 4. ФІЛАСОФІЯ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СВЯДОМАСЦЬ

***Мэта вывучэння тэмы: вызначэнне шляхоў эвалюцыі сацыяльна-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі ў нацыянальным і еўрапейскім агульнакультурным кантэксце***

Сацыякультурныя ўмовы фарміравання беларускай філасофскай думкі, яе духоўныя крыніцы і асноўныя этапы развіцця. Філасофска-эстэтычныя і этычныя даследаванні на тэрыторыі Беларусі X – XIII стст., іх сувязь са схаластычнай практыкай.

Анталагічныя і этычныя аспекты рэнесансна-гуманістычнай філасофіі ў Беларусі. Сацыяльна-палітычныя даследаванні эпохі Адраджэння ў Беларусі. Адраджэнне і Рэфармацыя.

Станаўленне нацыянальнай самасвядомасці і яе адлюстраванне ў сацыяльна-палітычнай і філасофскай думцы XV – XVII стст.

Развіццё навуковай і філасофскай думкі Беларусі ў XVII – XVIII стст. Л.Зізаній і стварэнне беларускай філасофскай тэрміналогіі. Роля творчасці Сімяона Полацкага ў культуры Беларусі. Рацыяналізм Б.Дабшэвіча. Сацыяльна-палітычныя і этычныя ідэі сярэдзіны XVIII ст. Асаблівасці беларускай асветніцкай філасофіі. Віленскі універсітэт як цэнтр асветніцкай дзейнасці.

Нацыянальна-вызваленчы рух і яго адлюстраванне ў сацыяльна-палітычнай і філасофскай думцы XIX стагоддзя. Нацыянальная ідэя і нацыянальная свядомаць у XX стагоддзі.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі: тэма дапаможа вызначыць месца духоўнай культуры Беларусі ў агульнаеўрапейскім культурным працэсе і паспрыяе выхаванню нацыянальнай свядомасці і гонару.*

***Змест тэмы***

• *Ключавая праблема: у сферы якіх уплываў развівалася беларуская філасофія і якое месца яна займае ў еўрапейскай духоўнай культуры?*

• *Вядучая ідэя: беларуская філасофская думка ёсць адлюстраванне адметнасці айчыннай культуры і сродак фарміравання нацыянальнай свядомасці.*

## Раздзел II. Філасофскія праблемы быцця.

### Тэма 5. МЕТАФІЗІКА І АНТАЛОГІЯ

***Мэта вывучэння тэмы: на падставе аналіза анталагічнай праблематыкі асэнсаваць ролю філасофіі ў рацыянальным спасціжэнні свету чалавекам.***

Сусвет як аб’ект філасофскага спасціжэння, асноўныя стратэгіі яго пазнання. Метафізіка і анталогія, эвалюцыя іх статуса ў гісторыка-філасофскай традыцыі. Быццё як філасофская катэгорыя і культуралагічная праблема. Варыянты разумення яе зместу. Субстанцыяльны падыход да інтэрпрэтацыі быцця. Субстанцыя як аснова Сусвету. Развіццё ўяўленняў аб матэрыі ў гісторыіі філасофіі і прыродазнаўства. Сучасная навука аб будове і ўласцівасцях матэрыі.

Матэрыяльны свет як дынамічная сістэма. Філасофскія і прыродазнаўчыя ўяўленні аб прыродзе і формах праяўлення руху. Праблема развіцця ў філасофіі і навуцы.

Прасторава-часавая структура свету. Субстанцыяльная і рэляцыйная канцэпцыі прасторы і часу. Сучаснае прыродазнаўства аб прыродзе прасторы і часу.

Філасофскі вобраз быцця ў яго суаднесенасці з сучаснай навуковай карцінай свету.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі: тэма адкрывае курс сістэматычнай філасофіі і з’яўляецца абагульненнем гісторыка-філасофскіх і прыродазнаўчых уяўленняў аб існасці і будове свету.*

***Змест тэмы.***

• *Ключавая праблема: як у філасофіі фарміруецца паняцце Універсума і якія існуюць катэгарыяльныя сродкі яго спасціжэння?*

• *Вядучая ідэя: анталогія як філасофскае вучэнне аб быцці забяспечвае самавызначэнне чалавека і свядомую арыентацыю яго у свеце.*

## Тэма 6. ФІЛАСОФІЯ ПРЫРОДЫ

***Мэта вывучэння тэмы: выяўленне гістарычных спосабаў і форм узаемадзеяння чалавека і прыроды і механізмаў фарміравання экалагічных каштоўнасцей сучаснай цывілізацыі.***

Філасофская інтэрпрэтацыя прыроды. Класічныя і сучасныя ўяўленні аб прыродзе. Прырода як прадмет філасофскага і прыродазнаўчага даследавання. Асноўныя гістарычныя этапы і формы ўзаемадзеяння прыроды і грамадства.

Прырода як сфера жыццядзейнасці чалавека Гістарычныя формы прыродакарыстання і іх эвалюцыя. Узаемадзеянне прыроды і грамадства як працэс кругазвароту рэчыва, энергіі і інфармацыі.

Філасофскія аспекты экалагтчнага крызіса і стратэгія яго пераадолення. Ідэя каэвалюцыі прыроды і грамадства. Паняцце наасферы. Экалагічны імператыў як умова і падстава каэвалюцыі грамадства і прыроды.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі: тэма прыроды з'яўляецца працягам і канкрэтызацыяй праблемы быцця, спосабам выяўлення чалавечага аспекта быцця.*

***Змест тэмы.***

- *Ключавая праблема: ці існуюць межы пераўтваральнай дзейнасці чалавека ў прыродзе?*
- *Вядучая ідэя:узаемадзеянне чалавека і прыроды павінна грунтавацца на прынцыпе суіснавання і будаваца на падставе экалагічнага імператыва.*

## Тэма 7. ЧАЛАВЕК ЯК ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ ПРАБЛЕМА ФІЛАСОФІІ

***Мэта вывучэння тэмы: зразумець сутнасць чалавека і спосабы і формы яго прысутнасці ў свеце.***

Чалавек як прадмет філасофскага пазнання. Эвалюцыя філасофскіх уяўленняў пра чалавека. Вобраз чалавека ў гісторыі філасофіі і культуры. Філасофская антрапалогія, яе прадмет, мэты і задачы.

Праблема паходжання чалавека і асноўныя спосабы яе вырашэння: крэацыяністскі, натуральна-эвалюцыяністскі, уфалагічны. Сучасныя канцэпцыі антрапасацыягенеза. Бівалентная прырода чалавека, суадносіны біялагічнага і сацыяльнага: варыянты інтэрпрэтацыі.

Дзейнасны характар чалавечага быцця. Чалавек як космапланетарная з’ява. Экалагічныя аспекты быцця чалавека. Каэвалюцыя чалавека і прыроды.

Аксіялагічная ацэнка быцця чалавека. Праблема жыцця і смерці ў духоўным досведзе чалавека. Сэнс жыцця. Антыноміі чалавечага быцця. Суадносіны цялеснасці і духоўнасці. Свабода і адказнасць у жыцці чалавека. Праблема існасці і існавання чалавека. Індывід, індывідуальнасць, асоба. Структура асобы, паняцце сацыяльнай ролі, статуса, інтарэсаў і патрэбнасцей асобы.

Сучасныя гуманістычныя пошукі і перспектывы чалавека ва ўмовах абвастрэння глабальных праблем сучаснасці.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі: тэма раскрывае антынамічнасць чалавечага жыцця, разнастайнасць спосабаў яго прысутнасці ў свеце і перспектывы яго дзейнасці з пункту гледжання сучасных праблем сусветнага супольніцтва.*

***Змест тэмы.***

- *Ключавая праблема: чаму і як мяняўся вобраз чалавека ў гісторыіі філасофіі і культуры?*
- *Вядучая ідэя:”чалавек – мера ўсіх рэчаў” альбо недапушчальнасць аднамернай ацэнкі чалавека.*

## Тэма 8.ПРАБЛЕМА СВЯДОМАСЦІ Ў ФІЛАСОФІІ

***Мэта вывучэння тэмы: раскрыць сутнасць свядомасці як спосаба духоўнай арыентацыі, пазнання і пераўтварэння свету чалавекам.***

Праблема свядомасці і спосабы яе вырашэння ў філасофіі. Субстанцыйны, функцыянальны і сацыякультурны падыходы да аналізу свядомасці. Спосабы асэнсавання праблемы свядомасці ў сучаснай філасофіі.

Генезіс свядомасці. Сучасныя навуковыя яўленні аб перадумовах узнікнення і механізмах функцыянавання свядомасці. Свядомасць і мозг. Псіха-фізіялагічныя асновы свядомасці і праблема ідэальнага. Функцыі свядомасці.

Структура свядомасці. Свядомае і неўсвядомленае. Свядомасць, мысленне, мова. Свядомасць і самасвядомасць.

Сацыякультурная прырода свядомасці. Культура і камунікацыя як умовы станаўлення развітых форм свядомасці. Свядомасць, паводзіны, дзейнасць.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі: тэма канкрэтызуе паняцце прыроды як сферы функцыянавання чалавечага розуму*

***Змест тэмы.***

- *Ключавая праблема: з'яўляецца свядомасць вынікам дзеяння сацыякультурных і прыродных фактараў, альбо яна толькі сведчанне аб існаванні творчай надпрыроднай сілы?*
- *Вядучая ідэя:свядомасць ёсць перадумовай ажыццяўлення і формай праяўлення крэатыўнай прыроды чалавека.*

## Тэма 9. ПАЗНАННЕ ЯК ПРАДМЕТ ФІЛАСОФСКАГА АНАЛІЗА

***Мэта вывучэння тэмы: засвоіць асноўныя філасофскія ўяўленні аб праблемах гнасеалогіі, навучыцца выкарыстоўваць здабытыя веды для аналіза канкрэтных пазнавальных сітуацый.***

Пазнанне як працэс і прадмет філасофскага аналіза. Разнастайнасць форм і спосабаў пазнання (міфалагічнае, рэлігійнае, мастацкае, філасофскае, будзённае, навуковае). Гнасеалогія як структурная частка філасофіі, яе мэты і задачы.

Праблема пазнавальнасці свету ў гісторыіі філасофіі. Магчымасці і межы пазнання. Гнасеалагічны аптымізм і феномен скептыцызма ў філасофіі.

Суб'ектна-аб'ектны характар пазнавальных адносінаў. Суб'ект і аб'ект пазнання ў класічнай філасофіі. Абгрунтаванне практычнай прыроды пазнання ў марксісцкай філасофіі. Практыка як аснова і мэта пазанння, яе функцыі ў пазнанні.

Структура і асноўныя заканамернасці пазнавальнага працэса. Адметнасць і роля пачуццяў і розуму ў пазнанні, іх узаемасувязь. Уласцівасці і формы пачуццёвага і рацыянальнага пазнання. Ацэнка эмпірызма і рацыяналізма ў гісторыка-філасофскім працэсе.

Пазнанне, разуменнне, творчасць. Фантазія, прадуктыўнае ўяўленне і інтуіцыя ў творчым працэсе.

Ісціна як мэта пазнання. Асноўныя канцэпцыі ісціны ў гісторыі філасофіі. Класічная інтэрпрэтацыя ісціны. Канцэпцыі ісціны ў посткласічнай філасофіі. Ісціна і каштоўнасць, ісціна і праўда. Праблема крытэрыя ісціны ў навуковым пазнанні.

*Месца тэмы ў курсе фіасофіі: тэма дае адказ на пытанне аб тым , што можа ведаць чалавек і якую ролю ў яго жыцці выконваюць здабытыя веды.*

***Змест тэмы.***

- *Асноўная праблема: як магчыма, калі магчыма, змястоўнае пазнанне свету і што можа ведаць чалавек пра свет?*
- *Вядучая ідэя: пазнанне ёсць актыўным працэсам духоўнага засваення свету і сродкам адаптацыі ў ім чалавека.*

## Тэма 10. САЦЫЯЛЬНАЯ ФІЛАСОФІЯ

***Мэта вывучэнны тэмы: вызначыць месца сацыяльнай праблематыкі ў межах філасофскіх ведаў і выявіць спецыфіку грамадства як здольнай да самаразвіцця сістэмы.***

Грамадства як прадмет філасофскага аналіза, яго спецыфіка. Эвалюцыя ўяўленняў аб прыродзе грамадства ў гісторыіі філасофіі. Асноўныя даследчыцкія праграмы ў грамадазнаўстве: натуралістычная, культурна-гістарычная, псіхааналітычная, соцыяпсіхалагічная.

Грамадства як сістэма сацыяльных адносін і дзейнасці. Структурная арганізацыя грамадства, тыпы сацыяльных структур (сацыяльна-класавая, сацыяльна-этнічная, сацыяльна-дэмаграфічная). Формы сацыяльнай дзейнасці і асноўныя сферы грамадскага жыцця, іх узаемасувязь і ўзаемазалежнасць. Сацыяльная структура сучаснай Беларусі: адметныя рысы і тэндэнцыі развіцця.

Грамадства як здольная да самаразвіцця сістэма. Крыніцы і фактары сацыяльнай дынамікі: варыянты тлумачэння. Праблема суб’екта гістарычнай дзейнасці. Накіраванасць гістарычнага жыцця грамадства і праблема сацыяльнага прагрэса.

Ідэя адзінства і разнастайнасці гістарычнага развіцця. Фармацыйны, цывілізацыйны і культуралагічны падыход да аналіза гісторыі грамадства.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі: тэма канкрэтызуе ўяўленні аб быцці і прыродзе, разглядаючы грамадства як спосаб існавання людзей у свеце.*

***Змест тэмы.***

- *Асноўная праблема: што злучае хаатычнае мноства людзей у грамадства як сістэмную цэласнасць?*
- *Вядучая ідэя: грамадства – гэта вынік супольнай дзейнасці людзей, форма іх гістарычнага жыцця і сфера рэалізацыі чалавечых патэнцый.*

## Тэма 11. ФІЛАСОФІЯ КУЛЬТУРЫ

***Мэта вывучэння тэмы: асэнсаваць феномен культуры як зместу сацыяльнага жыцця і сферы ажыццяўлення чалавечай свабоды.***

Паняцце культуры, варыянты яго інтэрпрэтацыі. Аксіялагічны, семіятычны, сацыялагічны, дзейнасны падыходы да аналіза і ацэнкі культуры.

Культура як сфера спецыфічна чалавечай дзейнасці і яе вынікі. Праблема класіфікацыі культуры. Матэрыяльная і духоўная культура, умоўны характар гэтага падзелу. Праблема выдзялення гістарычных тыпаў культур.

Асноўныя формы культуратворчасці. Мараль як спосаб рэгуляцыі міжчалавечых адносін і аснова культуры. Мастацтва як сфера творчасці і

спосаб самавыражэння чалавека. Духоўны патэнцыял рэлігіі і яе роля ў сучасным свеце.

Адзінства, разнастайнасць і ўзаемадзеянне культур. Культура і цывілізацыя. Стан і тэндэнцыі развіцця сучаснай культуры.

*Месца тэмы ў курсе філасофіі: тэма раскрывае спецыфічна чалавечы спосаб існавання ў свеце і з'яўляецца працягам і канкрэтызацыяй праблемы чалавека ў філасофіі.*

***Змест тэмы.***

- *Асноўная праблема: як у культуры і праз культуру раскрываецца сутнасць чалавека як дзейнасна-творчай істоты?*
- *Вядучая ідэя: культура ёсць сферай рэалізацыі чалавека ў якасці асобы і мерай яго свабоды.*

## Вучэбная і даведачная літаратура


1.Антология мировой философии: В 4 ч. М., 1969-1972.

2.*Алексеев П.В., Панин А.В.* Философия. М., 1997.

3.*Волчек Е.З.* Философия. Мн., 1998.

4.*Волчек Е.З.* Философия: Учебное пособие с хрестоматийными извлечениями. Мн., 2003.

5.Введение в философию: Учебник для вузов: В 2 ч /Под общ. ред. И.М. Фролова. М., 1989.

6.*Вольф Р.Т.* О философии: Учеб./Пер. с англ. М., 1996.

7.*Глядков В.А*. Философский практикум: Учеб. пособие. Вып. 1 – 3. М., 1994.

8.Гісторыя філасофіі./Пад рэд. Ч.С.Кірвеля. Гродна, 1997.

9.*Ермакова Е.Е.* Философия. М., 2000.

10.*Ермакова Е.Е.* Философия: Учеб. пособие для технических вузов. М., 2002.

11.История философии в кратком изложении. М., 1995.

12.*Ильин В.В*. Философия: Учебник для вузов. М., 1999.

13.*Калмыков В.Н.* Основы философии: Учеб. пособие. Мн., 2003.

14.*Курбатов В.И.* История философии. Конспект. Ростов н/Д., 1997.

15.Мир философии: Книга для чтения: В 2 ч. М., 1991.

16.Новейший философский словарь. Мн., 1999.

17.Современная западная философия./Под общей редакцией Т.Г.Румянцевой. Мн., 2000.

18.*Тарнас Р*. История западного мышления. М., 1995.

19.Философия: Учеб./Под ред. В.Д. Губина. М., 1996.

20.Философия: Учеб./Под ред. В.П. Кохановского. Ростов н/Д., 1998.

21. Філасофія: Вуч. дапаможнік./Пад рэд. А.С. Цернавога. Мн. 1996.

22.Философия: Учеб. пособие./Под ред. В.К.Лукашевича. Мн., 2002.

23.Философский энциклопедический словарь. М., 1994.

24.*Хюбшер* А. Мыслители нашего времени. Справочник по философии Запада XX века. М.,1994.

25.*Чуешов В.И.* Введение в современную философию: Учеб. пособие. Мн., 1997.

26.*Эрш Ж.*. Філасофскае здумленне. Гісторыя заходняй філасофіі. Мн., 1996.

# Частка ІІ. КАНСПЕКТ ЛЕКЦЫЙ ПА ФІЛАСОФІІ

## Раздзел І. ФІЛАСОФІЯ Ў СІСТЭМЕ КУЛЬТУРЫ

### Тэма 1. ФІЛАСОФІЯ ЯК ФЕНОМЕН КУЛЬТУРЫ

Калі да філасофіі ставіцца, як да навукі, то неабходна прызнаць, што гэта гістарычна першая форма тэарэтычнага асэнсавання свету. Але ў якой ступені яна – навука? І ці навука яна наогул? Каб адказаць на гэтыя пытанні, неабходна сфармуляваць яшчэ адно: як, калі і чаму ўзнікла філасофія?

Першыя элементы філасофскіх ведаў узнікаюць у трох найбольш развітых цэнтрах старажытнай цывілізацыі: Індыі, Кітаі і Грэцыі. Адбылося гэта ў канцы VII – першай палове VI стст. да н.э. пад уплывам тых перамен, якім падверглася старажытнае грамадства пад час пераходу ад века бронзы да веку жалеза. Бліжэйшым наступствам гэтага пераходу сталася рэзкае павышэнне прадукцыйнасці працы і, як вынік, больш поўнае задавальненне чалавечых патрэбнасцей. Аседласць становіцца нормай жыцця, значна паляпшаецца якасць жылля, вытворчасць набывае таварную форму. Пашыраюцца межы і формы практычнай дзейнасці людзей, узнікаюць такія спосабы жыццядзейнасці, якіх не было раней і ажыццяўленне якіх патрабуе дастаткова шырокай сістэмы пазітыўных ведаў. Разгалінаваная сістэма рамёстваў, гандаль і звязаныя з ім мараплаванне і судабудаўніцтва выявілі неэфектыўнасць ранейшых форм духоўнага засваення свету і, з аднаго боку, патрабавалі для свайго ажыццяўлення шырокіх ведаў, а з другога – выступалі надзейным і эфектыўным стымулам развіцця пазнавальнай дзейнасці.

Перамены ў сферы гаспадарчай дзейнасці непазбежна вялі да перабудовы сістэмы сацыяльных адносін. Ускладняецца сацыяльная структура грамадства, узмацняецца сацыяльная няроўнасць. Адносіны асабістай залежнасці дапаўняюцца таварна-грашовымі, гэта значыць эканамічнымі адносінамі. Нараджаецца і пашыраецца рэспубліканска-дэмакратычная форма арганізацыі палітычнага жыцця. Узмацняецца і становіцца больш жорсткай барацьба за ўладу. Узнікае і развіваецца безасабовае пісанае права. У дэмакратычна арганізаваных рабаўладальніцкіх палітычных сістэмах вырашэнне найбольш значных сацыяльных праблем ажыццяўляецца ўсім вольным насельніцтвам. Усё гэта нараджае востры пазнавальны інтарэс да самога грамадства і дзяржавы, да чалавека, патрабуе ведаў, якія б дазвалялі доказна і абгрунтавана праводзіць у жыццё палітычна важныя рашэнні. У гэтых умовах фарміруюцца і самі працэдуры доказу і абгрунтавання, уласцівыя тэарэтычнаму мысленню.

Пашырэнне падзелу працы і павышэнне прадукцыйнасці вытворчасці вяло да ўскладнення сацыяльнай структуры і фарміравання разнастайных сацыяльных сувязей дзеля арганізацыі супольнай дзейнасці і дасягнення тых альбо іншых мэтаў. Адзначаныя фактары спрыялі выдзяленню ў грамадстве такіх сацыяльных груп, якія "прыватызавалі" разнастайныя віды духоўнай дзейнасці, што таксама спрыяла развіццю мыслення і пазнання. Завяршаецца фарміраванне інтэлектуальных здольнасцей чалавека. Эмацыянальна-пачуццёвая сфера дапаўняецца здольнасцю лагічнага мыслення: абагульнення, тыпізацыі, абстрагіравання. Узнікае сістэма гэтак званых ідэальных аб'ектаў, фарміруецца культура маніпулявання імі. Веды, хай сабе яшчэ данавуковыя ці пераднавуковыя, а дакладней было б назваць іх пазітыўнымі, пачынаюць усведамляцца як каштоўнасць і падрываюць аўтарытэт традыцыйнага рэлігійна-міфалагічнага светапогляду. Узнікае сацыяльная патрэбнасць у такім светапоглядзе, які б адпавядаў новым грамадскім рэаліям, новаму ладу жыцця, мэтам і інтарэсам новых сацыяльных груп. Усе гэтыя фактары разам робяць філасофію неабходнай і магчымай.

## Філасофія і светапогляд

Дык што ж такое філасофія? Каб зразумець гэта, неабходна звярнуць увагу на тыя пытанні, якія з самага пачатку яна ставіць перад сабой. Філасофія зарыентавана не на даследаванне прадметаў знешняга свету ў іх разнастайнасці і выпадковасці, а на асэнсаванне свету як цэласнасці, на выяўленне першаасноў быцця свету і чалавека. Што ёсць свет і як ён узнікае? Што такое чалавек і якое месца ў свеце яму належыць? Што сабою ўяўляе прырода свету і ці існуюць межы магчымасцей чалавека ў ім? Але ж відавочна, што гэта пытанні светапогляду, пытанні светаразумення. Гэта значыць, што філасофія і ўзнікае менавіта як светапогляд, як гістарычна акрэслены спосаб бачання, перажывання і разумення свету.

Светапогляд – гэта цэласная сістэма тэарэтычных прынцыпаў, аксіялагічных установак і праксеалагічных схем, якія забяспечваюць асэнсаваную арыентацыю чалавека ў свеце, свядомы выбар ім жыццёвага шляху, здольнасць і гатоўнасць да сацыяльна значных дзеянняў. У светапогляд, такім чынам, уваходзяць сістэматызаваныя *веды* аб будове і сутнасці свету, грамадства і чалавека, гэта значыць, уласцівая для пэўнай гістарычнай эпохі карціна свету. Менавіта яны задаюць абагульнены вобраз свету і разуменне таго месца, якое займае ў свеце чалавек. Яны ўтрымліваюць універсаліі культуры, у якіх адлюстраваны фундаментальныя характарыстыкі свету як цэласнасці (прастора, час, прыродны закон, лёс, гармонія, прыгажосць, дабро, справядлівасць) і якія надаюць свету сэнс і значэнне адносна чалавека.

*Аксіялагічныя ўстаноўкі* – гэта сістэма *каштоўнасцей* і каштоўнасных арыентацый, якія вызначаюць прыярытэты ў адносінах чалавека да свету і іншых людзей і абумоўліваюць іх дзейнасць. Гэта разнастайныя маральныя, прававыя, эстэтычныя, рэлігійныя, палітычныя погляды, ідэалы і перакананні.

*Праксеалагічныя схемы* ўтрымліваюць інтарэсы, мэты ды сацыяльныя праграмы, а таксама нормы і схемы паводзін, якія праяўляюцца ў традыцыях, звычаях, абрадах і якія далучаюць індывіда да чалавечай супольнасці.

Адметная роля ў светапоглядзе належыць *веры.* Яна злучае розныя элементы светапогляду ў адзіную сістэму, надае яму асабова-суб’ектыўную афарбоўку, робіць “маім”, напаўняе яго сэнсам і значэннем для мяне асабіста. Гэта не толькі вера ў Бога, але і ў чалавека, розум, справядлівасць, навуку, гэта значыць, вера ў шырокім сэнсе слова як стан унутранай упэўненасці чалавека ў тым, што мэты, якія ён ставіць перад сабою, дасягальныя. Дзякуючы гэтаму вера, а значыць і светапогляд, надае чалавеку здольнасць, жаданне і гатоўнасць дзейнічаць у імя тых мэтаў, якія ён ставіць перад сабой. Таму светапогляд гэта не проста светаўспрыманне альбо светаразуменне, а фактар, які робіць чалавека актыўнай, дзейнай, творча-канструктыўнай істотай.

Калі падсумаваць уяўленні розных даследчыкаў па гэтаму пытанню, то мы прыходзім да высновы аб тым, што светапогляд:

- фіксуе ўніверсальныя асновы быцця свету і чалавека праз гранічную экстрапаляцыю дасягнутых вынікаў пазнання;
- сістэматызуе абагульненыя вынікі пазнання ў цэласную карціну свету;
- арыентуе сукупны патэнцыял пазнання на адкрыццё і тлумачэнне новых рэальнасцей быцця;
- вывучае свет у яго звароце да чалавека, як чалавечы свет, як свет чалавека;
- акумулюе ўніверсальныя нормы і схемы эмацыйна-ацэначнай і прадметна-пераўтваральнай дзейнасці чалавека.

Цалкам відавочна, што складовыя часткі светапогляду носяць канкрэтна-гістарычны характар і абумоўлены мэтамі эпохі, яе каштоўнасцямі, уласцівым ёй тыпам культуры. Таму нельга ўяўляць сабе светапогляд як штосьці дадзенае раз і назаўжды, а трэбы разглядаць яго канкрэтныя формы, гістарычныя тыпы. З гэтага пункту гледжання выдзяляюць міфалагічны, рэлігійны і філасофскі светапогляд.

*Міфы* – гэта архаічныя паданні аб дзеях багоў і героеў, у якіх адлюстраванны ўяўленні старажытных людзей аб паходжанні і будове свету. Гэта гістарычна першы тып светапогляду, які адпавядае самым раннім стадыям развіцця грамадства. Асновай міфалагічнага светапогляду з’яўляецца вера ў існаванне звышнатуральных сіл. Пры гэтым міфалагічная свядомасць не адрознівае натуральнае і звышнатуральнае, не

супрацьпастаўляе рэальнае і фантастычнае. Для гэтай свядомасці свет адзіны, натуральнае і звышнатуральнае суіснуюць у ім, яны абодва аднолькава рэальныя. Гэтая рыса міфалагічнай свядомасці называецца супранатуралізмам. Міф адлюстроўвае свет і яго асобныя часткі ў выглядзе пачуццёвых вобразаў-асацыяцый, а яго рэакцыя на прыроду носіць эмацыянальны характар. Кожная з'ява прыроды, праявы чалавечага жыцця і дзейнасці персаніфікуюцца ў вобразах багоў, герояў. Пры гэтым на прыроду пераносяцца рысы, уласцівыя самому чалавеку, свет ажыўляецца і адушаўляецца. Большасць міфаў скіравана на пошук прычын нараджэння свету. Міфалагічная свядомасць не ўспрымае міф як твор, выдумку, для яе гэта і ёсць свет – адзіны і непадзельны. У міфах акумуляваўся сукупны чалавечы досвед, які праз традыцыі, абрады і звычаі перадаваўся ад пакалення да пакалення і, будучы засвоены індывідам, далучаў яго да чалавечай супольнасці, да пэўнага роду, выступаў сродкам сацыялізацыі чалавека. Такім чынам, можна выдзяліць асноўныя рысы міфалагічнага светапогляду: *вобразнасць, супранатуралізм, персаніфікаванасць, асацыятыўнасць, аналагізацыя(імкненне знайсці падабенства паміж прадметамі, з'явамі і чалавекам), антрапамарфізм, анімізм, гілазаізм, генетызм.*

*Рэлігія* – гэта светапогляд і адпаведныя яму паводзіны людзей, у падмурку якога ляжыць вера ў існаванне іншага свету, заселенага звышнатуральнымі сіламі. Рэлігійная свядомасць, якая нараджаецца з міфа і нясе на сабе адбітак яго, з'яўляецца больш высокай формай духоўнага засваення свету. Гэта праяўляецца ў тым, што рэлігійнай свядомасці ўласціва здольнасць да абагульнення, параўнання і супрацьпастаўлення розных аспектаў быцця, выдзялення духоўнага як самастойнай формы існавання, першаснай адносна прадметнай сферы. Рэлігія дзеліць свет на натуральны і звышнатуральны, пры гэтым звышнатуральны свет успрымаецца як прычына і ўмова існавання натуральнага. Сапраўднае існаванне ўласціва толькі вышэйшаму быццю – Богу, які з'яўляецца ўвасабленнем дасканаласці, гармоніі, справядлівасці і дабра. Бог не толькі творца свету, але і ўмова маральнага жыцця. Вера ў Бога і служэнне яму – вось прызначэнне чалавека. Вера гэтая носіць ірацыянальны характар, яна заснавана на перажыванні інтымнай злучнасці чалавека з Богам. Усё, што адбываецца ў свеце, грамадстве і ў самім чалавеку, залежыць не ад яго, а ад вышэйшай сілы, якая таму вымагае пакланення і шанавання. *Вера ў існаванне звышнатуральных сіл, ірацыяналізм, дзяленне свету на рэальны і звышнатуральны, тлумачэнне існавання свету і чалавека дзеяннем пазасусветнага Бога* – вось асноўныя рысы рэлігійнага светапогляду.

На ранніх стадыях развіцця архаічнага грамадства, калі формы жыццядзейнасці характарызуюцца прастатой і нават прымітывізмам, калі задавальненне асноўных патрэбнасцей ажыццяўляецца не ў працэсе вытворчасці, а шляхам спажывання гатовага прыроднага прадукта, міф і

рэлігія, як формы светаразумення, адпавядаюць мэтам і ўзроўню развіцця гэтага грамадства. Але ж тыя перамены ў жыцці чалавека, пра якія гаворка ішла раней, выявілі неэфектыўнасць міфалагічна-рэлігійных сродкаў духоўнай арыентацыі чалавека ў свеце і прывялі да ўзнікнення *філасофіі*.

У параўнанні з міфам і рэлігіяй гэта была прынцыпова новая форма светаразумення. Адметнасць яе праяўлялася найперш у тым, што сваю галоўную задачу яна вырашала, абапіраючыся на розум. Сфера філасофіі – не вера і фантазія, а розум і веды. Гэта не азначае, што паміж філасофіяй, з аднаго боку, і міфалагічна-рэлігійным светапоглядам, з другога, не існуе аніякіх сувязей. Філасофія, як і міф, рэлігія, мастацтва, звернута да "свету як цэлага", да фундаментальных асноў быцця свету і чалавека. Філасофія, як і дафіласофскія формы светаразумення, мае відавочную каштоўнасную арыентацыю: яна прадстаўляе свет з пункту гледжання чалавека, як чалавечы свет, як свет для чалавека. Але робіць яна гэта рацыянальнымі сродкамі, з выкарыстаннем працэдур доказу, абгрунтавання і праверкі сваіх высноў. Яе мова – гэта мова паняццяў. Тое, што ў міфалагічным светаўяўленні ўвасабляецца ў пачуццёвых вобразах фантазіі, што ў рэлігіі апраўдана ірацыянальнай верай, у філасофіі набывае рацыянальны характар і асэнсоўваецца ў паняццях. У гэтым імкненні да рацыяналізацыі свету і чалавека фарміруецца мова філасофіі, пераадольваецца ўласцівы дафіласофскім формам светаразумення антрапамарфізм, сімвалізм і гілазаізм, некрытычная вера ў звышнатуральнае.

*Філасофія, такім чынам, узнікае як спосаб рацыянальна-крытычнага пераадолення міфа, як тэарэтычны спосаб асэнсавання свету і чалавека, незалежны ад рэлігійна-міфалагічнай фантазіі. Адметнасць філасофіі як тэарэтычнай мадэлі культуры ў яе канкрэтна-гістарычным існаванні грунтуецца на рацыянальнасці і абстрактнасці. Менавіта гэта забяспечыла пераход ад пачуццёвай вобразнасці міфа да катэгарыяльных структур, ад успрыняццяў асабовага досведу да "мыслення" прадметаў у іх сістэмнай цэласнасці.*

## Прадмет філасофіі ў яго гістарычнай дынаміцы

Адказ на пытанне аб тым, што вывучае філасофія, трэба шукаць у яе статусе тэарэтычнага тыпу светапогляду. Светапогляд жа заўжды звернуты да асноў свету і чалавека, да першых перадумоў іх існавання. Светапогляд нідзе не ставіць пытанне пра сутнасць асобных рэчаў, яго цікавіць існасць свету як татальнасці, у якую інтэграваны чалавек.

Пошук адказаў на гэтыя пытанні і ёсць мэтай філасофіі. Яна павінна даць чалавеку вобраз свету, у якім ён жыве, выявіць шляхі і сродкі пазнання гэтага свету і, нарэшце, абгрунтаваць мэты жыццядзейнасці чалавека і ацаніць яго магчымасці і спадзяванні. Акрэсліць праблемнае поле філасофіі лепш, чым гэта зрабіў Кант, немагчыма. Філасофія, на яго

думку, павінна даць адказы на тры асноўныя пытанні: што я магу ведаць, што я павінен рабіць, на што я магу спадзявацца.

Гэта значыць, што філасофія на падставе рацыянальнага пазнання павінна 1)сфарміраваць тэарэтычную мадэль свету як цэласнасці, вызначыць перадумовы, формы і спосабы яго існавання; 2)асэнсаваць прыроду чалавека і на гэтай падставе паказаць яму шляхі, сродкі і спосабы дзейнасці, якія забяспечваюць дасягненне мэтаў; 3)абгрунтаваць магчымасці чалавека ў пераўтварэнні прыроднага і сацыяльнага асяроддзя, вызначыць каштоўнасць і сэнс гэтай творча-пераўтваральнай дзейнасці. Гэта азначае, *што філасофія ёсць навукай аб фундаментальных асновах і ўніверсальных законах быцця свету і чалавека як узаемазвязаных і ўзаемазалежных элементах адзінай цэласнасці.*

Калі абстрагавацца ад канкрэтна-цялесных праяў быцця гэтых элементаў, то мы атрымаем дзве формы існавання – матэрыяльную і ідэальную, а праблема “чалавек у свеце” паўстае як пытанне аб адносінах прыроды і духа, матэрыі і свядомасці, мыслення і быцця. У сувязі з тым, што гэтае пытанне ў той альбо іншай форме паўстае перад філасофіяй кожнай эпохі, Ф.Энгельс назваў яго асноўным пытаннем філасофіі. Ён жа адзначыў, што змест гэтага пытання акрэслены двума аспектамі: 1)што ў гэтай “звязцы” матэрыя – дух ёсць першасным, а што другасным; 2)ці пазнавальны свет. Той альбо іншы адказ на гэтае пытанне вызначаецца фундаментальнай светаўяўленчай арыентацыяй філосафаў і нараджае два асноўныя напрамкі ў філасофіі: матэрыялізм і ідэалізм.

*Матэрыялізмам* называецца такі напрамак у філасофіі, прыхільнікі якога прызнаюць і адстойваюць першаснасць матэрыі, прыроды, а свядомасць, дух, мысленне разглядаюць як уласцівасць матэрыі.

*Ідэалізм* жа – гэта абазначэнне філасофскіх вучэнняў, якія сцвярджаюць першаснасць духу, свядомасці, а свет, прыроду, матэрыю лічаць другаснымі, вытворнымі і залежнымі ад духу. У тым выпадку, калі гэты дух разумеюць як свядомасць, псіхіку чалавека, мы маем справу з *суб’ектыўным ідэалізмам.* Калі ж гэты дух паўстае як знешні нематэрыяльны аб’ект – Сусветны дух, Абсалютная ідэя, Бог – то перад намі *аб’ектыўны ідэалізм.*

Гэтае пытанне, светаўяўленчы характар якога відавочны, утварае інварыянтную частку прадмета філасофіі. Сам жа прадмет, захоўваючы гэтае інварыянтнае ядро, падвяргаўся значным дэфармацыям у працэсе гістарычнага развіцця філасофіі і культуры. На ранніх этапах свайго існавання філасофія звернута да прыроды, космаса, асэнсаванне якога разглядаюць як перадумову тлумачэння і разумення чалавека. У гэтым праяўляецца *касмацэнтрызм* старажытнай, у прыватнасці – антычнай філасофіі.

Прадметам сярэдневяковай філасофіі ёсць Бог як прычына і ўмова ўсякага існавання, творца свету і чалавека, а асноўнае пытанне філасофіі –

гэта пытанне аб адносінах Бога і чалаека. Філасофія набывае выразна *тэацэнтрычны* характар.

Адраджэнне, звернутае да гуманістычных каштоўнасцей антычнай культуры, адкрывае жывога натуральнага чалавека, генія, што ў працэсе заснаванай на розуме дзейнасці ствараe свет свайго існавання, як свет чалавека і для чалавека, як чалавечы свет. *Гуманістычны антрапацэнтрызм* вызначае адметнасць гэтай філасофіі.

Новаеўрапейская філасофія як тэарэтычнае абгрунтаванне індустрыяльнай цывілізацыі зарыентавана на пошук шляхоў і сродкаў практычнага пераўтварэння свету і знаходзіць іх у ведах, у вопытна-эксперыментальным прыродазнаўстве. “Веды – гэта сіла”. Знакамітае выслоўе Ф.Бэкана раскрывае сутнасць філасофіі гэтай эпохі – яе *навукацэнтрызм.*

Посткласічная філасофія адмаўляецца ад метафізічных памкненняў філасофскай класікі да пабудовы ўніверсальных сістэм, у якіх свет і чалавек паўстаюць як адрозненыя і супрацьпастаўленыя адзін аднаму аб’ект і суб’ект. Галоўнае намаганне посткласічнай філасофіі – выяўленне і *асэнсаванне шматлікіх і разнастайных форм прысутнасці “чалавека-у-свеце”, інтэнцыянальнасць* як істотная рыса яго існавання.

## Структура філасофіі

Адначасова з працэсам фармавання і гістарычных мадыфікацый прадмета філасофіі адбываецца і яе структурызацыя, г.зн. станаўленне і развіццё асноўных раздзелаў філасофскіх ведаў. Ужо антычная натурфіласофія нараджае *анталогію* як навуку аб быцці (грэч. ontos – існае, logos – вучэнне), пошукі і аналіз першаасноў якога з непазбежнасцю паставілі пытанне аб пазнавальных магчымасцях чалавека. Сістэматычнае развязанне гэтых пытанняў вядзе да *логікі і гнасеалогіі.* Першая вывучае фармальныя правілы і сродкі рацыянальнага мыслення, другая выступае навукай аб межах, законах і шляхах ажыццяўлення пазнавальнай дзейнасці чалавека.

Актуалізацыя праблемы чалавека ў філасофіі абумовіла ўзнікненне і развіццё *філасофскай антрапалогіі* (грэч. anthropos – чалавек, logos – вучэнне) – раздзела філасофіі, які вывучае існасць чалавека, формы яго існавання ў свеце, што непазбежна вядзе да станаўлення *этыкі, эстэтыкі, палітыкі, аксіялогіі.* У працэсе развіцця філасофіі ўзнікаюць і пашыраюць свой змест такія раздзелы філасофскіх ведаў, як *філасофія навукі, філасофія культуры, філасофія тэхнікі, сацыяльная філасофія.* Сучасная філасофія – гэта складаная сістэма ведаў, у якой адлюстраваны найбольш агульныя прынцыпы быцця і пазнання, універсальныя законы функцыянавання і развіцця свету, раскрываецца культурна-гістарычнае адзінства чалавецтва.

## Метады філасофскага даследавання

Адметнасць прадмета філасофіі вымагае ад нас высновы аб тым, што 1)гэты прадмет істотна адрозніваецца ад прадмета канкрэтных навук і 2) што пазнанне яго патрабуе іншых, чым канкрэтна-навуковыя, метадаў. Метад – гэта сістэматызаваная і паслядоўная сукупнасць прыёмаў, сродкаў і працэдур, якія забяспечваюць дасягненне мэты ў практычнай дзейнасці альбо пазнанні. Сама праблема метада ўзнікае і свядома аналізуецца менавіта ў філасофіі.

Пільная ўвага гэтай праблеме надаецца ўжо ў старажытнасці. Сакрат, а найперш Платон, распрацавалі дыялектычны метад дыялога, які забяспечваў дасягненне ісціны шляхам прывядзення да супярэчнасці высноў апанента яго першапачатковаму тэзісу. У Новы час праблема метада набывае асаблівую актуальнасць. Ф.Бэкан стаў заснавальнікам новаеўрапейскага эмпірызма і стваральнікам індуктыўнага метада. Р.Дэкарт адкрывае рацыяналістычную традыцыю ў новаеўрапейскай філасофіі. Праблемам метада надавалі ўвагу Кант і Гегель. Не здымаецца з парадку дня гэтая праблема і ў посткласічнай філасофіі. Вынікам усіх гэтых намаганняў сталі дзве ідэі: адна сцвярджала рэфлексійны характар філасофскага пазнання, а другая выступала абгрунтаваннем адпаведнасці метада прадмету пазнання, што толькі і забяспечвае адэкватнасць і выніковасць пазнавальнай дзейнасці. Гэта азначае, што прадмет філасофіі спасцігаецца толькі розумам, яго нельга зафіксаваць у эксперыменце, уявіць у пачуццёвай форме. А таму і метады яго спасціжэння павінны быць адметнымі.

Гістарычна склаліся і шырока прымяняліся ў філасофіі два асноныя метады: дыялектычны і метафізічны. У сваёй развітай форме *дыялектычны* метад уяўляе сабой сістэму прынцыпаў, катэгорый і законаў, якія забяспечваюць змястоўнае адлюстраванне прадмета ў яго дынаміцы. Рух, зменлівасць, развіццё як вынік унутранай супярэчлівасці ўсяго існага – вось аснова дыялектычнага метада. Ён патрабуе разглядаць свет і асобныя з’явы як узаемазвязаныя і залежныя адзін ад аднаго. Крытычнасць ёсць істотнай рысай гэтага метада. Ён дае магчымасць асэнсаваць свет як разнастайнасць адзінства, у якім проціборства асобнага не знішчае адзінства, а вымушае яго да развіцця, да нараджэння новай якасці ў межах гэтага адзінства. Эўрыстычныя магчымасці гэтага метада распаўсюджваюцца не толькі на аб’ектыўную рэальнасць, але і на творчае мысленне, што надае яму ўніверсальнасць.

*Метафізічны* метад сфарміраваўся і набыў шырокае прымяненне ў новаеўрапейскай навуцы і філасофіі. Дакладней кажучы, ён узнікае ў новым эксперыментальным прыродазнаўстве, асновай якога была механіка. Яе поспехі, дакладнасць і ападыктычнасць яе ведаў прывялі да

абсалютызацыі метадаў механікі і пераносу прынцыпаў механістычнага прыродазнаўства ў светапогляд і філасофскую метадалогію. Сфарміраваўся гэты метад на той стадыі развіцця навукі, калі перад ёю стаяла задача накаплення фактаў. Для гэтага асобныя прадметы неабходна было “вырваць” з іх сувязей і разгледзець такімі, якімі яны былі самі па сабе. Вось чаму метафізічны метад накіроўвае пазнанне на канкрэтныя адзінкавыя прадметы, ніяк паміж сабой не звязаныя, ізаляваныя адзін ад аднаго, статычныя. Калі метафізіка і прызнае зменлівасць і развіццё, то толькі як перамену месца ў прасторы пад уздзеяннем знешніх сіл, як простае павелічэнне і змяншэнне. Адсюль аднабокасць метафізічных ведаў, іх абмежаванасць, арыентацыя пазнання на фіксацыю нязменнай прыроды рэчаў, іх устойлівасці.Таму калі навука перайшла ад канстатацыі фактаў да выяўлення прычын зменлівасці і развіцця, то адразу відавочнай стала абмежаванасць гэтага метада і рост папулярнасці дыялектыкі.

## Статус філасофіі ў сучаснай культуры

Адметнай рысай нашага часу з’яўляецца яго трагічнасць. XXI стагоддзе, у якое мы зусім нядаўна ўвайшлі, толькі падкрэслівае гэтую трагічнасць. А нарастаючае ўсведамленне таго, што гэта не проста храналагічны пераход, а нараджэнне новага сусвету чалавечых лёсаў, выклікае адчай, разгубленасць, прадчуванне крызісу асноў цывілізацыі, разбурэння жыццятворных сэнсаў. Але крызіс культуры – гэта яшчэ не гібель культуры. Крызіс ставіць перад разгубленым чалавекам не пытанне аб пахаванні культуры, а праблему пошукаў новых максім яе. І задача філасофіі – выявіць і растлумачыць гэтыя максімы, зразумець агульнасць і адметнасць традыцыі і культурнай навацыі і вызначыць схемы і нормы паводін чалавека ў сферы новай духоўнасці. Якой жа павінна стаць сама філасофія, каб быць здольнай вырашыць свае галоўныя праблемы?

Найперш яна павінна пазбавіцца ад метафізікі ў адмоўным сэнсе гэтага слова і стаць філасофіяй чалавека і для чалавека. Філасофія мусіць заняць такую пазіцыю, з якой свет магчыма ўбачыць вачыма асобы і менавіта як свет гэтай асобы, як значны для асобы свет, які набывае сэнс і можа быць апраўданы толькі ў кантэксце жыцця асобы.

Філасофія павінна пераадолець рацыяналістычную аднамернасць і адназначнасць класічнай традыцыі. Плюралізм для новай філасофіі паўстае чымсьці такім, чым для класічнай традыцыі быў рацыяналізм: максімай, якая вызначае спосаб і стыль філасофствавання. Адзінай праўдзівай і вычарпальнай інтэрпрэтацыі няма і быць не можа. Тым больш слушнай гэтая думка робіцца тады, калі аб’ектам філасофствавання паўстае чалавек: ніхто не ведае адзінае і поўнае праўды пра чалавека, бо такое праўды не існуе. Задача філасофіі – абгрунтаваць ідэю чалавека як універсальнай істоты, рацыянальнасць якой толькі адна з праяў шматмернай і

рознамернай істасці чалавека ў свеце, вызначыць і абгрунтаваць права асобы на самаздзяйсненне ў якасці асобы.

Кожны раз, уключаныя ў новую культурную сітуацыю, мы вымушаны не проста пражываць, а быць стваральнікамі яе, а значыць – і гістарычнага працэса, які праз гэта паўстае як абраны намі наш уласны лёс. І менавіта філасофія павінна паказаць, якое месца ў гэтым працэсе мусіць заняць чалавек, як і дзеля чаго ён будзе дзейнічаць.

Адзначаныя вышэй фактары мяняюць статус філасофіі ў сучасным свеце, вядуць да новай ранжыроўкі яе функцый. На першы план выходзяць такія функцыі філасофіі, як *светаўяўленчая, метадалагічная, сацыяльна-крытычная, аксіялагічная.*

*Светаўяўленчая функцыя* адлюстроўвае здольнасць і імкненне філасофіі да фарміравання арыенціраў, якія забяспечваюць свядомыя паводзіны чалавека ў свеце і дапамагаюць асэнсаваць сваё месца ў ім і жыццёвае прызначэнне. Гэтая функцыя паказвае таксама на філасофію як аснову навуковай карціны свету.

*Метадалагічная функцыя* выяўляе здольнасць філасофіі дзякуючы адметнасці свайго прадмета распрацоўваць і рэкамендаваць навуцы фундаментальныя прынцыпы, формы і сродкі пазнавальнай дзейнасці, на падставе якіх канкрэтныя навукі ствараюць свае ўласныя дысцыплінарныя метады даследавання. Метадалагічная функцыя філасофіі праяўляецца і ў тым, што яна абумоўлівае спосаб бачання свету і такім чынам уплывае на выбар прадмета канкрэтна-навуковага даследавання і сродкаў пазнання. Гэтая функцыя ажыццяўляецца праз абагульненне навуковага досведу і фарміраванне навуковай карціны свету, распрацоўку катэгарыяльнага апарата мыслення, з дапамогай якога асэнсоўваецца прадмет, сродкі і спосабы канкрэтна-навуковага пазнання.

*Сацыяльна-крытычная функцыя* праяўляецца ў грамадскай арыентацыі філасофіі, у тым, што яна выяўляе і асэнсоўвае законы грамадскага жыцця і гэтым уплывае на працэс яго арганізацыі, выбар стратэгіі сацыяльнага развіцця. Філасофія прапануе людзям ідэалы і каштоўнасці, якія, з аднаго боку, надаюць жыццю сэнс і значэнне, а з другога – служаць арыенцірамі ў стваральнай сацыяльнай дзейнасці. Філасофія крытычная па самой сваёй прыродзе. Яна прынцыпова не прызнае нязменнасць дадзенага, адвяргае аўтарытэт знешнасці. Яна, як пісаў Уладзімір Салаўёў, вучыць чалавека не прызнаваць аніякіх межаў, не схіляцца ні перад якімі аўтарытэтамі, не лічыцца з ніякімі меркаваннямі, калі яны навязваюцца звонку, не трымацца ніякіх даброт, калі яны не здабыты самім чалавекам. Філасофія разбурае залежнасць чалавека ад прыроднай знешнасці, вызваляе ад знешняга гвалту, звяргае чужых ідалаў і багоў кожны раз, калі яны пачынаюць пагражаць яго свабодзе і пазбаўляюць яго ўласнай волі. І адначасова філасофія паказвае чалавеку, што і як ён павінен рабіць, каб стаць чалавекам (Кант), адкрывае прастор

для пошуку новага, дае надзею на дасягненне ідэала. У гэтым, дарэчы, шукайма адказ на пытанне: ці варта вывучаць філасофію. Відавочна, што мажна пражыць і без яе. Як можна пражыць без жывапісу, без музыкі, без літаратуры. Ды, нарэшце, і без навукі можна абыйсціся. Але без усяго гэтага чалавек не зусім чалавек, а дакладней – і не чалавек зусім. Сутнасць чалавека вызначаецца не страўнікам: у гэтым мы нічым не адрозніваемся ад жывёлы. Толькі вольны дух робіць чалавека чалавекам, толькі ідэя напаўняе наша жыццё сэнсам і значэннем. А філасофія і ёсць дух, увасоблены ў слове.

## ТЭМА 2. ГІСТАРЫЧНЫЯ ТЫПЫ КЛАСІЧНАЙ ФІЛАСОФІІ

### Філасофская думка цывілізацый Старажытнага Усходу.

Перадумовы ўзнікнення і развіцця філасофскай думкі фарміраваліся ў перыяд пераходу старажытнага грамадства аб века бронзы да веку жалеза.

Паводле Чанышава ўсе старажытныя супольнасці века бронзы маюць шэраг агульных рысаў незалежна ад храналагічнага і прасторавага становішча. Да такіх рысаў адносяцца:

*у сферы эканомікі* – натуральная гаспадарка, прадуктаабмен, адсутнасць прыватнай уласнасці на зямлю, эканамічная перавага сяла над горадам;

*у сацыяльнай сферы* – устойлівасць абшчыны, патрыярхальны характар рабаўладання, каставасць, непасрэдныя персанальныя (асабовыя) адносіны між людзьмі, якія праяўляюцца ў форме асабовага панавання і падпарадкавання;

*у ідэалагічнай сферы* – наяўнасць дзяржаўнай рэлігіі, саслоўе жрацоў, пачаткі мастацтва і навукі.

Параўнаем гэтыя супольнасці з грамадствам века жалеза. Для яго ўласціва:

*у сферы эканомікі* – аддзяленне рамесстваў ад земляробства, узнікненне прыватнай уласнасці, пачатак таварна-грашовых адносін, якія дапаўнялі, а пазней і выцяснялі асабовыя адносіны, купля-продаж зямлі, перавага горада над сялом;

*у сацыяльнай сферы* – разбурэнне абшчыны, узнікненне безасабовага пісанага права, ускладненне сацыяльнай структуры і ўзмацненне барацьбы за палітычную ўладу, рэспубліканска-дэмакратычны лад палітычнага жыцця;

*у ідэалагічнай сферы* – пашырэнне пазітыўных ведаў, узнікненне філасофіі, фарміраванне дэдуктыўнай навукі.

У краінах Старажытнага Усходу гэты пераход ад века бронзы да века жалеза адбываўся больш павольна, а яго наступствы былі менш значныя, чым на Захадзе. Ірыгацыйнае земляробства як эканамічная аснова

старажытнаўсходніх цывілізацый, абмежаванасць рабства і яго патрыярхальны характар запавольвалі развіццё падзелу працы, не спрыялі ўмацаванню абстракцыйных здольнасцей, замаруджвалі станаўленне рацыянальна-лагічнага мыслення. Адзначаныя цывілізацыйныя адрозненні Старажытнага Усходу кансервавалі ідэалагічныя формы века бронзы, перашкаджалі развіццю і пашырэнню пазітыўных ведаў у сацыяльнай практыцы, замацоўвалі панаванне рэлігійна-міфалагічнага светапогляду. Традыцыя была асновай грамадскага жыцця, ёй падпарадкоўваліся ўсе сферы жыццядзейнасці, яна замяняла юрыдычныя сродкі сацыяльнага рэгулявання. Традыцыя стрымлівала сацыяльную актыўнасць людзей, фарміравала пасіўна-сузіральныя адносіны да знешняга свету. Вось чаму ўзнікшыя на Старажытным Усходзе пачаткі філасофскіх ведаў, па-першае, нідзе не набылі сістэматычных класічных форм , па-другое, не аддзяліліся ад дафіласофскіх форм пазнання і, па трэцяе, зліваліся з міфалагічна-рэлігійным светапоглядам у Індыі і з маральнай свядомасцю ў Кітаі.

Узнікненне старажытнаўсходняй філасофіі звычайна адносіцца да X – IX стст. да н.э. На думку ўсходніх мудрацоў філасофія – не прыемны занятак, а неабходнасць. Яна непазбежна вынікае з імкнення чалавека жыць паводле прынцыпаў, здабытых у працэсе пазнання самога сябе і свету. Яна патрэбна не толькі для таго, каб усведамляць непасрэдныя вынікі сваіх дзеянняў, але найперш для таго, каб асэнсоўваць далёкія наступствы гэтых дзеянняў. Філасофія і ёсць сродак асэнсавання свету і самога сябе. Таму чалавек выбірае не проста паміж метафізікай і яе адмаўленнем, а паміж добрай і дрэннай метафізікай. Старажытнаўсходняя філасофія, зрэшты, як і усякая іншая філасофія наогул, скіравана на даследаванне пытанняў, якія маюць прамое альбо ўскоснае дачыненне да чалавека. Яе прызначэнне – зрабіць жыццё чалавека свядомым і асэнсаваным.

*Індыйская філасофія* сфарміравалася на падставе ведычнай традыцыі і на працягу многіх стагоддзяў захоўвала сваю сувязь з ёю. (Веды гэта найстаражытнейшы міфалагічна-рэлігійны помнік Індыі, у якім адлюстраваны погляды яе людзей на будову і існаванне свету і чалавека). Гэта, з аднаго боку, надавала індыйскай філасофіі рэлігійна-міфалагічную арыентацыю, а з другога – аб’ядноўвала шматлікія і разнастайныя школы ў адзіную духоўную традыцыю. Традыцыяналізм увогуле з’яўляецца характэрнай рысай як індыйскай, так і усёй старажытнаўсходняй філасофіі. Адметнасцю індыйскай філасофіі з’яўляецца мноства разнастайных школ, погляды якіх значна адрозніваюцца адзін ад аднаго. Пры гэтым кожная школа імкнулася вывучыць погляды ўсіх іншых школ, старанна ўзважыць усе магчымыя аргументы і пярэчанні, перш чым фармуляваць свае ўласныя высновы. Пазіцыя апанента лічылася першапачатковым пунктам гледжання, тады як уласная пазіцыя паўставала як выснова альбо наступны пункт гледжання. Такі метад філасофствавання надаваў талерантнасці

адносінам паміж школамі і спрыяў абгрунтаванасці і завершанасці іх уласных вучэнняў.

Традыцыйна ўсе старажытнаіндыйскія філасофскія школы дзеляцца на дзве групы. Асновай такой класіфікацыі служыць стаўленне той альбо іншай школы да ведычнай традыцыі Тыя школы, якія прызнаюць аўтарытэт Вед і абапіраюцца на ведычныя каштоўнасці, называюцца *артадаксальнымі(астыка).* Гэта міманса, веданта, санкх'я, йога, ньяя і вайшэшыка. Акрамя гэтых шасці галоўных школ існавалі і менш значныя: граматычная, медычная ды іншыя. Школы ж, якія былі заснаваны на прынцыпах, адрозных і нават супрацьлеглых ведычным, і таму адвяргалі аўтарытэт Вед, называюцца *неартадаксальнымі (настыка).* Гэта чарвака, джайнізм і буддызм.

Варта адзначыць той факт, што аўтарытэт ведычнай традыцыі быў такі вялікі, а ўплыў Вед на духоўнае жыццё старажытнай Індыі такі моцны, што аніводная школа не парывала канчаткова сваёй сувязі з гэтай традыцыяй і кожная ў большай ці меншай ступені карысталася з яе духоўнага багацця. Гэта і надае старажытнаіндыйскай філасофіі адзінства і адметныя рысы:

*1)усе школы ставіліся да філасофіі як да практычнай неабходнасці і развівалі яе дзеля таго, каб зразумець, як найлепшым чынам ладзіць сваё жыццё. Мэта філасофіі – не марная мудрагелістасць, а асэнсаванае жыццё, прадбачанне. Менавіта таму кожная школа пачынае сваё вучэнне з тлумачэння таго, якім канчатковым мэтам чалавека яна будзе служыць;*

*2)гэтая практычная скіраванасць індыйскай філасофіі вынікае з таго факта, што нараджэнне яе звязваюць з душэўнай трывогай, якая ўзнікае пры сустрэчы са злом свету. Філасофія імкнецца зразумець крыніцу гэтага зла і знайсці сродкі пазбаўлення людзей ад пакутаў;*

*3)менавіта таму ўся індыйская філасофія заснавана на веры ў "вечны маральны светалад". Адсюль і агульнае для ўсіх індыйскіх сістэм паняцце кармы., якое паказвае, што ўсё зробленае чалавекам нідзе і ніколі не прападае дарма і тое, што адбываецца з чалавекам, ёсць вынікам яго ўласных учынкаў;*

*4)таму свет – гэта арэна для маральных дзеяў, у ім кожны чалавек мае магчымасць заслужыць найлепшае будучае;*

*5)калі ж чалавек гэтага будучага не дасягае, то гэта азначае адно: няведанне рэчаіснасці сталася прычынай яго пакутаў. Невуцтва, цемрашальства – вось прычыны нашых бедаў і нястач;*

*6)таму неабходна няспынна разважаць аб ісціне і на гэтай падставе пазбаўляцца памылковых меркаванняў, праз самакантроль падпарадкоўваць сваё жыццё вышэйшым маральным ідэалам і верыць у магчымасць вызвалення ад пакутаў.*

*Філасофія ў Кітаі* ўзнікае пасля VIII ст. да н.э. у перыяд “змагання царстваў”. Тагачасная кітайская дзяржава – тыповая ўсходняя дэспатыя. Начале яе стаяў манарх, які адначасова быў і найвышэшым жрацом, і адзіным землеўладальнікамкам. Узаемаадносіны паміж вышэйшымі (ваны – цары, чыноўнікі; чжухоў – зямельная арыстакратыя, дафу – старэйшыны кланаў вялікіх сем’яў) і ніжэйшымі (шужэнь – прасталюдзіны) саслоўямі рэгуляваліся не законамі, а рытуалам. Пры гэтым свецкі рытуал, які рэгуляваў адносіны паміж сацыяльнымі слаямі, быў падпарадкаваны рэлігійнаму рытуалу, што рэгуляваў стасункі паміж жывымі і мёртвымі. Усё жыццё кітайца паўставала як няспынная справаздача перад духамі продкаў. То й не дзіва, што гэтая філасофія мае відавочны маральна-рэгулятыўны характар.

Найбольш знакамітымі школамі старажытнакітайскай філасофіі, якія пакінулі адметны след у гісторыі культуры гэтай краіны, былі канфуцыянства, даасізм, маізм, школа закона, школа імёнаў. Аднак, як лічаць некаторыя даследчыкі, усю разнастайнасць школ можна звесці да дзвюх плыняў: канфуцыянства і даасізма. Тлумачыцца гэта тым, што у кітайскай філасофіі адзіны корань – старажытны міфалагічна-рэлігійны помнік “У-цзін” (Пяцікніжжа) і культура Дао. З гэтага пункту гледжання старажытнакітайскую філасофію можна разглядаць як розную рэстаўрацыю і інтэрпрэтацыю гэтай культуры. Пры гэтым неабходна зазначыць, што ва ўсіх школах пераважала практычная арыентацыя на праблемы жыцейскае мудрасці, маральных асноў сацыяльнага кіравання.

Характэрны для кітайскай культуры дух традыцыяналізма найбольш паслядоўна адлюстраваны ў канфуцыянстве. Назва гэтай школы паходзіць ад імя яе заснавальніка Кун-фу-цзы (у лацінскай транскрыпцыі – Канфуцый). Мэта філасофіі – дасягненне ідэальнай дзяржавы і багатага грамадства. Гэтай мэты нельга дасягнуць без павагі да продкаў і іх запаветаў, без навукі кіравацца ў сваім жыцці законамі Неба, бо Неба – вышэйшая сіла, лёс, гарант справядлівасці, яно Дао: касмічны і маральны закон. Уладкаванае заможнае жыццё ў згодзе наступае тады, калі кожны кіруецца трыма маральнымі правіламі: узаемнасцю, залатой сярэдзінай і чалавекалюбствам, якія разам складаюць “дао-правільны шлях”. Гэтым шляхам мусіць крочыць кожны, хто хоча жыць у згодзе з сабой, з іншымі людзьмі, з сусветам, гэта значыць – хоча жыць шчасліва. Хто трымаецца “залатой сярэдзіны”, г.зн. можа выбіраць паміж нястрыманасцю і асцярожнасцю, хто дасягае “чалавекалюбства” ці пашаны да бацькоў і павагі да старэйшых, хто не цураецца “ўзаемнасці” альбо клопату аб людзях, той дабрачынны чалавек. Толькі такія людзі з павагай і шанаваннем ставяцца да грамадства, без чаго немагчымы належны лад жыцця. Грамадства – гэта сям’я, дзе пануюць павага дзяцей да бацькоў, бацькоўская любоў да дзяцей, справядлівасць і мудрасць.

Заснавальнікам даасізма лічыцца Лао-цзы, які з самага пачатку арыентуе філасофію на мінулае як увасабленне грамадскага ідэала. Калі для Канфуцыя дао – гэта правільны шлях, што вядзе да ўсеагульнага дабрабыту, то для прыхільнікаў даосізма Дао паўстае як усеахопны закон, першапачатак, першая аснова і завяршэнне ўсяго існага. З Дао ўсё нараджаецца і ўсё вяртаецца да яго. Мудрасць – у спасціжэнні Дао, якое ўсяму надае жыццё і сэнс паводле натуральных прынцыпаў. Неведанне Дао – вось галоўная прычына сацыяльнага хаоса. Пазбегнуць ці пераадолець яго можна не праз актыўнае ўмяшальніцтва ў грамадскі лад. Такая актыўнасць толькі павялічвае хаос і множыць людскія беды. Шлях да сацыяльнай гармоніі – у нядзеянні, у адмаўленні ад хаатычнага быцця. Дао забараняе чалавеку кіраваць плынню жыцця, не дазваляе дзяржаве эксперыментаваць над сваім народам.

Такім чынам, старажытнакітайская філасофія мае маральную арыентацыю і заснавана на наступных прынцыпах:

*1)сацыяльная гармонія і заможнае жыццё магчымы толькі пры няўхільным выкананні вярхоўных дабрачыннасцей: чалавекалюбства, альбо спачування да ўсіх людзей, справядлівасці, ці роўнага шанавання ўсіх, пакорнасці перад законам і верай, праўдалюбства, або няспыннага пераадолення ўсяго лжывага, вернасці і сумленнасці ва ўсім;*

*2)асновай маральнага жыцця з'яўляецца памяркоўнасць і стрыманасць ва ўсім, раўнавага ў дзейнасці і як вынік – спакой мудраца;*

*3)чалавек ва ўсім павінен трымацца сярэдзіны, пазбягаць крайнасцей і не чыніць людзям таго, чаго сабе не жадае;*

*4)духоўныя веды, вера ў вечны маральны светалад – вось годны чалавека шлях, на якім знікаюць пакуты і нястачы і на якім чалавек сустракае свабоду як вышэйшую мэту свайго існавання і сведчанне сапраўднай чалавечнасці.*

## Асноўныя этапы развіцця антычнай філасофіі

Перадумовы ўзнікнення антычнай філасофіі складваліся ў IX – VII стст. да н.э. пад час станаўлення і ўмацавання грамадства веку жалеза. Гэты працэс у еўрапейскім сяродземнамор'і адбываўся значна больш інтэнсіўна, чым на Старажытным Усходзе, і наступствы яго як у эканамічнай, так і сацыяльна-палітычнай сферах былі больш радыкальныя. Інтэнсіўнае развіццё падзелу працы, узнікненне новых складаных сфер жыццядзейнасці, бурнае развіцце гандлю і гандлёва-грашовых адносін, мараплаванне і суднабудаванне запатрабавалі для свайго ажыццяўлення шматлікіх пазітыўных ведаў, з аднаго боку, і выявілі абмежаванасць міфалагічна-рэлігійных сродкаў рэгулявання грамадскага жыцця, з другога.

Рост грэчаскай эканомікі ў азначаны перыяд вёў да павелічэння калоній, росту народанасельніцтва і яго канцэнтрацыі ў гарадах, спрыяў пашырэнню рабства ва ўсіх сферах гаспадарчага жыцця, ускладненню сацыяльнай структуры і палітычнай арганізацыі Грэцыі. Дынамічная і дэмакратычная полісная арганізацыя ўцягвала ў сферу палітычнай дзейнасці масу свабоднага насельніцтва, стымулявала сацыяльную актыўнасць людзей, з аднаго боку патрабавала, а з другога – інспіравала развіццё ведаў аб грамадстве і дзяржаве, псіхалогіі чалавека, арганізацыі сацыяльных працэсаў і кіравання імі. Усе адзначаныя вышэй фактары разам спрыялі інтэнсіўнаму росту пазітыўных ведаў, паскаралі працэс інтэлектуальнага развіцця чалавека, фарміравання ў яго разумовых здольнасцей. Нараджалася і шырока прымянялася ў сацыяльнай практыцы працэдура доказу і абгрунтавання, чаго не ведаў Старажытны Усход і без чаго немагчыма навука. Лагічна даказаныя і рацыянальна абгрунтаваныя веды набывалі статус сацыяльнай каштоўнасці. Гэтыя перамены разбуралі традыцыйныя формы арганізацыі грамадскага жыцця і патрабавалі ад кожнага чалавека новай жыццёвай пазіцыі, фарміраванне якой не маглі забяспечыць старыя светаўяўленчыя сродкі. Узнікае вострая патрэбнасць у новым светапоглядзе, ствараюцца неабходныя і дастатковыя перадумовы для яго нараджэння. Такім светапоглядам і сталася філасофія, што сфарміравалася ў старажытнай Грэцыі ў VII – VI стст. да н.э.

## Перыядызацыя антычнай філасофіі.

Традыцыйна ў гісторыі антычнай філасофіі выдзяляюць тры асноўныя этапы. Першы этап ахоплівае перыяд з VII да сярэдзіны V стст. да н.э. і называецца *натурфіласофскім* альбо *дасакратычным.* Галоўным аб’ектам філасофскага даследавання на гэтым этапе была прырода, а мэтай пазнання – пошук першапачаткаў быцця свету і чалавека. Гэтая традыцыя выводзіць разнастайны свет з адзінай крыніцы была распачата філосафамі *Мілецкай школы* (Фалес, Анаксімандр, Анаксімен), прадоўжана ў творчасці знакамітага грэчаскага дыялектыка Геракліта Эфескага і прадстаўнікоў *элейскай школы* (Ксенафан, Парменід, Зянон) і дасягнула свайго натурфіласофскага завяршэння ў атамістычнай канцэпцыі Дэмакрыта. Напрыканцы VI – пачатку V стст. да н.э.пад уплывам супярэчнасцей, якія ўзнікалі ў працэсе пошуку субстанцыі як асновы ўсяго існага, элеаты пераарыетуюць філасофію на разумовы аналіз быцця. Яны выявілі абмежаванасць пачуццёвых уяўленняў аб будове свету, прапанавалі аддзяляць меркаванні, заснаваныя на пачуццях, ад ісціны, якая дасягаецца толькі розумам. Элеаты трансфармавалі касмалагічную арыентацыю натурфіласофіі ў анталогію.

Адметнымі рысамі антычнай натурфіласофіі з’яўляюцца *касмацэнтрызм, анталагізм, эстэтызм, рацыяналізм, архетыпічнасць.*

Свет тут паўстае як уладкаваны і арганізаваны космас, якому ўсеагульны закон-Логас надае адзінства, сіметрыю і прыгажосць і гэтым ператварае ў аб’ект эстэтычнай асалоды. Прызначэнне чалавека ў тым, каб з дапамогай розуму пазнаць вытокі гэтай касмічнай прыгажосці і жыць у згодзе з ёю.

Другі этап працягваўся з сярэдзіны V да канца IV стст. да н.э. і атрымаў назву *класічнай антычнасці*. Пачатак гэтаму этапу быў пакладзены *сафістамі*, якія пераарыентавалі філасофію з даследавання прыроды на пазнанне чалавека. Сафісты – пачынальнікі антрапалагічнай традыцыі ў антычнай філасофіі. Галоўнай праблемай філасофіі становіцца чалавек і формы яго прысутнасці ў свеце. “Чалавек – мера ўсіх рэчаў” – у гэтых словах Пратагора адлюстравана сутнасць згаданай пераарыентацыі. Нельга прэтэндаваць на пазнанне свету, папярэдне не пазнаўшы чалавека. Свет заўжды носіць тыя рысы, якія прыпісвае яму чалавек, і толькі адносна чалавека ён набывае сэнс і значэнне. Нельга разглядаць свет па-за чалавекам, па-за яго мэтамі, інтарэсамі і патрэбнасцямі. А паколькі гэтыя мэты, інтарэсы і патрэбнасці няспынна мяняюцца, то, па-першае, не бывае канчатковых, абсалютных ведаў, а па-другое, гэтыя веды маюць каштоўнасць толькі ў межах практычнага поспеху і толькі дзеля яго дасягнення. Карысць, якую могуць прынесці веды чалавеку, становіцца і мэтай пазнання, і крытэрыем ісціны ведаў. Прынцыпы філасофскай дыскусіі, тэхніка лагічнай аргументацыі, правілы красамоўства, шляхі дасягнення палітычнага поспеху – вось сфера інтарэсаў сафістаў.

Сістэмнасць гэтай тэматыцы надае Сакрат. Ён пагаджаецца з сафістамі ў тым, што сутнасць чалавека неабходна шукаць у сферы духа, але не прызнае іх рэлятывізма і гнасеалагічнага прагматызма. Мэта чалавечага існавання – агульны дабрабыт як перадумова шчаслівага жыцця, а яго нельга дасягнуць па-за розумам, без паглыбленага самапазнання. Бо толькі самапазнанне вядзе да мудрасці, толькі веды адкрываюць чалавеку сапраўдныя каштоўнасці: Дабро, Справядлівасць, Ісціну, Прыгажосць. Сакрат стварыў падмурак маральнай філасофіі, у яго творчасці філасофія пачынае афармляцца як рэфлексіўная тэорыя, у якой гнасеалагічная праблематыка заняла пачэснае месца. Пра гэта сведчыць і крэда Сакрата: “Пазнай самога сябе”.

Гэтая сакратычная традыцыя знайшла працяг не толькі ў так званых сакратычных школах (мегарцы, кінікі, кірэнаікі), але найперш у творчасці яго вялікіх паслядоўнікаў Платона і Арыстоцеля. Філасофскія погляды Платона інспіраваны разважаннямі Сакрата аб этычных паняццях і яго пошукамі абсалютных азначэнняў. Як, паводле Сакрата, ў сферы маралі чалавек шукае ўзоры дабра і справядлівасці, так, на думку Платона, ён шукае і ўсе іншыя Ідэі дзеля спасціжэння свету, тыя Універсаліі, якія робяць даступным для разумення хаатычнасць, плыннасць і разнастайнасць эмпірычнага свету і якія разам утвараюць сапраўдны свет існага. Яны – прычына прадметнага свету, выток касмічнай гармоніі,

умова існавання розуму ў душы і душы ў целе. Гэта свет сапраўдных каштоўнасцей, непарушнага парадку, свет, незалежны ад людзкога самавольства. Гэта робіць Платона заснавальнікам аб’ектыўнага ідэалізма, філасофскага вучэння, паводле якога думкі і паняцці існуюць аб’ектыўна, незалежна ад волі і свядомасці чалавека і з’яўляюцца прычынай і ўмовай існавання свету.

Свайго найвышэйшага росквіту антычная філасофія дасягнула ў творчасці Арыстоцеля. Ён не толькі сістэматызаваў назапашаныя антычнасцю веды, але і распрацаваў усе асноўныя раздзелы філасофіі. Яго мысленне разгортвалася ва ўсіх накірунках і ахоплівала логіку, метафізіку, фізіку, астраномію, псіхалогію, этыку, рыторыку, эстэтыку, славутую паэтыку і палітыку. Шмат увагі Арыстоцель надаваў метадалогіі даследавання, спосабам і сродкам аргументацыі і доказу. Тая сістэма катэгорый, якую распрацаваў Арыстоцель, на працягу усёй гісторыі філасофіі ўжывалася філосафамі. Менавіта ў творчасці гэтага вялікага вучонага філасофія набыла свой класічны ўзор, а яе ўплыў на еўрапейскую філасофскую традыцыю надзвычай вялікі. Філасофія Арыстоцеля, дзякуючы сваёй глыбіні і сістэмнасці, на доўгія часы вызначыла напрамкі развіцця філасофскага мыслення. Можна сказаць, што без Арыстоцеля ўся заходняя філасофія, тэалогія і навука развіваліся б зусім інакш. Яго энцыклапедычная філасофская сістэма аказалася такой значнай і важнай, што аж да XVII ст. ўсе навуковыя пошукі еўрапейскага розуму абапіраліся менавіта на арыстоцелеўскія працы.

На думку Арыстоцеля, задача філасофіі – спасціжэнне быцця, але не быцця як “вось таго” альбо “вось гэтага”: канкрэтнага чалавека, канкрэтнай рэчы, канкрэтнай думкі, а быцця самога па сабе, быцця як існага. Філасофія павінна знайсці нематэрыяльныя прычыны існага, абгрунтаваць вечныя існасці. Існае, як адзінства матэрыі і формы, ёсць *субстанцыя.* Станаўленне субстанцыі ёсць працэс пераходу ад матэрыі, як “быцця патэнцыйнага”, да формы, як “актуальнага быцця”, змяншэнне патэнцыйнасці матэрыі праз дэтэрмінацыю яе формай. Гэтая “актуалізацыя патэнцыйнасці” ажыццяўляецца праз дзеянне чатырох відаў прычын: *матэрыяльнай, фармальнай, дзейснай і мэтавай (фінальнай).* Усе чатыры прычыны імкнуцца да самарэалізацыі. Гэта дае падставу характарызаваць вучэнне Арыстоцеля як *канцэпцыю дынамічнай і мэтанакіраванай прыроды.* Яна не проста існуе, а імкнецца да чагосьці, нечага жадае, ёю рухае Эрас. Вяршыняй гэтага працэса ёсць чалавек. Яго адметная рыса – мысленне, з дапамогай якога ён злучае ў сваім розуме ўсё і ўсяму надае форму і адзінства і дасягае грамадскага дабрабыту і ўсеагульнага шчасця.

Арыстоцель завяршыў класічны этап у развіцці антычнай філасофіі. Полісная дэмакратычная Грэцыя ўступіла ў паласу доўгага і цяжкага сістэмнага крызіса, які завяршыўся не толькі падзеннем полісной дэмакратыі, але і крахам рабаўладання як сістэмы. Няспынныя войны,

эканамічныя і палітычныя крызісы рабілі жыццё невыносным, ставілі пад сумнеў класічныя антычныя каштоўнасці, патрабавалі новых форм сацыяльнай адаптацыі ва ўмовах палітычнай нестабільнасці. Гэтыя падзеі і адлюстраваны ў філасофіі трэцяга, заключнага этапа гісторыі антычнай філасофіі, які атрымаў назву *элінізма (канец IVст. да н.э. – V ст. н.э.).* Зацяжны сацыяльна-палітычны крызіс прывёў да радыкальнай пераарыентацыі філасофіі. У эпоху войнаў, гвалту і рабаўніцтва людзей менш за ўсё цікавяць пытанні першаасноў свету і ўмоў яго аб'ектыўнага пазнання. Крызісная дзяржава не забяспечвае дабрабыт і бяспеку людзей, кожнаму даводзіцца самастойна клапаціцца аб сваім існаванні. Вось чаму філасофія адмаўляецца ад пошукаў ўсеагульных прынцыпаў быцця і звяртаецца да жывога канкрэтнага чалавека, не прадстаўніка полісной цэласнасці, а індывіда, прапануючы яму праграму выратавання. Пытанне аб тым, як уладкаваны свет, тут саступае месца пытанню аб тым, што мусіць рабіць чалавек, каб выжыць у гэтым свеце. Маральна-этычная праблематыка, арыентацыя на індывідуальнае жыццё асобнага чалавека, сацыяльны песімізм і гнасеалагічны скептыцызм – вось адметныя рысы, якія аб'ядноўваюць шматлікія і вельмі розныя школы ў адзіны феномен, што называецца эліністычнай філасофіяй. *Эпікурэйцы, стоікі, кінікі, скептыкі* мяняюць сам ідэал філасофіі: гэта ўжо не спасціжэнне існага, а пошук шляхоў да шчаслівага і спакойнага жыцця. Не імкніся да большага, бо чым больш маеш, тым больш губляеш. Не шкадуй страчанага, бо яно ўжо не вернецца, не імкніся да славы і багацця, не бойся беднасці, хваробы і смерці, бо яны непадуладныя табе. Радуйся кожнаму імгненню жыцця, імкніся да шчасця праз маральныя развагі і інтэлектуальны трэнінг. Той, хто не баіцца ніякай страты ў жыцці, становіцца мудрацом, шчаслівым і ўпэўненым у сваім шчасці. Яго не палохаюць ні канец свету, ні пакуты, ні смерць.

Чым глыбейшы рабіўся крызіс антычнага (ужо рымскага) грамадства, тым больш відавочным станавіўся скептыцызм, недавер да рацыянальнага засваення свету, нарастаў ірацыяналізм і містыцызм. Грэка-рымскі свет апынуўся пад уздзеяннем розных усходніх і яўрэйскіх містычных уплываў. *Неаплатанізм* быў апошнім успляскам грэчаскай антычнасці. У творчасці яго найбольш слынных прадстаўнікоў *(Плоцін, Прокл)* былі распрацаваны ідэі, якія, з аднаго боку, выводзілі філасофію за межы антычнай рацыяналістычнай традыцыі, а з другога – служылі інтэлектуальнай асновай для раннехрысціянскай філасофіі і сярэдневяковай тэалогіі.

Такім чынам, антычнай філасофіі, гісторыя развіцця якой ахоплівае цэлае тысячагоддзе, уласцівы наступныя рысы:

*1)касмацэнтрызм – свет паўстае як уладкаваны космас, прынцыпы і парадак існавання якога супадаюць з прынцыпамі арганізацыі чалавечага розуму, дзякуючы чаму магчыма рацыянальнае пазнанне яго;*

*2)эстэтызм, паводле якога свет ёсць увасабленне парадку, сіметрыі і гармоніі, узор прыгажосці, да жыцця ў згодзе з якой імкнецца чалавек;*

*3)рацыяналізм – космас прасякнуты ўсеабдымным розумам, які надае свету мэту і значэнне і даступны для чалавека пры ўмове, што ён засяроджаны на пазнанні яго і развівае свае разумовыя здольнасці;*

*4)аб'ектывізм – у пазнанні неабходна кіравацца натуральнымі прычынамі і рашуча і паслядоўна выключаць антрапаморфныя элементы як сродкі тлумачэння і абгрунтавання ісціны;*

*5)рэлятывізм – прызнанне адноснасці наяўных ведаў, немагчымасці канечнай і канчатковай ісціны і патрабаванне крытыкі і самакрытыкі як неабходных элементаў пазнання.*

## Філасофія еўрапейскага сярэдневякоўя

Шлях да разумення сярэдневяковай філасофіі праходзіць не праз дакладна акрэсленыя храналагічныя межы яе развіцця. Такое абмежаванне немагчыма. Сапраўды, калі пачынаецца сярэдневякоўе? І калі яно канчаецца? Не мае перспектывы і спроба азначыць гэтую філасофію як філасофію феадалізма. Не таму, што сувязі паміж феадалізмам і сярэдневяковай філасофіяй няма, а найперш таму, што тая праблематыка, якая вызначае сутнасць гэтай філасофіі, узнікла значна раней, чым усталяваўся класічны феадалізм, а страціла яна сваю актуальнасць значна раней, чым феадалізм распаўся.

Але ў гэтым негатыўным азначэнні ёсць адно пазітыўнае сцвярджэнне: спасылка на характэрную для гэтай філасофіі праблематыку. Асаблівасцю сярэдневяковай філасофіі, якая праходзіць праз усю гісторыю гэтага перыяда, уласціва кожнаму філосафу і ў розных варыянтах пераносіцца з адной філасофскай сістэмы ў другую, *з'яўляецца яе сувязь з рэлігіяй ва ўсім спектры ўзаемаадносін: ад поўнага падпарадкавання рэлігіі ў якасці яе служкі, да спробаў вызвалення філасофіі ад тэалагічнай апекі.* Характэрнай рысай гэтай філасофіі з'яўляецца яе злучнасць з рэігійнай ідэалогіяй, заснаванай на прынцыпах манатэізма і боскага абвяшчэння. Што гэта азначае? *Па-першае, сярэдневяковая філасофія фундаментальна залежала ад рэлігіі. Хоць яна і не растваралася цалкам у рэлігіі, але была прынцыпова ёй падпарадкавана. Па-другле, гэтая філасофія прынцыпова тэацэнтрычная, для яе ідэя Бога выконвала такую ж функцыю, якую для антычнай філасофіі выконвала ідэя эстэтычна-касмацэнтрычная, ці для новаеўрапейскай філасофіі – ідэя пазітыўнай навукі.* Гэта дае нам падставы для вызначэння храналагічных межаў сярэдневяковай фіасофіі: яна пачынаецца са свядомага падпарадкавання рэлігіі, а канчаецца тады, калі гэтая злучнасць філасофіі і рэлігіі распадаецца. А вядома, што гістарычна першую спробу скарыстацца філасофіяй для абгрунтавання чыста рэлігійных праблем зрабіў Філон

Александрыйскі. Завяршылі ж распад гэтай злучнасці прадстаўнікі наміналістычна-сенсуалістычнай школы Оккама, зацвердзіўшыя канчаткова тэорыю “дзвюх ісцін”, якая ўзарвала маналітную сярэдневяковую ідэалогію. Гэта значыць, што сярэдневяковая філасофія ахоплівае перыяд прыкладна з канца I-пачатку II ст. да канца XIV-пачатку XV ст. *Па-трэцяе, сярэдневяковая філасофія ўзнікае пад час глыбокага крызісу рабаўладальніцтва, разбурэння познеантычнай культуры і ўзнікнення новых протафеадальных сацыяльна-палітычных і эканамічных рэалій.* Яна была інспіравана біблейска-іудзейскай і элліністычнай (у першую чаргу – неаплатанічнай) традыцыямі, якія разам стваралі культурны падмурак новага светапогляду. Першы феномен вёў да тэалагізацыі філасофіі, прыстасавання яе да новых сацыякультурных рэалій і ўспрыняцця яе рэлігійна арыентаванай варварскай свядомасцю. Элліністычная ж традыцыя выконвала ролю філасафізацыі тэалогіі, якая дзякуючы гэтаму страчвала сваю эмацыянальна-рэлігійную агрэсіўнасць і набывала талерантнасці. Гэтыя ж інспірацыі вызначалі і характэрныя ўласцівасці сярэдневяковага мыслення: зварот да Бібліі і звязаная з гэтым рэтраспектыўнасць, сімвалізм і аўтарытарызм, схаластычнасць.

У гісторыі сярэдневяковай філасофіі выдзяляюць два асноўныя этапы: *патрыстыку і схаластыку.* Патрыстыка (ад лацінскага patres – бацькі) ахоплівае перыяд з II да VIII стагоддзяў і звязана з дзейнасцю гэтак званых “бацькоў царквы”, якія, з аднаго боку, абаранялі хрысціянства і хрысціян ад язычніцкай дзяржавы, а з другога – распрацоўвалі тэарэтычныя асновы новага светапогляду, фарміравалі філасофскую, дакладней – тэалагічную парадыгму сярэдневяковага мыслення. Яны пераарыентавалі антычнае мысленне з яго космацэнтрызмам і рацыяналізмам на звышпрыроднага Бога і ірацыяналізм і гэтым заклалі падмурак лацінскага культурнага ўніверсума. Філасофскай асновай патрыстыкі быў платанізм, для якога характэрны зварот да трансцэндэнтнасці. Менавіта праз гэтую трансцэндэнтнасць вучэнне Платона набліжаецца да хрысціянскага вучэння з яго цвярджэннем: “Царства маё не ад гэтага свету...”

Філасофскія асновы новага светапогляду распрацоўваліся рознымі даследчыкамі як грэка-візантыйскай (Арыген, Васіль Вялікі, Рыгор Ніскі, Дыяніс Арэапагіт, Ян Дамаскін), так і лацінскай (Цертуліян, Баэцый, Аўгусцін) арыентацыі. Вынікам дзейнасці гэтых людзей сталася распрацоўка філасофскай парадыгмы сярэдневякоўя. Найбольш паслядоўна і поўна гэтая тэматыка распрацавана ў творах Аўгусціна Аўрэлія, думка якога ўспрымалася як узор, а творы – як ідэал навуковасці. Падмуркам гэтай парадыгмы сталіся наступныя прынцыпы:

*тэацэнтрызм* – прынцыпам і крыніцай усякага быцця, дабра і прыгажосці з’яўляецца Бог. Служэнне Богу – аснова маральнасці, перайманне Бога і прыпадабненне да яго – вышэйшая мэта. Усё існуючае суадносіцца з боскай дасканаласцю і дзякуючы гэтаму займае сваё месца ў свеце;

*крэацыянізм* – усё зменлівае створана Богам з нічога і ўсё створанае змяняецца і імкнецца да небыцця;
*правідэнцыялізм* – Бог перманентна правіць светам, людзкой гісторыяй і лёсам кожнага чалавека. Усё, што адбываецца, адбываецца паводле волі Бога, які адзіны напаўняе свет гармоніяй і сэнсам;
*рэвеляцыянізм* – крыніцай усякіх ведаў і самым надзейным спосабам пазнання з'яўляецца Святое Пісанне, у якім увасоблена боскае абвяшчэнне. Пазнаваць – значыць спасцігаць сэнс боскага слова;
*персаналізм* – створаны Богам чалавек ёсць недасканалае адлюстраванне ўседасканалай асобы Бога, таму ён – непаўторная персона, надзеленая розумам і воляй, падпарадкаваная толькі Богу і прызначаная служыць толькі яму.

Схаластыка ахоплівае IX – XV стст. і ў сваім развіцці праходзіць тры стадыі: ранняя схаластыка (IX – XII стст.), у якой пераважалі ідэі Аўгусціна і хрысціянізаванага неаплатанізма (Эрыўгена, Расцэлін, Ансельм); класічная схаластыка (XII – XIII стст.), калі пачалі ўзвышацца універсітэцкія цэнтры (Оксфард, Кембрыдж, Тулуза, Падуя) начале з Парыжскім універсітэтам, дзе пераважалі ідэі хрысціянізаванага Арыстоцеля (Фама Аквінскі); позняя ці крытычная схаластыка (XIV – XV стст.) з яе намаганнямі ўраўнаваць у правах розум і веру (Дунс Скот, У. Окам).

Сімвалам схаластыкі сталася барацьба *рэалізма і наміналізма.* Прадстаўнікі рэалізма (лацінскае realis – сапраўдны) лічылі, што сапраўднай рэальнасцю валодаюць не адзінкавыя рэчы, а толькі агульныя паняцці, універсаліі, якія існуюць па-за светам і незалежна ад яго. Універсаліі ўтвараюць ідэальны і самадастатковы свет, які пранізвае свет матэрыяльны і надае яму форму і якасную вызначанасць. Наміналісты (лацінскае nomina – імя, найменне) адстойвалі думку, што рэальна і аб'ектыўна існуюць толькі адзінкавыя рэчы, а ўніверсаліі – гэта імёны тых рэчаў, якія праяўляюцца ў мове і не існуюць па-за межамі свядомасці. Варта адзначыць, што рабіліся спробы прымірэння рэалізма і наміналізма, пераадолення іх крайнасцей. Прыкладам можа служыць творчасць П'ера Абеляра і яго ідэя *канцэптуалізма.*

Сваёй вяршыні схаластыка дасягае ў творчасці вялікага сістэматызатара сярэдневякоўя Фамы Аквінскага. Ён не толькі абагульніў вынікі тысячагадовых пошукаў хрысціянскай тэалогіі, не толькі пераадолеў крайнасці рэалізма і наміналізма, але і стварыў вучэнне, якое стала падставай для кананізацыі Фамы і паслужыла фундаментам неатамізма – афіцыйнай філасофскай дактрыны сучаснага Ватыкана.

Такім чынам, сярэдневяковая філасофія была інспіравана *элінізмам і біблеска-іудзейскай традыцыяй. Яна адлюстравала, з аднаго боку, распад рабаўладальніцтва і заняпад антычных каштоўнасцей, а з другога – нараджэнне і станаўленне феадальнага грамадства.* Гэтая філасофія

фарміравалася пад уплывам монатэістычнай богаабвешчанай рэлігіі і выступала тэарэтычнай асновай новага светапогляду. Яе галоўныя задачы:
*1)тэарэтычнае абгрунтаванне асноўных прынцыпаў монатэістычнага светапогляду: тэацэнтрызма, крэацыянізма, рэвеляцыянізма, правідэнцыялізма;*
*2)спасціжэнне існасці Бога рацыянальнымі сродкамі;*
*3)тэалагічнае абгрунтаванне субардынацыі душы і цела, веры і розуму, дабра і зла, боскага закона і свабоднай волі чалавека.*

Вырашэнне гэтых ірацыянальных задач рацыянальнымі сродкамі не толькі нарадзіла непераадольныя супярэчнасці паміж розумам і верай, але і падрыхтавала перадумовы для вызвалення розуму з-пад апекі рэлігіі і царквы і ўзнікнення новай філасофіі.

## Філасофія Адраджэння: адметнасці і кола праблем

Рэнесанс – гэта эпоха нараджэння новай цывілізацыі, якая прынцыпова адрознівалася ад традыцыйнага сярэдневяковага грамадства. Асновай гэтай цывілізацыі з’яўляецца прамысловасць з шырокім падзелам працы і ўкараненнем тэхніка-тэхналагічных сродкаў вытворчасці. Імклівы рост гарадоў, развіццё гандлю і мараплавання, вялікія геаграфічныя адкрыцці, з аднаго боку, патрабавалі шырокіх ведаў, а з другога – выступалі эфектыўным стымулам развіцця навуковага пазнання. Вось чаму філасофія Адраджэння самым непасрэдным чынам звязана з новым прыродазнаўствам, якое абумоўлівала і напрамак філасофскіх даследаванняў, і змест філасофскіх ідэй.

Ля вытокаў гэтай цывілізацыі стаялі чатыры тэхнічныя вынаходніцтвы, ужо ўкаранёныя ў будзёнае жыццё: магнітны компас, порах, механічны гадзіннік ды друкарскі станок. Наступствы гэтых вынаходніцтваў нельга пераацаніць. Магнітны компас адкрываў новыя землі і спрыяў нараджэнню новай геаграфіі, знаёміў еўрапейцаў з новымі культурамі, новымі рэлігіямі, новым ладам жыцця. Панаваўшая раней упэўненасць у непарушнасці, абсалютнасці і ўнікальнасці еўрапейскіх традыцый саступае месца ўсведамленню адноснасці звыклых каштоўнасцей. Порах, агнястрэльная зброя і артылерыя ўзвышалі нацыянальныя дзяржавы, надавалі ім свецкага характару і рабілі здольнымі супрацьстаяць каталіцкай царкве, давалі перавагу еўрапейцам у каланізацыі новых зямель. Гадзіннік стаўся не толькі і не проста правобразам і ўзорам машын і механізмаў, ён фарміраваў новае светаўяўленне, новы ідэал навукі, сучасны погляд на Сусвет, чалавека і грамадства і нават на Бога. Друкарскі станок спрыяў адкрыццю і масаваму асэнсаванню новых ідэй. Без яго была б немагчымай навуковая рэвалюцыя, што абапіралася на сувязі навуковай супольнасці. Друкарскі станок спрыяў распаўсюджванню адукацыі, ператвараў мысленне ў асабовы, нават

інтымны працэс, развіваў індывідуалізм, разбураў калектыўныя формы кантролю над разумовым жыццём.

Гэтая цывілізацыя ды інспіраваны ёю навуковы пошук вельмі хутка выявілі ўпадак і адсталасць паслярымскай культуры, дэградацыю маральнасці, нікчэмнасць чалавека. Мінулае ўяўлялася як “цёмны век”, дзе нельга знайсці апраўдання ні свету, ні чалавеку. Намаганнямі Петраркі хрысціянская Еўропа адкрыла для сябе сваё мінулае – класічную антычнасць, знайшла ў ёй тое, што не залежала ад царквы, а мела сваю ўласную каштоўнасць і ўзвышала чалавечы дух. Адкрытая антычнасць паўстае не проста і не толькі ўзорам для пераймання. Яна праяўляецца як магутны стымулятар і інспіратар культуратворчай дзейнасці. Гэта было не простым запазычаннем культурных каштоўнасцей антычнасці, а іх арыгінальнай творчай перапрацоўкай, тварэннем новай культуры. І ў гэтым творчым працэсе адкрываецца натуральнасць чалавека, яго зямное паходжанне, яго творчая прырода. Аказваецца, што ў тым свеце, дзе жыве чалавек, чалавечага не меней, чым боскага. Яго намаганнямі створаны гарады, замкі, дамы, храмы і палацы. Ён стваральнік жывапісу, музыкі, літаратуры. Яго талентам ствараецца навука і філасофія. Чалавек – гэта геній, які творыць свет свайго існавання. *Натуралізм* у інтэрпрэтацыі свету і чалавека спалучаецца тут з *антрапацэнтрызмам і гуманізмам*. Яны праяўляюцца не толькі ў тым, што менавіта чалавек становіцца галоўнай праблемай гэтай філасофіі, і не ў тым, што культывіруецца любоў да гэтага чалавека. Сутнасць рэнесанснага антрапацэнтрызма і гуманізма найперш і галоўным чынам заключаецца ў прызнанні за чалавекам права і абавязку ўдасканальваць свет і самога сябе з дапамогай розуму і ў адпаведнасці з яго прынцыпамі. Дантэ Аліг’еры, Франчэска Петрарка, а пазней Леон Баціста Альберці, Ларэнца Вала, Піка дэла Мірандола, Эразм Ратэрдамскі разбуралі традыцыйны вобраз чалавека як істоты грахоўнай і залежнай ад Бога, і сцвярджалі думку аб тым, што месца чалавека ў свеце абумоўлена не грахом і выратаваннем, а выключна яго годнасцю. Яна заключаецца ў здольнасці чалавека ўзвышацца ад жывёльнага стану да чалавечага, гэта значыць – у здольнасці да самаўдасканалення, і сведчаннем гэтай здольнасці ёсць створаны чалавекам свет навукі і мастацтва, эканомікі і рамёстваў, свет культуры, які дапаўняе і завяршае створанае Богам. Homo humanitas – гэта культурны, дзейны чалавек, які стварае і пазнае свет свайго існавання і дзякуючы гэтаму ўзвышаецца да ўзроўню творцы. Мэтай і сэнсам жыцця чалавека павінна стаць *свабода чалавечага дзеяння.*

Такое разуменне чалавека і яго прызначэння ў свеце не магло не прывесці да пытання аб тым, ці адпавядае сучаснае грамадства гэтаму “свабоднаму генію”, а калі не адпавядае, то якім яно павінна быць. Томас Мор у сваёй “Утопіі”, Тамаза Кампанела ў “Горадзе сонца” ствараюць мадэлі ідэальнага грамадства, свабоднага ад прыватнай уласнасці, няроўнасці і несправядлівасці. Так завяршаецца першы

*антрапацэнтрычна-гуманістычны* этап развіцця рэнесанснай філасофii (сярэдзіна XIV – сярэдзіна XV стст.).

Актуальнасць праблемы чалавека ў філасофii Адраджэння не выключала, а нават абвастрала цікаўнасць да прыроды, яе будовы і прынцыпаў існавання, стымулявала анталагічныя пошукі. І тут мы знаходзім відавочныя антычныя ўплывы, і тут мы заўважаем, што гэта было не простае паўтарэнне натурфіласофскіх ідэй антычнасці, а пошук уласнага шляху ў навуцы. Менавіта ў анталогіі сувязь Адраджэння з папярэдняй эпохай праявілася найбольш выразна. Галоўнай праблемай новай натурфіласофii ёсць праблема дачыненняў Бога і свету. *Бернардына Тэлезіа, Франчэска Патрыцы, Парацэльс, Мікола Кузанскі*, прызнаючы Бога ў якасці творцы свету, адступаюць ад кананічнага біблейскага разумення яго. Бог не па-за светам, не над ім, ён душа гэтага свету, святло, што пранізвае ўвесь свет і кожную рэч у ім і надае ўсяму сэнс і значэнне, нараджае гармонію. Бог і свет адзіны. Чым далей развівалася рэнесансная філасофія, тым больш сваіх кананічных рысаў страчваў Бог, тым выразней станавілася яшчэ неадэкватнае разуменне яго як прыроднага закона, натуральнай неабходнасці. Бог не гэтак творца прыроды, як гарманізуючы яе закон, а сама прырода са сферы, падпарадкаванай духу, ператвараецца ў натуральны пачатак усіх рэчаў. Да такіх высноваў прыходзіць рэнесансная філасофія на другім этапе свайго развіцця (сярэдзіна XV – першая трацiна XVI стст.), які атрымаў назву *анталагічна-неаплатанічнага.*

Трэці этап у гісторыі філасофii Адраджэння (другая палова XVI – пачатак XVII стст.) цесна звязаны з прыродазнаўствам і характарызуецца як *натурфіласофскі. Мікола Капернік, Йоган Кеплер, Галілеа Галілей, Джардана Бруна* стваралі новую тэарэтычную мадэль Сусвету, канчаткова парывалі з антычнымі і сярэдневяковымі поглядамі на яго будову, фарміравалі перадумовы навуковай рэвалюцыі. Ідэя бясконцага Сусвету, які развіваецца па сваіх уласных законах, рабіла відавочнай несумяшчальнасць навукі і рэлігіі, розуму і веры, дэманстравала згоду паміж будовай Сусвету і матэматычнымі законамі і стварала перадумовы ператварэння матэматыкі з абстрактнага занятку ў сродак спачатку астранамічных, а затым і прыродазнаўчых даследаванняў. Так у супярэчнасцях пераходнага перыяду нараджаюцца і набіраюцца моцы элементы новай навукі, новага светапогляду, новай культуры – Новага часу.

Падсумуем сказанае. Філасофія Адраджэння паўстае як самасвядомасць новай эпохі, звернутай да антычнай культуры, антычнай вучонасці, антычнага ладу жыцця і адначасова як выхад, пераадоленне сярэдневяковай схаластыкі і засілля рэлігіі. Але гэта было не “паўтарэнне пройдзенага”, а тварэнне новай філасофскай і культурнай прасторы, у цэнтры якой стаяў чалавек – творца сваёй рэчаіснасці. Галоўнымі рысамі гэтай філасофii з’яўляюцца:

1)*антрапацэнтрызм – прызнанне чалавека галоўнай праблемай філасофіі, цэнтральным элементам прыроды, вышэйшай праявай боскага тварэння;*
*2)гуманізм – прызнанне за чалавекам права і абавязку актыўна ўмешвацца ў прыроднае і сацыяльнае жыццё з мэтай яго ўдасканалення на падставе розуму і паводле яго прынцыпаў;*
*3)эстэтызм – стаўленне да Сусвету як увасаблення гармоніі, сіметрыі і прыгажосці;*
*4)натуралізм – свет і чалавек разглядаюцца не з пазіцый крэацыянізма, а як натуральныя існасці, прынцыпы існавання якіх знаходзяцца ў іх саміх;*
*5)пантэізм – атаясамленне свету і Бога, растварэнне Бога ў свеце, дзякуючы чаму Бог страчвае свой надпрыродны і па-запрыродны характар і зліваецца з прыродай, а прырода абагаўляецца.*

## Новаеўрапейская філасофія

*Асноўныя рысы філасофіі XVII ст. і яе сувязь з гістарычнай практыкай.*
XVII стагоддзе было перыядам магутнага ўздыму новай індустрыяльнай цывілізацыі, асновы якой закладваліся ў эпоху Адраджэння. Пачатак гэтага стагоддзя ў сваёй культуры адлюстраваў супярэчлівасць пераходнага перыяда і адначасова выявіў непарушную повязь часоў, няспыннасць гістарычнага працэса. Падмуркам гэтай цывілізацыі, яе эканамічнай асновай была прамысловасць, заснаваная на машыннай вытворчасці. Эфектыўнасць яе функцыянавання магла быць забяспечана толькі на шляху няспыннага ўдасканалення і вынаходніцтва новых тэхнічных сістэм і тэхналагічных працэсаў. Гэтую задачу нельга было вырашыць без шырокай сістэмы навуковых ведаў, здольных забяспечыць поспех у практычнай дзейнасці. З другога ж боку, эканоміка новай цывілізацыі патрабавала, і патрабавала ва ўсё больш шырокіх маштабах, уцягнення ў практычна-вытворчую сферу разнастайных прыродных матэрыялаў, што таксама немагчыма без разгалінаванай сістэмы навук. Такім чынам, па самой сваёй сутнасці новая цывілізацыя, з аднаго боку, патрабавала навуковых ведаў як умовы свайго развіцця, а з другога – інспіравала і стымулявала навуковы пошук. Але ні антычная, ні, тым больш, сярэдневяковая схаластычная навука не маглі забяспечыць патрэбнасць у ведах, бо былі чыста разумовымі, абстрактымі навукамі. Іх задачай быў пошук першых умоў быцця свету і чалавека, а не вырашэнне канкрэтных праблем сацыяльнага развіцця. Неабходна было пераарыентаваць навуку з трансцэндэнтных прынцыпаў усякага існавання на даследаванне канкрэтных прыродных прадметаў, а для гэтага трэба было стварыць новы вобраз навукі, новы ідэал навуковасці, новую метадалогію навуковага даследавання. Вось чаму гнасеалагічная праблематыка набывае пераважны характар у новаеўрапейскай філасофіі, а пошук новага метада навуковага пазнання вызначае філасофскае аблічча XVII стагоддзя.

## *Метадалагічныя пошукі і механіцызм*

Практычныя патрэбнасці развіцця грамадства ператвараюць навуковыя веды ў сацыяльную каштоўнасць, якая вызначае меру магчымасцей чалавека ў свеце і ступень яго свабоды. “Веды – гэта сіла” – гэтае крэда пачынальніка новаеўрапейскага эмпірызма Ф.Бэкана адначасова адлюстроўвае і сутнасць гэтай эпохі. Веды – сіла, бо чалавек толькі можа ў гэтым свеце, колькі ён ведае пра яго. Веды становяцца ўмовай рацыянальнага панавання чалавека над светам, асновай яго свабоднай дзейнасці. І натуральна, што ў пошуках новага метада вучоныя звяртаюцца да тых навук, якія забяспечвалі паспяховае рашэнне практычных задач: стварэння новых машын, астранамічных прыбораў, гадзіннікаў, караблёў. Гэтыя машыны і прыборы павінны былі надаць моцы ўздзеянню чалавека на прыроду, вызначыць працягласць тэхналагічных працэсаў, дакладна ўстанавіць месцазнаходжанне судна ў адкрытым моры. Гэтыя навукі пачынаюць фарміравацца яшчэ ў папярэднюю эпоху. Сваім узнікненнем яны абавязаны дзейнасці такіх вучоных, як Галілей і Агрыкола, Левенгук і Палісі, Паскаль і Тарычэлі, Гук і Гарвей, Гільберт і Бойль. Разам яны і ўтваралі тое, што атрымала назву вопытна-эксперыментальнага матэматызаванага прыродазнаўства, аснову якога складала механіка. Гэта і было адной з прычын, якія спрыялі развіццю механіцызма і пераносу яго з прыродазнаўства ў светапогляд, метадалогію і філасофію. Эксперымент і аналіз, класіфікацыя і абагульненне – вось асноўныя прыёмы навуковага даследавання. Мяняецца ідэал навуковага пазнання. Калі папярэдняя эпоха аддае перавагу аналогіі як сродку выяўлення “прыхаваных якасцей”, то Новы час прызнае толькі аналіз і параўнанне. Калі дзейнасць пазнання XVI ст. скіравана на збліжэнне рэчаў шляхам выяўлення іх “патаемных сіл”, то мысленне XVII ст.прызначана адрозніваць прадметы, адкрываць тоеснасць іх і ўказваць пераходы да ўсіх ступеняў аддалення ад гэтае тоеснасці.

## *Эмпірызм*

Роля, якая ў новым прыродазнаўстве адводзілася аналізу, была гэткай значнай, што прыводзіла да абсалютызацыі яго, а гэта, у сваю чаргу, спрыяла развіццю механістычнай аднабокасці той карціны свету, якая стваралася гэтым прыродазнаўствам. Расчляненне свету на складовыя часткі, выяўленне тоеснасці і адрозненняў паміж імі на падставе параўнання і вымярэння патрабавалі звароту да канкрэтных прадметаў, апірышча на вопыт, даверу пачуццям. Так фарміруецца *эмпірычная традыцыя* ў новаеўрапейскай філасофіі. *Эмпірызм* (грэч. empeiria – вопыт) адзінай крыніцай пазнання лічыць пачуццёвы вопыт, а веды разглядае як пачуццёвыя вобразы прадметаў гэтага вопыту. “У розуме няма нічога

такога, чаго б раней не было ў пачуццях" – вось формула эмпірызма. Роля розуму тут чыста службовая: параўнанне, абагульненне і абазначэнне таго, што дадзена ў вопыце. Эмпірызм абапіраецца на сенсуалізм (лац. sensus – пачуцце, адчуванне), які абсалютызуе ролю пачуццяў у пазнанні, лічыць іх адзінай і дастатковай крыніцай ведаў. Метадалагічнай асновай эмпірызма з'яўляецца індукцыя. Гэты метад, як і асновы эмпірызма, быў распрацаваны англійскім філосафам *Фрэнсісам Бэканам.* Ён лічыў, што для паспяховага пазнання прыроды найперш неабходна ачысціць розум ад гэтак званых ідалаў, гэта значыць прымхаў і памылак, народжаных нашай суб'ектыўнасцю і даверам да аўтарытэтаў. Свабодны розум адмаўляе любыя аўтарытэты і прызнае толькі аўтарытэт факта. Пазнанне – гэта паступовы пераход ад аднаго факта да другога, адсячэнне выпадковага, выяўленне ўстойлівага і фармулёўка агульнай высновы. Веды, атрыманыя такім метадам, заўжды носяць канкрэтны характар, існуюць у форме пачуццёвых вобразаў і могуць быць адноўлены і пацверджаны ў новым месцы і пры новых абставінах. Ідэя эмпірызма, сфармуляваная Ф.Бэканам, сістэматычна развівалася на матэрыялістычнай аснове *Томасам Гобсам і Джонам Локам,* а суб'ектыўна-ідэалістычная інтэрпрэтацыя яе была дадзена *Давідам Юмам і Джоржам Берклі.*

*Рацыяналізм*

Перавага колькасных метадаў навуковага даследавання, імкненне да максімальнай дакладнасці ў высновах патрабавалі і адпаведнай тэрміналогіі: дакладнай, адназначнай, эфектыўнай. Такім патрабаванням адпавядала матэматыка. Гэта спрыяла інтэнсіўнаму развіццю яе і ставіла праблему матэматызацыі навукі. Культура і навука XVII ст. ва ўсё большай ступені набывае сімвалічны характар. Пачуццёвыя вобразы, метафары, параўнанні выцясняюцца са сферы навуковага аналіза і замяняюцца матэматычнымі знакамі. Калі антычны космас поўны жывасці і фарбаў, то свет новай навукі – гэта свет геаметрыі. Ён страціў сваё натуральнае багацце і набыў форму геаметрычнай канструкцыі. Яе апісанне патрабавала новых сродкаў, рацыяналізаваных па самой сваёй сутнасці. Гэта і было адной з прычын нарастання ролі рацыяналізма ў філасофскім мысленні XVII ст. І чым больш пераадольваліся памылкі мінулых эпох, тым больш моцнай становіцца *рацыяналістычная тэндэнцыя.* Гэтаму спрыялі і іншыя акалічнасці. Па-першае, эмпірызм забяспечваў пазнанне асобных прадметаў і тых уласцівасцей іх, якія ляжалі на паверхні і маглі быць зафіксаваны з дапамогай органаў пачуццяў, але ён не меў сродкаў выяўлення прычын і агульных заканамернасцей. Па-другое, з пазіцый эмпірызма нельга было растлумачыць наяўнасць у навуковай тэорыі агульных паняццяў і механізм іх узнікнення, а менавіта гэтыя паняцці валодалі найбольшай эўрыстычнай каштоўнасцю. Па-трэцяе,

выклікала сумнеў тая службовая роля, якую эмпірызм прыпісваў розуму. Нарэшце, узмацненню рацыяналістычнах тэндэнцый спрыяла і тое разуменне ісціны, якое склалася ў новаеўрапейскай філасофіі. Ісцінныя веды не толькі могуць але і павінны быць абсалютнымі, поўнымі, вечнымі і нязменнымі. Ісціна заўжды валодае ўсеагульным і неабходным характарам, з'яўляецца канчатковай і ніякаму ўдакладненню не падлягае. Ёй уласціва паўната і яна не мае патрэбы ў дапаўненнях: спасцігнуўшы ісціну, мы валодаем усімі магчымымі ведамі. Ісціна непадуладна часу, яна адлюстроўвае не толькі тое, што ёсць, але і тое, што павінна быць і што абавязкова будзе. *Такую ісціну нельга вывесці з вопыта, адзінай яе крыніцай можа быць толькі розум.* Гэта азначае, што рацыяналізм (лац. ratio – розум) аддаваў перавагу розуму як больш надзейнаму і эфектыўнаму сродку пазнання і гэтым прынцыпова адрозніваўся ад эмпірызма, які абапіраўся на пачуцці. Пачынальнікам рацыяналістычнай традыцыі ў новаеўрапейскай філасофіі быў французскі філосаф *Рэне Дэкарт.* Пачаткам усякага пазнання ён лічыў метадычны сумнеў. Нельга некрытычна давяраць усяму таму, што паўстае перад нашым розумам. Кожную з'яву, кожнае паняцце мы павінны падвергнуць *сумненню*, з дапамогай *аналіза* пад строгім *кантролем* розуму дасягнуць іх *відавочнасці* і толькі тады ўключаць у сферу пазнання. Навуковы пошук павінен разгортвацца ад агульных паняццяў да вывядзення ўсіх магчымых простых і таму відавочных уяўленняў. Як бачым, Дэкарт у тэорыі пазнання аддаваў перавагу дэдуктыўнаму метаду. Унёсак Дэкарта ў развіццё еўрапейскай культуры і філасофіі цяжка перабольшыць. Ён не толькі філосаф, аўтар "новых правіл і прынцыпаў філасофіі". Дэкарт стваральнік аналітычнай геаметрыі, важкі яго ўнёсак ў развіццё вышэйшай матэматыкі, оптыкі.

Прадаўжальнікамі рацыяналістычнай традыцыі ў новаеўрапейскай філасофіі былі *Бенедыкт Спіноза і Готфрыд Лейбніц.* Разам яны ажыццявілі сістэматычную крытыку пазнавальных здольнасцей чалавека, правялі генетычнае даследаванне крыніц пазнання і логіка-метадалагічны аналіз яго прэтэнзій на ўніверсальнасць, апісалі фактычныя спосабы функцыянавання чалавечых пазнавальных здольнасцей і адначасова вялі пошук абсалютных, па-за часам і па-за чалавекам, норм ісціннасці.

*Сістэматворчасць*

Вынікам рацыяналістычных намаганняў новаеўрапейскай філасофіі сталася вывядзенне свету за межы розуму і супрацьпастаўленне яму. Галоўнай задачай розуму становіцца пабудова метафізічнай карціны свету на падставе "першых прынцыпаў мыслення". Дзеля рашэння гэтай задачы неабходна было рэканструяваць структуру пазнаючага мыслення, выявіць яго асноватворчыя прынцыпы і растлумачыць характар узаемаадносін паміж імі, г.зн. стварыць сістэму "чыстага розуму", у якой цалкам выразна

і лагічна несупярэчліва паўстаюць усе структурныя элементы яго. Гэтае імкненне да сістэматворчасці з’яўляецца адной з істотнейшых рыс новаеўрапейскага мыслення. Такія сістэмы не толькі аднаўлялі архітэктоніку розуму, з гэтай архітэктонікі яны выводзілі і структуру Сусвету.

Якія ж найбольш істотныя рысы філасофіі XVII стагоддзя?

1)*Найістотнейшай рысай новаеўрапейскай філасофіі з’яўляецца яе навукацэнтрызм. Веды і тая сфера дзейнасці, у якой гэтыя веды ствараюцца, паўстаюць мэтай чалавечага жыцця, асновай рацыянальнага панавання над светам, падставай і ўмовай свабоды чалавека, мерай яго магчымасцей. Пры гэтым мяняецца само разуменне навукі і ствараецца новы ідэал навуковасці. Мэта навукі – не марная мудрагелістасць, а забеспячэнне ўмоў для практычнага поспеху. Яна набывае статус грамадскага інстытута, прызначанага для рашэння сацыяльна значных праблем;*

2)*пад уплывам практыкі індустрыяльнага будаўніцтва і ў сувязі з развіццём прыродазнаўства* ў філасофіі XVII ст. распаўсюджваецца *механіцызм*, які выцясняе з навукі схаластыку, але адначасова выключае якасную разнастайнасць прыроды. Калі механіка – універсальная навука, то ўсе астатнія навукі толькі яе працяг. Таму можна і нават неабходна ўсе з’явы жыцця і свядомасці звесці да механічных працэсаў. *Механіцызм набывае характар светаўяўленчай пазіцыі.* Зведзеныя ж да механічных працэсаў усе з’явы могуць быць апісаны з дапамогай сродкаў механікі. Злучэнне, звязванне, групіраванне, вымярэнне, класіфікацыя – разнастайныя віды камбінаторыкі – разглядаюцца як універсальныя спосабы пазнання. *Механіцызм сцвярджаецца і ў якасці пануючага метадалагічнага падыхода;*

3)*змена светаўяўленчых і метадалагічных установак у культуры Новага часу* была вынікам навуковай рэвалюцыі, для якой уласціва адмаўленне ідэі канечнага, іерархічна ўладкаванага свету і замена яе ідэяй бясконцага Сусвету, цэласнасць якога забяспечваецца ідэнтычнасцю яго элементаў і аднастайнасцю дзеючых законаў. *Задача пазнання гэтага Сусвету разглядалася як задача пабудовы ідэальнай мадэлі свету на падставе “першых прынцыпаў розуму” і ў дакладнай адпаведнасці лагічным законам;.*

4)*пасля Галілея прырода ўсё больш і больш падвяргаецца ідэалізацыі.* Яна ператвараецца ў матэматычна сканструяванае быццё, якое і выступае прадметам філасофскага даследавання. Гэта, па стунасці, свет геаметрыі, а матматыка выступае як надзейны сродак яго пазнання, як узор навукі і навуковасці. Чалавечая праблематыка выцясняецца са сферы філасофіі. Гэта забяспечвала неабходны характар ведаў, але выключала магчымасць аналіза дзейнай прыроды суб’екта. Прынцып cogito стаўся той метадалагічнай устаноўкай, якая забяспечвала пазнанне ўсеагульнага.

Розум станавіўся адзіным і паўнаўладным суверэнам. Толькі ён на падставе сумнення мог здабываць ісцінныя веды. Розум паўставаў як вярхоўны суддзя ўсіх перадумоў. Сам жа ён не падлягаў ніякаму суду. Нават існаванне выводзілі з розуму. Але чым паўнейшай станавілася аўтаномія розуму, тым выразней праяўлялася яго супрацьлегласць быццю. Ідэал неабумоўленых ведаў вымагаў аналіза свету наогул, па-за яго суаднесенасцю з чалавекам і яго суб’ектыўнасцю;

*5)страта чалавечага ў свеце, супрацьпастаўленасць розуму і быцця, сумненне ў правамоцнасці і аб’ектыўна-змястоўнай значнасці метафізічных канструкцый – вось тэарэтычная аснова, на якой вырастае Асвета, што адкрыла свет культуры як свет спецыфічна чалавечай жыццядзейнасці.*

## Ідэалы асветніцкай філасофіі

Асвета як эпоха і як інтэлектуальны рух, у які былі ўцягнуты ўсе краіны цывілізаванай Еўропы, з’ява такая складаная і шматзначная, што яе характарыстыку можна пачынаць з самых розных пазіцый. Але ў гэтай разнастайнасці поглядаў, множнасці напрамкаў праяўляецца пэўная агульнасць намаганняў, тоеснасць арыентацый, якія прыдавалі асветніцкай культуры адзінства і цэласнасць. Калі гэтае адзінства звязаць з характэрным для Асветы імкненнем ачалавечыць свет шляхам яго рацыяналізацыі, то гэтым будзе выражана агульная, але не самая галоўная рыса яе. Бо найбольш глыбокім і праграмовым намаганнем Асветы з’яўляецца пошук чалавека ў шматзначнай сферы яко жыцядзейнасці. І гэтае намаганне пераважае над першым імкненнем. Асветніцкая філасофія – гэта не толькі праект ачалавечвання свету, але адначасова і імкненне да рэалізацыі гэтага праекта. Разам з тым філасофская думка Асветы – гэта што раз больш выразнае усведамленне чалавекам сваёй дзейна-канструктыўнай прыроды, гэта нараджэнне самапазнання ўласнай творчай актыўнасці чалавека. Асветніцкае разуменне чалавека не абмяжоўваецца ўяўленнем аб істоце, якая рацыяналізуе свет паводле ўласных законаў, каштоўнасцей і інтарэсаў. Асветніцкі чалавек – гэта той, хто ў філасофіі знаходзіць сябе як творцу гэтай рацыянальнасці. Філасофія Асветы – гэта сфера, у якой чалавек адкрывае сябе самога як актыўную творчую істоту.

Уважліва ўглядаючыся ў гістарычную рэальнасць, атрыманую ім у спадчыну, чалавек заўважае, што яе арганізацыя жудасная. Шматвяковае мінулае прывяло людзей толькі да няшчасця. Акрамя пакутаў у ім нічога няма. Чаму? Што падлягае разбурэнню ў гэтым свеце? Царква, ідэя сувязі чалавека з Богам, рэлігійная канцэпцыя жыцця? І адначасова – пазітыўнае намаганне: адшукаць, у згодзе з прыродай, страчанае шчасце, усталяваць новае права, якое не мае нічога агульнага з правам боскім, новую мараль, незалежную ад тэалогіі, новую палітыку, якая ператварае падданых у

грамадзян. Што ёсць ісціна? Што ёсць жыццё? Ці магчыма справядлівасць? Гэтыя вечныя праблемы становяцца праграмовымі для ранняга асветніцтва. Спробы адказаць на гэтыя пытанні прывялі да высновы, што ўсё папярэдняе жыццё было заснавана на прымхах і памылках. Таму з самага пачатку асветніцкая філасофія праграмова крытычная.

*Крытыка*

Гэтая крытыка скіравана найперш супраць рэлігійнага светапогляду. Менавіта светапогляду, а не якой-небудзь рэлігійнай дактрыны альбо догмы. Гэтым асветніцкая філасофія адрозніваецца ад вялікіх сістэм XVII стагоддзя. Папярэднікі Асветы таксама крытыкавалі рэлігію, але толькі ў асобных яе догматах, з сацыяльна-маральных ды іншых установак. Асветніцкая ж крытыка скіравана супраць усякіх ведаў, заснаваных на аўтарытэце веры, супраць рэлігійна-сімвалічнага перажывання свету.

Адна з плыняў гэтай крытыкі інспіравана новым прыродазнаўствам. Яно крытычнае і атэістычнае ўжо таму, што ў навуковым досведзе знаходзіць факты, якія супярэчаць рэлігіі і біблейскаму аўтарытэту. Але яшчэ больш выразней крытычны характар прыродазнаўства праяўляецца ў тым, што яно ісціну абвяшчае аўтаномнай каштоўнасцю і, абапіраючыся на вопыт як адзіную аснову пазнання, не звяртае ўвагі на веру, традыцыю і аўтарытэт як крыніцы ведаў.

Другім напрамкам з’яўляецца гістарычная крытыка, скіраваная галоўным чынам супраць Бібліі. Святыя біблейскія тэксты, якія да гэтага былі аб’ектам перажывання ў веры, цяпер ператвараюцца ў факты, ісціннасць і грамадская карысць якіх можа і павінна быць устаноўлена крытычным розумам. Калі ж розум не знаходзіць падстаў для апраўдання гэтых фактаў, то яны павінны быць адкінутыя як прымхі і памылкі. Адначасова гістарычная крытыка скіравана на абвяржэнне іерархічнай сістэмы каштоўнасцей традыцыйнага светапогляду, у якім любыя дзеянні чалавека падпарадкоўваюцца першапачатковым эсхаталагічным мэтам. Найбольш паслядоўна гэтая крытыка прадстаўлена ў атэістычнай канцэпцыі французскіх асветнікаў *Франсуа Вальтэра, Жан-Жака Русо, Дэні Дзідро, Эцьена Кандыльяка, Жульена Ламетры, Клода Гельвецыя, Поля Гальбаха.* У межах асветніцкай ідэалогіі атэізм суіснаваў з *дэізмам,* што прызнаваў Бога толькі як творцу свету, які пасля гэтага не ўмешваецца ў існаванне свету. Апошні існуе і развіваецца паводле сваіх уласных законаў і прынцыпаў. Можна сказаць, што дэізм рацыяналізуе Бога і адначасова гуманізуе яго, “прызямляе” Бога, здымае з яго покрыва таямнічасці і звышпрыроднасці.

Яшчэ адным аб’ектам асветніцкай крытыкі з’яўляеца права. Тут, як і ў крытыцы прыроды і гісторыі, абвяргаецца боскае паходжанне права і магчымасць апраўдання яго на падставе гістарычнай традыцыі. З мноства

звычаяў і традыцый, якія мы атрымліваем у спадчыну ад гісторыі, заканадаўца павінен адбіраць толькі тыя, што паддаюцца рацыянальнаму абгрунтаванню што да іх паходжання. *Гэта значыць, што асветніцкая крытыка вядзе барацьбу не толькі супраць "святых", але і супраць "герояў". Гэтая крытыка ў рэшце рэшт набывае не гэтак антыклерыкальны, колькі антыманархічны, антыфеадальны характар. З пункту гледжання асветнікаў сапраўднымі каштоўнасцямі з'яўляюцца не ваенная слава, не шляхетна-манархічнае паходжанне, а разумнасць грамадства і росквіт яго культуры.*

Крытычны дух асветніцтва праяўляецца і ў яго адносінах да філасофіі XVII ст. Сутнасна гэтыя адносіны таксама крытычныя, але сама крытыка не адназначная. З аднаго боку, рацыяналізм філасофіі папярэдняга стагоддзя цесна звязаны з асветніцкімі ідэямі: эвалюцыя картэзіянства вяла да асветніцкага светапогляду. Мастком, што злучаў гэтыя дзве эпохі, быў *Фантэнель,* у творчасці якога картэзіянскія традыцыі перарастаюць у асветніцкія. Спрыяў станаўленню асветніцкай культуры і *спіназізм*. Але калі не зважаць на канкрэтныя асобы і творы, то можна сказаць, што створаная рацыяналізмам XVII ст. канцэпцыя індывіда, які з дапамогай аўтаномнага і суверэннага розуму вызваляецца ад аўтарытэта і веры, была надзвычай блізкая асветнікай філасофіі. Ідэя чалавека, які ў рацыянальным пазнанні здабывае ісцінныя веды і з іх дапамогай стварае ўласнае бачанне свету і разуменне свайго месца ў ім, – гэтая ідэя вельмі імпанавала асветнікам. Але агульнасць інтэлектуальных высілкаў дзвюх эпох не ўсведамлялася асветнікамі. У іх свядомасці дамінавала ўяўленне аб раздзельнасці і супрацьпастаўленасці гэтых намаганняў. Найбольш выразна гэта праявілася ў крытычным непрыняцці і нават адмаўленні асветнікамі сістэматворчасці XVII ст., дзе цэласны вобраз свету канструяваўся на аснове "першасных прынцыпаў розуму" і набываў форму геаметрычнай канструкцыі, пазбаўленай жыцця і фарбаў. "Дух сістэм" з іх геаметрычным метадам быў чужы для Асветы, таму што ён спрошчваў свет, ігнараваў багацце мадыфікацый чалавечага розуму ў сукупнасці і цэласнасці ўмоў, што акружалі чалавека. Субстанцыя, душа, бесканечнасць – аснова філасофскіх пошукаў папярэдняга стагоддзя, падаюцца асветнікам абстрактнымі і ўбогімі. Асвета імкнецца адшукаць канкрэтнага чалавека ў канкрэтнасці яго існавання і паказаць бясконцасць яго зямных патрэбнасцей.

### *Шчасце*

Якой жа мусіць быць філасофія, калі яна прэтэндуе на прызнанне ў грамадстве? Якія ісціны яна павінна адкрыць чалавеку? У чым яе прызначэнне? Як узгоднена і дружна асветнікі падвяргалі бязлітаснай

крытыцы існуючыя парадкі і атрыманыя ў спадчыну прымхі, гэтак жа дружна яны сцвярджалі, што чалавеку патрэбна толькі тая філасофія, якая здольна ўказаць шлях да шчасця. І з усіх ісцін, якія здольна адкрыць філасофія і навука, значэнне маюць толькі тыя, што спрыяюць нашаму набліжэнню да шчасця. Чалавек, як свабодная істота, нараджаецца з непарушнымі натуральнымі правамі, і толькі адзін абавязак дадзены яму: быць шчаслівым. Летуценнікі мінулых эпох не прывялі людзей да шчасця. Дарогай рэлігійных фанатыкаў таксама нельга дасягнуць яго. Навошта нам рай, мы хочам зямнога шчасця.

*Розум*

Але дзе ж дарога да шчасця? Хто павядзе нас па гэтай дарозе да запаветнай мэты? Толькі розум дапаможа нам у гэтым. Прынятае ў папярэднія эпохі абагаўленне розуму, адносіны да яго як дара божага, якім надзяляецца кожны чалавек, асветнікі адвяргаюць як злую спадчыну мінулага. Папярэдняя крытыка рацыяналістычнага ідэала XVII ст. паказала, што спробы канструявання свету на падставе і паводле “першасных прынцыпаў розуму” марныя. Гэтая крытыка таксама выявіла абмежаванасць розуму, няздольнасць яго да пазнання субстанцыі, канструявання абстрактных сістэм. Як жа асветнікі ўяўляюць сабе розум?

Перадусім яны адмаўляюць прыроджаны характар яго. Розум фарміруецца адначасова з нашай душой і ўдасканальваецца разам з ёю. Розум – гэта тая ўнутраная дзейнасць, якая стварае абстрактныя ідэі на аснове пачуццяў. Яго мэта – не дэдукцыя змястоўна пустых паняццяў, а пераадоленне памылак і адкрыццё ісціны. Розум мінулых стагоддзяў – гэта храм без фундамента. Пазбаўлены сваёй асновы, ён страчвае арыентацыю, імкнецца да безумоўнага і самога сябе абвяшчае бузумоўным. Асветнікі не прызнаюць такога розуму. Яны абмяжоўваюць яго вопытам рэальнага жыцця і гэтым надаюць яму сілы і значнасці. Такому розуму не патрэбен ніякі аўтарытэт, гэты настаўнік памылак, яму без патрэбы традыцыя. Ён сам сабе суддзя, і толькі яму аднаму дадзена права выносіць прысуд усяму існаму. Ён пераадольвае памылкі, вызваляе нас ад ілюзій, упэўнена вядзе нас да шчасця.  Гэта промень святла ў той цемры, што апанавала зямлёй. Гэтае святло – сінонім розуму – і адлюстроўвае сутнасць эпохі: Асвета.

Зробім высновы:

*1)асветніцкая арыентацыя на розум, з аднаго боку, сцвярджала прыярытэт розуму ў рашэнні ўсіх праблем, фарміравала ўпэўненасць у тым, што з дапамогай розуму і навукі можна забяспечыць шчаслівае жыццё чалавека і грамадства, а з другога – непазбежна вяла да поўнай абсалютызацыі розуму, што асабліва відавочна ў Хрысціяна Вольфа і яго нямецкіх паслядоўнікаў. Тут мараль становіцца справай розуму, вера – яго*

*аперацыяй, і нават Бог – вытворным ад розуму.* Анталагічныя асновы свету аказваюцца залежнымі ад лагічных асноў мыслення;

*2)крытычная арыентацыя і вальнадумства* надавалі асветніцкай філасофіі рэвалюцыйную скіраванасць і непрымірымасць да аўтарытарызма. Асветнікі не прызнавалі ніякіх знешніх аўтарытэтаў ні ў адной са сфер рэчаіснасці. Уяўленні аб прыродзе, разуменне грамадскага ладу, рэлігійны светапогляд, прэтэнзіі дзяржавы – усё павінна было паўстаць перад судом розуму і альбо атрымаць апраўданне ад яго, альбо зыйсці з гістарычнай арэны, саступіць месца таму, што апраўдана розумам;

*3)бясспрэчным і найбольш значным дасягненнем асветніцкай філасофіі было адкрыццё культуры як сферы спецыфічна чалавечай жыццядзейнасці.* Гэтая культура становіцца не толькі аб’ектам даследаванння, але і той сферай, якая пачынае вызначаць формы і спосабы пазнання і разумення дзейнай прыроды чалавека.

## Нямецкая класічная філасофія

Нямецкая класічная філасофія – гэта магутная інтэлектуальная плынь у гісторыі нямецкай культуры сярэдзіны XVIII – першай паловы XIX стст., звязаная з імёнамі *Імануіла Канта, Йогана Фіхтэ, Фрыдрыха Шэлінга, Георга Гегеля.* Яна была існспіравана тымі сацыякультурнымі працэсамі, якія адбываліся як у Германіі, так і ў Еўропе гэтага перыяда. Эканамічна адсталая, тэрытарыяльна раздробленая, палітычна рэакцыйная Германія патрабавала радыкальных перамен, здзейсніць якія ў гэтых умовах было немагчыма. Усё жывое і таленавітае прыцяснялася, рэакцыя палітычнага рэжыма выключала магчымасць практычнага рэфармавання грамадства. У гэтых умовах актыўнасць немцаў пераносіцца ў духоўную сферу. Тое, чага немцы не маглі здзейсніць практычна-палітычна, яны ажыццяўлялі ў літаратуры, якая перажывала перыяд росквіту. Пераадоленне адсталасці, палітычнае і нацыянальнае аб’яднанне краіны, дэмакратызацыя палітычнага жыцця – вось галоўныя намаганні найбольш свядомай часткі нямецкага грамадства.

Магутным стымулам развіцця нямецкай філасофіі была французская буржуазная рэвалюцыя 1789 – 1794 гг. Яна інспіравала развагі аб перспектывах сацыяльнага развіцця, тэарэтычнае абгрунтаванне ідэалаў новага грамадства, пошук новай рацыянальнасці. А адсутнасць палітычных свабод і ўсеўладная цэнзура вялі да таго, што гэтыя развагі прынялі форму абстрактных і часта знарок складаных тэкстаў.

Вялікі ўплыў на тэматыку нямецкай класічнай філасофіі аказала і новае прыродазнаўства. Спроба асэнсаваць гэтую новую з’яву, выявіць механізмы функцыянавання гэтай навукі, вызначыць яе метадалагічную базу ў той ці іншай ступені праяўляюцца ў творах усіх аўтараў азначанага перыяда.

Непасрэдным ідэйным папярэднікам нямецкай класічнай філасофіі было асветніцтва. Дастаткова сказаць, што Кант высока цаніў творчасць Русо, а з нямецкімі асветнікамі быў звязаны асабістымі сувязямі. *Вольф, Крузіус, Ламберт, Тэтэнс, Мендэльсон, Гердэр, Лесінг, Гётэ* былі гістарычнымі сучаснікамі пачынальніка нямецкай класічнай філасофіі і тэарэтычнымі папярэднікамі яго. Асветніцкія ідэі былі ўспрыняты ў Германіі XVIII ст. і развіваліся тут у вострай барацьбе з прымхамі, фанатызмам, палітычнай і рэлігійнай нецярпімасцю. Менавіта тут найбольш выразна праявіліся галоўныя маральныя ўстаноўкі Асветы: цярпімасць, дабрачыннасць, гуманнасць. Нямецкія асветнікі следам за сваімі еўрапейскімі аднадумцамі бачылі свой навуковы і грамадзянскі абавязак у тым, каб адкрыць людзям праўду аб іх уласнай прыродзе, вывесці на шлях ісціны, здабыць свабоду ў найлепшым грамадскім ладзе.

### *Развіццё*

Асветнікі былі ўпэўненыя ў дасягальнасці гэтых мэтаў. Гістарычны аптымізм – характэрная ўласцівасць Асветы, галоўнай заваёвай якое сталася абгрунтаванне ідэі сацыяльнага прагрэса. Менавіта тут палягаюць карані гістарызма. Для філасофіі нямецкай Асветы гэтыя асаблівасці ўласцівы перш за ўсё. Малады Кант, Гердэр, Лесінг, Шылер, у рознай форме і з розным талентам праводзяць ідэю развіцця ў прыродазнаўства і грамадскія навукі.

Ідэі кантавай “Усеагульнай гісторыі і тэорыі неба” разбуралі ўяўленні аб боскім паходжанні і нязменнасці прыроды. Ідэя эвалюцыі станавілася галоўным светаўяўленчым і метадалагічным арыенцірам.

Творчасць Лесінга і Гердэра пераадольвала міф аб боскай завершанасці чалавека. Няспыннае ўдасканаленне – вось яго асаблівасць. *Чалавек ніколі не бывае завершаным. Развіваецца яго інтэлект, мова. Гісторыя мовы непарыўна звязана з гісторыяй мыслення, а абедзьве яны – часткі грамадскай гісторыі, у працэсе якой індывіды і народы засвойваюць назапашаны вопыт, асэнсоўваюць дасягненні мінулых эпох. Гэта свет культуры, якія перадаецца ад народа да народа. Гісторыя чалавека – гэта гісторыя чалавечай культуры.*

Але культура – вынік дзейнасці чалавека. Таму паўстае пытанне аб вытоках гэтай дзейнасці. А паколькі культура ў гэты перыяд разглядаецца выключна як духоўная культура, то вытокі дзейнасці як субстанцыі культуры спрабуюць адшукаць ў ідэальнай сферы свядомасці. Адсюль і ідэалізм, гэтак характэрны для нямецкай класічнай філасофіі.

*Ідэя актыўнасці свядомасці*

Найбольш істотным вынікам гэтых пошукаў сталася ідэя актыўнасці свядомасці, упершыню распрацаваная Кантам. Калі філасофія папярэдняга перыяда разглядала чалавека як пасіўна-сузіральную істоту, а працэс пазнання – як простае сузіранне, то Кант упершыню адкрывае творча-актыўную, сінтэтычна-канструктыўную прыроду чалавека, а пазнанне разглядае як працэс стварэння свету з'яў, альбо свету культуры. Падставы гэтай дзейнасці адначасова выступаюць і падставамі існавання культуры. Пры гэтым Кант мяркуе, што спосабы і мэты пазнання заўжды падпарадкаваны маральна-практычнай дзейнасці і сваю магчымасць набываюць дзякуючы ёй. Веды маюць каштоўнасць толькі ў той ступені, у якой яны спрыяюць чалавеку ў дасягненні дасканаласці. Гэтая ідэя мае для нас падвойнае значэнне: *па-першае, у суб'ектыўна-ідэалістычнай форме Кант упершыню паспрабаваў абгрунтаваць залежнасць пазнання ад практыкі і, па-другое, паказаць актыўнасць пазнання як канструяванне свету культуры, у якім чалавек набывае свабоду і рэалізуе маральны ідэал.*

Варта адзначыць той факт, што, паводле Канта, гэтая дзейнасць разгортваецца ў свеце прыроды, ў сферы "рэчаў саміх па сабе", якая абмяжоўвае розум і вымушае яго лічыцца з неабходнасцю прыроднага існавання. Гэта, на думку Канта, засцерагае розум ад празмернага суб'ектывізма. З гэтага пункту гледжання далейшае развіццё нямецкай класічнай філасофіі ідзе па шляху вызвалення ад гэтага матэрыялістычнага "давеску". У сістэмах Фіхте і Шелінга дзейнасць з атрыбута пазнання і культуры ператвараецца ў аснову свету. Прызначэнне чалавека – свабода. Сродкам яе дасягнення ёсць культура. Гэтая культура з'яўляецца вынікам чалавечай дзейнасці. Яна і ёсць свет чалавека, і ніякага іншага свету няма. Так фарміруецца ўяўленне аб дзейнай і таму супярэчлівай прыродзе чалавека і таго свету, які ён стварае. Але адначасова нарастае і суб'ектывізм. Яго пераадоленне пачынаецца ў творчасці Гётэ, братоў Гумбальдтаў, у рамантызме, але заслуга ў гэтым найперш належыць Шэлінгу з яго ідэяй усеадзінства. Шэлінг усё жыццё імкнуўся ажыццявіць сінтэз спіназізма з яго абсалютнасцю прыроды і фіхтэанства з яго абсалютызаванай суб'ектыўнасцю. Гэтае імкненне, часта незалежна ад самога Шэлінга, прыводзіць да нарастання аб'ектывізма ў ацэнках мыслення, якое ўсё больш і больш набывае рысы ўсеадзінага Бога, супярэчлівага па самой сваёй сутнасці. Бог – гэта і розум, і сам свет. У ім змагаюцца рэальнае і ідэальнае, эгаізм і любоў. Станаўленне свету (і Бога) – гэта пераадоленне эгаізма праз любоў.

Гэтыя напалову рэлігійныя, напалову піетычныя ўяўленні позняга Шэлінга становяцца непасрэдным разумовым матэрыялам для маладога Гегеля. У "Жыцці Ісуса" і ў "Духу хрысціянства" ён спрабуе пераадолець

разрыў паміж існым і належным у маралі, знайсці такую агульную сферу, якая б адпавядала асобнаму чалавеку.

*Дыялектыка*

У гэтых пошуках і нараджаецца гегелеўская дыялектыка – галоўнае дасягненне нямецкай класічнай філасофіі. Сутнасць дыялектыкі коратка можна характарызаваць наступным чынам. Ніякі стан свету і ніякія веды аб ім не бываюць нязменнымі. І свет, і яго пазнанне – гэта працэс, які няспынна мяняецца, і гэтая зменлівасць ёсць істотнай уласцівасцю іх. Усякі стан, любыя веды ўтрымліваюць у сабе сваю супрацьлегласць, сваё адмаўленне. Душой, крыніцай гэтай зменлівасці з’яўляецца супярэчлівасць усяго існага. *Штосьці існуе толькі ў той ступені, у якой яно ўнутры сябе ўтрымлівае сваю супрацьлегласць – гэты корань усякай жыццяздольнасці і сілы.* Пераадоленне гэтых супярэчнасцей і ёсць працэс развіцця. Яго нельга прыпыніць, ад яго нельга адмовіцца. Тое, што яшчэ ўчора было жыццядзейным, сёння робіцца састарэлым і асуджаным на адмаўленне. Справядлівае ў адным выпадку паўстае як вышэйшая несправядлівасць у другім. Сапраўднае ўчора перастае быць такім сягодня і альбо само павінна саступіць месца новаму, альбо падлягае прымусовай ліквідацыі з боку больш развітай рэчаіснасці. Але гэта – рэчаіснасць свядомасці, рэальнасць духа. Прырода ж – гэта “акамянелы дух”. Яе таму нельга ні абагаўляць, ні ставіць вышэй за чалавечыя здзяйсненні. Прыродныя формы не ведаюць развіцця. Такой здольнасцю валодае толькі дух. І менавіта ў духу завяршаецца развіццё, бо менавіта ў развіцці духу дасягаецца вышэйшая мэта – пазнаць самога сябе. Дух заўважае, што ўсё, што адрозніваецца ад яго, толькі здаецца такім. На самой справе гэта сам дух на розных стадыях свайго развіцця. Так розум замыкаецца на самім сабе і гэтым пазбаўляе сябе той асновы, на якой толькі ён і можа функцыянаваць. Рэальнае развіццё прыроды тут падмяняецца рухам і зменлівасцю паняццяў. Але як ў працэсе гэтага руху ўзнікае свет? Як развіццё паняццяў прыводзіць да з’яўлення прыроды?

Гэтыя пытанні адносяцца да самага ўразлівага месца ў філасофіі Гегеля. І паставіў іх яшчэ Шэлінг. І гэтыя ж пытанні сталіся падставай для самай бязлітаснай крытыкі з боку *Людвіга Фейербаха.*

*Антрапалагічны матэрыялізм і крытыка ідэалізма*

Фейрбах быў першым крытыкам нямецкага ідэалізма. Заслуга яго заключаецца ў тым, што з пазіцый матэрыялізма ён выявіў вытокі і ўмовы існавання рэлігіі і ідэалізма. Ён паказаў зямныя прычыны гэтых з’яў духоўнай культуры. У сапраўднасці прырода папярэднічае як Богу, гэтак і духу. “Так дзейнасць чэрава папярэднічае дзейнасці галавы, першае ў

жыцці – ежа і пітво", – пісаў  Фейербах. Ідэалізм абсалютызуе дзейнасць галавы, прыпісвае ёй такую моц і такія функцыі, якімі  ў сапраўднасці яна не валодае. Ідэалізм і рэлігія падвойваюць свет, у рэлігіі і ідэалізме аб'ектывізуеца немач і недасканаласць чалавека. З дапамогай духа і Бога чалавек пераадольвае свае недахопы. У дух і ў Бога змяшчае чалавек тыя праблемы, якія ён сам вырашыць не можа. Бог – гэта створаны чалавекам яго ўласны цень. Сапраўдным жа богам ёсць сам чалавек. Яго боскасць праяўляецца ў любові. Любоў гэта аснова маральнасці і чалавечнасці, падстава грамадзянскасці. Любоў – гэта Бог у чалавеку. Гэтая зямная гуманістычная скіраванасць Фейрбаха не можа не імпанаваць. І ён мае рацыю, калі сцвярджае Любоў як аснову чалавечых адносін. Але чаму ў рэальным жыцці гэтая любоў вядзе да войнаў, сварак, гвалту? На гэтае пытанне Фейебах не адказвае, ды і не можа адказаць. Яго заслуга ў іншым. У антрапалагічным матэрыяліме Фейербаха класічная заходняя  філасофія завяршыла сваё развіццё. Пасля яго крытыкі ідэалізма і рэлігіі далейшае развіццё галоўных праблем традыцыйнай класічнай філасофіі магчыма было толькі на шляху разбурэння падмурку гэтай філасофіі, на прынцыпова новай метадалагічнай і светаўяўленчай аснове.

Якія ж галоўныя здабыткі нямецкай класічнай фіасофіі?

*1)Значным дасягненнем нямецкай класічнай філасофіі сталася перакананне ў тым, што асэнсаваць існасць чалавека ні з пазіцый яго эмпірычнага існавання, ні з пункту гледжання "чыстага розуму" немагчыма.* Свет чалавека – гэта не першапачатковая дадзенасць, ён культывуецца чалавекам і толькі ў гэтым працэсе набывае статус сферы спецыфічна чалавечай жыццядзейнасці. Гэта свет культуры, які гістарычна ствараецца чалавекам. Без яго і па-за ім існаванне чалавека немагчыма. *Спосабам жа  рэалізацы  культуры, асновай яе ўзнікнення і існавання з'яўляецца дзейнасць;*

*2)асновай гэтай дзейнасці, яе глыбіннай крыніцай ёсць дыялектыка як адзінства супрацьлеглых тэндэнцый і іх барацьба.* Гэта галоўнае дасягненне  нямецкай класічнай філасофіі. На ідэалістычнай аснове дыялектыка тут была распрацавана гэтак грунтоўна, што адкрыла перад чалавечым мысленнем дагэтуль невядомыя абшары. Яна ўкараняла прынцып гістарызма як аснову мыслення і вяла да вельмі радыкальных высноў. У межах гэтай інтэлектуальнай плыні была радыкальна пераасэнсавана трактоўка пазнавальнай дзейнасці. Калі ў папярэдняй філасофіі сузіральны суб'ект альбо паглынаецца быццём як яго элемент, альбо адмяжоўваецца ад быцця і супрацьпастаўляецца яму, то нямецкія філосафы XVIII – XIX стст. абгрунтавалі творчую актыўную прыроду пазнання, у якім суб'ект і аб'ект цесна ўзаемазвязаны і ўтвараюць цэласную сістэму пазнавальных адносін, функцыянаванне якой абумоўлена сацыякультурнымі фактарамі. *Так упершыню распрацоўваецца ідэя практычнай абумоўленасці пазнання;*

*3)сістэматычнасць, грунтоўнасць і завершанасць, ідэалізм, рацыяналізм і лагіцызм, перавага гнасеалагічнай тэматыкі – вось галоўныя рысы нямецкай класічнай філасофіі.*

## Марксізм і філасофская класіка

Марксізм – гэта сітэма ідэй, створаная Марксам і Энгельсам у другой палове XIX ст., складовымі часкамі якой былі філасофія, эканамічная і сацыяльна-палітычная тэорыі. Узнік марксізм у 40-я гады XIX ст. і быў своеасаблівым тэарэтычным адказам на тыя пытанні, якія паставілі перад людзьмі сацыяльна-эканамічныя і палітычныя працэсы навейшай еўрапейскай гісторыі. Магутны эканамічны ўздым, імклівае развіццё навукі, гістарычны аптыміз асветнікаў, пацверджаны грандыёзнай сістэмай Гегеля, з аднаго боку, і галеча ды бездапаможнасць працоўнай масы ў маладым буржуазным грамадстве – з другога, вось вытокі філасофіі Маркса. Яго вучэнне было народжана жахлівым відовішчам сацыяльнай рэчаіснасці на фоне навуковага прагрэса, які, здавалася, мог забяспечыць чалавеку годныя ўмовы жыцця. Маркса ўразіла гаротнае становішча людзей сярод магутных машын, якія былі прызначаныя, але чамусьці не здолелі зрабіць лепшай долю чалавека.

На фарміраванне светапогляду Маркса аказалі ўплыў і іншыя фактары. Так, напрыклад, Ф.Энгельс адзначаў, што перакананні Маркса фарміраваліся пад уплывам сучаснага яму прыродазнаўства і, у першую чаргу, трох вялікіх адкрыццяў: закона захавання і ператварэння энергіі, тэорыі клетачнай будовы жывога арганізма і эвалюцыйнай тэорыі Ч.Дарвіна. Гэтыя адкрыцці разбуралі рэлігійныя погляды на праблему паходжання жыцця, укаранялі ў навуку прынцып развіцця і спрыялі фарміраванню дыялектычных і матэрыялістычных поглядаў на свет.

Але найперш неабходна адзначыць тое ўражанне, якое на маладога Маркса аказала філасофія Гегеля з яе *ўніверсальнасцю, гістарычнасцю і дыялектычнасцю.* Нельга не адзначыць і ўплыў Фейербаха, барацьба якога з Богам успрымалася Марксам як “вялікая тэарэтычная рэвалюцыя”, што ліквідавала рэлігійнае адчужэнне чалавека ад жыцця і стварала неабходныя перадумовы для крытычнага мыслення. Паўстаўшы разам з Фейербахам супраць Бога, Маркс паўстае і супраць гегелеўскага “сусветнага духу”. Для яго сапраўднай рэальнасцю з’яўляецца не сусветны дух, як лічыў Гегель, і не чыстая прырода, як думаў Фейербах, а рэальнасць чалавека, абумоўленая матэрыяльнай, сацыяльна-эканамічнай рэчаіснасцю. Дух, свядомасць гэтага чалавека вызначаецца матэрыяльнымі ўмовамі яго існавання, а не наадварот. Таму каб паўплываць на людзей, на іх свядомасць і гісторыю, неабходна змяніць гэтыя матэрыяльныя ўмовы існавання, гэта значыць – матэрыяльную вытворчасць з уласцівымі для яе *вытворчымі адносінамі.* У грамадстве большая частка людзей пазбаўлена

сродкаў вытворчасці, якія толькі і могуць забяспечыць чалавеку неабходныя ўмовы існавання. Але ж чалавек, які не мае сродкаў забеспячэння сваёй жыццядзейнасці, не належыць самому сабе, ён *адчужаны* ад сябе і падпарадкаваны іншаму чалавеку, а дакладней – сістэме. Адчужэнне вядзе да падзелу грамадства на бедных і багатых*, на грамадскія класы,* формай узаемаадносін паміж якімі з'яўляецца *класавая барацьба. Яна – рухавік гісторыі.* У працэсе гэтай барацьбы адзін клас знікае, саступаючы месца другому класу, які, у сваю чаргу, становіцца аб'ектам нападак з боку новых сацыяльных нізоў. *Гісторыя чалавецтва – гэта гісторыя класавай барацьбы, якая ў рэшце рэшт вядзе да ліквідацыі эксплуатацыі чалавека чалавекам і пабудове камуністычнага грамадства як пачатку сапраўднай гісторыі чалавецтва.*

Такое разуменне сацыяльнай гісторыі вядзе да радыкальнага пераасэнсавання філасофіі., сутнасць якога адлюстравана ў знакамітых "Тэзісах пра Фейербаха". Уся папярэдняя філасофія, на думку Маркса, імкнулася *тлумачыць* свет, тады як куды больш важнай справай з'яўляецца *пераўтварэнне* яго. Філасофія – гэта тэорыя змагання і прапаганды. Яна павінна выявіць прычыны чалавечых бедаў, адкрыць і паказаць шляхі і сродкі сацыяльнай перабудовы, якія вядуць да свабоды і дабрабыту ў грамадстве роўнасці, справядлівасці і братэрства. *Філасофія – гэта тэорыя практычнай дзейнасці, разумовая аснова praxis (практыкі), якая папярэднічае свядомасці і культуры, ўключае ў сябе ўсе віды свядомай дзейнасці чалавека і паўстае як гістарычная татальнасць.* Ідэя адзінства тэорыі і практыкі з'яўлецца цэнтральнай у творчасці Маркса. Любая навуковая тэорыя, у тым ліку і філасофія, апраўданы толькі тады, калі яны заснаваны на практыцы і спрыяюць яе дасканаласці.

Кожная эканамічная сістэма, як *базіс* грамадства, знаходзіць сваё апраўданне ў сістэме ідэалагічных канцэпцый і сацыяльных інстытутаў, гэтай *палітычнай надбудовы,* якую яна спараджае і якая ёй служыць. Таму адной з адмысловых задач філасофіі з'яўляецца *ідэалагічная крытыка*. Яна павінна асэнсаваць існуючыя ўяўленні чалавека пра сябе, свет і свае стасункі з ім і паказаць, што ўсе ранейшыя ідэалогіі не толькі былі няздольныя растлумачыць быццё чалавека, але свядома скажалі гэтае быццё. Таму змена спосабу вытворчасці як матэрыяльнай асновы грамадства павінна дапаўняцца зменай усіх ілжывых ідэалогій.

Якія ж рысы ўласцівы філасофіі Маркса?

*1)матэрыялізм складае светаўяленчую аснову гэтай філасофіі, але не "стары" метафізічна-механістычны матэрыялізм, які ўсё зводзіць да прыроды, фізікі, дзе ўсё падпарадкавана ўніверсальнаму дэтэрмінізму і выключае магчымасць свабоды. Перадумовай існавання чалавека з'яўляецца не прырода, а скіраваная на пераўтварэнне гэтай прыроды практычная дзейнасць, асновай якой і галоўнай мэтай выступае*

*матэрыяльнае жыццё людзей. Гэта матэрыялізм дыялектычны і гістарычны;*
*2)дыялектыка як тэорыя развіцця і метадалагічны прынцып адрозніває марксісцкую філасофію ад усіх папярэдніх філасофскіх тэорый;*
*3)сацыяцэнтрызм, сутнасць якога заключаецца ў тым, што грамадства разглядаецца як асноўны і нават адзіны аб'ект філасофскага даследавання, перадумова існавання чалавека і сапраўдны суб'ект гісторыі;*
*4)сацыяльна-крытычная арыентацыя, якая робіць гэтую філасофію "тэорыяй рэвалюцыйнага пераўтварэння свету";*
*5)вырашальная роля практыкі як спецыфічна чалавечай актыўнай дзейнасці, скіраванай на пераўтварэнне прыроднага і сацыяльнага асяроддзя з мэтай больш поўнага і ўсебаковага задавальнення грамадскіх патрэб.*

Больш падрабязны аналіз марксісцкай філасофскай канцэпцыі дазволіў бы выявіць шматлікія супярэчнасці ў ёй, сфармуляваць пытанні, на якія марксізм не даў адказаў. Але на гэта няма ні часу, ні месца. Трэба толькі адзначыць тры акалічнасці: па-першае, марксізм пакліканы да жыцця той сукупнасцю сацыякультурных рэалій, якія былі характэрны для еўрапейскага грамадства сярэдзіны XIX ст., па-другое, гэта была рэакцыя на галечу, бяспра'е і невыноснае становішча працоўнай масы на этапе ранняга капіталізма, па-трэцяе, бясспрэчным з'яўляецца той факт, што марксізм аказаў велізарнае ўздзеянне на гістарычнае жыццё чалавецтва ў XX стагоддзі і прадэманстраваў унікальную здольнасць да самаабнаўлення. Можна не пагаджацца з марксізмам, але нельга не прызнаваць яго як элемент еўрапейскай духоўнай культуры.

## ТЭМА 3. ПОСТКЛАСІЧНАЯ ФІЛАСОФІЯ: ТЭМЫ І ПРАБЛЕМЫ

### Традыцыі філасофскага класіцызма і посткласічная філасофія

Посткласічнай філасофіяй называюць сукупнасць разнастайных школ, плыняў і канцэпцый, што ўзнікалі і развіваліся ў перыяд з сярэдзіны XIX ст. і да нашых дзён і адлюстравалі тыя радыкальныя перамены, якім падверглася заходняя культура ў гэты перыяд. Гэтая філасофія развіваецца пад знакам надзвычай інтэнсіўнай палемікі з класічнай філасофскай традыцыяй. І гэтая палеміка вядзецца ў самым шырокім дыяпазоне: ад поўнага адмаўлення класічных філасофскіх каштоўнасцей да спробы выкарыстання традыцый дзеля вырашэння ўласных задач. Але гэта не разбурэнне класічнай філасофіі, а толькі яе трансфармацыі, працяг яе ў сучаснасць і прыстасаванне да актуальных праблем новай культуры.

Пад філасофскай класікай разумеюць тыя вучэнні, якія ўзнікалі з часоў антычнасці і да сярэдзіны XIX ст. і прапанавалі еўрапейскай

культуры ўзор філасофскай тэорыі, парадыгму філасофствавання. Што азначае класічная філасофская традыцыя? Традыцыйная філасофія была заснавана на пастулатах, якія ў той альбо іншай форме прысутнічалі ва ўсіх філасофскіх тэорыях усіх часоў. *Рацыяналізм – найістотнейшая рыса гэтай філасофіі.* Прызнанне розуму, давер розуму, павага да яго з'яўляецца асновай гэтай традыцыі. Ідэя рацыянальнасці свету і чалавека дамінавала ў філасофіі з часоў Платона, а сваё завяршэнне знайшла ў нямецкай класічнай філасофіі. Класічная філасофія канстытуявала сябе ў якасці тэорыі, зарыентаванай на розум як вышэйшую каштоўнасць. Пры гэтым розум паўставаў не толькі як істотная характарыстыка чалавека, але і як субстанцыяльная аснова свету. Прынамсі, ад грэкаў пайшла ўпэўненасць у тым, што прынцыпы будовы свету супадаюць з прынцыпамі функцыянавання розуму, і гэтае супадзенне забяспечвае магчымасць рацыянальнага пазнання свету. Гэтая антычная ідэя дасягае свайго лагічнага завяршэння ў гегелеўскай ідэі тоеснасці быцця і мыслення.

Адсюль і другая рыса класічнай філасофіі – *рацыяналізацыя чалавека.* Адзінае, што адрознівае чалавека ад усяго жывога, гэта розум, здольнасць да лагічнага мыслення. Гэты розум не прызнае ніякага аўтарытэта, а яго мэта – спасціжэнне ісціны. У сувязі з гэтым класічная філасофія разглядала чалавека выключна як разумную істоту, прызваннем якой была пазнавальная дзейнасць. Чалавек нараджаецца і жыве дзеля пазнання ўнутранай будовы свету і гэтае пазнанне патрабуе ад яго свядомага развіцця сваіх пазнавальных здольнасцей: розуму, інтуіцыі, памяці, маралі. Пазнанне не толькі патрэбнасць розуму, але і душы, бо толькі пазнанне спрыяе і пашырэнню магчымасцей чалавека ў свеце, і *духоўнаму вызваленню.*

Такое разуменне чалавечай прыроды вяло да *гнасеалагізацыі адносінаў чалавека і свету.* Класічная філасофія гэтыя адносіны разглядала выключна як тэарэтычна-пазнавальныя, як адносіны суб'екта і аб'екта, дзе суб'ект паўставаў абсалютным пунктам адліку, а яго розум – як адзіна магчымы спосаб бачання свету. Вынікі пазнавальнай дзейнасці фіксуюцца з дапамогай дакладных, адназначных і ападыктычных лагічных паняццяў і выключаюць усялякія антрапаморфныя праекцыі. Адзначаная акалічнасць вызначала і мэты філасофіі: пошук субстанцыянальных асноў быцця, спасціжэнне сапраўднай існасці свету як адзінай устойлівай цэласнасці. Гэтая філасофія была арыентавана на выяўленне фундаментальных структур рэчаіснасці, адкрыццё і асэнсаванне ўніверсальных законаў свету. *Класічная філасофія, такім чынам, мела відавочна метафізічны характар і анталагічную арыентацыю, для яе характэрны аб'ектывізм, субстанцыялізм, прызнанне тоеснасці быцця і мыслення, думкі і слова.*

Як жа гэтая традыцыя асэнсоўваецца ў посткласічнай філасофіі? Першым крокам на шляху станаўлення посткласічнай філасофіі было

радыкальнае абмежаванне рацыяналізма. Лагіцыстскія анталагічныя канструкцыі класічнай філасофіі не маюць нічога агульнага з сапраўднай рэчаіснасцю з яе дыскрэтнасцю, неаднароднасцю, супярэчлівасцю. У свеце разумнага не болей, чым неразумнага, а прэтэнзіі класічнай філасофіі на сістэмна-рацыянальнае спасціжэнне прыроды і чалавека, сцвярджэнне тоеснасці быцця і мыслення – толькі міф. *Ірацыяналізм у посткласічнай філасофіі не толькі дапаўняе рацыяналізм, але набывае статус светаўяўленчай парадыгмы, якая неразумнасць абвяшчае галоўнай характарыстыкай свету і яго разумення.* Гэта было не адмаўленнем розуму ці яго пазнавальных здольнасцей, а толькі абмежаваннем разумнага і сцвярджэннем неразумнага ў якасці канстанты быцця і пазнання. Гэтая ірацыяналістычная традыцыя падмацоўвалася і зменамі ў грамадстве. Крызіс класічнай культуры і навукі, масавае грамадства з яго адмаўленнем традыцыйных каштоўнасцей, эканамічныя крызісы, рэвалюцыі і войны, ідэалагізацыя грамадскіх працэсаў нараджаюць "крызісную свядомасць", "разгублены розум", якія паўстаюць супраць навукі (гэтага ўвасаблення розуму) і ірацыянальнасць паводзін чалавека пераносяць на будову свету, надаючы ірацыяналізму не толькі гнасеалагічны, але і анталагічны статус. З гэтай пазіцыі навука і розум паўстаюць як сродкі занявольвання людзей і іх прыгнёту.

Пад уплывам гэтых фактараў адбываецца *дэрацыяналізацыя* чалавека. Посткласічная філасофія не адмаўляе разумнасці чалавека, але і не дапускае яе вяршэнства. Чалавек не таму чалавек, што разумны і пазнае, а таму, што жыве. Сутнасць і спосаб існавання чалавека ў свеце абумоўлены не розумам, а татальнай катэгорыяй жыцця як сукупнасці разнастайных і шматзначных форм яго бытавання. Свет можна зразумець і апраўдаць не з пункту гледжання розуму, а з пазіцый жыцця. Чалавек нараджаецца ў свет не дзеля таго, каб пазнаваць, а каб жыць. І розум – толькі адна, і не самая галоўная, з праяў гэтага жыцця. Так мяняецца панаваўшае раней уяўленне аб сутнасці і прызначэнні чалавека.

Разам з гэтым адбываецца своеасаблівая *дэгнасеалагізацыя* адносінаў чалавека і свету. Характэрнае для класічнай філасофіі разуменне свету і чалавека як адносінаў аб’екта і суб’екта, супрацьпастаўленых адзін аднаму і незалежных адзін ад аднаго, непрыймальнае для посткласічнай філасофіі. Гэтая філасофія зыходзіць з тэзы, паводле якой кожны раз, як чалавек усведамляе сябе, ён усведамляе сябе тут і зараз, у гэты час, у гэтым месцы, у гэтым асяроддзі. Гэта значыць, што быццё чалавека – гэта быццё-у-свеце і быццё-у-часе. Свет і чалавек адзіны, іх нельга раздзяліць, нельга супрацьпаставіць. Чалавек знаходзіцца не па-за светам, а ўнутры яго і толькі так гэты свет і можа мысліцца. Посткласічную філасофію можна характарызаваць як "безсуб’ектную філасофію", якая пераадольвае субе’кт-аб’ектную дыхатамію класічнай філасофскай традыцыі. Гэтае быццё-у-свеце-і-у-часе не абмяжоўваецца адным розумам, а мае на мэце

ўсю паўнату існавання. Таму для апісання гэтага быцця недастаткова адных рацыянальных паняццяў, гэта патрабуе самага шырокага спектра сродкаў выяўлення, у тым ліку і ірацыянальных. Але ў такім выпадку мяняецца і вобраз самой філасофіі: са сродка *мыслення* свету ў катэгорыях розуму яна ператварецца ў спосаб *разумення* рэчаіснасці, адэкватнае пазнанне якой сродкамі аднаго розуму немагчыма. І рэчаіснасць гэтая губляе статус аб'екта, бо яна – сфера нашага жыцця, дзе мы заўжды знаходзім сябе не толькі разумных і святых, але і неразумных і разбэшчаных. І мэта філасофіі – спасціжэнне сэнсу і значэння нашага бытавання ў свеце. А паколькі гэтае бытаванне шматграннае і шматзначнае, то і філасофія страчвае сваё адзінства і цэласнасць. Сучасная філасофія – гэта спалучэнне самых розных школ і плыняў, якія так адрозніваюцца адна ад аднае, што агульным паміж імі з'яўляюцца хіба што крытычныя адносіны да філасофскай класікі. *Плюралізм – істотная рыса сучаснай філасофіі.*

Разам з тым усю разнастайнасць школ сучаснай філасофіі можна раздзяліць на групы паводле той стратэгіі, якой яны прытрымліваюцца ў сваім разуменні прадмета філасофіі, яе мэтаў і задач, і ў якой адлюстраваны адносіны да філасофскай класікі: *сацыяльна-крытычнай, аналітычнай і экзістэнцыяльна-фенаменалагічнай.*. Так сацыяльна-крытычная стратэгія скіравана на пераадоленне анталагізма і сузіральнасці класічнай філасофіі, прыхільнікі экзістэнцыяльна-фенаменалагічнай стратэгіі адвяргаюць класічны аб'ектывізм і арыентуюць філасофію на асабовы дух індывіда, аналітычная стратэгія мае на мэце пераадоленне субстанцыялізма класічнай філасофіі і перасцерагае ад спекулятыўных разважанняў.

## Заходнееўрапейская філасофія другой паловы XIX ст.

Пераасэнсаванне класічнай філасофскай спадчыны ўвогуле і нямецкай класічнай філасофіі ў прыватнасці пачынаецца прыкладна з сярэдзіны XIX ст. і ажыццяўляецца ў двух напрамках – *матэрыялістычным і ірацыяналістычным.* Першы напрамак прадстаўлены творчасцю Фейербаха, Маркса і Энгельса, погляды якіх ужо разгледжаны вышэй. Дзейны чалавек і соцыум набываюць тут статус галоўнай праблемы філасофіі, а яе асноўнай функцыяй становіцца крытыка як перадумова здзяйснення сацыяльнага ідэала.

Асаблівасці асэнсавання класічнай філасофскай спадчыны з пазіцый ірацыяналізма найбольш выразна праявіліся ў творчасці *А.Шапенгаўэра, С.Кіркегора і Ф.Ніцшэ.* Шапенгаўэр быў першым філосафам, які выступіў супраць гегелеўскага рацыяналізма і панлагізма. Сістэмна яго погляды выкладзены ў творы "Свет як воля і ўяўленне". Крытыка рацыяналізма тут такая радыкальная, што яна ставіць пад сумненне само паняцце розуму як

асэнсаванай дзейнасці чалавечай свядомасці. Інтэлект, паводле Шапенгаўэра, функцыянуе не па сваім рацыянальным плане, а пад уплывам волі. Гэтая воля ёсць абсалютнай асновай быцця, якая стварае свет і чалавека і носіць ірацыянальны характар. Інтэлект – усяго толькі сродак волі да жыцця. Інтэлект стамляецца, воля ж нястомная. Таму яна, а не розум, сапраўдная аснова свету і перадумова асабістай волі чалавека. У свеце, як і ў чалавеку, няма нічога рацыянальнага, ім уласціва ненасытнае жаданне, цёмны глухі парыў. Свет недарэчны сам па сабе, а ўся гісторыя свету – гэта гісторыя валявых флуктуацый, якія не маюць ніякага сэнсу.

Не мае сэнсу і воля да жыцця, бо само жыццё безсэнсоўнае, асабліва жыццё чалавечае. Яно безсэнсоўнае таму, што кожнаму чалавеку наканаваны хваробы, пакуты, старасць і смерць. Менавіта воля закінула нас у гэты свет без нашага ведама і дазволу, спакушае нас падманлівымі прыманкамі, найгоршай з якіх ёсць аптымізм – самы бязлітасны і безсаромны здзек над чалавецтвам. Жыццё чалавека – гэта няспынныя пакуты, а тое, што называюць шчасцем, на самой справе з'яўляецца толькі спробай вызвалення ад пакут, за якой прыходзяць новыя пакуты і нязбыўны сум. Жыццё – гэта плата па вексселю, што падпісаны не намі. Так аптымізм і давер да розуму разбіваецца аб трагізм чалавечага існавання ў свеце.

Гэтая ірацыяналістычная крытыка гегельянства знайшла свой працяг у творчасці дацкага філосафа *Сёрэна Кіркегора.* Для яго непрыймальны аб'ектывізм і рацыяналізм Гегеля. Ён абвяргае ўсялякі адзіны ідэальны пачатак свету, бо розум, воля, пачуцці – гэта ўсё толькі абсалютызаваныя элементы свядомасці. Пошук адзінай духоўнай субстанцыі, тварэнне ўсеабдымнай універсальнай сістэмы містыфіцыруе прыроду і гісторыю, дзе пануе адзінкавае, а не ўніверсальнае. Мэта філасофіі – не ўніверсальныя законы Сусвету, а *асобны чалавек у яго адметнасці і ўнікальнасці.* Насуперак Гегелю з яго ідэяй адзінства і неабходнасці гістарычнага працэса, Кіркегор абвяшчае абсалютнасць кожнага чалавека і самакаштоўнасць кожнага імгнення, пražытага чалавекам, самакаштоўнасць яго *існавання (existenz)* . Экзістэнцыя азначае, што чалавек ёсць не наступства дзеяння нейкіх знешніх прычын, а вынік працэса самаздзяйснення, распачаты ў яго суб'ектыўнасці. Чалавек – не наступства чагосьці знешняга. Ён творыць сябе сам і ў гэтым сэнсе ёсць абсалютным пачаткам.

Кіркегор выдзяляе тры стадыі экзістэнцыі: *эстэтычную, этычную і рэлігійную.* На эстэтычнай стадыі найбольш выразна праяўляецца індывідуальнасць чалавека, яго жыццё паўстае як мноства не звязаных паміж сабой дыскрэтных падзей. Гэтую стадыю экзістэнцыі характарызуе не пастаянства, а прыступы зменлівасці, навізны – параксізм. На гэтай стадыі няма ніякіх абавязкаў, свабода нічым не абмежавана і праяўляецца без перашкод. Але менавіта праз гэта недасягальнай аказваецца "ісціна"

існавання, што нараджае незадаволенасць і адчай, гэтую смяротную хваробу душы. Ад адчаю душа гіне, але яна гіне і без адчаю.

На этычнай стадыі пераважае дабрачыннасць і абавязак. Сумненне ў правільнасці жыцця толькі дзеля сябе нараджае імкненне рабіць дабро для іншых, выконваць свой абавязак у адносінах да чалавека. Але ж жыццё паводле абавязка – гэта жыццё дзеля ўсеагульнага, якое разбурае індывідуальнасць. Калі я жыву дзеля іншых, то ці не парушаю я сваё прызначэнне, ці не адмаўляю гэтым сваю чалавечую існасць? Сумненне, няўпэўненасць, разгубленасць і адчай не толькі не пераадольваюцца на этычнай стадыі, яны становяцца невыноснымі. І тады ў чалавека застаецца толькі адно – вера як увасабленне трэцяй стадыі экзістэнцыі.

На рэлігійнай стадыі чалавек усведамляе той факт, што ні эстэтычная разнастайнасць асалоды, ні этычны абавязак не апраўдваюць прысутнасць чалавека ў свеце, не прыносяць яму задавальнення і не здымаюць адчаю. Жыццё – гэта пакуты, разгубленасць і адчай. Іншага не дадзена, бо іншага няма. Таму трэба выбіраць: альбо асалода індывідуальнай распушчанасці, альбо дабрачыннасць паводле абавязку. І трэба верыць, што дабрачыннасць пажаданая Богам. Гэта не вызваляе нас ад пакутаў, але надзяляе свабодай: выбіраць і пакутаваць. Жыць без веры немагчыма. Але ніхто не можа верыць у бога ў хрысціянскім разуменні гэтага слова. Як жа тады жыць? Верыць, што твой выбар – гэта твая свабода, а звязаныя з ёю пакуты і адчай – патаемнае боскае ўказанне на магчымасць выратавання.

Рацыяналізм і сістэмнасць філасофскай класікі, яе гіпертрафіраваная разважлівасць падвяргаюцца радыкальнай крытыцы ў *“філасофіі жыцця”.* Яе праграмныя ўстаноўкі даюць нам падставу для высновы, што “філасофія жыцця” была своеасаблівай рэакцыяй на рацыяналістычны аптыміз асветнікаў, але найперш – на панлагізм і абстрактны рацыяналізм Гегеля. Асновы гэтай філасофіі былі закладзены *Фрыдрыхам Ніцшэ,* удакладняліся і развіваліся ў творах *Дыльтэя, Зіммеля, Бергсона* і іх паслядоўнікаў.

Галоўным аб’ектам філасофіі Ніцшэ з’яўляецца чалавек, але не як носьбіт сістэмы ўніверсальных аб’ектыўных ведаў, а як істота, напоўненая суб’ектыўнымі перажываннямі. Рацыянальнымі сродкамі нельга спасцігнуць аб’ектыўную ісціну, не таму, што такіх сродкаў няма, а таму, што адсутнічае такая ісціна. Прырода свету і чалавека шматзначная і разнастайная і існуе шмат розных пунктаў гледжання дзеля тлумачэння свету, але ніводны з іх не мае большай каштоўнасці, чым усе іншыя. Свет у аснове сваёй нявызначаны і неакрэслены і толькі фактам волі яму можна надаць пэўную форму. Вышэйшая ісціна нараджаецца ўнутры чалавека дзякуючы самастваральнай волі. Чалавек не нараджаецца чалавекам, а становіцца ім. І гэтае станаўленне чалавека як жывой рэчаіснасці ёсць актам тварэння тут і зараз самавызначальнай асобы. Такая асоба самое

сваё жыццё ператварае ў мастацкі працэс, у якім яна зноўку вынаходзіць сябе, ужыўляе сябе ў быццё і гэтым актам тварэння надае парадак і гармонію безсэнсоўнаму хаосу Сусвету. І тады Бог, што панаваў над чалавекам, нараджаецца ў яго душы і звонка гучаць пад сонцам яго словы: “Свет, ты чуеш голас свайго творцы?” Бо ісціна – гэта не тое, што небабходна даказаць ці абвергнуць, а тое, што трэба стварыць.

Чалавек ніколі не задаволены дадзеным, бо ў ім няма свабоды. Гэта адносіцца не толькі да рэчаў, але і самога чалавека. *Воля да жыцця і ўлады* не дае чалавеку супакоіцца, дасягнуць задавальнення. Чалавек толькі тады крочыць дарогай да чалавечнасці, калі імкнецца пераўзыйсці сябе, узвысіцца над сабой цяперашнім, стаць *звышчалавекам – валадаром свабоды.* Рухацца наперад, пераўзыходзіць самога сябе, імкнуцца да вышэйшага, расці і ўдасканальвацца – гэта ўсё і ёсць воляй да жыцця і ўлады. Звышчалавек – не бялявая шэльма, для якой не існуе ні маралі, ні сумлення, гэта звычайны чалавек, якім ён хоча, але не можа стаць.Гэта ідэал чалавека будучага. Паняцце звышчалавека азначае, што чалавек не задаволены тым, чым ён ёсць, і гэтая незадаволенасць з’яўляецца падставай для тварэння ўласнай гісторыі. І ў гэтым тварэнні толькі і адбываецца чалавек.

Галоўнай перашкодай на шляху да звышчалавека з’яўляецца традыцыйная мараль, Ёю прасякнута не толькі рэлігія, але і філасофія. Гэтая мараль пазбаўляе чалавека волі, адрывае ад жыцця, робіць яго недзеяздольным. Хрысціянства з яго аскетычнай мараллю непазбежна вядзе да распаду духоўнасці, “паўстання мас” і ўзыходжання на трон “будучага хама”, які нівелюе чалавека пад знакам усеагульнай роўнасці. Вось чаму настае час “пераацэнкі ўсіх каштоўнасцей”, пераадолення “чалавечага, занадта чалавечага” і тварэння “новай дабрачыннасці” – гэтай дарогі, што вядзе “па той бок дабра і зла”, у вясёлы свет звышчалавека, дзе няма абражальных правіл і метафізічных межаў, а сухі апалонаўскі розум падпарадкаваны дыянісійскаму буянству пачуццяў, якое і ёсць сапраўднае жыццё. У гэтым свеце няма нічога дадзенага, а толькі – станаўленне, буйны танец вечнага вяртання, у якім чалавек пераўзыходзіць самога сябе, узвышаецца над сабой, дасягае свабоды ў трагічнай містэрыі жыцця.

На жаль, побач з Ніцшэ-паэтам, Ніцшэ-рамантыкам, які праслаўляў вольнага чалавека, здольнага да самаўдасканалення, існуе і іншы Ніцшэ – амаральны чалавеканенавіснік, забойца бога. Гэты вобраз стварылі людзі, якія ніколі не чыталі Ніцшэ, а толькі “крытыку” яго. Іх погляды не маюць нічога агульнага з думкамі і словамі сапраўднага Ніцшэ. Мы не можам, і не павінны, успрымаць яго як узор для пераймання, але і ігнараваць не маем права, бо еўрапейскую філасофію без Ніцшэ ўжо нельга нават уявіць.

*Пасля Кіркегора і Ніцшэ Еўропа не магла больш верыць у традыцыйнага бога і традыцыйныя маральныя каштоўнасці, хоць як ніколі раней мела патрэбу верыць.*

## Асноўныя праграмы сучаснай постКласічнай філасофіі

Развіццё філасофіі ў другой палове XIX ст. прывяло да падрыву асноў метафізікі з яе аптымізмам, падсекла яе ўласныя традыцыйныя асновы. Прэтэнзіі гэтай метафізікі на змястоўнае пазнанне свету падвергліся сумненню. Аказалася, што чалавечае мысленне абумоўліваецца, структурыруецца і нават скажаецца шэрагам фактараў – прыроджанымі катэгорыямі, гісторыяй, культурай, класавай прыналежнасцю, мовай, эмоцыямі і г.д. Вера класікаў філасофіі ў тое, што чалавечы розум здольны праз пазнанне дасягнуць першых прынцыпаў усякага быцця, была канчаткова падарваная. У гэтых умовах далейшае развіццё філасофіі магло пайсці (і пайшло) ў трох напрамках: адмаўлення філасофіі і сцвярджэння навукі як светаўяўленчай асновы і крыніцы “пазітыўных” ведаў, адмаўлення навукі як прычыны людскіх няшчасцяў і сцвярджэнне суб’ектыўнасці, індывідуальнасці і інтымнасці чалавечага вопыта, арыентацыі на рэлігійныя каштоўнасці.

### *Аналітычная праграма сучаснай філасофіі*

Прагрэс навукі, яе відавочная сацыяльна-практычная каштоўнасць, дакладнасць яе фактаў, яснасць гіпотэз і іх практычнае пацвярджэнне, бясспрэчнасць вынікаў навуковага пазнання фармавалі перакананне, што навука неабмежаваная ў сваіх магчымасцях і здольная вырашыць усе сацыяльныя праблемы, якія паўстаюць перад чалавекам. Толькі навука дае нам дакладныя і аб’ектыўна-змястоўныя веды пра свет і чалавека і толькі ў навуцы мы адкрываем сапраўдныя іх вобразы. Навука, такім чынам, становіцца не толькі сродкам пазнання, але і светапоглядам. Гэтыя тэндэнцыі і былі заўважаны заснавальнікамі *пазітывізма Агюстам Контам і Гербертам Спенсерам.* Найбольш сістэмна новыя ідэі былі выкладзены ў вядомым творы Конта “*Курс пазітыўнай філасофіі”.* Тэрмін “пазітыўны” тут ужываецца ў сэнсе, процілеглым паняццю “спекулятыўны”. Пазітыўныя веды – гэта веды, якія абапіраюцца на факты, а не на выдуманыя розумам і змястоўна пустыя метафізічныя паняцці. Навука тым больш навука, чым менш у ёй метафізікі. Таму і філасофія, калі яна хоча апраўдаць сваё існаванне, павінна адмовіцца ад спекуляцый і стаць сродкам *класіфікацыі фактаў і законаў.* Яна павінна палягаць на фактах і законах навукі і не прэтэндаваць на пазнанне таго, што ляжыць па-за імі.

У сваім гістарычным развіцці пазнанне праходзіць тры стадыі: *тэалагічную, метафізічную* і *пазітыўную.* На тэалагічнай стадыі ўсе рэчы і падзеі разглядаюцца і знаходзяць сваё тлумачэнне з пункту гледжання звышпрыроднай волі, якая праяўляецца ў *фетышызме, політэізме і*

*монатэізме.* На метафізічнай стадыі, што працягвалася да канца сярэдневякоўя, знешняя воля як прынцып тлумачэння прадметаў саступае месца абстракцыям розуму, якім надаецца аб'ектыўная рэальнасць. На пазітыўнай стадыі адвяргаецца як воля аб'екта, гэтак і аўтарытэт суб'екта, а навука скіравана на назіранне за пастаяннымі і паслядоўнымі зменамі пэўных з'яў і адкрыццё на гэтай аснове непарушных законаў іх станаўлення. Усё сказанае адносіцца не толькі да навук прыродазнаўчых, а і да грамадскіх, і да іх – у першую чаргу, бо, на думку Конта, пазнанне грамадства – найважнейшая задача пазітыўнай філасофіі, якая павінна стаць *сінтэзам усіх чалавечых ведаў.*

Гэты сінтэз можна назваць філасофіяй, але пры адной умове: яна не павінна мець нічога агульнага з традыцыйнай філасофіяй. Пазітыўная філасофія павінна быць ачышчана ад метафізічнай праблематыкі і скіравана на абагульненне і сістэматызацыю канкрэтнанавуковых ведаў. Згаданая тэндэнцыя да "ачышчэння" навукі ад метафізічных праблем узмацняецца ў другой палове XIX ст. Складанасць аб'ектаў навуковага даследавання і пазнавальных сродкаў і працэдур інспіруюць павышаны інтарэс да гнасеалагічнай тэматыкі. На гэтай аснове і фарміруецца другое пакаленне пазітывізма – *эмпірыякрытыцызм* (крытыка вопыта), які імкнецца звесці філасофію да тэорыі пазнання з мэтай стварыць тэарэтычную мадэль самога працэса пазнання. Гэтая мэта дасягаецца на шляху ачышчэння вопыта ад усіх тых палажэнняў, якія маюць відавочную метафізічную прыроду, і арыентацыі пазнання на апісанне эмпірычна назіраемых з'яў, якія толькі і з'яўляюцца навуковымі.

Па сутнасці, пазітывісцкая праграма ў філасофіі была, з аднаго боку, інспіравана патрэбамі ўнутрынавуковага развіцця і пошукамі адэкватных метадаў пазнання, а з другога – тэарэтычным прадчуваннем новай навуковай рэвалюцыі. На пры канцы XIX – пачатку XX стст. навука перажывае свой залаты век. Яе адкрыцці ашаламлялі, яе арганізаванасць здзіўляла, яе практычная эфектыўнасць нараджала аптымізм, які палягаў на веры ў здольнасць навукі вырашыць любую праблему, адказаць на ўсе пытанні чалавечага розуму, забяспечыць умовы для здароўя і дабрабыту людзей. Але даследаванні Максвела, эксперымент Майкельсана-Марлі, адкрыццё радыёактыўнасці і крышачку пазней, на пачатку XX ст., спецыяльная і агульная тэорыя адноснасці, а затым фармулёўка асноўных палажэнняў квантавай механікі Борам і Гейзенбергам падарвалі класічную навуку, абверглі яе галоўныя пастулаты, паставілі пад сумненне самую яе пазнавальную каштоўнасць. Абвергнуты аказаўся ньютанаўскі недзялімы атам, цвёрдае рэчыва як прыродная субстанцыя губляе сваю відавочнасць, бо адкрыты такія аб'екты, адносна якіх нельга сцвярджаць, што яны маюць дыскрэтна-рэчавую прыроду. Абсалютныя прастора і час класічнай механікі рашуча замяняюцца чатырохмерным прастора-часавым кантынуумам. Еўклідава геаметрыя аказалася зусім не абавязковым

прынцыпам будовы Сусвету. На субатамным узроўні адносіны паміж аб’ектамі супярэчылі класічнаму прынцыпу дэтэрмінізма. Губляла сваё значэнне паняцце субстанцыі. Навуковыя веды, якія ў ньютанаўскім разуменні былі ўніверсальнымі і абсалютнымі, цяпер выяўляюць сваю абмежаванасць і адноснасць. Гэта не нейкія гнасеалагічныя абсалюты, а толькі нашыя тлумачэнні, у якіх неабавязкова адлюстраваны пэўныя прыродныя працэсы. Прырода, якую апісвае новая фізіка, гэта не “прырода-сама-па-сабе”, а толькі нашыя аносіны да яе, і навуковыя веды не маюць ні абсалютнага, ні адназначна аб’ектыўнага характару.

У гэтых умовах і на гэтай падставе і ўзнікае трэцяе пакаленне пазітывізма – *неапазітывізм.* Неапазітывізм фарміруецца і як філасофская плынь, і як спосаб філасофствавання, які патрабуе строгасці і дакладнасці прынятай тэрміналогіі і асцярожных, недаверлівых адносін да спекулятыўных разважанняў. У сваім развіцці неапазітывізм адлюстраваў як крызіс традыцыйнага прыродазнаўства, так і працэс станаўлення рэлятывісцкай навукі. Неапазітывізм, з аднаго боку, абапіраецца на ідэалогію тэхнакратызма, а з другога – паўстае сродкам навуковага абгрунтавання гэтай ідэалогіі. Сутнасць гэтай ідэалогіі заключаецца ў тым, што толькі навука і тэхніка прызнаюцца надзейным і ўніверсальным сродкам рашэння ўсіх сацыяльных праблем, а найбольш эфектыўнае кіраўніцтва сацыяльнымі працэсамі здольныя забяспечыць толькі тэхнічныя спецыялісты. Менавіта таму навука выступае для неапазітывізма галоўным і адзіным аб’ектам філасофіі.

Філасофія, калі яна хоча захаваць статус змястоўнай тэорыі, павінна адмовіцца ад спекулятыўных светаўяўленчых праблем і засяродзіцца на аналізе мовы навукі *(Рассэл, Вітгенштэйн)*. Неапазітывісты лічаць, што ўсе змястоўныя выказванні можна звесці да трох тыпаў: навукова-асэнсаваных, навукова-неасэнсаваных і безсэнсоўных *(Карнап).* Навукова-асэнсаванымі могуць быць толькі такія выказванні, якія адэкватна адлюстроўваюць пачуццёвыя перажыванні суб’екта і паддаюцца рацыянальнаму азначэнню ў тэрмінах мовы навуковай тэорыі. Такім статусам валодаюць толькі некаторыя, абсалютна верагодныя, выказванні прыродазнаўства, якія, дзякуючы сваёй прастаце і відавочнасці, называюцца пратакольнымі сказамі. Усе астатнія выказванні навукі такой верагоднасцю не валодаюць і таму павінны быць падвергнуты *верыфікацыі (Шлік).* Гэтая працэдура мае на мэце разлажэнне складаных выказванняў на простыя пратакольныя сказы, змест якіх супадае з тымі альбо іншымі фактамі. Выказванне, якое падвяргаецца верыфікацыі, з’яўляецца ісцінным толькі тады, калі выведзены з яго пратакольны сказ уяўляе сабой суджэнне “...у такім месцы, у такі час пры такіх акалічнасцях назіраецца тое і тое”. Зразумела, што ў такім выпадку аналіз мовы навукі набывае прыярытэтны характар, а сама філасофія ператвараецца ў лінгвістычны аналіз. Яго асноўныя рысы: *адмаўленне ад класічных*

*гнасеалагічных праблем, крытыка паняцця суб’екта, зварот да выяўлення сэнсу і значэння навуковых выказванняў, замена паняцця ісціны паняццем асэнсаванасці.*

Праблемы, якія не ўдалося вырашыць неапазітывізму, і, найперш, негрунтоўнасць прынцыпа верыфікацыі, нараджаюць *постпазітывізм,* які адмаўляецца ад аналітычных намаганняў неапазітывізма і абвяшчае аб’ектам філасофіі дынаміку навукі, спосабы будовы і прынцыпы функцыянавання навуковых тэорый. Навука няздольная даць веды верагодныя, ці хаця б імаверныя. Нашае пазнанне грунтуецца не толькі на верагодных паняццях, але і на шматлікіх здагадках і разнастайных тлумачэннях, якія павінны падвяргацца пастаянным праверкам *(Поппер).* Але ніводная праверка не дасягае канчатковай мэты і кожную тэорыю неабходна разглядаць як здагадку, што атрымала нейкае пацвярджэнне. Любая навуковая ісціна пад час чарговай праверкі можа выявіць сваю ілжывасць у новым кантэксце і прынцып верыфікацыі тут не дапаможа. Па сутнасці, працэдура верыфікацыі як лагічнага абгрунтавання адных выказванняў з дапамогай другіх вядзе да неабмежаванага рэгрэса, бо гэтая працэдура здольная толькі павялічыць ступень імавернасці нашых суб’ектыўных перакананняў ва ўласнай праваце. Таму неабходна звярнуцца да больш адназначнай працэдуры *фальсіфікацыі.* Калі паміж тэорыяй і вопытам выяўляецца разыходжанне, то гэта сведчыць аб ілжывасці яе высноў, якія павінны быць элімінаванымі са сферы тэорыі. Прынцып фальсіфікацыі паўстае як аснова самакрыткі навукі, сродак мінімізацыі памылак і дасягнення ісціны.

Але гісторыя навукі пераканаўча паказвае, што прынятыя ў ёй метады і працэдуры вельмі рэдка адпавядалі ідэалу самакрытыкі, аб якім вядзе гаворку Поппер *(Томас Кун).* Навука ў сваім гістарычным развіцці праходзіць тры стадыі: дапарадыгмальную, парадыгмальную (нармальную) і экстраардынарную (па-запарадыгмальную навуку стадыі навуковай рэвалюцыі). На першай стадыі навука ўяўляе сабой эклектычнае спалучэнне разнастайных узаемнасупярэчлівых гіпотэз і навуковых груповак. Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі ствараюцца шматлікія мадэлі рэальнасці, з ліку якіх на пэўным этапе развіцця выдзяляецца адна тэорыя як узор навуковага рашэння тэарэтычных задач, а яе фундаментальныя прынцыпы, метады і каштоўнасці, што безумоўна раздзяляюцца навуковай супольнасцю, утвараюць парадыгму. Яна задае тып аб’ектаў і спосабы іх пазнання і адначасова адвяргае ўсе факты і тэорыі, якія ёй супярэчаць. На гэтай стадыі нармальнай навукі адбываецца збор фактаў, правядзенне эксперыментаў на падставе і ў адпаведнасці з пануючай парадыгмай, пашырэнне межаў яе прымянення, спробы рашэння невырашаных праблем. Гэта перыяд нармальнага развіцця навукі, калі асноўныя заканамернасці аб’екта адкрыты і асэнсаваны і ажыццяўляецца накапленне ведаў і пошук межаў, у якіх гэтыя заканамернасці дзейнічаюць. Тут і

адкрываюцца “анамальныя” з’явы, якія не ўпісваюцца ў прынятую парадыгму. Гэта нараджае крызіс навуковай тэорыі, выклікае навуковую рэвалюцыю, у працэсе якой навука прыходзіць да новага творчага сінтэза і фармулёўкі новай парадыгмы.

Такім чынам:

*1)пазітывізм заснаваны на ідэалогіі тэхнакратызма і з’яўляецца адлюстраваннем і асэнсаваннем той ролі, якую навука пачала выконваць у грамадстве ўжо ў XIX стагоддзі;*

*2)пазітывісцкая праграма мадэрнізацыі філасофіі была скіравана на ачышчэнне філасофіі ад традыцыйнай светаўяўленчай праблематыкі і абмежаванне яе сферай аналіза навуковых выказванняў;*

*3)здзейснены неапазітывізмам і постпазітывізмам аналіз навуковай тэорыі і яе дынамікі паказаў, што гісторыя навукі – гэта не гісторыя лінейнага прагрэса, скіраванага ў бок усё болей дакладных і поўных ведаў аб’ектыўнай ісціны, а гісторыя рэваюцыйных пераўтварэнняў тэарэтычнага бачання свету, у якіх вызначальная роля належыць мноству нерацыянальных і неэмпірычных фактараў;*

*4)аналітычная праграма ў посткласічнай філасофіі выявіла адносны характар навуковых ведаў, паколькі яны залежаць ад назіральніка, матэрыяльнага асяроддзя, навуковай парадыгмы, ад пануючых у той альбо іншай культуры вераванняў, ад сацыяльнага акружэння і псіхалагічных пераваг і г.д., што спрыяла большай абачлівасці ў адносінах да навукі і яе ролі.*

### *Экзістэнцыяльна-фенаменалагічная праграма філасофствавання*

Чым большых поспехаў дасягала навука, чым больш маштабныя былі яе адкрыцці, тым больш відавочным рабіўся той факт, што тэхнічныя дасягненні зусім неабавязкова нясуць чалавеку толькі карысць. Першыя трывожныя папярэджанні з’яўляюцца ўжо ў XIX ст. Іх можна знайсці ў Кіркегора і Ніцшэ, але яны з’яўляюцца і ў асяроддзі прыродазнаўцаў. Эмерсан, напрыклад, сцвярджаў, што “рэчы асядлалі чалавецтва і гоняць яго наперад”. А к сярэдзіне XX ст.  “дзівосны новы свет” сучаснай навукі ўжо выступае аб’ектам радыкальнай крытыкі з самых розных бакоў. Тэхніка, якая павінна была вызваліць чалавека ад непасільнай фізічнай працы, дэгуманізуе і прыніжае яго. Навука дала чалавеку мноства штучных прыстасаванняў і прадметаў і адначасова адгарадзіла яго ад прыроды. Няспынны тэхнічны прагрэс вёў да ўніфікацыі жыццёвай прасторы, ператвараў чалавека ў прыдатак машыны. Разбуралася індывідуальнасць чалавека, нарастала яго залежнасць ад ананімных знешніх структур накшталт масавай вытворчасці, сродкаў масавай інфармацыі, палітычных і грамадскіх інстытутаў. Небяспечнае забруджванне вады, паветра і глебы, імклівая урбанізацыя і некантралюемая хімізацыя прыводзілі да вынікаў,

якія ставілі пад сумненне самую магчымасць выжывання чалавецтва. Тое, што раней успрымалася як сведчанне неабмежаваных перспектыў развіцця, ператвараецца ў сродак самазнішчэння. Хірасіма і Нагасакі разбурылі міф аб маральнай непрадузятасці навукі і яе здольнасці да дабрачыннага прагрэса. Аптымістычная вера ў тое, што ўсе сусветныя праблемы будуць вырашаны навуковым прагрэсам і заснаванымі на ім сацыяльнымі маніпуляцыямі, развеялася дымам. Еўропа зноў губляла веру – на гэты раз у навуку і свабодны чалавечы розум. Яшчэ робяцца спробы выратаваць навуку, знайсці ёй апраўданне, але ўсе яны непазбежна вядуць да пашырэння скептыцызма і нават нігілізма адносна магчымасцей розуму і навуковага пазнання.

*Фенаменалізм* быў першым крокам на гэтым шляху. Яго пачынальнікам стаўся *Эдмунд Гусерль,* які шмат у чым прадвызначыў шляхі развіцця сучаснай філасофіі. Гусерль шукае пэўнасці (определенности) навукі і філасофіі. Што ёсць асновай пэўнасці навуковых ведаў? Наша свядомасць, бо толькі ў ёй мы знаходзім як свет, так і сябе ў гэтым свеце. Але пэўнасць нашых ведаў – не вынік унутраных станаў нашай псіхікі. Псіхалагізацыя працэса пазнання недапушчальная, бо яна вядзе да ідэалізма, як гэта здарылася з Берклі і Юмам. Гэтая пэўнасць не дасягаецца і дэкартавым cogito, бо яно ізалявана ад рэчаіснасці. Вось чаму Дэкарту неабходны Бог як пасярэднік паміж мысленнем і аб'ектыўнай рэальнасцю. Але мысленне заўсёды – гэта мысленне чагосьці: аб'екта, рэчы, з'явы, і адбываецца яно непасрэдна. Задача заключаецца ў тым, каб апісаць змест гэтага мыслення, які толькі і дадзены ў свядомасці і можа быць спасцігнуты толькі праз свядомасць. Задача філасофіі – даследаванне свядомасці. Не аб'ектаў, дадзеных свядомасці, а самога зместу свядомасці. Філасофію павінны цікавіць не аб'екты, *а тое, як яны пазнаюцца суб'ектам., як яны дадзены суб'екту, г.зн.феномены.* З дапамогай "фенаменалагічнай рэдукцыі" свядомасць ачышчаецца ад суджэнняў аб прадметах знашняга свету, а затым і ад псіхалагічных актаў, пасля чаго застаецца толькі свядомасць як інтэнцыя, якая надае аб'ектам сэнс і робіць іх такімі, якімі яны ёсць. Інтэнцыйнасць свядомасці – гэта яе скіраванасць у знешні свет, на аб'ект. Свядомасць існуе толькі як свядомасць іншага, а не ўсведамленне ўласных актаў. У рэальным свеце няма ніякай логікі, ён пазбаўлены сэнсу. Сэнсам валодаюць толькі феномены, але гэта – не іх уласнасць, бо ён прыўносіцца ў феномены інтэнцыйнай свядомасцю. Сутнасць феномена не ў яго існаванні, а ў тым, што́ з яго дапамогай выяўляе чалавек. Верыць у тое, што па-за феноменам існуе штосьці аб'ектыўна-рэальнае абсурдна, бо яно нідзе, ніколі і ніяк нам не дадзена. Ёсць толькі свядомасць і тыя арыентацыі і схемы паводзінаў, якія яна прапануе. Яны і ўтвараюць "жыццёвы свет" – дафіласофскую і данавуковую свядомасць, сферу "вядомага ўсім, непасрэдна відавочнага". Гэты свет заўжды суб'ектыўны, адносны, абумоўлены культурна-

гістарычнай сітуацыяй і можа быць тэматызаваны ў якасці аб'екта пазнання толькі "навукай аб духу" як анталогіяй "жыццёвага свету".

*Так крытыка аб'ектывізма навукі і філасофіі адкрывае ўнутраны свет дзейнасці свядомасці, прафесійнага мыслення, робіць даступнымі для разумення такія сферы жыццядзейнасці чалавека, якія раней альбо выносіліся за сферу навуковага аналіза, альбо выступалі аб'ектам спекуляцыі (кіраванне, інфармацыя, грамадскія сувязі, сацыяльныя адносіны, рэфлексіўныя гульні ды інш.).*

*Аб'ект філасофіі – чалавек-у- свеце, задача яе – дапамагаць чалавеку ў яго імкненні да аўтэнтычнага асабовага быцця праз даследаванне свядомасці як інтэнцыі.*

Фенаменалагічны пратэст супраць аб'ектывізма нарастае ў экзістэнцыялізме. *Экзістэнцыялізм* – гэта адна з самых буйных і папулярных плыняў філасофіі XX ст. Ён узнікае перад першай сусветнай вайной у Расіі (*Л.Шэстаў, М.Бярдзяеў)*, развіваецца (ужо пасля вайны) ў Германіі *(М.Хайдэгер, К.Ясперс)* і сваёй найвышэйшай папулярнасці дасягае ў сярэдзіне XX ст. ў Францыі *(Ж-П.Сартр, А.Камю. М.Мерло-Панці).* Менавіта ў гэты час экзістэнцыялізм стаў найбольш уплывовым культурным фактарам эпохі, і ўплыў яго найперш распаўсюджваецца на творчую інтэлігенцыю. Многія з прадстаўнікоў экзістэнцыялізма былі таленавітымі пісьменнікамі, што таксама спрыяла папулярнасці экзістэнцыялістскіх ідэй. Традыцыйна выдзяляюць экзістэнцыялізм рэлігійны (Ясперс, Марсель, Бярдзяеў) і атэістычны (Сартр, Камю, Мерло-Панці, Хайдэгер), хоць такое дзяленне носіць умоўны характар.

Самі экзістэнцыялісты сваімі папярэднікамі лічылі Паскаля, Кіркегора, Ніцшэ, Дастаеўскага. Значны ўплыў на экзістэнцыялізм аказала філасофія жыцця і фенаменалогія. І калі ў фенаменалогіі яшчэ робіцца спроба апраўдання навукі шляхам яе пераарыентацыі на даследаванне ўнутранага жыцця свядомасці, то экзістэнцыялізм рашуча паўстае супраць навукі як сродка вырашэння чалавечых праблем. Экзістэнцыялізм выступае супраць рацыяналістычнай традыцыі рэфлексіўнай філасофіі, адвяргае ідэалогію тэхнакратызма як неадпавядаючую прыродзе чалавека. Для экзістэнцыялізма непрыймальная гнасеалагізацыя чалавека, звядзенне яго існасці да розуму, адносіны да чалавека як да органа аб'ектыўнага пазнання. Чалавек нараджаецца для жыцця, а не для пазнання. Яго адметнасць вызначае не розум, а *экзістэнцыя.* Паняцце экзістэнцыі з'яўляецца цэнтральным для гэтай філасофіі і азначае спецыфічна чалавечы спосаб існавання ў свеце. У адрозненне ад рэчы, якая проста існуе, чалавек ніколі не бывае роўным самому сабе, а толькі імкнецца быць самім сабой. Яго існаванне – гэта "няспынная няўстойлівасць", "вечнае пытанне", праблема ў стане незавершанага рашэння. Чалавек не проста ёсць, ён няспынна робіць сябе чалавекам.

У гэтай сувязі экзістэнцыялізм і падвяргае радыкальнай крытыцы ідэалогію тэхнакратызма з яго наіўнай верай у навукова-тэхнічны прагрэс. Існасць чалавечага жыцця вызначаецца не тэхнікай і спажываннем. Вера ў здольнасць індывіда як унікальнай самасці супрацьстаяць уніфікаванай знешнасці, ананімнай сацыяльнасці, псеўдакалектывізму – вось аснова жыцця. Экзістэнцыялізм – гэта спроба сцвердзіць адметнасць чалавечага існавання, заснаванага на творчасці, свабодзе і асабістай адказнасці, паказаць самасць і аўтэнтычнасць сапраўднага існавання і выкрыць неаўтэнтычнае, канфармісцкае, безадказнае жыццё паводле прынцыпа “як усе”.

Сапраўдны характар чалавечага існавання праяўляецца толькі ў “памежнай сітуацыі” *(К. Ясперс)*. Толькі ў экстрэмальных умовах чалавек пачынае ўсведамляць выпадковасць свайго жыцця, непадуладнасць яго чалавеку. Адкрыццё сваёй канечнасці, свайго існавання-да-смерці, непадуладнасці існавання і, адначасова, абсалютнай асабістай адказнасці за жыццё, якое табе не належыць, нараджае страх, трывогу, заклапочанасць, боль ... і надзею, якая дае жаданне жыць. Сапраўднае існаванне чалавека, абумоўленае не знешнімі абставінамі, а толькі ўласнай індывідуальнасцю (экзістэнцыя), недасягальнае ў знешнасці прадметнага свету, яно – свабода. Гэтае існаванне першапачаткова азначае факт прысутнасці ў свеце (у *Хайдэгера* – быццё-у-свеце), закінутасць у свет. Кожны раз, калі чалавек заўважае сябе, ён заўважае сябе ў свеце. Яго існаванне – гэта Dasein, “тут-быццё”, у канкрэтным месцы і ў канкрэтны час, куды і калі закінуў чалавека лёс. Істотнай характарыстыка Dasein з’яўляецца яго канечнасць, тэмпаральнасць. Яно ўказвае на тое, што мяжа паміж мною і светам калі і не адсутнічае, то, прынамсі, вельмі размытая. Гэтая фактычнасць быцця і размытасць, нявызначанасць межаў паміж індывідам і іншымі, нараджае заклапочанасць сучасным і прыводзіць чалавека ў безасабовы свет Man – свет, дзе жывуць як усе. У гэтым свеце ніхто нічога не вырашае, а таму ніхто не нясе ніякай адказнасці за сваё існаванне. Man патрабуе адмовіцца ад сваёй індывідуальнасці, стаць “як усе”. Тут асоба памірае, індывідуальнасць раствараецца ў пасрэднасці. Man – гэта свет штодзённай будзённасці, у якім усе імкнуцца затрымацца, каб пазбегнуць смерці. Адзіным спосабам пераадолення Man з’яўляецца сумленне. Яно пераарыентуе свядомасць чалавека з ананімнай фактычнасці існавання на будучыню, дзе чалавек не пазбягае смерці, а ўсведамляе яе як уласны лёс і непазбежнасць і арганізуе сваё жыццё з улікам гэтай акалічнасці. Таму жыццё чалавека – гэта праект ад пачатку і да канца. У гэтым праекце, а дакладней – у спробе яго ажыццяўлення і заключаецца свабода *(Сартр)*. Актам праектавання самога сябе чалавек імкнецца вызваліцца ад выпадковасці сваёй фактычнасці і існаваць на сваіх “уласных падставах”. Праект – гэта ўласны спосаб быць у свеце і сярод іншых людзей. Свабода, якая дасягаецца ў праекце, супрацьпастаўляецца

выпадковасці. Яна ёсць аўтаномія намаганняў чалавека самавызначыцца і гэтым надаць сэнс свайму выбару. Чалавек ёсць аўтар свайго жыцця і сваіх паводзінаў. Здольны праектаваць сваё існаванне чалавек нічым не абмежаваны, свабодны і цалкам адказны за свет і за сябе ў гэтым свеце.

Такім чынам:

*1)экзістэнцыялізм – гэта рэакцыя на аб'ектывізм папярэдняй класічнай філасофіі і адмаўленне ідэалогіі тэхнакратызма;*

*2)спроба абгрунтаваць самакаштоўнасць чалавека як непаўторнай індывідуальнасці, мэтай і сэнсам існавання якой з'яўляецца свабода;*

*3)экзістэнцыялізм аказаў вялікі ўплыў на развіццё філасофскай думкі і мастацкай культуры XX ст;*

*4)экзістэнцыялізм – гэта ўвасабленне разгубленасці сучаснага духу і адначасова імкненне пераадолець безабароннасць асобы перад ананімнымі аб'ектыўнымі структурамі быцця, зварот да глабальных і балючых праблем існавання, што сталіся прыкметай XX стагоддзя: пакутаў і смерці, самотнасці і жаху, сацыяльнай няўстойлівасці і крушэння абсалютных каштоўнасцей.*

Цяжкасці, з якімі сутыкнулася нетрадыцыйная посткласічная філасофія, крызіс культуры і веры інспіравалі ажыўленне рэлігійных пошукаў. У разнастайнасці сучаснай заходняй філасофіі ўзнікаюць і развіваюцца *рэлігійна-філасофскія сістэмы,* якія адлюстроўвалі як канфесійныя (найперш каталіцкія і пратэстанцкія), так і агульнахрысціянскія рэаліі. Радыкальныя перамены ў сацыяльным жыцці, дэмакратызацыя палітычнай сферы і культурны плюралізм, так характэрны для XX стагоддзя, і, самае галоўнае, рост ролі навукі ў вырашэнні сацыяльных праблем, вялі да пашырэння атэізма ў светапоглядзе людзей і скарачэння колькасці вернікаў. У гэтых умовах першачарговай задачай станавілася мадэрнізацыя веравучэння на падставе пераасэнсавання новаеўрапейскай філасофскай спадчыны, крытычнага прачытання сучаснай філасофіі і прыстасавання ідэй новага прыродазнаўства да патрэб царквы і рэлігіі.

Найбольш уплывовай версіяй рэлігійнай філасофіі быў *неатамізм,* у якім рэалізавана праграма мадэрнізацыі каталіцкага веравучэння. Узнікае неатамізм у 20-я гады XX ст. і пачатак яму быў пакладзены гэтак званымі "24 тэзісамі" папы Пія X. Яны з'явіліся ў друку ў 1914 годзе і сталі ідэалагічнай асновай неатамізма, патрабуючы звароту да класікаў схаластыкі і, найперш, да творчасці Фамы Аквінскага. Неабходнасць рэстаўрацыі ідэй святога Фамы тлумачылася тым, што свабоднае развіццё мноства філасофскіх школ дэзарыентавала хрысціян і ўносіла ў іх свядомасць настроі і ідэі, якія супярэчылі хрысціянскай дактрыне. Мэта гэтай рэстаўрацыі заключалася ў тым, каб прывесці тамізм і хрысціянскую дагматыку ў адпаведнасць новым філасофскім рэаліям і новай навуковай

карціне свету, а таксама ў супрацьдзеянні сацыяльным канфліктам і заняпаду духоўнасці.

Неатамізм пераняў усе рысы тамізма: тэацэнтрызм, крэацыянізм, правідэнцыялізм, рэвеляцыянізм і ўзбагаціў іх ідэямі, запазычанымі ў экзістэнцыялізме, філасофскай антрапалогіі, фенамненалогіі і герменеўтыцы. Гэтыя асаблівасці развіцця неатамізма ўвасоблены ў праграме *аджорнамента*-абнаўлення. Уласна кажучы, гэта і была праграма адаптацыі неатамізма да ўстановак сучаснай культуры *(Жыльсон, Марытэн, Бахеньскі, Ранер).*

Жыльсон лічыў, што патэнцыял тамізма далёка не вычарпаны. Пытанне аб суадносінах веры і розуму вырашаецца аднымі і тымі ж сродкамі і спосабамі незалежна ад таго, калі яно паўстае перад людзьмі. Таму сярэдневяковы тамізм у новым культурным кантэксце можа разглядацца як “філасофія будучага”. Мадэрнізацыя тамізма галоўным чынам звязана з яго філасафізацыяй.

Чалавек не проста тварэнне Бога. Яго жыццё – гэта “слуханне слова божага” і імкненне да Бога. Гэтым забяспечваецца адзінства Бога і чалавека, у свядомасці якога актуалізуюцца магчымыя формы боскага быцця. З гэтага ж адзінства вынікае і адзінстве веры і розуму. Рэлігійная вера і рацыянальнае пазнанне не супярэчаць адно аднаму, а ўзаемна дапаўняюць адно аднаго. Гэта два шляхі, якія вядуць нас да аднае мэты. Вера свае ісціны знаходзіць у боскім абвяшчэнні, крыніцай жа рацыянальнага пазнання з’яўляецца розум. Хоць ён і недасканалы, а ўсё ж няма падстаў адвяргаць яго. Аб недасканаласці розуму сведчыць тое, што ёсць ісціны, непадуладныя яму. Таму вера вышэй за розум. Яна пашырае межы кампетэнцыі розуму і, адначасова, паўстае адзіным надзейным крытэрыем ісціны. Рацыянальнае пазнанне правамоцна толькі ў той ступені, у якой яно не супярэчыць рэлігійным догматам. Бо ісціна – гэта вера, альбо непахісная ўпэўненасць у тым, што Бог адкрываецца нам праз слова, і што выказанае слова Бога ісціннае, хоць шмат хто і не разумее гэтага. Філасофія і рацыянальнае пазнанне неабходны таму, што, па-першае, яны пракладваюць дарогу да веры, па-другое, паказваюць, што недаступныя для навукі ісціны боскага абвяшчэння не супярэчаць розуму. Кожны раз філосаф павінен звяраць свае высновы з ісцінамі веры і адмаўляцца ад іх альбо выпраўляць іх адпаведна вышэйшай ісціне. Тое, што тэалогія абвяшчае памылковым, не можа быць ісцінным у філасофіі. Пры гэтым усе ісціны дзеляцца на дзве групы. Да першай, ніжэйшай, групы адносіцца ўсё тое, што спасцігаецца розумам. Да другой, вышэйшай, адносяцца догматы, якія па самой сваёй існасці знаходзяцца па-за межамі розуму і навукі. На думку Жыльсона, узорам вырашэння праблемы вера-розум да гэтага часу застаецца Фама Аквінскі, які да рэчаў ставіўся па-філасофску, разумна, а да Бога – тэалагічна, на падставе веры.

Агульнахрысціянскія праблемы сучаснага існавання рэлігіі знайшлі адлюстраванне ў творчасці французскага даследчыка Тэйяра дэ Шардэна, аўтара канцэпцыі “хрысціянскага эвалюцыянізма”. Ён імкнуўся стварыць “звышнавуку”, якая б дала цэласнае ўяўленне аб свеце і месцы ў ім чалавека. Зыходным і галоўным паняццем гэтай навукі з’яўляецца эвалюцыя. Сусвет – гэта не парадак, а працэс. Таму эвалюцыя – не прыватная гіпотэза, а фундаментальная ўмова, якой падпарадкоўваюцца і адпавядаюць усе гіпотэзы, тэорыі і сістэмы. Касмагенез праходзіць тры стадыі: “пераджыццё”, “жыццё” і “розум”. Першая стадыя – гэта існаванне матэрыі (літасфера і геасфера), калі адбываецца эвалюцыя хімічных элементаў, фарміраванне і змяненне галактык, утварэнне абалонкі зямлі і ўзнікненне на ёй фізіка-хімічнага асяроддзя, прыгоднага для фарміравання першых форм жыцця.

Увасабленнем другога этапа з’яўляецца біясфера, эвалюцыя якой ажыццяўляецца ад узнікнення простых форм жыцця да нараджэння чалавека.

Трэцяя стадыя – гэта станаўленне чалавека і гістарычная эвалюцыя чалавецтва, якая вядзе да ўтварэння сферы разумнай прысутнасці чалавека, ноасферы. На гэтай стадыі завяршаецца фарміраванне адзінага чалавецтва і сферы духа, праз якую адкрываецца выйсце да “звышжыцця”, да “пункту Амега” – духоўнага цэнтра “універсума”. Усё існае паходзіць з адзінай субстанцыі, “тканіны ўніверсума”. Гэтая субстанцыя ад пачатку павінна быць адухоўленай, бо інакш нельга зразумець наяўнасць “Чалавека” ў свеце.

Асновай эвалюцыі ўніверсума з’яўляецца адзіная энергія, якая дзеліцца на дзве складовыя часткі: тангенцыяльную і радыяльную. Тангенцыяльная частка – гэта энергія ў фізічным значэнні. Вынікам дзеяння яе з’яўляюцца сувязі паміж элементамі аднаго ўзроўню. Менавіта тангенцыяльная энергія забяспечвае “салідарнасць” гэтых элементаў. Радыяльная частка энергіі духоўная па сваёй сутнасці і забяспечвае мэтанакіраванасць руху і развіцця, скіроўвае развіццё наперад і ўверх да ўскладнення. Гэтая энергія канцэнтруецца ў “пукце Амега” як увасабленні Бога, як свеце боскай дасканаласці. Прарывам да “пункту Амега” з’яўляецца ноасфера, якая не проста складаецца з крупінак думкі, а ўтварае адзіную разумную абалонку зямлі, адзіную думку ў касмічным маштабе, якая групіруе і ўзмацняе мноства індывідуальных мысленняў. Сам жа “пункт Амега” ёсць прарывам да Бога. Гэта сам Бог, “які патаемна працяў свет Сваёй сілай, выцягнуў яго ў гіганцкае Дрэва жыцця і набліжае да свайго быцця. Усе творчыя намаганні чалавека, уся яго культура і цывілізацыя, яго любоў, яго энергія, яго дзеі і, нарэшце, усе асабістыя бессмяротныя індывідуальнасці, – усё гэта служыць сусветнай Боскай Мэце.”

Такім чынам, рэлігійная філасофія:

*1)гэта спроба пераасэнсаваць з пункту гледжання царквы новую і навейшую філасофію і на гэтай аснове мадэрнізаваць хрысціянскую тэалогію ў адпаведнасці з новым тыпам філасофствавання і ў сувязі з новай навуковай карцінай свету;*
*2)у ёй адлюстраваны як унутрыканфесійныя, так і агульнахрысціянскія праблемы развіцця рэлігійнага светапогляду на сучасным этапе;*
*3)гэта таксама была рэакцыя на сацыяльныя супярэчнасці XX стагоддзя і заняпад духоўнасці ў сучасным свеце;*
*4)яна ўяўляе сабой разнастайныя рэлігійна-філасофскія сістэмы, аб'яднаныя паміж сабой клопатам аб стане веры і неабходнасцю абнаўлення тэалагічных асноў. Найбольш уплывовым сярод іх быў неатамізм.*

## ТЭМА 4. ФІЛАСОФІЯ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ СВЯДОМАСЦЬ

### Сацыякультурныя перадумовы фарміравання беларускай філасофскай думкі

Інтэлектуалізацыя духоўгага жыцця Беларусі адбываецца пад моцным уплывам хрысціянства. Хрышчэнне старажытнабеларускіх земляў не толькі ўмацоўвала гандлёва-эканамічныя сувязі з хрысціянскім светам, але і далучала да еўрапейскай вучонасці і еўрапейскай культуры, уводзіла нашу краіну ў агульнаеўрапейскі гістарычна-культурны кантэкст. Увядзенне хрысціянства суправаджалася неабходнасцю асэнсавання і тлумачэння новай веры, распрацоўкі рэлігійна-царкоўных тэкстаў, арганізацыі культавых мерапрыемстваў. Для гэтага патрабаваліся спецыфічныя веды, якія першапачаткова пранікалі да нас з Візантыі. Разам з Евангеллем сюды пранікае патрыстычная літаратура, якая прадстаўляла не лацінскую, а грэчаскую патрыстыку. А менавіта патрыстыка не толькі не парывала, але і свядома захоўвала сувязі з антычнай культурнай традыцыяй. Таму пранікненне патрыстычнай літаратуры ўводзіла нас не толькі ў таямніцы хрысціянскай веры, але і ў духоўны досвед антычнасці.

Пры гэтым неабходна ўлічваць асаблівасці хрысціянізацыі беларускіх земляў. Калі Кіеў і Ноўгарад хрысціліся "агнём і мячом" з масавым знішчэннем помнікаў паганскай веры і культуры, то хрышчэнне Полацка было працяглым у часе і адносна мірным. Дзякуючы гэтаму паганская культура захавалася тут у значна большых маштабах, чым у нашых суседзяў, і яна аказвала значна большы ўплыў на ўсе сферы жыццядзейнасці. Пасля хрышчэння ў развіцці беларускай культуры праяўляюцца дзве тэндэнцыі. З аднаго боку, ажыццяўляецца хрысціянізацыя паганскай культуры і паганскіх традыцый, іх дэфармацыя і прыстасаванне да патрэб хрысціянскай царквы. З другога ж боку, адбываецца "аб'язычванне хрысціянства", разбаўленне хрысціянскіх

догматаў элементамі язычніцкіх вераванняў. Светапогляд беларусаў у значнай ступені быў паганскім, у ім пераважалі пачуццёвая вобразнасць, анімізм, гілазаізм ды супранатуралізм. Таму і на ранніх этапах, і ў больш познія часы ў беларускай філасофскай думцы маральна-этычны аспект пераважаў і дамінаваў над фармальна-лагічным, анталагічна-гнасеалагічным аспектам. Сутнасць філасофіі ўвасабляецца тут не ў логасе-законе, а ў Сафіі – адзінстве мудрасці і хараства. Калі гісторыю айчыннай філасофіі параўноўваць з антычнасцю, то можна сказаць, што ў беларускай філасофскай думцы праяўляецца маральна-практычны (сакратаўскі) і мастацка-эстэтычны (платонаўскі) метады і амаль што не выяўляецца арыстоцелеўскі лагічны аналіз. Гэта тлумачыцца і тым, што развіццё беларускай філасофскай думкі інспіравана хрысціянствам, дзе маральна-этычны аспект узаемадачыненняў Бога і чалавека з'яўляецца вырашальным. Зазначым, аднак, што гэткая этычна-эстэтычная скіраванасць у філасофіі не з'яўляецца чымсьці другасным, пабочным, гэта не праява дылетантызму ў філасофіі. Мастацка-вобразны спосаб філасофствавання – з'ява распаўсюджаная ў сусветнай філасофіі, і вынікі такога філасофствавання калі не пераўзыходзяць лагічны спосаб, то і не саступаюць яму.

Патрыстыка, а разам з ёю і антычнасць, даходзіла да нас у творах такіх аўтараў, як *Васіль Вялікі, Рыгор Ніскі, Ян Дамаскін* ды іншыя. Васіль Вялікі выказве думку, што ў акце тварэння свету Богам была закладзена здольнасць да "самазарджэння" – здольнасць развіцця. Акт тварэння – гэта толькі пачатак, парастак, з якога створанае ўзыходзіць да дасканаласці. Таму існаванне свету – гарманічнае існаванне, а сузіранне гарманічнага космаса наводзіць чалавека на думку аб Творцы гэтай гармоніі, яго найвышэйшай дасканаласці і мудрасці.

Значны ўплыў на развіццё беларускай філасофскай думкі аказалі і творы Яна Дамаскіна, якія фарміравалі ўяўленні пра філасофію, яе структуру і прызначэнне. Філасофія, як любоў да мудрасці, як спасціжэнне Бога, дзеліцца на тэарэтычную і практычную. Тэарэтычная філасофія ўключае ў сябе багаслоўе – пазнанне нематэрыяльных прадметаў, фізіялогію – пазнанне матэрыяльных прадметаў, матэматыку альбо пазнанне прадметаў, якія не маюць матэрыяльнай прыроды, але праяўляюцца толькі ў матэрыяльных утварэннях. Практычная ж філасофія дзеліцца на этыку, якая даследуе індывідуальныя дзеянні людзей, эканоміку, якая дае нам веды аб законах сямейнага жыцця, і палітыку, што вывучае законы дзейнасці гарадоў і царстваў. Дзякуючы Яну Дамаскіну на Беларусь пранікаюць ідэі Арыстоцеля і іншых антычных аўтараў.

Другой крыніцай беларускай філасофскай думкі была Кірыла-Мефодзіеўская традыцыя. Можна нават сцвярджаць, што засваенне антычных і грэка-патрыстычных ідэй адбывалася пад уплывам Кірылы і Мефодзія, характэрнага для іх збліжэння філасофіі і этыкі. У філасофіі яны

бачылі “веды прадметаў боскіх і чалавечых”. Філасофія набліжае чалавека да Бога, прывучае яго да дабрачыннасці, у якой чалавек упадабляецца свайму творцы.

Важнай крыніцай філасофскай мудрасці былі хронікі і фларылегіі. Праз кароткія, трапныя афарызмы нашы продкі знаёміліся з імёнамі Сакрата, Дэмакрыта, Зянона, Анаксагора, а найперш Платона. Этычная тэматыка фларылегіяў далучала беларусаў да антычнай мудрасці, хрысціянскага маральнага кодэкса. Дабро ўзвышае чалавека да Бога, дабру можна і неабходна вучыцца, бо менавіта для гэтага чалавеку дадзены розум.

## Асноўныя этапы развіцця беларускай філасофскай думкі

Ранні этап станаўлення беларускай філасофскай думкі звязаны з імёнамі *Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Кліменція Смаляціча*.. Этычная тэматыка тут пераважае над усімі іншымі тэмамі. Справы зямныя і нябесныя, дабро і зло, вечнае і часовае, абавязак чалавека перад людзьмі і Богам, ідэя служэння вышэйшым мэтам – вось тэмы разважанняў нашых першых вялікіх асветнікаў. У адпаведнасці з хрысціянскімі каштоўнасцямі яны дабро і прыгажосць зямныя падпарадкоўваюць дабротам вечным. Кірыла Тураўскі, напрыклад, не адмаўляў зямной, пачуццёвай прыгажосці, але падпарадкоўваў яе прыгажосці духоўнай, якая прыносіць святло ў душы людзей. Гэтак жа разумее прыгажосць і Еўфрасіння Полацкая. Увесь свет, які мы бачым, прыгожы, але прыгажосць гэтая хутка праходзіць і, як кветка, вяне. Прыгажосць жа нябесная існуе вечна.

Жыццё дадзена чалавеку зусім не для таго, каб упівацца асалодамі зямнымі, а для падрыхтоўкі да жыцця вечнага. І сапраўднае дабро – у вернасці і адданасці Богу. Але нельга пазбягаць і дабра зямнога. Яно – у цярпенні, у слове дабрачынным, у імкненні да мудрасці, у павазе да старэйшых, у душэўнай чысціні.

Першыя асветнікі зямлі беларускай значнае месца ў жыцці чалавека адводзілі розуму. Кірыла Тураўскі разглядаў розум як вышэйшую каштоўнасць чалавечага жыцця. Развіваць свой розум, удасканальваць яго – абавязак кожнага чалавека, бо толькі розум вядзе да духоўнай раўнавагі і шчасця. Салодкі мёд і цукар салодкі, але саладзейшы за іх кніжны розум. Гэтак жа высока цаніў чалавечы розум і Кліменцій Смаляціч, які лічыў, што хоць розум і абапіраецца на пачуцці і ў іх здабывае матэрыял для разважанняў, але ён прызначаны для кіраўніцтва пачуццямі. Тут відавочны ўплыў Яна Дамаскіна, які лічыў, што няма нічога больш каштоўнага за пазнанне, бо пазнанне – гэта свет разумнай душы.

На фарміраванне грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі значны ўплыў аказалі *фларылегіі* (“Паралелі Яна Дамаскіна”, “Менадр”, “Пчала”, “Кветкі дараванняў”) – блізкія да народных прыказак і

прымавак афарызмы кніжнага паходжання, у якіх адлюстроўваліся самыя розныя аспекты жыцця. Філасофская мудрасць фарміравалася і на падставе *агіяграфічнай літаратуры,* а таксама твораў свецкага характару (“Слова аб палку Ігаравым”, “Аповесць мінулых гадоў”).

На другім этапе (XIV – XVI стст.), які пачынаецца з утварэння Вялікага Княства Літоўскага і характарызуецца станаўленнем культуры новага тыпу, беларуская філасофская і грамадска-палітычная думка перажывае ўздым у сваім развіцці. Гэтая думка развіваецца ў кантэксце і ў адпаведнасці з культурнымі ўстаноўкамі агульнаеўрапейскага Адраджэння. Гуманізм, эстэтызм, фарміраванне юрыдычнага светапогляду, пранікненне і пашырэнне прыродазнаўчых ведаў, апора на антычную культуру і антычную мудрасць – вось тая духоўная аснова, на якой узнікае і развіваецца беларуская рэнесансная думка і якая лучыць нас з еўрапейскім Адраджэннем і еўрапейскай культурай. Як і ў еўрапейскім Адраджэнні, у беларускай рэнесанснай думцы можна выдзяліць гуманізм, анталогію і сацыяльную філасофію. Гуманізм беларускага Адраджэнне быў заснаваны на новай трактоўцы ролі і прызначэння чалавека. Калі ў папярэднюю эпоху чалавек разглядаецца як грахоўная пасіўная істота, падпарадкаваная Богу і царкве, то Адраджэнне адкрывае чалавечую актыўнасць, заснаваную на розуме, здольнасць чалавека да ўдасканалення сябе і свету на падставе свайго розуму і ў адпаведнасці з яго прынцыпамі. Намаганнямі *Ф.Скарыны, С.Буднага, М.Гусоўскага. Л.Зізанія, А.Волана* ў грамадскай думцы ўкараняецца перакананне ў тым, што чалавек не толькі можа, але і абавязаны ўдасканальваць свой розум, сваё жыццё, свет свайго існавання паводле разумных прынцыпаў.

У анталагічных вучэннях гэтага часу можна выдзяліць непаслядоўны крэацыянізм Ф.Скарыны, дэізм С.Буднага, натуралізм М.Гусоўскага і атэізм К.Лышчынскага. За выключэннем апошняга, ніхто больш не парывае з рэлігійнымі поглядамі на будову свету. Скарына трымаецца ідэі крэацыянізма, але пры гэтым імкнецца скарыстаць і вучэнне Арыстоцеля аб матэрыі. Гусоўскі, не адмаўляючы Бога як першапрычыну свету, засяроджваецца на натуральных асновах яго, на творчых здольнасцях прыроды. С.Будны прызнае Бога творцам свету, але гэтым і абмяжоўвае яго ўладу над светам: створаны Богам свет існуе сам па сабе, без боскага апякунства. Спроба тлумачыць свет на падставе натуральных фактараў – характэрная рыса філасофскіх поглядаў С.Буднага.

Гуманізм Адраджэння быў тым падмуркам, на якім фарміравалмся сацыяльна-філасофскія ўяўленні таго часу. Менавіта на гуманізме грунтуецца ідэя юрыдычнага светапогляду. Калі культура мінулай эпохі палягала на ідэях граху, пакаяння і ўседаравання, то Адраджэнне асноватворнымі прынцыпамі мае антрапацэнтрызм, свабоду і натуралізм. Калі галоўным этыка-палітычным інстытутам сярэдневякоўя была царква, то такім інстытутам Адраджэння становіцца дзяржава, але не як

палітычная рэальнасць, а толькі як ідэал, да якога імкнецца грамадства. Адгэтуль і ўласцівая Адраджэнню думка аб неабходнасці сацыяльнага рэфармавання ўсяго спектра грамадскага жыцця: ад рэлігійна-царкоўных інстытутаў да дзяржаўна-прававых структур. Пры гэтым філасофія права вынікала не з антычных юрыдычных канцэпцый (хоць і абапіралася на іх), а з антыаўтарытарнага рэлігійнага руху, які распачаўся ў XVI ст.

Сацыяльна-палітычная адраджэнцкая думка Беларусі мае свае асаблівасці. Па-першае, рэфармацыйныя ідэі разгортваліся тут пад моцным уплывам феадальнай ідэалогіі і таму насілі кампрамісны характар. Па-другое, прававыя ідэі часта спалучаліся з сярэдневякова-хрысціянскімі поглядамі на дзяржаву і грамадства. Развівалася гэтая думка ў двух напрамках – памяркоўна-гуманістычным і радыкальным, у якім адлюстраваны простанародныя спадзяванні.

Неабходнасць сацыяльных перамен дыктавалася інтэнсіўным культурна-эканамічным развіццём, актывізацыяй намаганняў пануючага класа да "выпраўлення дзяржавы", узнікненнем буржуазных элементаў, ростам гарадоў і дзейнасці гараджан. Спалучэнне гэтых розных фактараў і сацыяльных груп і надавала кампрамісны характар рэфарматарскай дзейнасці. Сацыяльна-філасофскія вучэнні ставілі дзве задачы: абгрунтаваць неабходнасць сацыяльных змен і даказаць магчымасць свабоды як універсальнай здольнасці чалавека тварыць сябе і сваё акружэнне. Скарына, Будны, Міхалон Літвін, Гусоўскі праводзяць думку аб тым, што грамадскія законы гэта не кара боская, а вынік дзейнасці людзей, якія дэфармуюць жыццё сваёй нястрыманасцю і сквапнасцю. Таму чалавек не толькі можа, але і абавязаны актыўна ставіцца да сацыяльнай рэчаіснасці, прымаць удзел ва ўдасканаленні грамадскіх адносін. Рэформы – абавязковая ўмова жыццяздольнасці грамадства. Ліквідацыя супярэчнасцей грамадскага жыцця пры дапамозе разумных змен і дасягнення сацыяльнай стабільнасці – вось галоўная думка ад Скарыны да Сімяона Полацкага.

Скарына адным з першых паставіў пытанне аб магчымасці і неабходнасці сацыяльных рэформ. Асновай дзяржаўнага жыцця павінен стаць "прыроджаны закон", што запісаны Богам у сэрцы ўсіх людзей. Закон павінен служыць агульнаму дабру, адпавядаць звычаям народа, грунтавацца на маралі і спрыяць справядлівасці. Таму ўлада павінна абапірацца не на волю суверэна, а на закон, і спрыяць асвеце грамадства. Чалавечая супольнасць будуецца на міры і згодзе, ад якіх усё добрае прыходзіць, "нязгода ж і найбольшыя царствы разбурае".

Мікола Гусоўскі лічыў, што ў дзяржаве павінен быць справядлівы суд, міралюбівая палітыка і ідэальны правіцель, узорам якога для Гусоўскага быў вялікі князь Вітаўт. Міхалон Літвін патрабаваў памяркоўнасці ва ўласнасці, любові да бліжняга, справядлівага падаткаабкладання ("у каго зямлі больш і плаціў бы больш").

Значнае месца ў гісторыі культуры Беларусі эпохі Адраджэння належыць Андрэю Волану. Яго погляды на дзяржаву і грамадства абапіраюцца на ідэі Арыстоцеля. Для яго дзяржава – гэта злучнасць людзей з мэтай дасягнення агульнага дабра і бяспекі жыцця і маёмасці. Як і большасць філосафаў Адраджэння, Волан прызнаваў і адстойваў "права натуры", г.зн. натуральнае права і вяршэнства закона ў дзяржаве. Закон павінен быць скіраваны на абарону свабоды і справядлівасці, а для гэтага ён мусіць быць заснаваны на розуме і здаровым сэнсе. Адметны след у беларускай рэнесанснай культуры пакінулі Л.Сапега, А.Валовіч, П.Кахлеўскі, М.Сматрыцкі.

У XVII – першай палове XVIII стст. грамадска-палітычная і філасофская думка Беларусі развівалася пад знакам Контррэфармацыі. Рэнесансна-гуманістычная традыцыя, якая працягвалася ў творчасці *Чаховіца, Лована, Лышчынскага. Л.Зізанія,* сутыкнулася з каталіцкай экспансіяй, засіллем царквы, ідэалогіяй контррэфармацыі. Таму элементы матэрыялізма і атэізма, што праяўляліся ў грамадскай думцы XVI ст., саступаюць месца схаластыцы і эклектыцы. Аднак новаеўрапейскія ўплывы паступова разбураюць схаластычна-эклектычныя настроі і стымулююць развіццё навукі і філасофскіх пошукаў. Гэты працэс пачынаецца з твораў *Казіміра Нарбута, А.Скарульскага, С.Шадурскага, Б.Дабшэвіча.* Менавіта ў іх творчасці былі закладзены духоўныя перадумовы развіцця асветніцкай філасофіі ў Беларусі.

Беларуская Асвета пачынаецца крыху пазней, чым у Еўропе (сярэдзіна XVIII – пачатак XIX стст.) і развіваецца пад знакам барацьбы са схаластыкай і рэлігіяй. Ужо Нарбут, а затым і *Вярней, Стырпейка* адстойваюць свабоду філасофіі, падкрэсліваюць ролю розуму ў жыцці асобнага чалавека і грамадства. Навуковае асэнсаванне прыроды і чалавека ўласціва *Пачобуту, Яну Снядэцкаму,* вучоным-прыродазнаўцам, выкладчыкам Віленскага універсітэта *Жыліберу, Форстэру, Бісісу, Юндзілу.* Праблемы грамадства, права і маралі даследуюць *Млоцкі, Страйноўскі, Нарушэвіч. Храптовіч,* сябры "Таварыства філаматаў". Вядомым філосафам-асветнікам быў *А.Доўгірд.*

Грамадска-палітычная і філасофская думка XIX – пачатку XX стст. адлюстравала асаблівасці нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусі, працэс фарміравання беларускай нацыі, нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальнай ідэі. Каліноўскі, Багушэвіч, Купала, Колас, Багдановіч ствараюць, прапагандуюць і адстойваюць ідэю нацыянальнай і сацыяльнай свабоды, В.Ластоўскі прапануе тэорыю крыўскага паходжання беларусаў, Абдзіраловіч стварае культуралагічную канцэпцыю беларускага народа. Цэнтрам інтэлектуальнага жыцця, асветніцтва і нацыянальнага адраджэння становіцца "Наша Ніва". Гэты працэс быў перарваны ўжо ў 20-я гады сталінскімі рэпрэсіямі. Свабоднае развіццё нацыянальнай думкі было заменена бальшавіцкай ідэалогіяй і марксісцка-ленінскай філасофіяй.

Такім чынам, кароткі агляд гісторыі беларускай грамадска-палітычнай і філасоскай думкі прыводзіць нас да высновы аб тым, што:

*1)інтэлектуалізацыя духоўнага жыцця на старажытных беларускіх землях адбываецца пад вырашальным уплывам хрысціянства і на падставе тэалагічнай літаратуры пераважна візантыйскага паходжання. У справе фарміравання філасофскіх ідэй у Беларусі важная роля належыць таксама фларылегіям і жыццяпісанням;*

*2)развіццё грамадска-палітычнай і філасофскай думкі Беларусі адбываецца ў рэчышчы духоўных праблем Еўропы, што сведчыць аб прыналежнасці Беларусі да агульнаеўрапейскага культурнага асяроддзя. Асабліва выразна гэта праяўляецца ў эпоху Адраджэння, калі Беларусь праходзіць еўрапейскім шляхам ад сцвярджэння гуманізма і фарміравання юрыдычнага светапогляду да распаўсюджвання ідэй новага прыродазнаўства;*

*3)хрысціянскі ўплыў і рэаліі палітычнага жыцця Беларусі абумовілі перавагу ў філасофскіх пошуках маральна-этычнай праблематыкі. Гэтая адметнасць праяўляецца на ўсіх этапах развіцця беларускай духоўнай культуры і з'яўляецца дамінуючай, што не азначае адсутнасці анталагічных, сацыяльна-філасофскіх і гнасеалагічных даследаванняў;*

*4)гісторыя беларускай філасофскай і грамадска-палітычнай думкі з'яўляецца адлюстраваннем працэса фарміравання беларускай нацыі і ўвасабленнем яе нацыянальнай свядомасці і нацыянальнага характару.*

## Слоўнік асноўных тэрмінаў
## да першага раздзела

**Агнастыцызм** – філасофскае вучэнне, прыхільнікі якога адмаўляюць здольнасць чалавека да аб’ектыўна-ісціннага пазнання.

**Аксіялогія** – філасофскае вучэнне аб паходжанні і эвалюцыі каштоўнасцей, іх структуры і месцы ў грамадстве.

**Антрапамарфізм** – адна з фундаментальных характарыстык міфалагічнай свядомасці, якая заключаецца ў пераносе псіха-фізіялагічных якасцей чалавека на прадметы прыроды і ўпадабленні іх чалавеку.

**Антрапацэнтрызм** – характарыстыка філасофскіх канцэпцый, якія чалавека разглядаюць як цэнтр і вышэйшую мэту Сусвету.

**Артэфакт** – паняцце, якое азначае ўсё, што створана чалавекам.

**Герменеўтыка** (ад грэчаскага “тлумачыць”) – мастацтва і тэорыя тлумачэння тэкстаў, назва аднаго з напрамкаў у сучаснай філасофіі, які разуменне разглядае як умову сацыяльнага быцця.

**Гнасеалогія** – тэорыя пазнання, раздзел філасофіі, які вывучае магчымасці, формы і спосабы пазнання свету чалавекам.

**Гуманізм** – фундаментальная характарыстыка філасофіі Адраджэння, сістэма ўяўленняў аб самакаштоўнасці чалавека, яго праве на свабодную творчасць у сферы прыроднага і сацыяльнага асяроддзя з мэтай яго ўдасканалення паводле прынцыпаў розуму.

**Дуалізм –** філасофскае вучэнне, прыхільнікі якога прызнаюць існаванне двух раўнапраўных і незалежных адзін ад аднаго пачаткаў свету: духа і матэрыі.

**Дыялектыка –** філасофскае вучэнне аб фундаментальных заканамернасцях развіцця свету і чалавека, філасофскі метад, заснаваны на прынцыпах супярэчлівасці ўсяго існага, ўзаемасувязі, узаемаабумоўленасці і ўзаемазалежнасці з’яў і працэсаў.

**Ідэалізм –** паняцце для абазначэння філасофскіх вучэнняў, аўтары і прыхільнікі якіх адстойваюць першаснасць духоўнага (свядомасці) над матэрыяльным. Пачынальнікам ідэалізма ў філасофіі традыцыйна лічаць Платона.

**Ірацыяналізм** (ад лац. irrationalis – неразумны) – філасофскі прынцып, які абмяжоўвае альбо адмаўляе разумнасць чалавека і рацыянальнасць свету і сцвярджае алагічнасць быцця.

**Крэацыянізм** (ад лац. creatio – тварыць) – фундаментальны прынцып сярэдневяковай філасофіі, рэлігійна-філасофскае вучэнне аб тварэнні свету Богам з нічога.

**Логас** – паняцце старажытнагрэчаскай філасофіі, уведзенае Гераклітам для абазначння касмічнага закона, які надае свету адзінства, гармонію і прыгажосць.

**Логіка –** навука аб правілах і законах мыслення.

**Манізм** – філасофская канцэпцыя, якая прызнае існаванне аднаго і адзінага (матэрыяльнага ці ідэальнага) пачатку быцця.

**Матэрыялізм** – напрамак у філасофіі, прыхільнікі якога адстойваюць першаснасць матэрыі над духам (свядомасцю).

**Метафізіка** – філасофская тэорыя аб першых умовах быцця, пачатках усяго існага, якія спасцігаюцца не пачуццямі, а розумам. У новаеўрапейскай філасофіі выступае як метад, заснаваны на патрабаванні разглядаць рэчы адасобленымі, нязменнымі, пастаяннымі.

**Міф** – архаічны аповед аб дзеях багоў і герояў, у якіх адлюстраваны ўяўленні старажытных людзей аб паходжанні і існаванні свету. Гістарычна першы тып светапогляду, заснаваны на веры ў існаванне звышнатуральных сіл, характэрнымі рысамі якога з'яўляюцца антрапамарфізм, сінкрэтызм і супранатуралізм.

**Наміналізм** – філасофскае вучэнне сярэдневякоўя, якое сцвярджала, што рэальна існуюць толькі асобныя, адзінкавыя рэчы а паняцці (універсаліі) існуюць толькі ў мысленні як імёны (лац. nomen – імя) гэтых рэчаў.

**Натурфіласофія** – першая форма антычнай філасофіі, філасофія прыроды, аб'ектам якой выступалі спасцігаемыя розумам умовы яе існавання.

**Пантэізм** – філасофскае вучэнне, якое атаясамлівае Бога і свет, растварае Бога ў свеце.

**Плюралізм** – філасофская канцэпцыя, якая прызнае і адстойвае наяўнасць некалькіх ці нават мноства субстанцыяльных пачаткаў быцця.

**Правідэнцыялізм** – адзін з фундаментальных прынцыпаў сярэдневяковай філасофіі, рэлігійна-філасофскае вучэнне аб прадвызначанасці ўсяго існага, яго падпарадкаванасці волі Бога, які перманентна правіць светам, людской гісторыяй і лёсам кожнага чалавека.

**Псіхааналіз** – уплывовы напрамак у посткласічнай філасофіі, які прыроду чалавека выводзіць з бессвядомага як галоўнага матыватара яго паводзін.

**Рацыяналізм** – спосаб філасофствавання, які асновай пазнання і паводзін чалавека прызнае розум.

**Рэалізм** – філасофскае вучэнне сярэдневякоўя, якое адстойвала рэальнае існаванне агульных паняццяў (універсалій), што ўтвараюць іерархію духоўных існасцей начале з Богам.

**Рэвеляцыянізм** – прынцып сярэдневяковай філасофіі, рэлігійнае вучэнне аб Боскім абвяшчэнні як крыніцы ўсіх магчымых ісцін і самым надзейным спосабе пазнання.

**Рэдукцыянізм** (ад лац. reduktio – адсоўванне назад, вяртанне да пачатковага стану) – метадалагічны прынцып звядзення вышэйшых форм існавання да ніжэйшых.

**Рэлігія** – гістарычны тып светапогляду, заснаваны на веры ў існаванне іншага свету, заселенага звышнатуральнымі сіламі, якія абумоўліваюць існаванне свету і вызначаюць паводзіны чалавека.

**Секулярызацыя** – працэс вызвалення грамадскай і індывідуальнай свядомасці ад уплыву рэлігіі і царквы, сацыяльных адносін і інстытутаў ад рэлігійнага санкцыянавання.

**Сенсуалізм** – спосаб філасофствавання, які пачуцці абвяшчае адзінай крыніцай ісціннага пазнання.

**Скептыцызм –** філасофскае вучэнне, прыхільнікі якога адмаўляюць наяўнасць механізмаў суаднясення ведаў і аб'ектыўнай рэальнасці і на гэтай падставе сумняваюцца ў здольнасці чалавека да ісціннага пазнання і сцвярджаюць гіпатэтычнасць яго.

**Субстанцыя** (ад лац. substantia – існасць, тое, што ляжыць у аснове) – тое, што існуе само па сабе, залежыць толькі ад сябе, а не ад нечага іншага, і з'яўляецца ўмовай узнікнення, існавання і змянення разнастайных элементаў свету.

**Суб'ектыўны ідэалізм** – напрамак у філасофіі, прыхільнікі якога сцвярджаюць залежнасць свету і яго ўласцівасцей ад свядомасці чалавека. Крайнім выражэннем суб'ектыўнага ідэалізма з'яўляецца саліпсізм, які прызнае толькі існаванне аднаго Я.

**Схаластыка** – этап у развіцці сярэдневяковай філасофіі, форма рэлігійнага філасофствавання, для якой характэрна прынцыповае падпарадкаванне філасофіі, навукі і розуму багаслоўю і імкненне спалучыць рэлігійныя догматы з рацыяналістычнымі сродкамі пазнання.

**Філасофія** – тэарэтычная фарма светапогляду, навука аб універсальных законах развіцця прыроды, грамадства і мыслення.

**Экзістэнцыялізм** – уплывовы напрамак у посткласічнай філасофіі XX ст., філасофія існавання.

**Эмпірызм** – напрамак у тэорыі пазнання, прадстаўнікі якога прызнаюць вопыт крыніцай пазнання і сцвярджаюць, што змест яго ўяўляе сабой апісанне гэтага вопыту.

## Раздзел II. Філасофскія праблемы быцця.

### ТЭМА 5. МЕТАФІЗІКА І АНТАЛОГІЯ

У першым раздзеле ўжо ішла гаворка аб тым, што з самага пачатку філасофія скіравана не на даследаванне канкрэтных прадметаў, а на выяўленне і тлумачэнне фундаментальных умоў існавання свету, першых прынцыпаў усякага быцця. Гэтае імкненне да спасціжэння ўсеагульнага, арыентацыя на пазнанне ўсеагульных характарыстык рэчаіснасці робіць філасофію "першай філасофіяй", метафізікай. *Метафізіка – гэта філасофская навука аб першых умовах быцця, пачатках усякага існавання, якія спасцігаюцца не пачуццямі, а розумам.* На розных этапах існавання метафізіка па-рознаму вырашала сваю асноўную задачу: пошук і тлумачэнне прычын адзінства свету. Антычная натурфіласофія мела на мэце пошук натуральных элементаў, якія з'яўляюцца субстанцыяльнымі пачаткамі свету – зямлі, вады, агню, паветра, атамаў, з якіх усё ўзнікае і ў якія ўсё ператвараецца. Свет – гэта адзіны космас, які мае агульную аснову. Мноства з'яў і прадметаў космаса, звязаных паміж сабой разастайнымі сувязямі, сведчыць пра тое, што гэта не штосьці завершанае, а працэс, станаўленне, у яго ёсць мінулае і будучае, яму ўласціва развіццё.

Сярэдневяковая філасофія асновай свету, пачаткам і ўмовай яго існавання лічыць Бога – быццё вышэйшае, дасканалае, ісціннае, да якога і па-за якім няма і не можа быць чаго-небудзь іншага. Гэта вечны і нязменны пачатак, а ўсё зменлівае створана Богам і імкнецца да небыцця.

Метафізіка Новага часу пераарыентуе сваю ўвагу з першаасноў свету на даследаванне механізмаў і прынцыпаў пазнання яго і становіцца, такім чынам, не гэтак формай філасофскага спасціжэння свету, колькі метадам. Можна сказаць, што філасофія як метафізіка, як навука аб першых асновах свету, эвалюцыянавала ад натурфіласофіі да філасофіі духу, што найбольш поўна ўвасобілася ў нямецкай класічнай філасофіі.

Арыентацыя метафізікі на выяўленне першых умоў існавання свету і чалавека цесна звязана са спробай асэнсавання быцця. А быццё – гэта прадмет *анталогіі* як часткі метафізікі. Анталогія даследуе не быццё асобных прадметаў, а быццё само па сабе, быццё як існае. *Анталогія – гэта навука аб паходжанні свету, прынцыпах і законах яго будовы і існавання.*

### Філасофскае вучэнне аб быцці

Свет утварае бясконцае мноства разнастайных прадметаў, з'яў і працэсаў, агульнай рысай якіх з'яўляецца тое, што яны існуюць. Гэтыя прадметы змяняюцца, злучаюцца з іншымі прадметамі, раз'ядноўваюцца,

рухаюцца. Але гэта магчыма толькі тады, калі ёсць нейкая прычына, якая рухае, злучае, нараджае і змяняе гэтыя прадметы. Гэта і ёсць быццё. Яно прыпісваецца ўсяму, што *ёсць* і ўказвае на тое, *чым* яно ёсці і *якім* яно ёсць. Паняцце быцця, сцвярджаючы наяўнасць чагосьці (штосьці ёсць), адачасова сведчыць аб тым, што яно сабою ўяўляе (указвае на існасць прадмета) і якім яно бывае (фіксуе яго характарыстыкі). *Быццё – гэта філасофская катэгорыя, якая абазначае існаванне разнастайнасці свету ў яго адзінстве і цэласнасці.*

Традыцыйна паняцце быцця ў філасофіі мае два значэнні: па-першае, яно азначае ўсё тое, што калі-небудзь існавала, існуе цяпер і мае ўнутраную патэнцыю для рэалізацыі ў будучым; па-другое, пад быццём разумеюць пачатак і аснову свету, яго сутнасць. Быццё ў першым значэнні гэта космас, сусвет, *Універсум*, у другім жа значэнні быццё – гэта аснова Універсума, прычына яго адзінства, цэласнасці і вечнасці. Універсум існуе як непарушнае адзінства па-за воляй і свядомасцю і незалежна ад іх. У яго ўваходзіць і свет духоўны, чалавечы, ідэальны. Яны вельмі розныя, але паміж імі агульнае тое, што абодва ёсць, існуюць. Універсум не проста існуе, ён рэальны, сапраўдны і ў гэтай якасці перад-стаіць чалавеку ў выглядзе рэчаў, працэсаў, створаных чалавекам прадметаў, іншых людзей. Гэта рэчаіснасць, якая рэальна перад-стаіць свядомасці як аб’ект пазнання і практычнай дзейнасці асобных індывідаў і пакаленняў людзей.

Такім чынам, паняцце быцця азначае:

*1)рэальнасць саму па сабе;*

*2)існаванне існага;*

*3)агульную рысу ўсяго, якая надае свету адзінства і цэласнасць.*

Быццё дзеліцца на аб’ектыўнае (матэрыя, рэчы, з’явы, людзі) і суб’ектыўнае (разнастайнасць пачуццяў, мысленне, свядомасць).

## Праблема субстанцыі ў філасофіі

Першай і агульнай прыкметай быцця ёсць існаванне. Але што з’яўляецца яго першапрычынай, адзінай першаасновай? Для абазначэння такой першаасновы ў гісторыіі філасофіі карысталіся катэгорыяй *субстанцыі* (ад лацінскага *substantia* – існасць, тое, што ляжыць у аснове). Пад субстанцыяй разумелі тое, што існуе само па сабе, залежыць толькі ад сябе, а не ад нечага іншага і з’яўляецца ўмовай узнікнення, існавання і змянення разнастайных элементаў свету. Субстанцыя характарызуецца самадэтэрмінацыяй (нестваральнасць, незнішчальнасць), універсальнасцю (абазначае устойлівую, пастаянную, абсалютную, ні ад чаго незалежную першааснову), каузальнасцю (ёсць усеагульная прычына ўсіх з’яў).

Розныя філасофскія школы па-рознаму трактуюць прыроду субстанцыі. Гэта залежыць ад таго, як прадстаўнікі гэтых школ вырашаюць пытанне аб адзінстве свету і яго паходжанні. Тыя вучэнні, якія выводзяць

свет з адной субстанцыі і, абапіраючыся на яе, будуюць карціну свету як адзінства разнастайныў прадметаў і з'яў, характарызуюцца *філасофскім манізмам.* Калі ў якасці першаасновы свету бяруцца дзве субстанцыі, то такая пазіцыя называецца *дуалізмам.* Калі ж паходжанне свету тлумачыцца дзеяннем некалькіх субстанцый, то такі пункт гледжання называецца *плюралізмам.* У гісторыі філасофіі існавалі два асноўныя падыходы да разумення субстанцыі: матэрыялістычны і ідэалістычны. Матэрыялістычны манізм заснаваны на перакананні ў тым, што свет адзіны, недзялімы, ад пачатку матэрыяльны і гэтая матэрыяльнасць заснавана на матэрыяльнасці субстанцыі. Дух, свядомасць, ідэальнае ў такіх канцэпцыях пазбаўлены субстанцыяльнага харатару і выводзяцца з матэрыяльнай субстанцыі як яе ўласцівасці і праявы (французскія асветнікі-матэрыялісты XVIII ст., Маркс). Ідэалістычны манізм прызнае матэрыю вытворнай ад духу, што з'яўляецца асновай усякага быцця, валодае вечным існаваннем і характарызуецца незнішчальнасцю. Пры гэтым адрозніваюць аб'ектыўна-ідэалістычны маніз (Бог у філасофіі Фамы Аквінскага, абсалютны дух Гегеля) і суб'ектыўна-ідэалістычны манізм (суб'ектыўная свядомасць Берклі, комплекс адчуванняў Маха).

## Філасофскае вучэнне аб матэрыі

Субстанцыяльныя пошукі філасофіі прывялі да паняцця "*матэрыі"*, якое ў гісторыка-філасофскім працэсе неаднаразова мяняла свой змест. Першапачаткова пад матэрыяй разумелі пэўны канкрэтна-прадметны пачатак (зямля, вада, агонь, паветра), з якога ўсё нараджаецца і ў які ўсё ператвараецца. Затым матэрыя ператвараецца ў адзіную субстанцыю, якая ўяўляе сабой бясконцае мноства атамаў. У творчасці Платона матэрыя – гэта пасіўны пачатак, які набывае форму дзякуючы творчай ідэі. Арыстоцель лічыў матэрыю першапачаткам усяго існага, што актуалізуецца пры наяўнасці фармальнай і мэтавай прычыны.

У філасофіі Новага часу адраджаецца атамістычная канцэпцыя свету, у якой матэрыя паўстае як бясконцая сукупнасць атамаў, надзеленых атрыбутыўнымі ўласцівасцямі: працягласцю, масай, недзялімасцю, непранікальнасцю. Так фарміравалася ўяўленне аб матэрыі як будаўнічым матэрыяле, з якога ўсё "зроблена", але які існуе і сам па сабе, у чыстым выглядзе. Такое разуменне матэрыі адпавядала прадметна-субстрактнаму падыходу да тлумачэння свету і аналітычнаму метаду навуковага пошуку.

Але ўжо французскія матэрыялісты XVIII ст. ставяць пад сумненне гэтыя ўяўленні, звяртаючы ўвагу на тое, што такую матэрыю ніхто нідзе не знаходзіў. Матэрыя, лічылі яны, гэта ўсё тое, што ўздзейнічае на нашыя органы пачуццяў і выклікае ў іх разнастайныя адчуванні. Гэтая ідэя атрымала сваё развіццё ў марксізме, які, па-першае, адмовіўся ад звядзення матэрыі толькі да прыроднага быцця і распаўсюдзіў яе на сацыяльную

рэальнасць, а па-другое, звязаў паняцце матэрыі са свядомасцю як функцыянальнай уласцівасцю яе. Тут *матэрыя – гэта аб'ектыўная рэальнасць, якая, будучы дадзенай свядомасці, існуе незалежна ад яе.* У такой інтэрпрэтацыя паняцце матэрыі азначае *1)сукупнасць усяго мноства прадметаў, з'яў і працэсаў, узятых разам; 2)аб'ектыўную рэальнасць, што існуе па-за свядомасцю і незалежна ад яе; 3)агульную рысу ўсіх рэчаў і з'яў; 4)незнішчальны астатак, які захоўваецца пры любых зменах прадметаў.* Пры гэтым матэрыя разглядаецца не як штосьці неакрэсленае, аморфнае, а як дынамічная сістэмная цэласнасць, арганізаваная ў прасторы і часе.

## Структурная арганізацыя матэрыі

Матэрыя заўжды існуе ў выглядзе арганізаваных сістэм. Пад сістэмай звычайна разумеюць *абмежаваную і арганізаваную сукупнасць элементаў, сувязі паміж якімі больш трывалыя, чым сувязі з элементамі іншых сукупнасцей, што надае ім адзінства і цэласнасць.* Сістэмы бываюць закрытыя і адкрытыя. Закрытымі называюць сістэмы, у якіх адсутнічаюць абменныя працэсы са знешнім асяроддзем, у выніку чаго ўзрастае энтрапія, якая вядзе да дэзінтэграцыі і гібелі сістэмы. Адкрытыя ж сістэмы ажыццяўляюць разнастайныя абменныя працэсы і характарызуюцца ўстойлівасцю, здольнасцю да самарэгуляцыі і развіцця.

Элементы, з якіх складаецца сістэма, знаходзяцца ў адносінах каардынацыі і субардынацыі. Гэта азначае, што сістэма структурна арганізавана. *Структура* – гэта спосаб сувязі элементаў, унутраная будова сістэмы, якая надае ёй цэласнасць, устойлівасць і якасную акрэсленасць. Структурная арганізацыя матэрыі мае шматузроўневы характар, пры гэтым кожны канкрэтны ўзровень уключае ў сябе элементы ніжэйшых узроўняў і сам у якасці элемента ўваходзіць у больш складаныя сістэмы. Такая арганізацыя матэрыяльных сістэм з'яўляецца ўмовай адзінства свету. Сучасная навука выдзяляе субмікраэлементарны, мікраэлементарны, ядзерны, атамна-малекулярны, макраскапічны, планетарны, галактычны і метагалактычны ўзроўні структурнай арганізацыі матэрыі.

## Дынамічная арганізацыя Універсума

Сістэмна арганізаваны і структурна ўладкаваны матэрыяльны свет існуе як няспынная зменлівасць. Гэтая зменлівасць уласціва свету на ўсіх узроўнях яго арганізацыі, таму яна з'яўляецца яго атрыбутам. Зменлівасць праяўляецца ва *ўзаемадзеянні, руху і развіцці.* Пад узаемадзеяннем звычайна разумеюць такія адносіны паміж сістэмамі, калі ў працэсе ўзаемнага ўздзеяння змены ў адной сістэме прыводзяць да змен у другой сістэме. Рухам называюць любыя змены матэрыяльных сістэм, па-за якімі

існаванне іх немагчыма. Таму рух называюць спосабам існавання матэрыі. На пачатку развіцця філасофіі пад рухам разумелі ўзнікненне і знікненне чаго-небудзь, пазней рухам называлі злучэнне і раздзяленне. У Арыстоцеля рух – гэта перамена месца цела ў прасторы. Відавочна, што на розных этапах развіцця філасофіі існавала тэндэнцыя зводзіць рух да адной з яго форм. Гэтая тэндэнцыя атрымала назву *рэдукцыянізма*. Прынцып рэдукцыянізма быў падвергнуты крытыцы Энгельсам, які і ўвёў у філасофію паняцце руху як любога змянення наогул і сцвярджаў якасную разнастайнасць яго форм. Ён жа прапанаваў і класіфікацыю форм руху, якая, з аднаго боку, грунтавалася, а з другога – адлюстроўвала стан навукі другой паловы XIX ст.: механічную, фізічную, хімічную, біялагічную і сацыяльную. Сучасная навука не адвяргае прапанаванай Энгельсам класіфікацыі, але паглыбляе яе, дазваляе выдзеліць такія формы руху, якія ў XIX ст. былі невядомыя. Прынцып жа класіфікацыі застаецца ранейшы: сувязь з відам матэрыі, спосабам існавання якога з'яўляецца дадзеная форма руху.

## Прасторава-часавая арганізацыя свету

Калі рух з'яўляецца спосабам існавання матэрыі, то формай такога існавання ёсць прастора і час. Уяўленні аб прасторы і часе фарміруюцца ў працэсе практычнага і тэарэтычнага засваення свету. Параўноўваючы розныя прадметы, мы заўважаем, што яны бываюць доўгія і кароткія, шырокія і вузкія, высокія і нізкія, адны знаходзяцца бліжэй, другія далей, зверху альбо знізу і г.д. Гэтыя ўласцівасці характарызуюць працягласць прадметаў, іх узаемнае размяшчэнне і будову. Іх абагульненне і прыводзіць нас да паняцця прасторы. *Прастора – гэта аб'ектыўная ўсеагульная форма быцця матэрыі, якая з'яўляецца ўмовай узнікнення і існавання канкрэтных матэрыяльных сістэм і адлюстроўвае іх працягласць, узаемнае размяшчэнне і структурную арганізацыю.*

Гэтак жа фарміруюцца і ўяўленні аб часе. Мы заўважаем, што адны прадметы існуюць даўно, другія з'явіліся нядаўна, адны папярэднічаюць другім, другія з'яўляюцца пасля першых, працягласць існавання адных большая, другіх меншая і г.д. *Час – гэта аб'ектыўная ўсеагульная форма быцця матэрыі, якая з'яўляецца ўмовай узнікнення і змянення канкрэтных матэрыяльных сістэм і адлюстроўвае працягласць іх існавання, паслядоўнасць змены станаў і структурную арганіацыю.*

У працэсе станаўлення і развіцця ўяўленняў аб прасторава-часавай арганізацыі свету ў філасофіі сфарміраваліся паняцці рэальнага, перцэптуальнага і канцэптуальнага часу і прасторы. Пад рэальнымі прасторай і часам разумелі характарыстыкі аб'ектыўнай рэальнасці. Перцэптуальная прастора і час трактаваліся як формы ўладкавання ўнутранага чалавечага досведу (успрыняццяў, уяўленняў, перажыванняў).

Канцэптуальныя прастора і час – гэта тэарэтычная мадэль рэальнай прасторы і часу.

Гістарычна сфарміраваліся дзве асноўныя канцэпцыі прасторы і часу: *субстанцыяльная і рэляцыйная.* У субстанцыяльнай канцэпцыі прастора і час паўставалі як універсальныя, абсалютныя, незалежныя адна ад аднае формы быцця, якія не аказвалі ніякага ўплыву на матэрыяльны свет і самі не падвяргаліся ўплыву з боку аб'ектыўнага свету. Гэтая канцэпцыя ўзнікае ў філасофіі Дэмакрыта, а сваё прыродазнаўчае абгрунтаванне атрымала ў ньютанаўскай фізіцы і новаеўрапейскай матэрыялістычнай філасофіі. Тут яны набылі статус незалежных ад матэрыі, вечных, нязменных і самастойных ёмістасцей, што ўтрымліваюць у сабе ўсе прадметы.

Рэляцыйная канцэпцыя трактуе прастору і час як уласцівасці саміх матэрыяльных сістэм, як формы адносін паміж прадметамі, з'явамі і працэсамі. Самі па сабе, па-за гэтымі прадметамі яны не існуюць, залежаць адно ад аднаго і ад умоў існавання матэрыяльных сістэм, характарыстыкамі якіх з'яўляюцца. Пачатак гэтай канцэпцыі быў пакладзены ў філасофіі Арыстоцеля, развіты Лейбніцам і абгрунтаваны ў тэорыі адноснасці Эйнштэйна і сучаснай рэлятывісцкай фізіцы. Менавіта тут сфарміравалася ўяўленне аб адзінай *прасторы-часе*, прастора-часавым кантынууме, дзе прастора і час звязаныя паміж сабой і маюць сэнс толькі адносна адно аднаго. Метрычнымі характарыстыкамі прасторы з'яўляюцца трохмернасць, аднароднасць (раўназначнасць усіх напрамкаў) і ізатропнасць (раўназначнасць усіх пунктаў прасторы). Час жа аднамерны, незваротны і анізатропны.

Такім чынам, анталогія як раздзел філасофіі дае ўяўленне аб будове свету як цэласным Універсуме, аб спосабах і формах яго існавання. Яна:

*-фарміруе ўяўленне аб быцці як існаванні існага, што надае свету адзінства і цэласнасць;*

*-прапануе канцэпцыю субстанцыі як асновы свету ў розных філасофскіх інтэрпрэтацыях яе (маністычнай, дуалістычнай і плюралістычнай);*

*-дае навукова абгрунтаваную характарыстыку сістэмна-структурнай, дынамічнай і прасторава-часавай арганізацыі Універсума.*

# ТЭМА 6. ФІЛАСОФІЯ ПРЫРОДЫ

## Прырода як аб'ект філасофскага пазнання

Праблема спасціжэння прыроды стаіць перад чалавекам адвеку. Дыяпазон інтарэсу людзей да прыроды шырокі і разнастайны: ад чыста спажывецкага да маральна-эстэтычнага. Як жа мяняліся погляды людзей на сутнасць прыроды, на спосабы і формы ўзаемадзеяння чалавека і прыроды?

Варта зазначыць, што ў гісторыі філасофіі існавалі і развіваліся тры асноўныя пазіцыі ў гэтым аспекце: *анталагічная*, задача якой заключалася ў доказе існавання прыроды як аб'ектыўнай рэальнасці; *гнасеалагічная* з імкненнем абгрунтаваць неабмежаваныя магчымасці ў пазнанні прыроды чалавекам; *аксіялагічная* – разуменне і тлумачэнне прыроды як каштоўнасці, без якой чалавек не ў стане існаваць і развівацца ў якасці разумнай і гуманнай істоты.

Кожная з гэтых пазіцый дазваляе трактаваць прыроду ў шырокім і вузкім сэнсе слова. *У шырокім сэнсе прырода – гэта ўся разнастайнасць форм быцця, аб'ектыўная рэальнасць, матэрыя, адметнай рысай якой з'яўляецца існаванне па-за свядомасцю і незалежна ад яе.* Розныя аспекты і фрагменты гэтай прыроды выступаюць аб'ектам прыродазнаўчага пазнання.

А ў якой жа якасці прырода цікавіць філасофію? Чаму філасофія ўвогуле звяртае сваю ўвагу на прыроду? Адказ на гэтыя пытанні павінен улічваць спецыфіку філасофіі як навукі. Яе галоўнай праблемай ёсць чалавек, таму прыроду яна разглядае выключна з пазіцый чалавека, яго інтарэсаў і патрэб. *У вузкім сэнсе прырода, як аб'ект філасофскага пазнання, гэта сукупнасць натуральных умоў існавання чалавека і грамадства.* Відавочна, што з пункту гледжання прыродазнаўства такое азначэнне прыроды не зусім правільнае: натуральныя ўмовы існавання чалавека – гэта не ўся прырода, а толькі частка яе: зямная кара, ніжняя частка атмасферы, глеба, гідрасфера, раслінны і жывёльны свет, г.зн. тое, што звычайна называюць геаграфічным асяроддзем. Але менавіта тут ажыццяўляецца ўзаемадзеянне чалавека са знешнім светам і менавіта гэты аспект прыроды і з'яўляецца аб'ектам філасофскага разгляду.

## Сучасныя канкрэтнанавуковыя мадэлі прыроды

Сучаснае прыродазнаўства на падставе прынцыпа ўніверсальнага эвалюцыянізма стварае вобраз прыроды як сістэмнай цэласнасці, што знаходзіцца ў стане самаразвіцця. Абапіраючыся на ідэі сістэмнасці і эвалюцыянізма, сучаснае прыродазнаўства абгрунтоўвае адзіную навуковую карціну свету, у якой аб'ядноўваюцца тры яго асноўныя сферы: нежывая прырода, арганічны свет і сацыяльнае жыццё. Уяўленні аб прыродзе як сістэме, здольнай да самаразвіцця, грунтуюцца на тэорыі нестацыянарнага Сусвету, сінергетыцы і тэорыі біялагічнай эвалюцыі, дапоўненай канцэпцыямі біясферы і ноасферы.

Гістарычна першай канкрэтызацыяй тэорыі нестацыянарнага Сусвету сталася канцэпцыя расшырэння яго, якая дазволіла ўявіць Сусвет як вынік касмічнай эвалюцыі, распачатай 15-20 мільярдаў год назад. У сярэдзіне XX ст. была распрацавана канцэпцыя раздування Сусвету, што дало магчымасць звязаць эвалюцыйныя працэсы ў мега- і мікрасвеце.

Даследаванні апошніх дзесяцігоддзяў мінулага стагоддзя скіраваны на стварэнне несупярэчлівай мадэлі самаарганізацыі Універсума, у якой працэсы, што адбываюцца на розных узроўнях арганізацыі матэрыі, апісваюцца на падставе адзінага падыхода.

Сінергетыка – гэта сучасная тэорыя самаарганізацыі сістэмных утварэнняў. Свет яна разглядае як узаемадзеянне сістэм, што ўключаюць у сябе разнастайныя падсістэмы (атамы, малекулы, клеткі, органы, арганізмы, людзі, супольнасці людзей і інш.), агульнай прыкметай якіх з'яўляецца здольнасць да самаразвіцця. Самаструктураванне, самарэгуляцыя, самааднаўленне разглядаюцца ў сінергетыцы як фундаментальная ўласцівасць свету.

Ужо ў першай чвэрці XX ст. тэорыя біялагічнай эвалюцыі была дапоўнена вучэннем аб эвалюцыі біясферы і ноасферы. Асновы гэтага вучэння былі распрацаваны У.І.Вярнадскім і пакладзены ім у падмурак біягеахіміі. Паводле Вярнадскага, біясфера гэта не проста адна з частак свету, а спецыфічнае геалагічнае цела, структура і функцыі якога вызначаюцца адметнымі ўласцівасцямі Зямлі і космаса. Яна сталася вынікам працяглай эвалюцыі жывога рэчыва ў неразрыўнай сувязі з развіццём неарганічнага свету. Вяршыняй гэтай эвалюцыі з'явілася нараджэнне чалавека. Яго пазнавальная і практычная дзейнасць, заснаваная на розуме, паступова, але няўхільна вядзе да ноасферы як дапаўнення, працягу, новага стану біясферы, дзе разумныя магчымасці чалавека становяцца параўнальныя з геалагічнымі працэсамі ў свеце, а жыццё як эвалюцыйны працэс паўстае складовай часткай касмічнай эвалюцыі.

*Такім чынам, развіццё прыродазнаўчых навук у XIX – XX стст.вяло да станаўлення агульнанавуковай карціны свету як здольнай да самаразвіцця сістэмы. Гэтая карціна свету выступае не толькі як тэарэтычная аснова сучаснага светапогляду, але і як фундаментальная праграма навуковых даследаванняў.*

## Філасофская канцэпцыя прыроды

Вышэй гаворка ішла аб тым, што філасофія звяртае ўвагу на прыроду як сферу існавання чалавека і даследуе яе з пункту гледжання інтарэсаў чалавека. Гэта значыць, што філасофію ў першую чаргу цікавіць пытанне аб характары ўзаемадзеяння чалавека і прыроды. Якія ж формы ўзаемадачыненняў з прыродай выяўляліся на розных этапах гістарычнага развіцця грамадства? Звычайна выдзяляюць тры формы адносін чалавека да знешняга свету. *Практычныя адносіны*, у якіх прырода выступае ў якасці натуральных умоў існавання, сродка стваральнай дзейнасці чалавека, матэрыяла для вытворчасці. Тут пераважае прагматычна-утылітарны інтарэс, а прырода разглядаецца як крыніца спажывання. *У*

*пазнавальных адносінах* галоўнай мэтай з’яўляецца пазнанне прыродных працэсаў, а сама прырода паўстае як аб’ект навуковага даследавання. У гэтых адносінах рэалізуюцца пазнавальныя інтарэсы, але дыктуюцца яны практычнымі патрэбамі людзей і вызначаюцца імі. Сродкам рэалізацыі гэтых адносін з’яўляюцца канкрэтныя прыродазнаўчыя навукі. Нарэшце, *каштоўнасныя адносіны* грунтуюцца на ацэнках прыроды з пазіцый дабра і прыгажосці. Пры гэтым прырода можа разглядацца і як сфера дасканаласці, ідэал гармоніі і ўзор для пераймання, і як сфера нізкага, неразумнага і недасканалага ў параўнанні з культурай.

Узаемадзеянне разнастайных сфер прыроды ажыццяўляецца ў форме абмену рэчывам і энергіяй. Формы гэтага абмену бываюць наступныя:
1)геалагічны абмен уключае ў сябе змены рэльефа і ландшафта, цыркуляцыю вады і атмасферных патокаў, перанос мінаральных рэчываў;
2)біялагічны абмен забяспечвае сінтэз і дэструкцыю арганічных рэчываў;
3)сацыяльны абмен, які ўзнікае з нараджэннем чалавека і грамадства і звязаны з культурастваральнай дзейнасцю людзей. Менавіта на гэтым этапе паўстае праблема ўзаемадзеяння чалавека і прыроды, важнейшым аспектам якой з’яўляецца характар *прыродакарыстання.*

Выдзяляюць два асноўныя тыпы прыродакарыстання. *Спажывецка-міграцыйны* тып прыродакарыстання характэрны для ранніх стадый развіцця грамадства, калі вытворчасць адсутнічае альбо існуе ў прымітыўных пачатковых формах. Задавальненне жыццёва важных патрэб ажыццяўляецца шляхам спажывання і прымітыўнай перапрацоўкі пэўнага прыроднага рэсурса да поўнага яго вычарпання. Тады адбываецца міграцыя і пачынаецца спажыванне новага рэсурса ў новым месцы. Гэта тыпова экстэнсіўны спосаб гаспадарання, пры якім чалавек карыстаецца тым, што дае прырода, а яго залежнасць ад прыроды максімальная. *Стабільна-вытворчы* тып прыродакарыстання характарызуецца не простым спажываннем гатовага прыроднага прадукта, а культывацыяй яго, мэтанакіраваным пераўтварэннем і штучным аднаўленнем у працэсе вытворчасці.

З развіццём сродкаў вытворчасці мяняецца і характар уздзеяння чалавека на прыроду. На *першым, архаічным,* этапе пераважнай формай жыццядзейнасці з’яўляецца прыстасаванне чалавека да знешняга асяроддзя. Гэты этап ахоплівае гістарычную эпоху ад узнікнення чалавека да неаліта. Для яго характэрныя такія віды дзейнасці, як паляванне, рыбалоўства, збіральніцтва, г.зн. прысваенне і спажыванне гатовага прыроднага прадукта. Прырода тут адухаўляецца і ачалавечваецца, а сам чалавек не выдзяляе і не аддзяляе сябе ад прыроды.

*Дапрамысловы альбо традыцыйны перыяд* працягваўся ад эпохі неаліта да сярэдневякоўя ўключна. Ён пачынаецца з “неалітычнай (земляробчай) рэвалюцыі”, якая нарадзіла жывёлагадоўлю і земляробства – першыя формы ўласна гаспадарчай дзейнасці з выразным вытворчым

характарам. Яму ўласцівы: экстэнсіўны характар і параўнаўча маруднае развіццё асноўных відаў і форм дзейнасці, выкарыстанне ў якасці крыніц энергіі мускульнай сілы чалавека і жывёлы, вады і ветру. Спосабы дзейнасці і яе вынікі не аказвалі значнага ўздзеяння на прыроду, не супярэчылі прынцыпам яе існавання і не парушалі адзінства і цэласнасці прыроднага асяроддзя.

*Індустрыяльны (прамысловы) перыяд* пачаўся ў канцы XVI ст. і працягваўся да сярэдзіны XX ст. Уздзеянне чалавека на прыроду набывае тэхнічны характар і памеры, разбуральныя для навакольнага асяроддзя. Гэты этап характарызуецца:
-інтэнсіфікацыяй гаспадарчай дзейнасці, уключэннем у гаспадарчы зварот усё большай колькасці прыродных рэсурсаў;
-урбанізацыяй грамадства;
-асваеннем энергіі пара, электрычнасці і ядзернага сінтэза;
-узнікненнем новых сродкаў сувязі і транспарта;
-выхадам чалавека ў космас;
-развіццём інфарматыкі і вылічальнай тэхнікі. Узаемадзеянне чалавека і прыроды на гэтым этапе набывае характар супрацьстаяння і панавання, што сталася асноўнай прычынай экалагічнай праблемы.

На апошнім, *тэхналагічным этапе,* пачатак якому пакладзены разгортваннем сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, адбываецца вельмі маруднае і цяжкае ўсведамленне таго, што прагматычна-утылітарныя адносіны да прыроды не толькі абмежаваныя, але і небяспечныя, і што дзеля выжывання чалавек павінен знайсці новыя, нетрадыцыйныя стратэгіі прыродакарыстання. Усё шырэй распаўсюджваецца разуменне прыроды не толькі як матэрыяльнага асяроддзя, а найперш як існасці, надзеленай духоўнымі якасцямі, як носьбіта прынцыпаў жыццядзейнасці ўсяго жывога і разумнага. Пры гэтым жывое не зводзіцца да аднаго толькі чалавека, а чалавек не супрацьпастаўляецца ўсяму свету як яго валадар. У тэарэтычных мадэлях прыроды і ў практыцы ўзаемадачыненняў з ёю ўсё большую папулярнасць набывае ідэя каэвалюцыі – збліжэння дзвюх узаемазвязаных эвалюцыянуючых сістэм, змены ў адной з якіх інспіруюць змены ў другой і пры гэтым не вядуць да непажаданых, а тым больш непрыймальных для першай сістэмы наступстваў. Прынцып каэвалюцыі адвяргае панаванне чалавека над прыродай, патрабуе ўзгодненасці ў адносінах паміж імі і неабходнасці дыялога з ёю, падкрэслівае адказнасць чалавека за тое, што адбываецца ў навакольным свеце.

Такім чынам:
*1)у спецыфічна філасофскім разуменні прырода – гэта натуральная перадумова існавання чалавека і грамадства, сфера яго жыццядзейнасці;*
*2)спосабы узаемадзеяння чалавека і прыроды залежаць ад узроўню развіцця сродкаў дзейнасці, носяць канкрэтна-гістарычны характар і праяўляюцца ў тыпах прыродакарыстання;*

*3)узаемадзеянне чалавека і прыроды уключае ў сябе як уплыў прыроды на чалавека, так і ўздзеянне чалавека на прыроду.Гэтае ўздзеянне з ростам тэхніка-тэхналагічнай магутнасці набывае памеры геалагічнай сілы і нараджае экалагічную праблему як праблему будучага ўсяго чалавецтва;*
*4)сучасны этап характарызуецца пошукам новых стратэгій узаемадзеяння з прыродай, схемы якіх прадстаўлены ў канцэпцыях каэвалюцыі, экалагізма, біяцэнтрызма і ўніверсальнай этыкі.*

## ТЭМА 7. ЧАЛАВЕК ЯК ФУНДАМЕНТАЛЬНАЯ ПРАБЛЕМА ФІЛАСОФІІ

### Эвалюцыя філасофскіх уяўленняў пра чалавека

Праблема сутнасці і быцця чалавека – адна з “вечных” праблем філасофіі. Цікавасць да яе, вострая заўжды, асабліва абвастраецца ў крытычныя, пераломныя перыяды гісторыі. У такую адказную пару жыцця, як наша, калі патрабуюцца хуткія і індывідуальна адказныя рашэнні і ўчынкі, чалавек менш за ўсё давярае незалежным ад яго аб’ектыўным фактарам і сілам, нават калі ён і верыць у іх існаванне. Усё часцей ён звяртаецца да самога сябе, да сваіх “уласна чалавечых” сіл і магчымасцей і адначасова пытаецца, а што гэта такое “ўласна чалавечае”, якая ўвогуле прырода чалавека, у чым яго прызначэнне? І ў гэтых умовах спадзявацца на стыхійнае і натуральнае вырашэнне праблемы чалавека было б неразумна. Патрэбны радыкальныя змены ці не ва ўсіх сферах жыццядзейнасці, неабходна па-новаму асэнсаваць змест і межы свабоды, усвядоміць далягляды новай маралі, а найперш – адмовіцца ад стыхійнасці, якая дагэтуль панавала ў людскім асяроддзі.

Ці можа чалавек стварыць такую мараль, ці здольны ён да тварэння новай духоўнасці? Ці знойдзе ён у сабе сілы і розум, каб прыняць новы вобраз свабоды – гэтай найвялікшай каштоўнасці? Вось чаму думка аб тым, што XXI ст. альбо будзе векам гуманітарным, альбо яго не будзе наогул, гэта не прыгожы афарызм, а вобразнае адлюстраванне тых працэсаў і тэндэнцый, якія маюць месца ў сучасным жыцці чалавецтва. *Комплекснае даследаванне чалавека і распрацоўка на гэтай аснове мадэлі чалавека будучага – можа адна з самых практычных задач навукі.* Практычных, бо яе вырашэнне патрабуе ўзважлівых і глыбока прадуманых адказаў на пытанні:
-ці з’яўляюцца сучасныя палітычныя і эканамічныя інстытуты грамадства неабходнымі стварэннямі і ці адпавядаюць яны чалавечай прыродзе?
-ці з’яўляюцца войны пастаяннным фактарам жыцця людзей, ці сведчыць гэта аб тым, што яны непазбежныя?

-ці караніцца імкненне да асабістай выгоды так глыбока ў прыродзе чалавека, што ўсе спробы пабудаваць грамадства на аснове іншай, чым канкурэнцыя, непазбежна церпяць крах?
-што вызначае паводзіны чалавека – спадчыннасць ці асяроддзе, стыхія ці свядомасць?
-ці паддаецца зменам прырода чалавека шляхам свядомых і мэтанакіраваных намаганняў звонку? У гэтых пытаннях ва ўсёй складанасці адлюстравана і актуальнасць праблемы чалавека ў філасофі, і яе практычная арыентацыя. Зразумела, што гэтыя пытанні цікавяць не толькі філасофію і, можа, найменш філасофію. Яе задача іншая: *праблема сэнсу жыцця, ідэалаў і каштоўнасцей чалавека.*.Праўда, праблемы гэтыя вырашаліся па-рознаму на розных этапах гістарычнага развіцця філасофіі.

Усе філасофскія канцэпцыі чалавека можна падзяліць на дзве часткі: *аб'ектывісцкія і суб'ектывісцкія.* У канцэпцыях першай часткі чалавек, спосаб яго існавання і жыццёвае прызначэнне абумоўлены знешнім светам і пазнаюцца праз яго. Інакш кажучы, аб'ектывісты ідуць ад свету да чалавека, пры гэтым чалавек разглядаецца як істота, залежная ад аб'ектыўных сфер космаса, касмічнай разумнасці, боскай волі, гістарычнай неабходнасці.

У тэорыях другой часткі чалавек паўстае як істота аўтаномная, а яго спасціжэнне – гэта найперш самаспасціжэнне, якое адначасова ёсць і перадумовай спасціжэння свету. Шлях тут супрацьлеглы: ад чалавека да свету ў імя чалавека. Да аб'ектывістаў належалі Дэмакрыт, Платон, Фама Аквінскі, французскія асветнікі-матэрыялісты, Гегель, Маркс. Да суб'ектывістаў адносяцца сафісты, Эпікур, Берклі, Кант, экзістэнцыялісты, персаналісты.

Першапачатковыя ўяўленні пра чалавека складваюцца значна раней, чым нараджаюцца рэлігія, а тым больш філасофія. Старажытная міфалогія не расчляняе свет: прырода, чалавек і бог у міфалагічнай свядомасці злітныя. У гэтай свядомасці чалавек не разглядаецца самастойнай істотай, чалавек і космас тут адзіны. Пытанне аб паходжанн6і свету ёсць адначасова і пытаннем аб паходжанні чалавека. Космас – гэта правобраз, чалавек жа – недасканалае адлюстраванне яго. Што ёсць у космасе, тое ёсць і ў чалавеку, а чалавечае прысутнічае ў космасе. У міфалагічнай свядомасці космас чалавечны, чалавек касмічны. Паміж космасам і чалавекам няма раздзелу, сувязі паміж імі прамыя і непасрэдныя. Чалавек гэта "*мікракосм",* свет жа – *"макракосм".*

Тэацэнтрычная сярэдневяковая філасофія парушае гэтае адзінства, злучнасць чалавека з космасам ліквідуецца, як ліквідуецца і характэрная для міфа і нават для антычнай філасофіі безасабовасць. Чалавек – тварэнне Бога, адлюстраванне яго абсалютнай асобы, таму ён таксама нясе ў сабе асабовае. Дзякуючы гэтаму ён не частка космасу, а самакаштоўная індывідуальнасць, супрацьпастаўленая космасу. Яго цэласнасць ёсць

толькі непазбежнасцю, якая мусіць быць дапоўнена духоўнасцю і падпарадкавана ёй. Гармонія духа і цела тут асіметрычная ў нераўнапраўнасці аднаго і другога: цела дадзена толькі для жыцця духа, а сам дух – дзеля спасціжэння Бога. Таму задача чалавека – культываваць розум і ўдасканальваць сэрца: з дапамогай аднаго дасягаецца разуменне Бога, праз другое – любоў да яго. Але ж розум і пачуцці разам робяць чалавека ўнікальнай непаўторнасцю, асобай. Агульны можа быць грэх, ачышчэнне ж ад яго праз разуменне Бога і любоў да яго можа быць толькі персанальным. Чалавек ва ўсёй непаўторнасці характэрных для яго псіхафізіялагічных рысаў ёсць вечная і бясспрэчная каштоўнасць. Хрысціянства сталася той глебай, на якой вырасла еўрапейская персаналісцкая традыцыя. Далейшае развіццё філасофіі было толькі пацвярджэннем, развіццём, абаронай гэтай традыцыі.

Гэтая традыцыя выразна праяўляецца ў рэнесанснай канцэпцыі чалавека як "творчага генія", які стварае сябе і свет свайго існавання. Яна прасвечваецца ў новаеўрапейскіх рацыяналістычных канцэпцыях чалавека як разумнай істоты, якая, дзякуючы сваёй разумнасці, дасягае рацыянальнага панавання над светам, творыць дабро і імкнецца да шчасця. На гэтай традыцыі заснавана і кантаўская ідэя актыўнасці чалавека, уключанага як у прыродную неабходнасць, так і ў сферу маральнай свабоды і абсалютных каштоўнасцей. Гэтая традыцыя працягваецца і ў сацыяцэнтрычных канцэпцыях, якія падкрэсліваюць сацыяльную існасць чалавека. Напрыклад, марксізм разглядае чалавека як гістарычна зменлівую творча-актыўную істоту, якая ў працэсе практычнага пераўтварэння прыроды стварае ўмовы свайго існавання – соцыум.

Філасофія ХХ ст. імкнецца не да спасціжэння быцця самога па сабе, не законаў яго існавання. Яна звяртаецца да сферы чалавечай суб'ектыўнасці і праз усведамленне асноў свабоднай і творчай дзейнасці чалавека, яго сапраўднага быцця, сцвярджае значэння быцця ўсякага іншага. Сутнасць жа свабоды чалавека гэтая філасофія бачыць у тым, што чалавек як унікальная індывідуальнасць, злучаная са светам, паўстае не як рэч, якую фармуе прыроднае ці сацыяльнае асяроддзе, а як істота, што выбірае самога сябе, стварае сябе кожным сваім учынкам як рэалізацыю свайго ўласнага праекта. Менавіта таму свабодны чалавек нясе адказнасць за зробленае ім, а не апраўдвае свае дзеянні абставінамі. *Экзістэнцыяльна-фенаменалагічны падыход,* прадстаўлены ў посткласічнай філасофіі экзістэнцыялізмам, персаналізмам і фенаменалізмам, падкрэслівае непаўторнасць, унікальнасць быцця чалавека, якое набывае сэнс толькі ў сферы свабоды.

*Натуралістычны падыход*, уласцівы фрэйдызму, неафрэйдызму і інш., акцэнтуе ўвагу на аб'ектыўных і безасабовых асновах чалавека – сферы неўсвядомленага, бессвядомага, біялагічнай структуры, што робіць

чалавека непаўнавартасным, а гэтая непаўнавартаснасць кампенсуецца дзейнасцю.

*Сацыялагізатарскі падыход* патрабуе ставіцца да чалавека як сукупнасці грамадскіх адносін, якія ствараюць яго і абумоўліваюць яго існасць (марксізм), альбо выводзіць чалавека з базісных мадэляў культуры (структуралізм), што дэтэрмінуе паводзіны, мысленне і дзейнасць чалавека.

## Біясацыяльная прырода чалавека

Пытанне аб паходжанні чалавека – гэта пачатак усіх разважанняў аб яго прыродзе. У вырашэнні гэтага пытання можна выдзяліць некалькі асноўных падыходаў. *Крэацыянізм* разглядае чалавека як тварэнне Бога, якое з'яўляецца недасканалым адлюстраваннем уседасканалай асобы Бога.

*Уфалагічны* падыход адстойвае ідэю незямнога, касмічнага паходжання чалавека і заснаваны на цяжкасцях і загадках, з якімі сутыкаецца навука ў вырашэнні праблемы антрапасацыягенеза.

*Натуральна-эвалюцыйны* падыход трактуе паходжанне чалавека як аб'ектыўна-заканамерны вынік прыроднай і сацыяльнай эвалюцыі.

Схематычна навуковыя ўяўленні аб анрапасацыягенезе выглядаюць наступным чынам. Прыкладна 3,5 – 5,5 млн. год назад прыродна-кліматычныя перамены на Зямлі (геамагнітныя інверсіі, змены тэмпературнага рэжыму планеты, змяненне флоры і фаўны) прывялі да фарміравання гамінід з антрапаморфнымі ўласцівасцямі (прамахаджэнне, адметная будова рук і складаная арганізацыя мозга). Яны разам і складалі прыродна-біялагічныя перадумовы фарміравання чалавека. Гэтыя фактары дапаўняліся зачаткамі сацыяльных умоў: эвалюцыяй і рэгуляваннем сямейна-шлюбных адносін, табу, мовай, што вяло да развіцця працоўнай дзейнасці, фарміравання сацыяльных праграм паводзін і ўзнікнення культуры. Працэс гэты выглядае так: 3,5 – 5,5 млн. год – гамініды, аўстралапітэкавыя; 0,5 млн. год – архантрапы (пітэкантрапы і сінантрапы); 50 – 40 тыс. год назад з'явіліся неандэртальцы; 45 – 15 тыс. год краманьёнцы як пачынальнікі сучаснага тыпу чалавека. На гэтым біялагічная эвалюцыя завяршылася, чалавек уступіў у паласу сацыяльнай эвалюцыі.

Адна з галоўных праблем прыроды чалавека гэта праблема душы і цела, іх узаемаадносін. Быццё асобнага чалавека ёсць непасрэдна дадзенае адзінства цела і духа. Чалавек з гэтай пазіцыі ёсць комплекснай матэрыяльна-духоўнай, аб'ектыўна-суб'ектыўнай рэальнасцю. Пры гэтым духоўнае і суб'ектыўнае значыць не меней, чым матэрыяльнае і аб'ектыўнае. Філасофскія пошукі чалавека гэта, найперш, пошукі сувязі паміж целам і духам, целам і думкамі, перажываннямі, воляй – тым што традыцыйная філасофія і тэалогія называла душой, а сучасная навука

азначае як псіхіку. Праблема душы і цела – гэта вядомая псіхафізіялагічная праблема, якая на розных этапах гісторыі чалавецтва вырашалася анімістычнымі, рэлігійнымі, філасофскімі сродкамі. У другой палове XIX ст. яна выдзелілася з філасофіі і стала асновай асобнай навукі – псіхалогіі. У філасофіі ж яна праяўлялася як праблема ідэальнага, як пытанне аб узаемасувязі біялагічнага і сацыяльнага ў чалавеку.

Чалавека можна разглядаць як біялагічную істоту. У гэтай сваёй якасці ён з'яўляецца арганізмам, часткай прыроды. Чалавека можна разглядаць і сацыяльна, тады ён паўстае як асоба. У рэальным жыцці рэальнага чалавека аддзяліць адно ад аднаго немагчыма. Біялагічнае ў чалавеку – гэта сукупнасць цялесных уласцівасцей, якія развіліся ад жывёльных продкаў і змяняліся пад уздзеяннем сацыяльных фактараў. Біялагічныя асаблівасці з'яўляюцца неабходнай умовай існавання чалавека і ствараюць прыродныя падставы для фармавання асобы. Яны, такім чынам, выступаюць асновай сацыяльнага бытавання чалавека.

Сацыяльнае – гэта ўсё тое, што чалавек набывае ў працэсе антрапасацыягенеза, што ўзнікае ў антагенезе ў выніку зносін з іншымі людзьмі. З гэтага пункту гледжання чалавек – гэта сацыяльна дэтэрмінаваная і сацыяльна інтэграваная жывая сістэма, біялагічныя асаблівасці якой кантралююцца сацыяльнымі якасцямі. Найбольш выразнай праявай сацыяльнасці чалавека з'яўляецца яго інтэнцыянальнасць, звязаная з жаданнямі, інтарэсамі, схільнасцямі, ідэаламі, нормамі, ацэнкамі, перакананнямі, светапоглядам. Паводзіны чалавека дэтэрмінаваны не прыроднымі законамі, а спецыфічна чалавечымі матывамі і ацэнкамі і ажыццяўляюцца паводле мэты як каштоўнасна арыентаванай інтэнцыянальнасці.

Чалавек, такім чынам, гэта біясацыяльная істота, існаванне якой падпарадкавана дзвюм праграмам: біялагічнай і сацыяльна-культурнай.

## Аксіялагічная ацэнка быцця чалавека

Змяненні неадушаўлёных прадметаў і дзеянні біялагічных сітэм абумоўлены прыроднымі законамі, паводзіны ж людзей вызначаюцца правіламі і нормамі, якія залежаць ад каштоўнасцей. Пры гэтым правілы канстытуіруюць парадак дзеянняў і спрыяюць дасягненню мэты, а нормы надаюць гэтым дзеянням маральнае значэнне і сацыяльную значнасць. Яны далучаюць чалавека да іншых людзей, інтэгруюць яго ў грамадства, робяць сацыяльнай істотай. Менавіта ва ўзаемадачыненнях з іншымі людзьмі ў грамадстве фарміруецца сістэма каштоўнасцей, якая вызначае паводзіны чалавека, абумоўлівае тыя перавагі, што праяўляюцца ў адносінах яго да іншых людзей, свету і самога сябе. Сістэма гэтых каштоўнасцей, а, значыць, і ацэнка прыроды чалавека розныя на розных гістарычных этапах існавання чалавецтва. Творчая індывідуальнасць,

разумнасць, самадзейнасць, свабода разглядаліся ў класічнай філасофіі як фундаментальныя характарыстыкі чалавека. У аснове гэтых ацэнак ляжыць гуманізм як прызнанне самакаштоўнасці чалавека і яго здольнасці да самаразвіцця і самаўдасканалення на падставе розуму і ў адпаведнасці з яго прынцыпамі.

Відавочна, што агульнай прыкметай для гэтых каштоўнасцей з'яўляецца духоўнасць, у якой і ўвасабляецца ўласна чалавечая прырода. Бо адчуванні ўласцівы і для жывёл, здольнасць жа да эстэтычнага перажывання характэрна толькі чалавеку. У любым жывёльным статку існуе пэўная сістэма правіл, якія рэгулююць узаемаадносіны супольнасці, але правілы гэтыя заснаваны на інстынктах і носяць выключна біялагічны характар. І толькі чалавек арганізуе сваё жыццё на падставе маральных норм у адпаведнасці з прынцыпамі дабра і зла, справядлівасці і несправядлівасці, адказнасці і абавязку. Толькі чалавеку вядомы матывы і ацэнкі, толькі чалавек усведамляе факт свайго існавання і толькі яму дадзена такая здольнасць, як рэфлексія – усведамленне і асэнсаванне ўласных форм і спосабаў існавання. *Чалавек – гэта дух, які аб'ядноўвае розум і пачуцці, сумленне і адказнасць, маральныя нормы і эстэтычныя каштоўнасці.*

Духоўнасць ёсць той асновай, на якой і дзякуючы якой паўстае пытанне аб сэнсе жыцця. Чалавек не задавальняецца самім фактам свайго існавання, ён ставіць перад сабой пытанне: *дзеля чаго жыць?* Гэтае пытанне – не выдумка паэтаў і філосафаў. Спасылаючыся на Альбера Камю, можна сцвярджаць, што для філасофіі, і для чалавека, існуе толькі адно фундаментальнае пытанне: вартае ці невартае жыццё таго, каб яго пражыць. Усе іншыя пытанні другасныя і маюць сэнс толькі тады, калі знойдзены сэнс жыцця. Пытанне аб тым, што надае жыццю сэнс, не мае адназначнага, а тым больш адзінага адказу. Гэта пытанне нават не індывідуальнае, а інтымнае, і кожны мусіць адказаць на яго сам і толькі сам, і адказаць усім сваім жыццём. Адносна сэнса жыцця, як і адносна жыццёвых мэтаў і каштоўнасцей, мы можам сцвярджаць, што яны ёсць, могуць быць альбо не, але мы не можам, не маем права навязваць гэтыя каштоўнасці іншым людзям. Сэнс жыцця не прыўносіцца кімсьці звонку, ён заўжды ёсць вынікам свабоднага і свядомага асабовага выбару, здольнасці і гатоўнасці адказваць перад сваім сумленнем і іншымі людзьмі за гэты выбар. А гэта і ёсць прыкметы *асобы*, якія характарызуюць чалавека ў якасьці сацыяльнай істоты і выражаюць яго здольнасць да асэнсаваных, свядомых, адказных і сацыяльна значных дзеянняў.

Падсумуем сказанае.

*1)чалавек ёсць вынікам працяглай у часе эвалюцыі прыроды, абумоўленай як прыродна-біялагічнымі, так і сацыяльнымі фактарамі;*

*2)па сваёй прыродзе чалавек ёсць біясацыяльнай істотай, існаванне якой абумоўлена дзвюма праграмамі: біялагічнай і сацыяльнай;*

*3)сацыяльная сутнасць чалавека праяўляецца ў асобе як сукупнасці сацыяльна значных уласцівасцей, якія надаюць чалавеку здольнасць да свядомага і асэнсаванага выбару форм жыццядзейнасці і гатоўнасць да адказнасці за вынікі гэтага выбару;*
*4)вышэйшай праявай чалавечнасці чалавека з'яўляецца яго духоўнасць, звязаная не толькі з розумам і пачуццямі, але і з маральнай адказнасцю, свабодай, каштоўнасцямі, матывамі, ацэнкамі і мэтамі;*
*5)інтэгральнай характарыстыкай быцця чалавека з'яўляецца сэнс жыцця.*

## ТЭМА 8. ПРАБЛЕМА СВЯДОМАСЦІ Ў ФІЛАСОФІІ

### **Праблема свядомасці і спосабы яе вырашэння ў гісторыі філасофіі**

Свядомасць – адна з фундаментальных філасофскіх катэгорый, якая прайшла доўгі і складаны шлях фарміравання ад першых анімалістычных уяўленняў да сучасных навуковых канцэпцый. Свядомасць з'яўляецца асновай духоўнасці чалавека, выражае яго здольнасць да пазнання, выступае сродкам рэгуляцыі міжчалавечых адносін, абмену вопытам і перадачы яго ад пакалення да пакалення. Свядомасць аб'ядноўвае творчыя магчымасці чалавека, забяспечвае каштоўнасныя арыентацыі і з'яўляецца сродкам камунікацыі і ўмовай рацыянальных паводзін чалавека, што адрознівае яго ад усіх іншых жывых істот. *Свядомасць – гэта вышэйшая, уласцівая толькі чалавеку і звязаная з мовай функцыя мозга, якая забяспечвае пазнанне і асэнсаванне свету і рэгуляцыю жыццядзейнасці чалавека.*

У змесце паняцця свядомасці можна выдзяліць тры асноўныя аспекты: 1)кагнітыўны, які ўказвае на свядомасць як сродак пазнання, арганізацыі практычнай дзейнасці, рэгуляцыі і ацэнкі узаемаадносін паміж людзьмі, камунікацыі і перадачы вопыта. Гэты аспект раскрывае інструментальна-функцыянальны бок свядомасці; 2)фенаменалагічны аспект адлюстроўвае адметнасці структуры свядомасці, каардынацыі і субардынацыі разнастайных ідэальных з'яў (феноменаў), працэсаў і станаў свядомасці; 3)інтэнцыянальны аспект характарызуе скіраванасць свядомасці на пэўны аб'ект і выражае мэтазгоднасць яе і сувязь свядомасці з умовамі, сродкамі і формамі адлюстравання.

У гісторыка-філасофскім працэсе сфарміраваліся і на розных яго этапах абумоўлівалі разуменне свядомасці некалькі падыходаў. Гістарычна першым быў *субстанцыянальны* падыход. Вытокі яго знаходзім ужо ў Платона і Арыстоцеля, якія разглядалі свядомасць у якасці самастойнага духоўнага свету чалавека. Найбольш поўна гэты падыход рэалізаваны ў новаеўрапейскай філасофіі, дзе свядомасць разглядаецца як субстанцыяльны элемент быцця (Дэкарт), адмежаваная ад свету,

самадастатковая суб’ектыўнасць як прынцып быцця (Лейбніц). Субстанцыянальны падыход арыентаваў філасофію на выяўленне і асэнсаванне разнастайных “пазнавальных здольнасцей” і спрыяў вывучэнню структуры свядомасці.

*Натуралістычна-функцыянальны* падыход сфарміраваўся ў працах матэрыялістаў-метафізікаў XVIII ст. як вынік асэнсавання дасягненняў фізіялогіі і медыцыны. Прыхільнікі гэтага падыходу (Ламетры, Гальбах) пад свядомасцю разумелі спецыфічную функцыю мозга, якая ўвасабляецца ў пазнанні і самапазнанні. У межах гэтага падыходу распрацоўвалася псіхафізіялагічная абумоўленасць свядомасці, залежнасць свядомасці ад цялеснай арганізацыі чалавека і знешняга асяроддзя. Крайняй формай натуралістычна-функцыянальнага падыходу стаўся “вульгарны матэрыялізм” XIX ст. (Фохт, Бюхнер, Молешот), які мысленне і яго вынік – думку лічыў матэрыяльнымі. Даследаванні прыхільнікаў гэтага падыходу спрыялі выяўленню сувязі, а таксама форм і спосабаў узаемадзеяння свядомасці і псіхафізіялагічных працэсаў, але не ўлічвалі сацыякультурныя ўмовы ўзнікнення і функцыянавання свядомасці.

*Сацыякультурны* падыход першапачаткова распрацаваны ў нямецкай класічнай філасофіі, дзе свядомасць разглядаецца як абумоўленая ўніверсаліямі культуры індывідуальная здольнасць мыслення, уяўлення, волі (Кант), альбо як дух, абумоўлены гістарычнымі формамі грамадскага жыцця (Гегель). Яшчэ адзін варыянт гэтага падыхода распрацаваны ў марксісцкай філасофіі. Маркс і Энгельс адмаўлялі субстанцыяльны характар свядомасці і разглядалі яе як функцыю мозга, што ўзнікае і развіваецца пад уздзеяннем сацыякультурных фактараў у працэсе практычна-прадметнай дзейнасці людзей.

Постакласічная філасофія прапануе розныя праграмы даследавання свядомасці, зададзеныя галоўным чынам экзістэнцыяльна-фенаменалагічнай і псіхааналітчычнай традыцыяй. У межах першай традыцыі ўзнікае *інтэнцыяналісцкая* праграма даследавання свядомасці. Прыхільнікі гэтай праграмы адмаўляюцца ад традыцыйнага “суб’ект-аб’ектнага” тлумачэння свядомасці і звяртаюцца да аналізу інтэнцыянальнасці як скіраванасці свядомасці на аб’ект (прадмет, з’яву, працэс) і спосабаў дадзенасці яго праз акты і аперацыі. Інакш кажучы, інтэнцыянальная праграма скіравана не на тлумачэнне існасці свядомасці, а на выяўленне ўмоў і магчымасцей ажыццяўлення свядомых працэсаў.

Псіхааналітычная традыцыя стварае *кандыцыяналісцкую* праграму (conditio – умова), якая арыентуецца на выяўленне прыхаваных фактараў цялеснай і псіхічнай арганізацыі чалавека, а таксама сацыяльнага асяроддзя і культуры, якія абумоўліваюць паводзіны чалавека і ўплываюць на яго свядомасць, хоць і не прысутнічаюць у ёй (у Фрэйда, Юнга, Фрома – персанальнае і калектыўнае неўсвядомленае ).

У структуралізме (Фуко) і філасофскай герменеўтыцы (Гадамер) праблема існавання свядомасці вырашаецца на падставе аналіза структур мовы, механізмаў прадукавання і трансляцыі безадрасных паведамленняў па каналах камунікацыі.

На падставе ўсяго сказанага можна выдзяліць тры асноўныя стратэгіі філасофскага даследавання свядомасці: па-першае, вывучэнне паходжання, структуры і функцый свядомасці, па-другое, выяўленне сацыякультурнай абумоўленасці свядомасці і сувязі яе са знакавымі сістэмамі, па-трэцяе, пошук "субстрата" свядомасці і шляхоў і сродкаў яе штучных мадыфікацый.

## Паходжанне свядомасці, яе структура і функцыі

Праблема генезіса свядомасці сістэматычна распрацоўвалася ў межах сацыякультурнага падыходу, а найперш – у марксісцкай філасофіі. Тут свядомасць разглядаецца як вынік гістарычнай эвалюцыі ўласцівасці, характэрнай для ўсёй матэрыі, – адлюстравання (отражения). *Адлюстраванне – гэта здольнасць адной матэрыяльнай сістэмы ў працэсе ўзаемадзеяння аднаўляць унутры сябе некаторыя ўласцівасці другой матэрыяльнай сістэмы і пры гэтым захоўваць сваю цэласнасць.* Адлюстраванне ўласціва ўсёй матэрыі і праяўляецца ў разнастайных формах, якія залежаць ад узроўню структурнай арганізацыі яе. У працэсе развіцця на аснове фізіка-хімічных працэсаў, характэрных для неарганічнага свету, узнікаюць біялагічныя формы адлюстравання: *раздражняльнасць, адчувальнасць і псіхіка..* На ўзроўні псіхікі, уласцівай вышэйшым жывым арганізмам, пад уздзеяннем разнастайных фактараў як прыродна-біялагічнага, так і, галоўным чынам, сацыяльнага кшталту сфарміравалася свядомасць як вышэйшая форма псіхічнага адлюстравання свету ў ідэальных вобразах. Сярод біялагічных фактараў, якія аказалі найбольш значны ўплыў на фарміраванне свядомасці, неабходна адзначыць прамахаджэнне, спецыфічную будову рук, гартані, складаны мозг, адсутнасць жорсткіх механізмаў інстынктаў. Найбольш значнымі сацыяльнымі фактарамі былі: прадметна-практычная дзейнасць на падставе сістэматычнага стварэння і прымянення прылад працы, калектыўны лад жыцця, узнікненне і развіццё мовы як сродка камунікацыі і перадачы вопыта, фарміраванне культуры як сферы спецыфічна чалавечай жыццядзейнасці.

Развіццё псіхалогіі, фізіялогіі вышэйшай нервовай дзейнасці, медыцыны дазволіла выявіць найбольш істотныя структурныя элементы свядомасці: *інтэлект, эмоцыі, волю, увагу, памяць.* Пад інтэлектам разумеюць здольнасць да мыслення і пазнання на падставе паняццяў. Важную ролю ў структуры свядомасці выконваюць эмоцыі. Эмацыянальныя працэсы адлюстроўваюць унутраны стан чалавека, яго

адносіны да знешняга свету, іншых людзей і самога сябе. Прырода эмоцый дзвюхзначная: яны адначасова выступаюць і як пазнавальна-інфармацыйны сродак, і як інструмент ацэнкі. Воля забяспечвае рэгуляцыю чалавечай жыццядзейнасці і пераадоленне перашкод на шляху дасягнення мэтаў. Воля надае чалавеку здольнасць і гатоўнасць дзейнічаць, нараджае настойлівасць у дасягненні мэты. Памяць як фактар свядомасці дазваляе чалавеку захоўваць і аднаўляць свой жыццёвы вопыт, звязваць сябе са сваімі папярэднікамі, уключацца ў культуратворчы працэс. Але памяць нельга інтэрпрэтаваць як звернутасць да мінулага. Памяць – гэта сродак аднаўлення мінулага ў сучаснасці і прагназаванне на гэтай падставе будучага. Памяць надае свядомасці адзінства і цэласнасць.

Развіццё навукі ў XX ст. дазволіла выявіць у духоўным жыцці чалавека шырокую сферу неўсвядомленага, куды не пранікае свет розуму. Гэтая сфера неўсвядомленых і неасэнсаваных перажыванняў шмат у чым вызначае дзейнасць свядомасці і ўплывае на паводзіны чалавека. Гэта азначае, што свядомасць не зводзіцца толькі да мыслення і пазнання, а ўключае ў сябе шматлікія і разнастайныя формы і элементы псіхічнага жыцця чалавека.

У гэтым шырокім сваім значэнні свядомасць выконвае цэлы шэраг функцый, якія маюць важнае значэнне ў жыццядзейнасці чалавека. *Пазнавальная функцыя* праяўляецца ў здольнасці чалавека здабываць, назапашваць і захоўваць веды пра свет і пра сябе самога. *Мэтавая функцыя* адлюстроўвае здольнасць свядомасці фармуляваць мэты і распрацоўваць планы дзейнасці чалавека ў прыродным і сацыяльным асяроддзі. *Рэгулятыўная функцыя* дазваляе рэгуляваць і кантраляваць разнастайныя адносіны паміж людзьмі, а таксама паміж людзьмі і знешнім светам. *Крэатыўная функцыя* адлюстроўвае здольнасць свядомасці чалавека вызначаць каштоўнасці і каштоўнасныя арыентацыі існавання і творча пераўтвараць умовы свайго быцця.

## Сацыякультурная прырода свядомасці

Носьбітам свядомасці з'яўляецца асобны чалавек. Але фарміруецца гэтая індывідуальная здольнасць толькі ў грамадстве, у складанай сістэме сацыяльных адносін паміж людзьмі ў працэсе іх жыццядзейнасці. Прырода ў працэсе эвалюцыі стварае толькі біялагічныя перадумовы свядомасці, але гэтыя перадумовы рэалізуюцца толькі ў грамадстве.

Сацыякультурная прырода свядомасці можа быць абгрунтавана з пункту гледжання *генетычнага*. Біялагічная эвалюцыя стварае перадумовы перахода да працы як прадметна-практычнай дзейнасці, заснаванай на стварэнні і сістэматычным прымяненні прылад працы. Але праца – гэта перадусім працэс адносін паміж людзьмі, складаная сістэма ўзаемадачыненняў, звязаных са стварэннем і прымяненнем сродкаў

дзейнасці, рэгуляваннем і арганізацыяй дзейнасці і размеркаваннем вынікаў яе. На гэтай падставе развіваецца і ўдасканальваецца псіхіка, фарміруюцца здольнасці стварэння паняццяў, лагічнага мыслення, рацыянальнага спасціжэння свету з дапамогай абстрактна-лагічных сродкаў. Працоўная дзейнасць патрабавала таксама новых, больш развітых і эфектыўных сродкаў рэгулявання і зносін, што вяло да ўзнікнення мовы. Развіццё працоўнай дзейнасці, гістарычныя падзелы працы нараджаюць мараль, мастацтва, навуку, рэлігію, фарміруюць сацыяльныя праграмы паводзін чалавека, вядуць да культуры як сферы спецыфічна чалавечай жыццядзейнасці.

Сацыяльная абумоўленасць свядомасці праяўляецца і *функцыянальна.* Свядомасць узнікае ў працэсе жыццядзейнасці чалавека, скіраванай на пераўтварэнне прыроднага асяроддзя і задавальнення на гэтай падставе сваіх патрэбнасцей. Таму свядомасць ёсць не што іншае, як адлюстраванне гэтай жыццядзейнасці і тых прадметаў, на якія яна скіравана. Свядомасць – гэта заўжды ўсвядомленае быццё, усвядомлены працэс жыцця людзей. Па свайму зместу і функцыях свядомасць абумоўлена сацыяльна-гістарычнай практыкай, з’яўляецца адлюстраваннем яе.

Сацыяльны характар свядомасці раскрываецца і ў *камунікатыўным* падыходзе да яе. Гэты падыход патрабуе выяўлення сувязі свядомсці з мовай як універсальным сродкам камунікацыі. Мова – гэта сістэма знакаў, з дапамогай якіх ажыццяўляюцца зносіны людзей, пазнанне свету і самога сябе, захаванне і перадача інфармацыі, а таксама кіраванне паводзінамі. З гэтага азначэння вынікаюць і асноўныя функцыі мовы: *камунікатыўная, пазнавальная(кагнітыўная), экспрэсіўная, кумулятыўная і рэгулятыўная.*

Нарэшце, сацыяльная прырода свядомасці выяўляецца ў яе *творчым, актыўна-канструктыўным* характары. Свядомасць не проста і не толькі адлюстроўвае прадметы, яна фармулюе праграмы дзейнасці, мэты і задачы яе, выступае асновай творчай дзейнасці чалавека.

Зробім высновы з усяго сказанага.

*1)Свядомасць – гэта адкрытая сістэма, у якую ўключаны не толькі рацыянальныя паняцці, тэарэтычныя веды і аперацыянальныя дзеянні, але і эмацыянальна-валявыя і пачуццёва-вобразныя сродкі адлюстравання свету;*

*2)яна ўзнікае на падставе прыродна-біялагічных перадумоў у працэсе ўзнікнення і развіцця сацыяльнай практыкі і з’яўляецца яе адлюстраваннем;*

*3)важнейшымі фактарамі ўзнікнення і развіцця свядомасці былі прадметна-практычная дзейнасць з прымяненнем прылад працы, мова, гаспадарчы лад жыцця, супольнае існаванне;*

*4)свядомасць – гэта вышэйшая, уласцівая толькі чалавеку і звязаная з мовай функцыя мозга, якая заключаецца ў здольнасці да абагульненага,*

*ацэначнага і мэтанакіраванага пазнання і канструктыўна-творчага пераўтварэння рэчаіснасці, папярэдняга мысленнага праектавання дзеянняў і прадбачання іх вынікаў, а таксама разумнага рэгулявання і кантралявання поводзін чалавека (Спіркін А.Г.).*

## ТЭМА 9. ПАЗНАННЕ ЯК ПРАДМЕТ ФІЛАСОФСКАГА АНАЛІЗА

### Праблема пазнання ў гісторыі філасофіі

Дзейнасць ёсць спосаб існавання чалавека, бо толькі ў дзейнасці і праз дзейнасць чалавек стварае неабходныя для свайго існавання ўмовы. Аб'ектам гэтай дзейнасці выступае не толькі прыроднае асяроддзе, але і грамадства, а мэтай – асэнсаванае пераўтварэнне прыроднага і сацыяльнага свету і задавальненне на гэтай аснове разнастайных патрэбнасцей. Дасягненне гэтай мэты немагчыма без шырокай сістэмы ведаў пра свет і грамадства. Вось чаму пазнавальныя адносіны чалавека да рэчаіснасці з'яўляюцца неабходным элементам усёй сістэмы яго адносін да свету. *Пазнанне – гэта сацыяльна-гістарычны працэс арганізаванай духоўнай дзейнасці чалавека, скіраванай на адлюстраванне і асэнсаванне аб'ектыўнай рэальнасці з мэтай атрымання верагодных ведаў аб ёй..*

Ужо гэтае азначэнне пазнання вымагае ад нас высновы аб тым, што пазнанне дзеля свайго ажыццяўлення патрабуе развітай свядомасці і культуры, якая ўтрымлівае сацыяльна значныя праграмы дзейнасці і паводзін чалавека. А гэта азначае, што змест пазнання, формы і спосабы яго ажыццяўлення залежаць ад асаблівасцей канкрэтна-гістарычных этапаў развіцця грамадства і культуры. На ранніх этапах антрапасацыягенеза пазнанне непасрэдна ўключана ў прадметна-практычную дзейнасць чалавека, ажыццяўляецца ў вобразна-пачуццёвай форме і скіравана на абагульненне і асэнсаванне непасрэднага жыццёвага досведу. Гэта *духоўна-практычная* форма пазнавальнай дзейнасці, якая ўвасабляецца ў штодзённым пазнанні альбо здаровым сэнсе. На больш позніх і развітых этапах гістарычнага развіцця пазнанне выдзяляецца са структур практычнай дзейнасці ў якасці адносна самастойнага віда духоўнай вытворчасці і набывае *духоўна-тэарэтычную* форму. На гэтай падставе можна выдзяліць міфалагічнае, рэлігійнае, эстэтычнае, філасофскае і навуковае пазнанне.

Пазнавальную дзейнасць нельга зводзіць толькі да акта мыслення. У пазнавальным працэсе ўдзельнічае ўся свядомасць, пачуцці, памяць, воля, мэты. У пазнавальных адносінах праяўляецца духоўная актыўнасць чалавека, у ёй прысутнічаюць перакананні, вера, памылкі і ілюзіі. Гэта з'яўляецца падставай для разнастайных, часта супярэчлівых інтэрпрэтацый пазнання. Але як бы ні адрозніваліся адна ад адной разнастайныя канцэпцыі пазнання, агульным для ўсіх было пытанне аб тым, ці магчыма

пазнанне, ці здольны чалавек да змястоўнага і аб'ектыўна значнага пазнання. У гэтым пытанні – спецыфіка філасофскага падыходу да праблемы пазнання, які ўвасабляецца ў тэорыі пазнання альбо гнасеалогіі – спецыяльным раздзеле філасофіі, прысвечаным даследаванню пазнання.

У гісторыка-філасофскім працэсе праблема пазнавальнасці свету і адэкватнасці атрыманых ведаў аб'ектам рэальнасці вырашалася з пазіцый *гнасеалагічнага аптымізма, скептыцызма і агнастыцызма.* Прыхільнікі першай пазіцыі прызнаюць прынцыповую пазнавальнасць свету, наяўнасць у чалавека неабходных для гэтага здольнасцей і сродкаў і лічаць, што атрыманыя ў працэсе пазнання веды адэкватна адлюстроўваюць уласцівасці аб'ектаў знешняга свету. На пазіцыі гнасеалагічнага аптымізма стаялі Арыстоцель, Бэкан, Дэкарт, Спіноза Гегель, Маркс.

Складанасць пазнавальнага працэса, спецыфіка суб'ектыўных здольнасцей чалавека і неадназначнасць атрыманых вынікаў нараджае скептыцызм, які не адмаўляе здольнасці пазнання, але ставіць гэтую здольнасць пад сумненне. У чалавека, на думку скептыкаў, няма ніякіх сродкаў, з дапамогай якіх можна было б устанавіць сувязь нашых ведаў з прадметамі знешняга свету. На такіх пазіцыях у антычнасці стаялі Аркесілай, Секст Эмпірык, а ў Новы час скептыцызм вызнавалі Гасендзі, Бейль, а найперш Д.Юм, распрацаваўшы аргументаваную сістэму скептыцызма.

Ідэя скептыцызма сталася асновай, на якой узнікае агнастыцызм. Прыхільнікі яго (Берклі, Кант) абвяргаюць здольнасць чалавека да аб'ектыўна-змястоўнага ісціннага пазнання і зводзяць пазнанне да суб'ектыўных перажыванняў альбо апрыёрных канструкцый, не звязаных з аб'ектамі рэчаіснасці.

Так у гісторыі філасофіі ставілася праблема пазнання, спосабы і сродкі вырашэння якой утвараюць праблемнае поле гнасеалогіі, скіраванай на выяўленне статуса суб'екта ў пазнанні, аналіз структуры пазнавальных адносін, распрацоўку форм і метадаў пазнання, даследаванне ўмоў ісціннасці атрыманых ведаў. Як жа гэтая праблема вырашалася ў гісторыка-філасофскім працэсе?

## Гістарычныя версіі суб'екта і аб'екта пазнання

Зыходным пунктам пазнання, яго асновай з'яўляюцца адносіны суб'екта і аб'екта, іх узаемадзеянне. Праблема суб'екта – гэта, перадусім, праблема яго пазнавальных здольнасцей, іх уплыву на пазнавальную дзейнасць і магчымасць дасягнення ісцінных ведаў. У шырокім сэнсе слова *суб'ект* – гэта крыніца мэтанакіраванай актыўнасці, носьбіт прадметна-практычнай дзейнасці, ацэнкі і пазнання (П.В.Алексеев, А.В.Панин.

Философия). *Субъект пазнання* – гэта надзелены свядомасцю і пазнавальнымі здольнасцямі чалавек, які ажыццяўляе працэс пазнання.

*Аб'ектам пазнання* звычайна называюць фрагмент рэальнасці, на які скіравана пазнавальная дзейнасць суб'екта. Інакш кажучы, аб'ектам пазнання з'яўляецца ўсё тое, што не залежыць ад суб'екта і супрацьстаіць яму ў пазнанні. У класічнай філасофіі працэс пазнання і разглядаўся як адносіны супрацьпастаўленых адзін аднаму суб'екта і аб'екта. Пры гэтым сама прырода суб'екта тлумачылася па-рознаму Прадстаўнікі метафізічнага матэрыялізма XVIII ст. пад суб'ектам разумелі асобнага чалавека як біялагічнага індывіда, пазнавальныя здольнасці якога маюць натуральнае паходжанне, а працэс пазнання ўяўлялі як працэс сузірання свету і яго апісання. Прыхільнікамі гэтай *наіўна-рэалістычнай* тэорыі пазнання былі Дзідро, Гальбах, Ламетры, Фейербах. Галоўныя недахопы гэтай тэорыі – ігнараванне актыўнай прыроды суб'екта пазнання, сузіральнасць, няздольнасць растлумачыць паходжанне агульных паняццяў у сістэме ведаў.

У межах ідэалістычнага эмпірызма сфарміравалася *гнасеалагічная версія* суб'екта пазнання як сукупнасці пазнавальных здольнасцей, заснаваных на адчуваннях, успрыняццях, уяўленнях, гэта значыць – на формах пачуццёвага вопыту. Гэтыя здольнасці з'яўляюцца не толькі сродкамі пазнання, але і ўмовамі існавання аб'екта, які, паводле гэтай канцэпцыі, ёсць сукупнасцю адчуванняў. Гэтая версія распрацавана ў творах Берклі, Юма, Маха, Авенарыуса і носіць выразны суб'ектыўна-ідэалістычны характар.

Пералічаныя версіі заснаваны на супрацьпастаўленні суб'екта і аб'екта, а пошук умоў і спосабаў сувязі паміж імі тут паўстае галоўнай праблемай. Кант стварае *трансцэндэнтальную* версію пазнання, у якой аб'ект не супрацьпастаўлены суб'екту, а з'яўляецца вынікам яго творчай актыўна-канструктыўнай дзейнасці, заснаванай на апрыёрных формах арганізацыі пазнання. Суб'ект жа – гэта не біялагічны індывід і не эмпірычна-псіхалагічная свядомасць, а чысты розум, абумоўлены апрыёрнымі формамі адчувальнасці і развагі, якія робяць магчымым сам працэс пазнання.

У нямецкай філасофіі XIX ст. была распрацавана *сацыякультурная* версія пазнання, у якой пераадольваецца гэтак званая "гнасеалагічная рабінзанада" ў трактоўцы суб'екта пазнання як ізаляванага індывіда, надзеленага пазнавальнымі здольнасцямі. Суб'ект тут набывае сацыяльна-гістарычны статус. Ён фарміруецца ў працэсе прадметна-практычнай і пазнавальнай дзейнасці і з'яўляецца вынікам культурна-гістарычнага вопыту. Гегель гэты вопыт разумеў як гістарычнае развіццё абсалютнага духу. У марксісцкай інтэрпрэтацыі згаданы вопыт паўстае як аб'ектывацыя форм сацыякультурнай практыкі. Чалавек толькі тады і ў такой ступені становіцца суб'ектам пазнання, калі і ў якой ступені ён

далучаецца да культурнай спадчыны і засвойвае традыцыі, нормы і каштоўнасці грамадства ў працэсе сацыялізацыі.

Сучасная посткласічная філасофія стварае свае версіі пазнання і інтэрпрэтацыі пазнавальных адносін. Для гэтай філасофіі характэрна адмаўленне ад супрацьпастаўлення суб’екта і аб’екта як першапачатковай умовы пазнання, зварот да аналіза суб’ектыўнасці, даследаванне механізмаў фарміравання новых ведаў і тэхналагічнасці іх. У некаторых школах сучаснай філасофіі аналіз праблемы пазнання зводзіцца да выяўлення функцый мовы. У посткласічнай філасофіі падвяргаецца перагляду і праблема ісціны ў пазнанні, якая тлумачыцца не з пункту гледжання сувязі ведаў з аб’ектамі рэчаіснасці, а з пазіцый канвенцыяналізма і прагматызма.

## Структура пазнавальнага працэса

Пазнавальная дзейнасць ажыццяўляецца на двух асноўных узроўнях – *пачуццёвым і рацыянальным.* Пачуццёвае пазнанне ажыццяўляецца ў наглядна-вобразнай форме, скіравана на прадметы, непасрэдна дадзеныя ў паўсядзённым вопыце, адлюстроўвае знешнія прыкметы прадметаў у іх выпадковым праяўленні. Пачуццёвае пазнанне ажыццяўляецца ў трох формах. Элементарнай і гістарычна першай формай пачуццёвага пазнання з’яўляецца адчуванне. *Адчуванне* – гэта здольнасць псіхікі фіксаваць асобныя прыкметы прадмета, альбо суб’ектыўны вобраз асобных бакоў і прыкмет прадмета, які ўзнікае ў працэсе непасрэднага ўздзеяння яго на органы пачуццяў. *Успрыманне* – гэта цэласны вобраз прадмета, непасрэдна дадзенага суб’екту ў працэссе пазнання. Структурна успрыманне гэта сінтэз разнастайных адчуванняў. *Уяўленне* – гэта пачуццёвы вобраз раней успрынятага прадмета, які ўтрымліваецца ў свядомасці з дапамогай памяці.

Вынікам пачуццёвага пазнання з’яўляецца ідэальны вобраз, пазбаўлены якіх-небудзь фізічных параметраў. Ён фарміруецца ў працэсе актыўнай прыстасавальнай дзейнасці арганізма да навакольнага асяроддзя і ўказвае на тое, што пазнанне ёсць не пасіўным сузіраннем, а актыўнай творчай дзейнасцю. Ідэальны вобраз з’яўляецца вынікам узаемадзеяння аб’екта з разнастайнымі элементамі псіха-фізіялагічнай структуры арганізма і ўяўляе сабой функцыянальна выдзелены змест нейрадынамічнага кода, суаднесены з паводзінамі і дзейнасцю.

Рацыянальнае пазнанне ажыццяўляецца ў форме паняцця, суджэння і выснавання. *Паняцце* – гэта форма мыслення, у якой адлюстраваны істотныя прыкметы прадмета, што фіксуюцца моўнымі сродкамі ў дэфініцыях. Гэта зыходная і асноўная форма рацыянальнага пазнання. Фарміраванне паняццяў – працэс складаны. У ім удзельнічаюць разнастайныя пазнавальныя працэдуры, звязаныя з аналізам, крытыкай,

ацэнкай пазнавальнай дзейнасці і пераўтварэннем яе вынікаў: групіроўка ўласцівасцей прадмета, параўнанне і выдзяленне дамінуючай прыкметы, выяўленне мяжы той ці іншай уласцівасці альбо ідэалізацыя і інш. *Суджэнне* уяўляе сабой форму мыслення, у якой штосьці сцвярджаецца альбо адмаўляецца адносна чаго-небудзь. *Высноўванне (умозаключение)* – форма мыслення, у якой на падставе некалькіх суджэнняў робіцца выснова, якая змяшчае новыя веды. Рацыянальнае пазнанне носіць абстрактны характар, ажыццяўляецца ў паняційнай форме, скіравана на выяўленне ўнутранай структуры аб’екта, яго сувязей і механізмаў змянення.

Выдзяленне двух узроўняў пазнання не азначае, што ў рэальным пазнавальным працэсе яны адасоблены адзін ад аднаго. Пачуццёвае і рацыянальнае – гэта два элементы адзінага працэса пазнання, якія ўзаемна дапаўняюць адзін аднаго. Сувязь пачуццёвага і рацыянальнага мае характар узаемаабумоўленасці. Рацыянальнае фарміруецца на аснове пачуццёвага, залежыць ад яго, а пачуццёвае перадвызначана рацыянальным, залежыць ад семіатычных канструкцый, структур сацыяльнай практыкі, норм і каштоўнасцей, прынятых грамадствам на той ці іншай ступені яго развіцця.

Менавіта спробы асэнсавання пачуццёвага і рацыянальнага пазнання прыводзяць да ўзнікнення ў новаерапейскай філасофіі эмпірызма і рацыяналізма. *Эмпірызм* – гэта напрамак у філасофіі, які пачуццёвы вопыт лічыць адзінай ці пераважнай крыніцай пазнання. Прыхільнікі эмпірызма перакананы ў тым, што ў розуме няма нічога такога, чаго б не было ў пачуццях. Роля розуму ў эмпірычнай мадэлі пазнання другасная і службовая: ён абагульняе дадзеныя пачуццёвага вопыту і дае ім найменне.

*Рацыяналізм* – напрамак у гнасеалогіі Новага часу, які адстойвае прыярытэт розуму ў пазнанні і аддае перавагу дэдуктыўнаму метаду і інтуіцыі. Як цэласная сістэма пачаў фарміравацца ў новаеўрапейскай філасофіі пад уплывам  матэматыкі і матэматызаванага прыродазнаўства. Рацыяналісты былі перакананы, што ўсеагульныя і неабходныя ісціны нельга вывесці непасрэдна з пачуццёвага вопыту, для гэтага неабходны спецыяльныя намаганні розуму, які і з’яўляецца крыніцай гэтых ісцін.

Прыхільнікі гэтых плыняў у філасофіі выявілі і абгрунтавалі істотныя характарыстыкі пазнавальнага працэса, выказалі шэраг ідэй, якія мелі вялікае значэнне для далейшага развіцця тэорыі пазнання. І ўсё ж яны не пазбеглі абмежаванасці і аднабаковасці. Эмпірызм абсалютызаваў ролю пачуццяў у пазнанні, пачуццёвае пазнанне разглядаў не як этап альбо ўзровень агульнапазнавальнага працэса, а як самастойны від пазнання. Гэтым самым прыніжалася, а то і наогул адмаўлялася роля мыслення ў пазнанні. Рацыяналізм жа адмаўляў магчымасць вопытнага паходжання такіх прыкмет ведаў, як усеагульнасць і неабходнасць, арыентаваўся на выяўленне ўніверсальных лагічных схем дзейнасці, якія часцей за ўсё

разглядаў у якасці прыроджаных ідэй, дадзеных суб'екту да ўсякага вопыту, апрыёрна. Гэта значыць, што як эмпірызм, так і рацыяналізм у новаеўрапейскай філасофіі не выходзілі за межы дыхатаміі пачуццёвага і рацыянальнага, іх ізаляванасці і супрацьпастаўленасці.

## Праблема ісціны ў філасофіі

Сутнасць пазнання заключаецца ў тым, што яно ёсць адлюстраваннем знешняга свету, а веды, як вынікі гэтага адлюстравання, выступаюць у якасці ідэальных вобразаў адпаведных аб'ектаў. Вось чаму галоўным пытаннем тэорыі пазнання ёсць пытанне аб тым, як адносяцца нашыя веды да аб'ектыўнага свету. У гэтым пытанні – сутнасць праблемы ісціны. Фармулёўка і асэсаванне гэтай праблемы мы знаходзім ужо ў антычнай філасофіі, а вынікам гэтага асэнсавання сталася распрацоўка асноўных палажэнняў класічнай канцэпцыі ісціны. Арыстоцель, аналізуючы веды з пункту гледжання іх верагоднасці, прыходзіць да высновы, што, па-першае, веды ісцінныя тады, калі яны адпавядаюць прадметам і іх прыкметам, якія існуюць па-за свядомасцю і незалежна ад яе, а па-другое, характарыстыка ісціннасці адносіцца не да прадметаў, а менавіта да ведаў аб гэтых прадметах. Гэта значыць, што пад ісцінай Арыстоцель разумеў такія веды, якія змястоўна адпавядаюць рэальнаму стану рэчаў. Гэтая ідэя і была пакладзена ў аснову класічнай канцэпцыі ісціны як адпаведнасці ведаў пазнаваемай рэчаіснасці. Ужо ў XX ст. яна атрымала назву *карэспандэнтскай канцэпцыі ісціны* (Дж.Мур). Азначаная канцэпцыя ісціны заснавана на прызнанні аб'екта, незалежнага ад суб'екта і станаў яго свядомасці, магчымасці выявіць адназначную адпаведнасць паміж ведамі і рэчаіснасцю, наяўнасці надзейнага крытэрыя, з дапамогай якога гэтую адпаведнасць альбо адсутнасць яе можна ўстанавіць.

Аднак у працэсе развіцця філасофіі і навукі выявіліся недакладнасці і супярэчнасці гэтай канцэпцыі. Сцвярджаючы ісціну як адпаведнасць ведаў рэчаіснасці, гэтая канцэпцыя не адказвала на пытанне аб тым, у чым заключаецца гэтая адпаведнасць і якой рэчаіснасці веды адпавядаюць. Пераадоленне гэтых недахопаў класічнай канцэпцыі ісціны адбывалася ў двух напрамках: удасканалення гэтай канцэпцыі шляхам вырашэння яе праблем і распрацоўкі альтэрнатыўных канцэпцый. Рэалізацыяй першага напрамку сталася *дыялектыка-матэрыялістычная* канцэпцыя ісціны, сутнасць якой заключаецца ў наступных пастулатах: ісціна заўжды носіць аб'ектыўны характар, працэс пазнання – гэта працэс узыходжання ад ісцін адносных да абсалютнай ісціны, ісціна заўжды канкрэтная, адзіным надзейным і аб'ектыўным крытэрыем вызначэння ісціны з'яўляецца практыка. Іншы спосаб удасканалення класічнай канцэпцыі ісціны быў распрацаваны А.Тарскім і атрымаў назву *семантычнай канцэпцыі.* Гэтая канцэпцыя прапануе, па-першае, строга размежаваць аб'ектную мову і

мэтамову, а ісціннасць аб’ектных выказванняў вызначаць шляхам параўнання іх з выказваннямі мэтамовы, да якіх толькі і можа прымяняцца паняцце ісціны.

Прадстаўнікі другога напрамку разам з крытыкай класічнай версіі ісціны прапанавалі альтэрнатыўныя варыянты рашэння праблемы:
*прагматычная канцэпцыя* (грэч. pragma – справа, дзеянне) прапануе лічыць ісціннымі толькі тыя веды, якія з’яўляюцца карыснымі для чалавека і эфектыўнымі ў якасці сродка пазнання (Ч.Пірс, П.Брыджмен);
*канвенцыяналісцкая канцэпцыя* (лацінскае conventio – пагадненне) ісціннасць разглядае як пагадненне паміж членамі навуковай супольнасці, якое вызначаецца свабодным выбарам навукова-метадалагічнага апарата (К.Айдукевіч, А.Пуанкарэ);
*кагерэнтная канцэпцыя* (лацінскае cohaerentia – сувязь) прапануе інтэрпрэтацыю ісціны як лагічнай несупярэчлівасці ведаў (Р.Карнап, О.Нейрат).

У сучаснай філасофіі праблема ісціны вырашаецца на шляху адмаўлення ад гнасеалагічнага суб’екта і звароту да “суб’екта зацікаўленага”. Гэта азначае, што рашэнне праблемы ісціны тут выводзіцца ў больш шырокую, чым толькі гнасеалагічная, і больш значную для чалавека сферу каштоўнасцей, мэтаў і сэнсаў.

## Метады навуковага пазнання

Пазнанне як спецыфічны від дзейнасці для свайго ажыццяўлення патрабуе пэўных прыёмаў і аперацый, якія павінны забяспечыць дасягненне пастаўленых мэтаў. Гэта метадычныя сродкі пазнавальнай дзейнасці. *Метад* – гэта сукупнасць разнастайных прыёмаў, аперацый і сродкаў практычнага і тэарэтычнага засваення рэчаіснасці. Метад павінен уключаць у сябе а)сфармуляваную мэту, b)апісанне аб’ектыўнай сітуацыі, у межах якой вырашаецца практычная альбо тэарэтычная задача, с)працэдуру альбо пералік аперацый, якія неабходна ажыццявіць для дасягнення мэты ў дадзеных умовах.

На ўзроўні штодзённай практычнай дзейнасці метад фарміруецца стыхійна і толькі пазней усведамляецца людзьмі. У сферы ж навукі метад фарміруецца свядома і мэтанакіравана. Навуковы метад толькі тады адпавядае свайму статусу, калі ён забяспечвае адэкватнае адлюстраванне ўласцівасцей і заканамернасцей прадметаў знешняга свету. Таму навуковы метад супадае з навуковай тэорыяй. Метад – гэта тэорыя ў яе практычным прымяненні. З аднаго боку, тэорыя ўяўляе сабой сістэму ведаў аб тым альбо іншым фрагменце свету, а з другога – яна ж выступае і як сродак рашэння тэарэтычных задач, гэта значыць як метад.

Навуковаму метаду ўласцівы наступныя прыкметы:
1)яснасць альбо агульнадаступнасць;

2)дэтэрмінаванасць альбо адсутнасць стыхійнасці і адвольнасці ў прымяненні;
3)скіраванасць ці здольнасць забяспечваць дасягненне мэты;
4)плённасць альбо здольнасць даваць не толькі намечаныя, але і не менш значныя пабочныя вынікі;
5)надзейнасць ці здольнасць з высокай імавернасцю забяспечваць жаданы вынік;
6)эканомнасць альбо здольнасць даваць вынік з найменшымі выдаткамі сродкаў і часу.

Метады, якія выкарыстоўваюцца ў пазнавальнай дзейнасці, можна раздзяліць на тры групы. Да першай адносяцца агульналагічныя метады, якія прымяняюцца ў любым акце пазнання і на любым узроўні. Гэта аналіз і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя, абагульненне, аналогія і іншыя.

Да другой групы адносяцца метады, якія прымяняюцца ў пэўнай канкрэтнай тэорыі і прыстасаваны для даследавання менавіта гэтага аб’екта. Адметнасцю гэтых метадаў з’яўляецца іх залежнасць ад аб’екта даследавання і спецыфікі пастаўленых задач.

Трэцюю групу складаюць агульнанавуковыя метады, якія больш незалежныя ад спецыфікі аб’екта даследавання і тыпа праблем, але пры гэтым залежаць ад узроўню і глыбіні даследавання. На гэтай падставе дадзеныя метады можна падзяліць на метады эмпірычнага і тэарэтычнага пазнання, якія адпавядаюць эмпірычнаму і тэарэтычнаму этапу даследавання. На эмпірычным этапе ажыццяўляецца збор фактаў, іх першасная апрацоўка, апісанне, класіфікацыя, выяўленне знешніх залежнасцей. На тэарэтычным этапе ажыццяўляецца абагульненне эмпірычных залежасцей, выяўленне структуры аб’екта, устойлівых узаемадзеянняў, пабудова ідэальных мадэляў аб’екта і тэарэтычных схем ажыццяўлення пазнавальных праграм.

На эмпірычным этапе прымяняюцца такія метады, як *назіранне, класіфікацыя, эксперымент.*.Назіранне – гэта наўмыснае і мэтанакіраванае ўспрыняцце аб’екта, абумоўленае задачай даследавання. Класіфікацыя – гэта метад раздзялення мноства аб’ектаў даследавання на падмноствы на падставе зафіксаваных падабенстваў і адрозненняў. Эксперыментам называецца метад даследавання, пры дапамозе якога пэўны аб’ект альбо працэс даследуецца ва ўмовах, што кантралююцца і кіруюцца даследчыкам. Эксперымент прымяняецца альбо для стварэння сітуацыі, якая дазваляе вывучаць аб’ект у чыстым выглядзе, альбо для праверкі ўжо існуючых гіпотэз і тэорый, альбо для фармулёўкі новых гіпотэз і тэарэтычных уяўленняў.

На тэарэтычным этапе выкарыстоўваюцца *аксіяматычны, гіпатэтыка-дэдуктыўны метады, метад узыходжання аб абстрактнага да канкрэтнага, а таксама гістарычны і лагічны метад.* Апошнім карыстаюцца пры даследаванні складаных гістарычна зменлівых аб’ектаў.

Аксіяматычны метад спачатку задае набор зыходных аксіём, з якіх затым па вызначаных правілах ствараецца сістэма вывадных выказванняў. Аксіёмы і выказванні разам і складаюць тэорыю Сутнасць гіпатэтыка-дэдуктыўнага метада заключаецца ў тым, што спачатку фармулюецца адна альбо некалькі гіпотэз, з якіх затым выводзіцца сістэма прыватных гіпотэз, што падлягае вопытнай праверцы. Метад узыходжання ад абстрактнага да канкрэтнага арыентуе даследаванне на пошук і асэнсаванне такіх уласцівасцей, сувязей і адносін, якія пеершапачатковаму абстрактнаму вобразу аб'екта надаюць канкрэтнасць, выразнасць і акрэсленасць. Гістарычны метад патрабуе апісання фактычнай гісторыі аб'екта ва ўсёй разнастайнасці яго існавання. Лагічны ж метад – гэта мысленная рэканструкцыя гісторыі аб'екта, ачышчаная ад усяго выпадковага, неістотнага і засяроджаная на выяўленні яго існасці.

На тэарэтычным этапе даследавання прымяняюцца і такія метады, як ідэалізацыя, фармалізацыя, мадэляванне (у тым ліку матэматычнае і камп'ютэрнае). Гэтая разнастайнасць навуковых метадаў забяспечвае адэкватнасць вынікаў пазнання, лагічную несупярэчлівасць навуковых ведаў, эмпірычную абгрунтаванасць і магчымасць прынцыповай праверкі атрыманых ведаў.

Сфармулюем асноўныя палажэнні тэмы.

*1)пазнанне – гэта вышэйшая форма псіхічнага адлюстравання, спецыфічны від духоўнай дзейнасці, скіраванай на вытворчасць, накапленне і трансляцыю аб'ектыўна-змястоўных ведаў аб прыроднай і сацыяльнай рэчаіснасці. Змест, формы і спосабы пазнання носяць сацыяльна абумоўлены, канкрэтна-гістарычны характар;*

*2)пазнанне інспіравана патрэбнасцямі прадметна-практычнай дзейнасці людзей і ўяўляе сабой структураваны працэс узаемадзеяння суб'екта і аб'екта, у якім удзельнічаюць такія здольнасці чалавека, як мысленне, эмоцыі, воля, памяць, інтуіцыя;*

*3)пазнанне ажыццяўляецца на пачуццёвым і рацыянальным узроўні, якія выступаюць як узаемазвязаныя і ўзаемазалежныя элементы цэласнага пазнавальнага працэса. Аналіз характарыстык гэтых элементаў і выяўленне ролі іх у пазнавальнай дзейнасці нараджае ў новаеўрапейскай філасофіі дылему эмпірызма і рацыяналізма;*

*4)галоўным пытаннем тэорыі пазнання ёсць пытанне аб ісціннасці нашых ведаў. У гісторыі філасофіі гэтае пытанне вырашалася па-рознаму, але найбольш распаўсюджанай і дасканалай была класічная канцэпцыя, якая ісціну разумела як адпаведнасць зместу ведаў уласцівасцям аб'ектаў знешняга свету, а крытэрыем гэтай адпаведнасці абвяшчала практыку;*

*5)вышэйшай формай пазнавальнай дзейнасці з'яўляецца навуковае пазнанне, для ажыццяўлення якога ствараюцца разнастайныя метады, што забяспечваюць адэкватнасць вынікаў пазнавальнага працэса.*

## ТЭМА 10. САЦЫЯЛЬНАЯ ФІЛАСОФІЯ

### Грамадства як аб’ект філасофскага аналіза

Існаванне чалавека немагчыма па-за грамадствам. Але што такое грамадства, як яно ўзнікае, якая яго будова, паводле якіх прынцыпаў яно існуе і функцыянуе? Гэтыя пытанні складаюць прадметнае поле таго раздзела філасофскіх ведаў, які называецца сацыяльнай філасофіяй і на які абапіраюцца такія гуманітарныя тэорыі, як філасофія гісторыі і сацыялогія. *Сацыяльная філасофія – гэта філасофскае вучэнне аб універсальных умовах узнікнення, існавання і развіцця грамадства.*

Паняцце “грамадства” ўжываецца ў вузкім і шырокім сэнсе. Пад грамадствам у вузкім сэнсе разумеюць аб’яднанні груп людзей для супольнай дзейнасці, альбо пэўны этап чалавечай гісторыі (першабытнае грамадства), ці гістарычнае жыццё асобнага народа альбо краіны (беларускае грамадства).

Грамадства ў шырокім сэнсе – *адасобленая ад прыроды, але цесна звязаная з ёю частка матэрыяльнага свету, якая ўяўляе сабой гістарычна зменлівую сістэму сувязей, зносін і форм аб’яднання людзей, што ўзнікае ў працэсе іх жыццядзейнасці.*

Што вызначае характар гэтых сувязей і адносін, гэта значыць, што складае аснову грамадства? Адказы на гэтыя пытанні залежаць ад той пазіцыі (альбо праграмы даследавання), якой прытрымліваецца вучоны. Прыхільнікі *натуралістычнага падыходу* тлумачылі паходжанне і сутнасць грамадства дзеяннем прыродных прычын: геаграфічнага асяроддзя, клімата, касмічных выпраменьванняў, генетычных альбо расавых асаблівасцей людзей, біялагічнай прыроды чалавека. Грамадства пры такім падыходзе зводзіцца да статуса прыроднага аб’екта, уключанага ў сферу дзеяння ўніверсальных натуральных законаў і падпарадкаванага ім (Гобс, Мантск’е, Спенсер, Гумілёў). Недахопы гэтага падыходу сталі відавочныя ў канцы XIX – пачатку XX стст., калі грамадства становіцца самастойнай сферай даследавання сацыяльна-гуманітарных навук.

Даследчыкі, якія прытрымліваліся *культурацэнтрысцкага падыходу,* спецыфіку грамадства выводзілі з ідэй, мэтаў, ідэалаў, гэта значыць, з духоўных каштоўнасцей, якія вызначаюць як працэс гісторыі, так і жыццё асобных індывідаў. Гэты падыход пачынае фарміравацца ў творчасці Канта, Гегеля, Рыкерта, Віндэльбанда, развіваецца ў Хейзінгі, Бахціна і ў герменеўтыцы, дзе грамадства разглядаецца як надындывідуальнае ўтварэнне, спецыфіка якога не дазваляе рэдуцыраваць яго да прыроднага аб’екта. Грамадства выступае аб’ектам даследавання ідэаграфічных навук, якія апісваюць асобныя гістарычныя падзеі з дапамогай спецыяльных метадаў.

Прыхільнікі *псіхалагічнага падыходу* тлумачаць грамадства і грамадскае жыццё адметнасцю чалавечай псіхікі, неўсвядомленымі памкненнямі, спецыфікай сацыяльнай псіхалогіі. Гэты падыход абгрунтаваны ў даследаваннях Тарда, Фрэйда, Фрома і іншых.

У сучасным грамадазнаўстве выдзяляюць таксама *марксісцкі падыход*, дзе грамадства разглядаецца як абумоўлены эканамічнымі фактарамі вынік сацыяльна-практычнай дзейнасці людзей, сістэма сацыяльна-палітычных, ідэалагічных і духоўных элементаў, народжаных эканомікай і залежных ад яе.

Разнастайнасць даследчыцкіх праграм, метадалагічны плюралізм сацыяльнай філасофіі сведчыць аб складанасці грамадства і стварае аснову эфектыўнага пазнання сацыяльна-культурных працэсаў.

## Грамадства як здольная да самаразвіцця сістэма.

Незалежна ад арыентацыі на тую альбо іншую праграму даследавання, неабходна прызнаць, што грамадства – гэта і людзі, і іх дзейнасць, і яе вынікі. Жыццё і дзейнасць людзей нельга нават уявіць без прыроды і па-за ёю. Таму прырода выступае як неабходная натуральная перадумова існавання грамадства. Але адносіны грамадства да прыроды не прамыя, яны апасродкаваны прыладамі і вынікамі дзейнасці, гэта значыць – культурай. Пры гэтым важнай прыкметай, якая адрознівае прыроду ад грамадства, з'яўляецца тое, што прырода існуе і эвалюцыянуе ў адпаведнасці з аб'ектыўнымі законамі, якія праяўляюцца ў выглядзе сляпых стыхійных сіл. Грамадства ж існуе і функцыянуе ва ўзаемадзеянні з прыродай як вынік свядомай і мэтанакіраванай дзейнасці людзей.

З прыведзенага вышэй азначэння грамадства вынікае, што гэта не проста супольнасць людзей, а найперш сувязі, узаемадзеянні, аб'яднанні, якія ўтвараюць складаную сістэму сацыяльных адносін паміж асобнымі індывідамі, сацыяльнымі групамі і супольнасцямі людзей. Гэта азначае, што грамадства існуе і развіваецца як арганізаваная сістэмная цэласнасць, якая ўнутры сябе стварае ўмовы і механізмы ўласнага развіцця. З гэтага, сістэмнага, пункту гледжання *грамадства – гэта складанаарганізаваная і здольная да самаразвіцця сістэма, усе элементы якой знаходзяцца ў адносінах ўзаемасувязі і ўзаемазалежнасці.* Грамадства як здольная да самаразвіцця сістэма характарызуецца: 1)разнастайнасцю элементаў і сувязей паміж імі; 2)інтэгратыўнасцю, якая забяспечваецца нормамі і схемамі паводзін надындывідуальнага кшталту (мараль, традыцыі, права); 3)самадастатковасцю, гэта значыць здольнасцю аднаўляць умовы свайго існавання; 4)дынамічнасцю і альтэрнатыўнасцю шляхоў развіцця; 5)нелінейным характарам сацыяльных працэсаў.

Грамадства як сістэмнае ўтварэнне ўключае ў сябе асобных індывідаў, сацыяльныя групы і супольнасці (сям'ю, класы, нацыі),

дзяржаву з яе існстытутамі, мараль, рэлігію, мастацтва, навуку. Гэтыя элементы маюць больш альбо менш складаную прыроду і самі выступаюць як арганізаванае цэлае. Гэта так званыя структурныя падсістэмы, якія ўтвараюць *сферы грамадскага жыцця – эканамічную, сацыяльную, палітычную і духоўную.* Эканамічная сфера ўключае ў сябе матэрыяльную вытворчасць, а таксама адносіны паміж людзьмі, якія ўзнікаюць з нагоды вытворчасці, абмена, размеркавання і спажывання матэрыяльных каштоўнасцей. Элементамі сацыяльнай сферы з'яўляюцца малыя і вялікія сацыяльныя групы, слаі, класы і нацыі, а таксама формы і спосабы іх узаемадзеяння. Палітычная сфера аб'ядноўвае дзяржаву і яе інстытуты, прававую сістэму, палітычныя партыі і аб'яднанні. Менавіта тут ажыццяўляецца палітычная дзейнасць людзей і ажыццяўляюцца іх палітычныя інтарэсы. У духоўную сферу ўваходзяць мараль, рэлігія, мастацтва, навука, якія разам утвараюць духоўную культуру грамадства. Усе сферы грамадства не толькі ўзаемазвязаны, але і ўзаемаабумоўліваюць адна адну. Так, напрыклад, эканоміка нараджае і абумоўлівае прававыя адносіны, але апошнія самі могуць істотна ўплываць на сферу эканомікі: спрыяць альбо перашкаджаць прытоку інвестыцый, стымуляваць эканамічную актыўнасць людзей альбо стрымліваць яе.

## Крыніцы і фактары сацыяльнай дынамікі

Складанасць грамадства, разнастайнасць яго элементаў і, адначасова, яго цэласнасць ставяць перад даследчыкамі праблему выяўлення і тлумачэння сістэмаўтваральных фактараў сацыяльнай дынамікі. У творчасці Конта, Маркса, Вебера, Сарокіна асновай жыццядзейнасці грамадства выступае *супольная дзейнасць* людзей і *сацыяльныя адносіны* паміж імі. Менавіта дзейнасць з'яўляецца асновай класіфікацыі сфер грамадскага жыцця і ўмовай адзінства грамадства. Пад дзейнасцю разумеюць спецыфічна чалавечую форму актыўных адносін да прыроднага і сацыяльнага свету з мэтай яго змянення і перўтварэння. Сацыяльныя ж адносіны – гэта разнастайныя формы і спосабы сувязей і ўзаемаадносін вялікіх сацыяльных груп, якія ўзнікаюць у працэсе супольнай дзейнасці ў розных сферах грамадскага жыцця.

Розныя аўтары па-рознаму ацэньваюць ролю тых альбо іншых фактараў у жыцці грамадства. Маркс, напрыклад, асновай фарміравання грамадства і ўмовай яго існавання лічыў спосаб матэрыяльнай вытворчасці і характэрныя для яго аб'ектыўныя эканамічныя адносіны. Менавіта яны дэтэрмінуюць віды дзейнасці і характар сацыяльных сувязей. Вебер жа ў якасці асноўнага фактара выдзяляў нарматыўна-каштоўнасныя асновы сацыяльных дзеянняў, характэрныя для розных гістарычных эпох: традыцыйныя і афектыўныя дзеянні традыцыйнага грамадства, каштоўнасна-рацыянальныя дзеянні эпохі перахода ад традыцыйнага да

індустрыяльнага грамадства і мэтарацыянальныя дзеянні індустрыяльнага грамадства. З гэтага вынікае, што ўсе прычыны, якія абумоўліваюць сацыяльную дынаміку, можна раздзяліць на *аб'ектыўныя і суб'ектыўныя фактары.* Да аб'ектыўных фактараў можна аднесці сацыяльна-эканамічныя (узровень развіцця эканомікі, яе характар, патрэбнасці, узровень равіцця навукі і тэхнікі і інш.), прыродна-геаграфічныя (клімат, ландшафт, наяўнасць альбо адсутнасць прыродных рэсурсаў), дэмаграфічныя (колькасць і якасць насельніцтва, суадносіны пакаленняў). Да суб'ектыўных адносяцца этнакультурныя фактары (менталітэт, традыцыі, звычаі, духоўныя каштоўнасці, мэты, інтарэсы). Першыя фактары фарміруюцца незалежна ад волі і свядомасці як асобных індывідаў, так і супольнасцей людзей, другія ж з'яўляюцца вынікам свядомай дзейнасці сацыяльных суб'ектаў.

Неабходна адзначыць той факт, што працэс развіцця грамадства, гэта значыць гістарычны працэс, хоць і ажыццяўляецца праз свядомую дзейнасць людзей, але носіць аб'ектыўны характар і не залежыць ад волі і жаданняў чалавечай супольнасці. Аднак гэта не азначае, што гісторыя грамадства фатальна прадвызначана, а чалавек у гісторыі ўсяго толькі марыянетка. У супольнай арганізаванай дзейнасці людзі здольны вырашаць самыя грандыёзныя задачы, дасягаць самых высокіх мэтаў, але мусяць лічыцца з тымі аб'ектыўнымі фактарамі, якія з'яўляюцца вынікам папярэдняй гісторыі, ад іх волі не залежаць і служаць перашкодай на шляху адвольнага суб'ектывізма. Ігнараванне суб'ектыўнага фактару вядзе да *фаталізма*, які выключае свабоду, а чалавека ператварае ў раба падзей. Недаацэнка ж аб'ектыўнага фактару з'яўляецца асновай *валюнтарызма*, які волю разглядае як вышэйшы і вызначальны фактар гістарычнага працэса. У рэальнай жа гісторыі аб'ектыўны ход падзей дапаўняецца свядомай мэтанакіраванай дзейнасцю людзей.

Менавіта людзі, індывіды і іх супольнасці, выступаюць *суб'ектамі сацыяльнага развіцця.* Гэта народныя масы, сацыяльныя групы, грамадскія аб'яднанні, гістарычныя асобы, якія сваёй дзейнасцю спрыяюць сацыяльнаму прагрэсу. Народ – гэта грамадская супольнасць, якая на канкрэтных этапах гісторыі ўключае ў сябе сацыяльныя слаі і групы, здольныя па свайму рэальнаму становішчу рашаць задачы прагрэсіўнага развіцця грамадства. Дзякуючы сваёй арганізаванасці і ўсведамленню адзінства народ і выступае вырашальнай сілай гістарычнага працэса. Саслоўі, класы і нацыі, якія аб'ядноўваюць вялікія масы людзей, у працэсе сваёй дзейнасці вырашаюць найбольш значныя праблемы грамадскага жыцця. Што да гістарычных асоб, то іх роля ў сацыяльным працэсе тым вышэйшая, чым больш поўна і паслядоўна яны выражаюць, абараняюць і праводзяць у жыццё інтарэсы людзей.

Праблема сацыяльнай дынамікі цесна звязана з пытаннем аб скіраванасці сацыяльных працэсаў. Пытанне гэтае вырашалася

неадназначна. Адны даследчыкі грамадскага жыцця адстойвалі ідэю паступальнага ўзыходжання ад простых і ніжэйшых форм арганізацыі да больш складаных і вышэйшых і абгрунтоўвалі канцэпцыю *сацыяльнага прагрэса.* На пазіцыі сацыяльнага аптымізма стаялі Сен-Сімон, Конт, Гегель. Ідэя прагрэсіўнага ўзыходжання чалавецтва са стану дзікасці да камунізма як "царства свабоды" знайшла абгрунтаванне у сацыяльнай філасофіі Маркса. У XX ст. гэтая ідэя знайшла ўвасабленне ў ідэалогіі тэхнакратызма, заснаванай на веры ў неабмежаваныя магчымасці навукі і тэхнікі і эфектыўнасць кіравання тэхнічных спецыялістаў. Па-рознаму вырашалася і праблема крытэрыяў прагрэсіўнага развіцця. Асветнікі, напрыклад, умовай прагрэсіўнага развіцця лічылі свабодны розум. Марксізм крытэрыем сацыяльнага прагрэса лічыў узровень эканамічнага развіцця. У сучасным грамадазнаўстве сцвярджаецца, што крытэрыем сацыяльнага прагрэса з'яўляецца комплексны паказчык, які ўключае ў сябе становішча чалавека ў грамадстве, узровень яго свабоды, ступень сацыяльнай і экалагічнай бяспекі, мера духоўнасці.

Аднак неадназначнасць сацыяльных працэсаў і супярэчлівасць шляхоў іх развіцця нараджае ідэю *сацыяльнага рэгрэса* і гістарычнага песімізма. Прыхільнікі гэтай ідэі альбо зусім адвяргаюць здольнасць людзей да паступальнага развіцця (канцэпцыя "канца гісторыі" Фукуямы), альбо абмяжоўваюць прагрэсіўныя тэндэнцыі сферай лакальных цывілізацый.

Асноўнымі формамі сацыяльнай дынамікі з'яўляюцца *эвалюцыя* і *рэвалюцыя.* Эвалюцыйныя змены ажыццяўляюцца шляхам паступовага рэфармавання розных бакоў грамадскага жыцця і ўдасканалення заканадаўства ў межах існуючага ладу. Рэвалюцыя ж – гэта форма сацыяльнага развіцця шляхам радыкальных пераўтварэнняў усёй сістэмы грамадскіх адносін з карэнным змяненнем сацыяльна-класавай структуры, палітычных інстытутаў. Рэвалюцыйныя перамены ажыццяўляюцца шырокімі масамі людзей і суправаджаюцца звяржэннем існуючага грамадскага ладу. Часцей за ўсё вынікі эвалюцыйнага і рэвалюцыйнага працэсаў бываюць аднолькавыя, але пры гэтым рэвалюцыя суправаджаецца шматлікімі стратамі і ахвярамі, што ставіць пад сумненне апраўданасць гэтага шляху развіцця.

## Адзінства і разнастайнасць гістарычнага працэса

Паняцце грамадства спалучаецца з уяўленнямі аб краінах і народах, якія існавалі ў розныя часы ў розных рэгіёнах планеты. І першае, што кідаецца ў вочы пры іх параўнанні – гэта непадабенства, унікальнасць гэтых краін, непаўторнасць іх гістарычных шляхоў. Гэта і нараджае ўяўленне аб гісторыі чалавецтва як суіснаванні асобных, непаўторных, унікальных і разнастайных форм супольнага жыцця.

Але як бы ні адрозніваліся адна ад аднае гэтыя краіны, у іх арганізацыі мы знаходзім агульныя для ўсіх элементы: матэрыяльную вытворчасць, класы, палітычныя інстытуты, мараль, права. Гэтая акалічнасць фарміруе ўяўленне аб існаванні ўсеагульных, універсальных форм арганізацыі чалавечага грамадства, аб адзінстве і цэласнасці яго гісторыі.

Гэтыя асаблівасці гістарычнага працэса і нараджаюць розныя падыходы да яго інтэрпрэтацыі: *лінейны, ці стадыяльна-паступальны* і *нелінейны, альбо цывілізацыйны.* Лінейны падыход арыентуе на разуменне гісторыі як паступальнага развіцця да ступеняў усё большай дасканаласці (праграэсізм), альбо паслядоўнага вяртання да простых форм арганізацыі (рэгрэсізм).

Прагрэсістскі варыянт канцэпцыі лінейнага развіцця найбольш паслядоўна ўвасоблены ў марксісцкім вучэнні аб сацыяльна-эканамічнай фармацыі. Паняцце фармацыі фіксуе ўніверсальныя, заканамерныя рысы гістарычнага працэса, яго адзінства. Вучэнне аб фармацыі заснавана на наступных палажэннях: 1)сукупнасць матэрыяльных умоў існавання людзей, г.зн. грамадскае быццё з'яўляецца першасным адносна іх грамадскай свядомасці; 2)асновай грамадства выступае спосаб вытворчасці матэрыяльных даброт з уласцівымі яму прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі; 3)вытворчыя адносіны складаюць эканамічны базіс грамадства, які нараджае і вызначае ўсе іншыя сацыяльныя сферы; 4)на аснове базіса ўзнікае і развіваецца надбудова як сістэма духоўных адносін, ідэй, а таксама арганізацый і ўстаноў, якія кіруюць сацыяльнымі працэсамі; 5)прычынай пераходу ад адной фармацыі да другой з'яўляецца супярэчнасць паміж прадукцыйнымі сіламі і вытворчымі адносінамі, а формай такога пераходу выступае сацыяльная рэвалюцыя; 6) гісторыя грамадства – гэта натуральна-гістарычны працэс паступальнага пераходу ад адной фармацыі да другой у напрамку да камунізма як вышэйшай формы сацыяльнай арганізацыі. *Фармацыя – гэта канкрэтна-гістарычны тып грамадства, які знаходзіцца на пэўнай ступені гістарычнага развіцця, характарызуецца ўласцівымі для яго сувязямі, адносінамі і формамі арганізацыі людзей і функцыянуе і развіваецца паводле сваіх спецыфічных законаў на падставе пэўнага спосабу вытворчасці.*

Найбольш істотнымі недахопамі тэорыі фармацыі з'яўляюцца: звядзенне ўсёй разнастайнасці грамадскага жыцця да эканамічных адносін, ігнараванне лакальных асаблівасцей гістарычнага працэса, недаацэнка па-заэканамічных фактараў сацыяльнага жыцця, перабольшванне ролі гвалту ў гісторыі.

На пераадоленне гэтых недахопаў і скіраваны нелінейны падыход, які рэалізаваны ў дзвюх формах: цывілізацыйнай і культуралагічнай. Упершыню паняцце цывілізацыі прымяняецца ў творах французскіх асветнікаў для абазначэння грамадства, заснаванага на прынцыпах розуму і

справядлівасці. Пазней змест паняцця цывілізацыі мяняецца. Яго прымяняюць альбо для абазначэння ўзроўню развіцця рэгіёна ці этнаса (антычная цывілізацыя, кітайская цывілізацыя), альбо для выдзялення стадыі заняпаду культуры (Шпенглер), альбо як сінонім культуры (Тойнбі). Але якое б значнне ні надавалі паняццю цывілізацыі, агульнапрызнаным з'яўляецца тое, што цывілізацыя азначае ўласна сацыяльную форму арганізацыі людзей, якая істотна адрозніваецца ад эпохі дзікасці і варварства. Прыкметамі цывілізацыі з'яўляюцца: 1)наяўнасць вытворчасці як сродка задавальнення чалавечых патрэбнасцей; 2)грамадскі падзел працы; 3)выдзяленне сям'і ў якасці самастойнага элемента грамадства; 4)сацыяльны спосаб арганізацыі людзей; 5)сукупнасць традыцый, звычаяў і рэлігійных уяўленняў, якія вызначаюць адносіны да прыроды і чалавека; 6)наяўнасць сістэмы пазітыўных ведаў, якая пастаянна пашыраецца і развіваецца.

Паняцце цывілізацыі фіксуе разнастайнасць форм гістарычнага працэса, унікальнасць гістарычнага лёсу краін і народаў, непаўторнасць сістэмы сацыяльных і духоўных каштоўнасцей, адметнасць геапалітычнага становішча. Любая цывілізацыя характарызуецца спецыфічным для яе ладам жыцця, сістэмай каштоўнасцей, светапоглядам.

*Цывілізацыя – гэта ўстойлівая культурна-гістарычная супольнасць людзей, якая адрозніваецца агульнасцю духоўных каштоўнасцей і культурных традыцый, адметнасцю ладу жыцця і тыпу асобы, наяўнасцю агульных этнічных прыкмет і адпаведных геаграфічных межаў.*

Разуменне цывілізацыі як стадыі ў развіцці грамадства (на такіх пазіцыях стаялі Бэл, Тофлер, Бжэзінскі) дапаўняецца ўяўленнем аб цывілізацыі як сукупнасці адметных рысаў культуры, эканомікі, традыцый, звычаяў асобных краін і народаў, альбо культурна-гістарычным тыпе. Такое разуменне цывілізацыі і з'яўляецца асновай культуралагічнага падыходу да ацэнкі гістарычнага працэса як змены ўнікальных лакальных культур. Напрыклад, заснавальнік гэтай канцэпцыі Данілеўскі выдзяляў егіпецкую, кітайскую, індыйскую, яўрэйскую, германа-раманскую, рускую цывілізацыі.

Відавочна, што паняцце цывілізацыі прызначана для таго, каб адрозніць грамадства, якое задавальняе свае патрэбнасці шляхам прысваення прыроднага прадукта, г.зн. грамадства эпохі дзкасці і варварства, ад грамадства, заснаванага на вытворчасці. Цывілізаванае грамадства ў яго гісторыі прадстаўлена двума тыпамі: традыцыйным і тэхнагенным. Яно праходзіць такія стадыі развіцця, як аграрна-тэхнічная, індустрыяльная і постіндустрыяльная. Індустрыяльная цывілізацыя характарызуецца высокім узроўнем развіцця прамысловасці, шырокай вытворчасцю тавараў масавага спажывання, дынамізмам і скіраванасцю на ўсё новае. Гэтыя рысы дапаўняюцца ў постіндустрыяльным грамадстве перавагай сферы паслуг, вядучай роллю навукі і інфармацыі,

індывідуалізацыяй вытворчасці і спажывання, ростам удзельнай вагі “сярэдняга класа”.

Высокі ўзровень тэхналагізацыі і тэхнізацыі сучаснага грамадства на аснове навукі адкрывае перад чалавекам па сутнасці неабмежаваныя магчымасці ў пераўтварэнні свету і задавальненні сваіх патрэбнасцей. Пры гэтым пераадольваюцца адрозненні ў эканоміцы, культуры, традыцыях розных народаў, ажыццяўляецца збліжэнне іх з дапамогай навейшых тэхналогій, міжнародных інстытутаў і агульначалавечых каштоўнасцей. Глабалізацыя і інтэграцыя вядуць да сцірання нацыянальна-культурнай спецыфікі народаў, разбурэння нацыянальных каштоўнасцей. Разам з тым, адзначаныя фактары нараджаюць і шматлікія негатыўныя з’явы, якія, нарастаючы, пачынаюць пагражаць самому існаванню чалавека і атрымалі назву глабальных праблем сучаснасці. Сярод гэтых праблем галоўнымі з’яўляюцца праблема прадухілення новай сусветнай вайны, экалагічная і дэмаграфічная праблемы, праблема нераўнамернасці сацыяльнага развіцця і інш.

Сфармулюем асноўныя палажэнні тэмы:

*1)грамадства з’яўляецца вынікам супольнай дзейнасці людзей і выступае складанаарганізавай, здольнай да самаразвіцця сістэмай. Грамадства нельга зводзіць да сумы індывідаў, а належыць разглядаць як сістэму сувязей, адносін і форм арганізацыі людзей;*

*2)асновай грамадскага жыцця і формай актыўных адносін чалавека да свету з’яўляецца сацыяльная дзейнасць, адметныя формы якой нараджаюць сферы грамадскага жыцця: эканамічную, сацыяльную, палітычную і духоўную;*

*3)грамадства ўяўляе сабой структураваную цэласнасць, якая ўключае ў сябе разнастайныя сацыяльныя групы, што класіфіцыруюцца на падставе класавага, этнічнага, дэмаграфічнага і іншых прынцыпаў;*

*4)дынаміка сацыяльных працэсаў абумоўлена спалучннем аб’ектыўных і суб’ектыўнах фактараў, важнейшымі сярод якіх з’яўляюцца сацыяльна-эканамічныя патрэбнасці і інтарэсы,прыродныя ўмовы, нацыянальны характар, духоўныя арыентацыі. Суб’ектамі сацыяльных дзеянняў выступаюць народ, класы, нацыі, гістарычныя асобы;*

*5)у сучаснай сацыяльнай філасофіі існуюць стадыяльна-паступальны (лінейны) і цывілізацыйны (нелінейны) падыходы да ацэнкі характару гістарычнага працэса, якія найбольш поўна і паслядоўна ўвасоблены ў тэорыях фармацыі і цывілізацыі;*

*6)сучасны этап чалавечай гісторыі носіць пераходны характар і звязаны з пераходам да постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства, мэта якога – трывалы мір, высокая якасць жыцця, самавызначэнне асобы.*

# ТЭМА 11. ФІЛАСОФІЯ КУЛЬТУРЫ

## Культура як аб'ект філасофскага аналіза

Цікаўнасць да культуры ў нашы дні вызначаецца шматлікімі акалічнасцямі. Сучасная цывілізацыя імкліва пераўтварае навакольнае асяроддзе, сацыяльныя інстытуты, сферу быта. У гэтым выпадку культура паўстае як фактар творчага ўладкавання жыцця, крыніца сацыяльных навацый. Адсюль імкненне выявіць патэнцыял культуры, яе ўнутраныя рэзервы, адшукаць магчымасці актывізацыі яе. Ставячыся да культуры як да сродка самарэаліацыі чалавека, можна выявіць новыя імпульсы, здольныя аказаць уплыў на гістарычны працэс, на самога чалавека. Таму сучасная філасофія ставіцца да культуры як да фактару сацыяльнага развіцця. Яна прыходзіць да высновы, што сацыяльна-гістарычная дынаміка вызначаецца духоўнымі рысамі грамадства.

Інтарэс філасофіі да культуры абумоўлены і тым разрывам, які ўзнікае паміж самаадчуваннем індывіда і безасабовай культурнай плынню. Як узнікае традыцыя, чаму непрадказальнымі з'яўляюцца наступствы культурных акцый, які вынік развіцця цывілізацыі? Гэтыя пытанні на сучасным этапе маюць не толькі тэарэтычнае, але і вялікае практычнае значэнне.

Зварот да культуры інспіраваны таксама і сучаснай экалагічнай сітуацыяй. Разбурэнне асноўных сфер існавання чалавека з непазбежнасцю вядзе да пытання: "А ці не супярэчыць культура "натуры"? Ці ёсць спосаб гарманізацыі адносін паміж культурай і прыродай?"

Актуальны і яшчэ адзін аспект філасофскага аналіза – культура і грамадства. Як культурны працэс уплывае на сацыяльную дынаміку? Што нясе культурны рух гісторыі? У мінулым сацыяльны цыкл быў значна карацейшы за культурны. Культура не мянялася на працягу стагоддзяў, паўставала перад кожным індывідам і генерацыяй як штосьці вечнае і нязменнае і надавала адзінства гістарычнаму працэсу. У XX ст. на працягу жыцця аднаго пакалення змяняецца некалькі культурных эпох. І вельмі важна ведаць, ці здолее чалавек адаптавацца да гэтых радыкальных перамен, ці зможа ён прыстасавацца да новых культурных імператываў.

У паняцці культуры знаходзіць адлюстраванне ўсведамленне чалавекам сваёй самастойнай ролі ў рэальным свеце, толькі яму ўласцівай актыўнасці, якая не зводзіцца да дзеяння ні прыродных, ні боскіх сіл. Культура, такім чынам, гэта культ чалавека. Культура – гэта ўзвышэнне чалавека і чалавечнасці да іх сапраўднай існасці. Культура аўтарытэт прыроды і ўлады падпарадкоўвае аўтарытэту чалавека, падначальвае праву чалавека на ўласную думку, уласную творчасць, уласны лёс. У культуры чалавек упершыню дасягае сваёй сапраўднай існасці – чалавечнасці і,

пераадольваючы сваю абмежаваную прадметнасць, узвышаецца да духоўнай бессмяротнасці.

Галоўны прынцып культуры, якую ствapae і кантралюе чалавек, заключаны ў формуле: “Чалавек – творца культуры”. Дзякуючы сваёй здольнасці паляпшаць, удасканальваць дадзенае прыродай, надаваць яму высакароднасць, чалавек узвышаецца над абмежаванасцю фізічнага існавання. Ад прыроды істота фізічна канечная, чалавек, дзякуючы сваёй дзейнасці, стварае тое, чаго няма ў прыродзе і гэтым як бы пераадольвае сваю канечнасць, далучаецца да гармоніі цэлага. Узнікненне паняцця культура фіксавала факт эмансіпацыі чалавека ад боскага і прыроднага свету. Гэтае паняцце азначала сферу рэчаіснасці, дэтэрмінаваную не прыроднай неабходнасцю і не боскай вышэйшай воляй, а ўласнай чалавечай дзейнасцю ў якасці самастойнай і свабоднай істоты. Свет культуры – гэта свет чалавека, ад пачатку і да канца створаны ім самім Культура ў класічным разуменні – гэта адмыслова чалавечая дзейнасць, яе прадметная і інстытуцыянальная аб’ектывацыя. Такі падыход дазваляў зразумець: 1)чаму практычная дзейнасць ёсць субстанцыяй культуры; 2)як у культуры і праз культуру адбываецца фарміраванне чалавечых якасцей; 3)як прыродныя схільнасці і патрэбнасці робяцца патрэбнасцямі і схільнасцямі чалавечымі.

## Асноўныя канцэпцыі культуры

Тэрмін культура ўзнікае ў XVIII ст. для абазначэння працэса і вынікаў пераўтварэння прыроды ў штучнае асяроддзе існавання чалавека. Паняцце культура, па-першае, фіксуе агульнае адрозненне чалавечай жыццядзейнасці ад біялагічных форм жыцця. У гэтым сэнсе культура ёсць сферай спецыфічна чалавечай жыццядзейнасці ў розных формах яе праяўлення. Па-другое, культура – гэта аб’ектывізаваны змест разнастайнай чалавечай дзейнасці, зафіксаваны ў адпаведных сацыяльных каштоўнасцях ад звычаяў і традыцый да філасофскіх тэорый. Праз гэтыя аб’ектывацыі ажыццяўляецца сацыялізацыя чалавека, уключэнне кожнага ў сацыяльна-культурную творчасць.

Але ж формы жыццядзейнасці чалавека вельмі разнастайныя, яшчэ большай разнастайнасцю характарызуюцца вынікі гэтай дзейнасці. І ў залежнасці ад таго, якім формам дзейнасці і якім вынікам яе надаецца больш значнасці ў культуратворчым працэсе, розныя даследчыкі прапануюць розныя канцэпцыі культуры. Асноўнымі сярод іх з’яўляюцца *натуралістычная, класічная, некласічная і постмадэрнісцкая.* Першая звязана са спробай вывядзення культуры з нязменнай натуральнай прыроды чалавека. Культура тут разглядаецца як сістэма механізмаў і інстытутаў, якія забяспечваюць жыццё людзей у адпаведнасці з патрабаваннямі і патрэбнасцямі іх “натуральнай” прыроды.

Класічная канцэпцыя атаясамлівае культуру з формамі духоўнага і палітычнага развіцця грамадства, заснаванымі на розуме. Культура паўстае тут як духоўнае багацце грамадства і ўнутраны здабытак чалавека, у аснове якога ляжыць імкненне да ісціны, дабра і прыгажосці.

Некласічная канцэпцыя тлумачыць культуру як сістэму каштоўнасцей і ідэй, якія з'яўляюцца арганічнай часткай сацыяльнай сістэмы, надаюць ёй уладкаванасць і забяспечваюць кіраванне ёю.

Постмадэрнісцкая канцэпцыя ўяўляе культуру як пазбаўленую ўсеагульнасці ацэнтрычную сістэму знакаў, якія забяспечваюць больш-менш надзейную арыентацыю чалавека ў навакольным, найперш – сацыяльным, асяроддзі.

У межах гэтых канцэптуальных мадэлей культуры сфарміраваліся розныя падыходы ў даследаванні яе: аксіялагічны, сацыялагічны, семантычны, дзейнасны і інш. Аксіялагічны падыход разглядае культуру як адзінства матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, якія забяспечваюць годны чалавека лад жыцця. З пункту гледжання сацыялагічнага падыходу культура – гэта сістэма сацыяльных інстытутаў, якія забяспечваюць трансляцыю норм і правіл чалавечай жыццядзейнасці. Семантычны падыход звязаны з разуменнем культуры як сукупнасці знакаў (сацыякодаў), якія служаць арыенцірамі ў жыцці чалавека і яго дзейнасці.

Найбольш распрацаваным з'яўляецца дзейнасны падыход да тлумачэння культуры, дзе культура разглядаецца як вынік практычнай дзейнасці людзей. Гэтыя вынікі матэрыялізуюцца, ці дакладней – аб'ектывізуюцца ў тых або іншых прадметах ці духоўных каштоўнасцях. Толькі ў працэсе светапераўтваральнай творчай дзейнасці чалавек уваходзіць у сферу сацыяльнасці, сацыяльнага бытавання, у сферу культуры. У гэтай дзейнасці ствараецца спецыфічна чалавечы свет, які паўстае як сацыльная рэальнасць. Толькі ў працэсе аб'яднання прыродных якасцей і творчай дзейнасці чалавек стварае свой чалавечы свет і самога сябе як чалавека. З гэтага пункту гледжання культура ёсць: 1)дзейнасць грамадскага чалавека, якая ажыццяўляецца ў пэўных гістарычных умовах і скіравана на стварэнне матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей; 2)сукупнасць гэтых каштоўнасцей як вынікаў дзейнасці; 3)працэс аднаўлення гэтых каштоўнасцей. Адсюль вынікае, што *культура – гэта створаны людзьмі свет спецыяфічна чалавечай жыццядзейнасці, а таксама сродкі і спосабы яе здзяйснення, дзе ўвасабляюцца мэты, ідэалы, нормы і каштоўнасці грамадства.*

Культура азначае: 1)сферу жыццядзейнасці чалавека; 2)спосабы і сродкі ажыццяўлення дзейнасці і яе вынікі; 3)спосабы наследавання сацыяльнага цела і сацыяльнай памяці; 4)якасны стан чалавечай супольнасці; 5)сродак сацыялізацыі індывіда; 6)праяўленне актыўнасці чалавека; 7)спосаб пераўтварэння індывідуальнага ў агульназначнае.

## Структура культуры

Чалавек, як вядома, істота біясацыяльная. Працэс яго жыццядзейнасці – гэта працэс задавальнення разнастайных матэрыяльных і духоўных патрэбнасцей. На гэтай падставе і ўсе вынікі чалавечай дзейнасці, альбо культуру можна раздзяліць на *матэрыяльную і духоўную.* Матэрыяльная культура ўключае ў сябе сферу вытворчасці і засваення прадметнага свету: будынкі і збудаванні, тэхналогіі вытворчасці і маніпулявання матэрыяльнымі аб'ектамі, устойлівыя сувязі паміж людзьмі і формы, спосабы і сродкі рэгулявання адносін паміж імі (сям'я, працоўны калектыў, дзяржава). Гэта азначае, што пад матэрыяльнай культурай разумеюць дзейнасць, скіраваную на вытворчасць і аднаўленне каштоўнасцей, здольных задавальняць матэрыяльныя патрэбнасці людзей, а таксама вынікі, спосабы ажыццяўлення і рэгуляцыі гэтай дзейнасці.

Духоўная культура складаецца з ідэалаў і ідэй, праграм зносін і паводзін людзей, працэсаў духоўнай вытворчасці, маральна-эстэтычных, навуковых і рэлігійных каштоўнасцей. Базіснымі элементамі духоўнай культуры з'яўляюцца традыцыі, звычаі, норавы, законы, каштоўнасці, якія разам утвараюць нарматыўную сістэму культуры. Гэтая сістэма і ажыццяўляе рэгуляцыю паводзін чалавека, яна паказвае, што, як і ў якіх сітуацыях яму належыць рабіць. Каштоўнасці і нормы з'яўляюцца эфектыўнымі сродкамі фарміравання культурнага асяроддзя. Духоўная культура, выконваючы функцыю сацыялізацыі індывіда, фарміруе светапоглядныя ўяўленні, стыль мыслення і спосаб паводзін. Культура выконвае задачу сувязі індывідаў у супольнасць і забяспечвае злучнасць пакаленняў.

Вядома, падзел культуры на матэрыяльную і духоўную вельмі ўмоўны. Ён заснаваны на дзвюх асноўных формах дзейнасці чалавека: матэрыяльна-практычнай і духоўна-мастацкай. Але калі ўсё ж улічыць, што канчатковай мэтай гэтай дзейнасці ёсць ачалавечванне нечалавечага свету, то культура – гэта адзіны працэс пераводу рэчаіснасці са стану натуры ў стан роднаснай чалавеку духоўнасці.

Кожнае грамадства стварае складаную сістэму культурных каштоўнасцей, якія адрозніваюцца як па спосабу іх вытворчасці, так і па формах функцыянавання, сферы распаўсюджання і ўтвараюць сферы культуры: эканамічную, палітычную, мастацкую, маральную ды іншыя. Сферы культуры выступаюць элементамі тыпаў культуры – канкрэтна-гістарычных сукупнасцей норм і каштоўнасцей, якія ўтвараюць цэласныя і адносна замкнутыя сістэмы. З гэтага пункту гледжання выдзяляюць *дамінуючую, элітарную, народную, масавую культуру і субкультуру.*

Дынаміка культуры – гэта складаны працэс вытворчасці, назапашвання і трансляцыі культурных каштоўнасцей, які характарызуецца спалучэннем разнастайных механізмаў, форм і спосабаў

культуратворчасці. З аднаго боку, гэты працэс звязаны з напрацоўкай, захаваннем і перадачай новым пакаленням культурных каштоўнасцей і “тэхналогій” іх вытворчасці, а з другога – вынаходніцтвам новых творчых тэхналогій і стварэннем новых культурных аб’ектаў.

Першая тэндэнцыя ўвасабляецца ў пераемнасці, якая ўказвае на сувязь паміж культурнымі эпохамі і стылямі, наследаванне і захаванне ідэй, творчых прынцыпаў і прыёмаў. Пераемнасць у культуры існуе як традыцыя і як захаванне. Культурная традыцыя звязана з засваеннем і наследаваннем ідэй, гіпотэз, прыёмаў культуратворчасці, што вядзе да накаплення і памнажэння культурных каштоўнасцей і забяспечвае сувязь культур розных часоў і народаў. Захаванне ж – гэта наследаванне не асобных кампенентаў культуратворчасці альбо актуальных ідэй, а духоўна-культурных каштоўнасцей як цэлага. Пераемнасць – гэта не проста паўтарэнне, кананізацыя, а творчы адбор і трансляцыя лепшага ў суполным культурным вопыце чалавецтва.

Другая тэндэнцыя ажыццяўляецца ў інавацыйных працэсах, у наватарстве, якое звязана са стварэннем новых культурных узораў, памнажэннем культурных каштоўнасцей. Дзякуючы наватарству ў культуры з’яўляюцца новыя жанры і стылі, новыя навуковыя тэорыі, новыя ідэалы і каштоўнасці. Гісторыя культуры, такім чынам, паўстае як гісторыя захавання, узбагачэння і развіцця культурных каштоўнасцей.

Як элемент грамадства, культура выконвае шэраг надзвычай важных сацыяльных функцый. *Аксіялагічная* функцыя выражае здольнасць культуры напрацоўваць і прапаноўваць чалавеку сістэму каштоўнасцей і каштоўнасных арыентацый, якія, будучы засвоенымі чалавекам, напаўняюць яго жыццё значэннем і сэсам, гарманізуюць і гуманізуюць яго. *Адаптацыйная* функцыя праяўляецца ў тым, што культура праз разнастайныя нормы і ўзоры паводзін дапамагае чалавеку прыстасавацца да зменлівага прыроднага і сацыяльнага асяроддзя і прыстасаваць гэтае асяроддзе да сваіх патрэб і інтарэсаў. *Нарматыўная* функцыя адлюстроўвае здольнасць культуры ствараць ідэалы і нормы, а таксама культурныя праграмы, якія фарміруюць стандарты паводзін, вызначаюць каштоўнасныя арыентацыі людзей і ўплываюць на лад жыцця і спосабы дзейнасці. Функцыя *сацыялізацыі* праяўляецца ў тым, што засваенне культурных каштоўнасцей у працэсе навучання і выхавання фарміруе ў індывіда сацыяльныя рысы, якія злучаюць яго з грамадствам і надаюць асобе здольнасць да адказнай і сацыяльна значнай дзейнасці. *Інтэгратыўная* функцыя праяўляецца ў здольнасці культуры аб’ядноўваць людзей на падставе адзіных каштоўнасцей і нормаў, якія адначасова і адрозніваюць адны супольнасці ад другіх, надаючы ім культурную адметнасць. *Знакава-сімвалічная (сігніфікатыўная)* функцыя звязана са здольнасцю культуры выступаць у якасці знакаў, у якіх захоўваецца сэнс і значэнне культурных каштоўнасцей. Спасціжэнне культуры – гэта, па

стунасці, разшыфроўка і засваенне яе знакаў і сімвалаў і спасціжэнне на гэтай аснове сэнса жыцця і гісторыі. Важнае значэнне мае *камунікатыўная* функцыя культуры як сродка зносін людзей, абмена вопытам і ведамі, перадачы, прыёма і асэнсавання інфармацыі. *Дзейнасна-творчая* функцыя адлюстроўвае актыўную, канструктыўную прыроду культуры, яе здольнасць стымуляваць творчую актыўнасць людзей з дапамогай назапашанага сацыяльнага досведу.

## Асноўныя формы культуратворчасці

Асноўнымі формамі культуратворчасці з’яўляюцца мараль, мастацтва і рэлігія.

*Мараль* – гэта спецыфічная сфера культуры, у якой ствараюцца, назапашваюцца і абагульняюцца ідэі, нормы і правілы паводзін, што рэгулююць дзейнасць чалавека ў розных галінах грамадскага жыцця, ацэньваюць чалавека з пазіцый дабра і зла і карэлююць інтарэсы асобы і грамадства. Такое азначэнне маралі патрабуе адрозніваць яе ад *маральнасці (нравственности)*, пад якой звычайна разумеюць сукупнасць правіл паводзін у штодзённым жыцці. Мараль арыентуе чалавека на тое, што і як ён *павінен* рабіць, а маральнасць паказвае *як* рэальна паводзіць сябе чалавек у канкрэтных умовах.

Мараль характарызуецца імператыўнасцю, яна патрабуе ад чалавека належных паводзін і ўказвае не на тое, што ёсць, а на тое, як павінна быць. Нормы маралі носяць абагульнены, светаўяўленчы характар і праяўляюцца ў маральным выбары і асабістай арыентацыі чалавека. Мараль закранае ўсе сферы жыццядзейнасці, таму яе патрабаванні маюць усеагульны і ўсёпранікальны характар. Яны адносяцца да ўсяго грамадства, да груп людзей, да кожнага чалавека: захоўвай сваю годнасць, будзь чалавекам.

Структура маралі носіць шматузроўневы характар. Найбольш простымі з’яўляюцца *нормы паводзін:* не забі, не ўкрадзь, не падмані. У нормах сканцэнтраваны шматвяковы досвед чалавецтва. Больш складаным элементам маралі выступаюць *маральныя якасці* (дабразычлівасць, разважлівасць, шчодрасць). З глыбокай даўніны ў чалавеку шануюцца мудрасць, памяркоўнасць, мужнасць, справядлівасць. Значнае месца ў структуры маралі належыць *маральным прынцыпам,* якія звязваюць маральныя якасці ў адзіную сістэму і вызначаюць стыль паводзін. Гэта калектывізм, індывідуалізм, эгаізм, альтруізм. Прынцыпы надаюць устойлівасць маральным арыентацыям чалавека і не дазваляюць яму сыйсці з маральнага шляху. Маральныя прынцыпы суадносяцца з *маральнымі ідэаламі*, у якіх увасабляюцца канечныя мэты маральнага развіцця. Асновай маральнай арыентацыі асобы з’яўляюцца *вышэйшыя маральныя каштоўнасці* (дабро, зло, любоў, абавязак, сумленне), якія выступаюць у якасці механізмаў маральнага самакантролю асобы.

Са структуры маралі вынікаюць і яе функцыі. Адной з найбольш значных з'яўляецца *гуманізуючая* функцыя, якая выяўляе здольнасць маралі надаваць адносінам паміж людзьмі чалавечнасць, рабіць годнымі нашы ўчынкі. *Рэгулятыўная* функцыя адлюстроўвае ролю маралі ў каардынацыі ўчынкаў, рэгуляванні паводзін. *Каштоўнасна-арыенціровачная* функцыя праяўляецца ў тым, што мараль прапануе чалавеку сістэму каштоўнасцей, якія надаюць жыццю сэнс і значэнне і вызначаюць адносіны чалавека да свету, іншых людзей і самога сябе. *Пазнавальная функцыя* маралі заключаецца ў спасціжэнні сэнсу з'яў навакольнага свету, у пазнанні мэтаў і каштоўнасцей чалавечага жыцця. З гэтым цесна звязана фукцыя *выхавання.* Некаторыя даследчыкі выдзяляюць таксама *імператыўную, прагнастычную і камунікатыўную* функцыі.

Такім чынам, *мараль – гэта сукупнасць норм, прынцыпаў і ідэалаў, якія рэгулююць адносіны паміж людзьмі з пазіцый дабра і зла. Гэтыя нормы фарміруюцца гістарычна і залежаць ад асаблівасцей будовы грамадства і ўзроўню яго развіцця. Яны ахопліваюць усе бакі жыцця грамадства, гуманізуюць чалавечыя адносіны і з'яўляюцца абавязковымі для выканання паводле грамадскай думкі, звычаяў і традыцый і рэалізуюцца ў працэсе маральнага выбару асобы.*

У працэсе практычнага пераўтварэння свету чалавек не толькі задавальняе свае жыццёвыя патрэбнасці, але і заўважае сіметрыю, уладкаванасць, гарманічнасць свету і яго элементаў. Пачуцці, якія ўзнікаюць у чалавека ў працэсе ўспрыняцця і перажывання гармоніі і суладдзя свету, называюцца эстэтычнымі пачуццямі. У гэтых пачуццях зафіксавана не прагматычная карыснасць прадмета, а яго здольнасць нараджаць задавальненне, асалоду, спецыфічнае здавальненне. Гэтыя пачуцці – адметнасць эстэтычных адносін да свету. *Эстэтычнымі называюцца такія адносіны, якія пазбаўлены ўтылітарна-прагматычнага характару і нараджаюць мастацкія вобразы, што маюць для чалавека самастойную каштоўнасць.*

Вышэйшай формай эстэтычнай дзейнасці з'яўляецца *мастацтва.* Паняцце мастацтва ўжываецца ў шырокім і вузкім значэнні. У шырокім значэнні мастацтва азначае вышэйшы ўзровень майстэрства незалежна ад сферы яго праяўлення. У вузкім значэнні пад мастацтвам разумеюць спецыфічную форму духоўнай дзейнасці, у працэсе якой ствараюцца эстэтычныя каштоўнасці. Мастацтва як феномен культуры дзеліцца на шэраг відаў, якія характарызуюцца спецыфічнай мовай, уласнай знакавай сістэмай, адметнымі сродкамі выяўлення. Мастацкая дзейнасць з'яўляецца ўмовай узнікнення і асновай існавання мастацкай культуры. Яе існаванне абумоўлена двума фактарамі. З аднаго боку, мастацтва існуе ў межах арганізацыйных структур, якія забяспечваюць тварэнне, функцыянаванне і трансляцыю эстэтычных каштоўнасцей. Гэта адукацыйныя і выдавецкія

ўстановы, навукова-даследчыя арганізацыі, музеі, сродкі масавай камунікацыі. З другога боку, мастацтва немагчыма без творчай эстэтычнай дзейнасці і па-за ёю. Гэта выяўленчыя сродкі, мастацкія тэхналогіі, стылі, асаблівасці адносін паміж творамі мастацтва і рэцыпіентамі.

Асаблівасцю мастацкай культуры з'яўляецца яе пачуццёва-вобразны характар. Мастацтва адлюстроўвае свет не ў сухіх і абстрактных паняццях, як навука, а ў жывых, канкрэтных, прывабных мастацкіх вобразах. Пры гэтым мастацтва не капіруе свет, а творча пераасэнсоўвае яго, стварае сваю ўласную рэчаіснасць, у якой аб'ектыўныя ўласцівасці прадметаў арганічна спалучаюцца з перажываннямі чалавека-творцы. У мастацкім вобразе прадмет адлюстраваны не такім, якім ён ёсць, а такім, якім яго бачыць, ці хоча бачыць чалавек. Дзякуючы гэтаму ў мастацтве нават звычайныя прадметы набываюць эстэтычную значнасць, здольнасць выклікаць у нас эстэтычныя пачуцці.

Мастацтва праз эстэтычнае ўздзеянне ўключае людзей у актыўнае грамадскае жыццё, фарміруе імкненне змяніць гэтае жыццё ў адпаведнасці з эстэтычнымі і маральнымі ідэаламі. Яно фарміруе эстэтычны густ і развівае эстэтычныя здольнасці чалавека, узвышае яго, выступае сродкам зносін паміж людзьмі. Мова мастацтва, наднацыянальная па самой сваёй сутнасці, дапамагае пераадолець моўныя, нацыянальныя адрозненні, збліжае людзей, узбагачае іх зносіны.

Такім чынам, *мастацкая культура з'яўляецца вынікам эстэтычнай дзейнасці, у аснове якой ляжыць свабодная творчасць і развітая эстэтычная свядомасць. Эстэтычная дзейнасць – гэта пазбаўленая прагматызма і спажывальніцтва дзейнасць паводле законаў прыгажосці. Вышэйшай праявай гэтай дзейнасці з'яўляецца мастацтва як адлюстраванне прыроднага і сацыяльнага свету ў мастацкіх вобразах. Функцыі, якія выконвае мастацтва, робяць яго надзвычай важным элементам культуры, які спрыяе гуманізацыі і эстэтызацыі міжчалавечых адносін.*

Важнае месца ў духоўнай культуры чалавецтва належыць рэлігіі. *Рэлігія – гэта светапогляд і адпаведны яму тып паводзін, заснаваны на веры ў існаванне звышнатуральных сіл.* Структурна рэлігія складаецца з трох асноўных узаемазвязаных элементаў: рэлігійнай свядомасці, рэлігійнага культа і рэлігійнай арганізацыі. Злучаюцца гэтыя элементы ў адзінае цэлае верай – асновай любой рэлігіі. Сутнасць рэлігійнай свядомасці праяўляецца ў імкненні дзяліць свет на прыродны і звышнатуральны, супрацьпастаўляць іх адзін аднаму. Гэтая свядомасць перакanaна ў перавазе звышнатуральнага над прыродным і магчымасці ўстанаўлення сувязі паміж імі на падставе веры і культавых дзеянняў.

Рэлігія выконвае шэраг значных як для вернікаў, так і для ўсяго грамадства функцый. Важнейшымі сярод іх з'яўляюцца светаўяўленчая, кампенсаторная, камунікатыўная, рэгулятыўная, культуратрансляцыйная.

Рэлігія прапануе людзям сістэму поглядаў на будову свету і месца ў ім чалавека, вызначае формы і спосабы адносін да свету, іншых людзей і свамога сябе і забяспечвае арыентацыю ў свеце, выбар жыццёвага шляху. Рэлігія даазваляе кампенсаваць недахопы рэчаіснасці, пераадолець уласную слабасць. Яна аб'ядноўвае людзей, забяспечвае іх зносіны паміж сабой і з Богам, прадпісвае нормы і правілы паводзін. Нарэшце, рэлігія назапашвае, зберагае і перадае ад аднаго пакалення да другога культурныя каштоўнасці. Яна дае чалавеку надзею, напаўняе яго ўпэўненасцю, стымулюе імкненне да маральнай чысціні. Назапашаны рэлігіяй духоўны патэнцыял спрыяе гуманізацыі грамадства.

Такім чынам, *рэлігія выступае арганічным элементам духоўнай культуры, заснаваным на фантазіі і інтуіцыі. Яна таму не можа характарызавацца ў катэгорыях ісціны і ілжы, а яе ацэнка магчыма толькі з пункту гледжання той ролі, якую рэлігія выконвае ў жыцці асобнага чалавека і грамадства. Дастаткова таго, што ў веры людзі знаходзяць суцяшэнне і надзею, вера дае ім свае адказы на пакутлівыя пытанні аб сэнсе жыцця, смерці і бессмяротнасці.*

Зробім высновы са сказанага:

*1)культура з'яўляецца вынікам дзейнасці чалавека і спосабам выяўлення яго творча-актыўнай канструктыўнай прыроды, паказчыкам чалавечнасці чалавека і крытэрыем яго свабоды;*

*2)пад культурай разумеюць складаную сістэму гістарычна зменлівых праграм дзейнасці людзей, іх зносін і паводзін, заснаваных на сацыяльнай інфармацыі. Гэтыя праграмы забяспечваюць адпаведныя гістарычным умовам спосабы рэгуляцыі, захавання, аднаўлення і развіцця як грамадства, так і асобнага чалавека;*

*3)у залежнасці ад спосабаў вытворчасці культурных каштоўнасцей і спецыфікі патрэбнасцей, якія яны задавальняюць, выдзяляюць культуру матэрыяльную і духоўную. Гэтыя каштоўнасці ўтвараюць сферы культуры, якія з'яўляюцца асновай тыпаў культур: дамінуючай, элітарнай, народнай, масавай і субкультуры;*

*4)асноўнымі фармамі культуратворчасці з'яўляюцца мараль, мастацтва і рэлігія.*

## Слоўнік асноўных тэрмінаў
## па другому раздзелу

**Аб’ект** – існуючы па-за свядомасцю і незалежна ад яе знешні свет, які з’яўляецца прадметам пазнання альбо практычнага ўздзеяння суб’екта.

**Аб’ектыўная ісціна** – незалежны ад волі і жаданняў суб’екта змест чалавечых ведаў.

**Абсалютная ісціна** – поўныя, вычарпальныя, непадлеглыя абвяржэнню веды аб прадмеце.

**Абстракцыя** – лагічная працэдура мысленнага адцягнення ад шэрагу прыкмет прадмета з адначасовым выдзяленнем іншых яго прыкмет.

**Адлюстраванне** – усеагульная ўласцівасць матэрыі як здольнасць адной матэрыяльнай сістэмы ў працэсе ўзаемадзеяння аднаўляць унутры сябе пэўныя асаблівсці другой сістэмы; фундаментальная перадумова свядомасці.

**Адносная ісціна** – веды, залежныя ад умоў, якія абмяжоўваюць іх дакладасць і паўнату.

**Адчуванне** (ощущение) – здольнасць псіхікі фіксаваць асобныя прыкметы прадмета, пачуццёвы вобраз асобных бакоў і прыкмет прадмета, які ўзнікае ў працэсе непасрэднага ўздзеяння яго на органы пачуццяў.

**Аксіяматычны метад** – спосаб пабудовы навуковай тэорыі шляхам фармулёўкі сістэмы аксіём (пастулатаў) і правіл вывядзення, з дапамогай якіх дэдуктыўна выводзяцца тэарэмы (палажэнні) тэорыі.

**Анталогія** – раздзел філасофіі, які вывучае фундаментальныя прынцыпы быцця як цэласнасці.

**Антрапасацыягенез** – гісторыка-эвалюцыйны працэс узнікнення і фарміравання чалавека і грамадства.

**Атрыбут** – неад’емная, істотная, неабходная ўласцівасць аб’екта, без якой ён не можа ні існаваць, ні мысліцца.

**Базіс** – у марксісцкай філасофіі элемент сацыяльна-эканамічнай фармацыі, гістарычна пэўная сукупнасць вытворчых адносін, залежная ад узроўню развіцця і характару прадукцыйных сіл, на якой узнікае і развіваецца адпаведная палітычная надбудова.

**Быццё** – фундаментальная філасофская катэгорыя для абазначэння ўсяго існуючага ў яго ўзаемасувязі і цэласнасці.

**Выснаванне** (умозаключение) – форма мыслення, у якой на падставе некалькіх суджэнняў, што называюцца пасылкамі, робіцца выснова (новае суджэнне), якая змяшчае новыя веды.

**Вытворчыя адносіны** – адносіны, якія ўзнікаюць паміж людзьмі ў працэсе вытворчасці, абмену, размеркавання і спажывання матэрыяльных каштоўнасцей.

**Гілазаізм –** філасофскае вучэнне аб усеагульнай універсальнай адушаўлёнасці матэрыі.

**Гіпатэтыка-дэдуктыўны метад** – метад пабудовы навуковай тэорыі шляхам фармулёўкі адной альбо некалькіх гіпотэз, з якіх паводле ўстаноўленых правіл выводзяцца прыватныя гіпотэзы, што патрабуюць вопытнай праверкі.

**Грамадскае быццё** – сукупнасць матэрыяльных умоў існавання людзей.

**Грамадская свядомасць** – сукупнасць уяўленняў, поглядаў, тэорый і ідэй, у якіх адлюстраваны ўмовы існавання чалавека і грамадства.

**Грамадства** – адасобленая ад прыроды, але цесна звязаная з ёю частка матэрыяльнага свету, якая ўяўляе сабой гістарычна зменлівую сістэму адносін, сувязей і форм арганізацыі людзей, што ўзнікае ў працэсе іх жыццядзейнасці.

**Дзейнасць** – спецыфічна чалавечая форма актыўных адносін да навакольнага свету з мэтай яго змянення і пераўтварэння.

**Дзяржава** – асноўны інстытут палітычнай сістэмы, які ажыццяўляе кіраванне дзяржавай, а таксама ахову яго эканамічнай і сацыяльнай структуры.

**Дэдукцыя** – метад навуковага пазнання, у якім адбываецца пераход ад агульных паняццяў да асобных фактаў і адзінкавых з’яў.

**Закон** – сукупнасць неабходных, істотных, устойлівых сувязей паміж рэчамі, з’явамі і працэсамі.

**З’ява** – знешняе праяўленне сутнасці, зменлівыя, пачуццёва ўспрымальныя бакі прадметаў і працэсаў.

**Індукцыя** – метад пазнання, у якім думка рухаецца ад канкрэтных адзінкавых фактаў да агульнага вываду.

**Індывід** – паняцце, якое азначае ўсялякага асобна ўзятага прадстаўніка чалавечага роду.

**Інтэнцыя** – намер, мэта, скіраванасць свядомасці на які-небудзь прадмет.

**Існасць** (сущность) – адзінства глыбінных сувязей, адносін і законаў, якія вызначаюць асноўныя рысы і тэндэнцыі развіцця тых альбо іншых сістэм.

**Ісціна** – веды, аб’ектыўны змест якіх супадае з уласцівасцямі прадметаў знешняга свету.

**Каштоўнасць** – усё, што здольна задавальняць разнастайныя патрэбнасці людзей і выражаецца ў маральных прынцыпах, ідэалах і мэтах.

**Каэвалюцыя** – збліжэнне дзвюх узаемазвязаных эвалюцыянуючых сістэм такім чынам, што змены ў адной з іх інспіруюць змены ў другой і пры гэтым не вядуць да непажаданых, а тым больш непрыймальных для першай сістэмы наступстваў; супольнае, узаемаўзгодненае развіццё чалавека і прыроды.

**Класы** вялікія групы людзей, якія адрозніваюцца па іх месцы ў сістэме эканамічных адносін, найперш – па іх адносінах да сродкаў вытворчасці.

**Матэрыя** – аб'ектыўная рэальнасць, якая існуе па-за межамі свядомасці і незалежна ад яе, бясконцае мноства аб'ектыўна існуючых прадметаў, з'яў і працэсаў, узятых разам.

**Метад** – сукупнасць сродкаў, прыёмаў і аперацый практычнага і тэарэтычнага засваення свету.

**Надбудова** – у марксісцкай філасофіі – элемент сацыяльна-эканамічнай фармацыі, сукупнасць духоўных адносін, тэорый і ідэй, а таксама арганізацый і ўстаноў, якія ажыццяўляюць кіраванне грмадствам.

**Ноасфера** – сфера ўзаемадзеяння грамадства і прыроды, у межах якой разумовая дзейнасць чалавека становіцца вырашальным фактарам развіцця.

**Пазнанне**– сацыяльна-гістарычны працэс творчай дзейнасці, скіраваны на вытворчасць ведаў і фармулёўку матываў і мэтаў дзейнасці.

**Паняцце** – форма думкі, у якой у абагульненай форме адлюстраваны істотныя прыкметы прадметаў.

**Прадукцыйныя сілы** – адзінства сродкаў вытворчасці і людзей, якія з іх дапамогай ажыццяўляюць пераўтварэнне навакольнага асяроддзя ў працэсе грамадскай вытворчасці.

**Прастора** – форма быцця матэрыі, якая характарызуе працягласць, структурнасць і ўзаемную арыентацыю матэрыяльных сістэм.

**Развага** (рассудок) – узровень свядомасці, на якім праяўляецца здольнасць аперыраваць паняццямі, правільна кваліфікаваць факты і сістэматызаваць веды.

**Розум** – узровень свядомасці, на якім праяўляецца здольнасць сінтэзавання вынікаў пазнання і стварэння новых ідэй.

**Рух** – усялякае змяненне матэрыяльных і сацыяльных аб'ектаў; спосаб існавання матэрыі, яе атрыбут.

**Сацыяльая сістэма –** складанаарганізавая цэласнасць індывідаў, сацыяльных груп і супольнасцей, аб'яданых разнастайнымі сувязямі і ўзаемаадносінамі.

**Свабода** – гарантаваная законам і абароненая дзяржавай здольнасць чалавека дзейнічаць у адпаведнасці са сваімі мэтамі і інтарэсамі на падставе пазнання аб'ектыўнай неабходнасці.

**Светапогляд** – складаная сістэма шырока абагульненых ведаў аб будове свету, а таксама аксіялагічных установак і праксеалагічных схем, якія забяспечваюць свядомую арыентацыю чалавека ў свеце і выбар ім жыццёвага шляху.

**Страта** – група людзей, аб’яднаных пэўнай сацыяльнай адзнакай (напр., маёмаснай, прафесійнай, адукацыйнай і да т.п.).

**Структура** – сукупнасць устойлівых сувязей аб’екта, якая забяспечвае яго адзінства і цэласнасць.

**Сутнасць** – унутраны змест прадмета, які выражаецца ў адзінстве ўсіх разнастайных форм яго быцця.

**Суджэнне** – форма думкі, у якой што-небудзь сцвярджаецца альбо адмаўляецца адносна якога-небудзь прадмета.

**Універсум** – паняцце для абазначэння прыроды як аб’екта навуковага і філасофскага пазнання.

**Успрыманне** (восприятие) – цэласнае пачуццёвае адлюстраванне прадмета ў працэсе яго непасрэднага ўздзеяння на органы пачуццяў.

**Уяўленне** (представление) – форма пачуццёвага пазнання, у якой адлюстраваны цэласны вобраз раней успрынятага прадмета.

**Фармацыя** – у марксісцкай філасофіі – канкрэтна-гістрычны тып грамадства з характэрнымі для яго сувязямі, адносінамі і формамі арганізацыі людзей, які функцыянуе і развіваецца па сваіх спецыфічных законах на аснове пэўнага спосабу вытворчасці.

**Фаталізм** – светаўяўленчая пазіцыя, паводле якой усе працэсы, што адбываюцца ў свеце, падпарадкаваны лёсу, прадвызначаны, што выключае магчымасць свабоды.

**Футуралогія** – галіна ведаў аб перспектывах развіцця сацыяльных працэсаў.

**Цывілізацыя** – устойлівая культурна-гістарычная супольнасць людзей, якая характарызуецца агульнасцю духоўных каштоўнасцей і культурных традыцый, адметнасцю ладу жыцця і тыпу асобы, наяўнасцю агульных этнічных прыкмет і адпаведных геаграфічных межаў.

**Час** – усеагульная форма быцця матэрыя, якая з’яўляецца ўмовай узнікненнння і змянення канкрэтных матэрыяльных сістэм і выражае працягласць іх існавання, паслядоўнасць змены станаў і структурную арганізацыю.

**Эвалюцыя** – у шырокім сэнсе – сінонім развіцця, у вузкім – азначае працэс павольнага, паступовага і паэтапнага змянення разнастайных сістэм.

**Экалогія** – навука, якая вывучае ўзаемаадносіны арганізмаў паміж сабою і навакольным асяроддзем.

**Эклектыка** – механічнае злучэнне разнастайных, часам узаемавыключальных поглядаў, ідэй альбо прынцыпаў.

**Эксперымент** – метад пазнання, пры дапамозе якога прадметы рэальнасці даследуюцца ў кантралюемых і кіруемых умовах.

## Заключэнне

Так выглядае філасофія ў яе канспектыўным выкладанні. І гэты выгляд вымушае нас да высновы: філасофія – гэта рэфлексія над пакутамі душы і пошукамі духа. І гэтая рэфлексія пераконвае нас у тым, што ніхто не ведае адзінай і поўнай праўды пра чалавека, бо такой праўды не існуе. Чалавек – істота ўніверсальная, а яе рацыянальнасць – адна з праяў шматмернага і разнамернага быцця чалавека ў свеце.

Філасофія не можа і не павінна быць сродкам тэарэтычнага абгрунтавання “рэвалюцыйнай перабудовы свету”, як і апалогіяй “наяўнай сацыяльнасці”. Галоўнае не ў тым, каб звяргаць ці абараняць, галоўнае – пазнаваць, каб разумець і на падставе разумення ствараць такія ўмовы, якія спрыяюць кожнаму чалавеку дасягнуць магчымасці жыць вольным ад дадзенай знешнасці, незалежна ад таго, з’яўляецца гэтая знешнасць прыроднай ці сацыяльнай.

Філасофія паказвае нам, што жыць і заставацца вольным разумны чалавек можа толькі ў адносным свеце культуры, якая не прэтэндуе на канчатковасць. У гэтым свеце няма апошняй ісціны, бо яна нічым не адрозніваецца ад звычайнай ілжы. Гэты свет не ведае неабмежаванай свабоды, бо такая свабода вядзе толькі ў няволю. Гэта адносны свет нашай духоўнасці.

Да гэтага часу мы часта духоўнасць падмянялі ідэалагічнымі клішэ. Апошнія звонку навязваюць чалавеку пэўны лад жыцця (найчасцей не адпавядаючы прызначэнню чалавека). Духоўнасць жа – гэта ўнутраны выбар уласнага лёсу, гэта сустрэча чалавека з сабой як з чалавекам. Духоўнасць – гэта той адзіны свет, у якім чалавек упершыню знаходзіць сябе як асобу і ставіцца да сябе менавіта як да асобы. Духоўнасць – гэта сфера, у якой індывідуальнасць дасягае максімальнага самаўсведамлення і адначасова – сваёй злучнасці з Сусветам. Такі чалавек паўстае не як элемент сабornасці альбо калектыўнасці, а як персона, асоба, для якой агульначалавечыя каштоўнасці набываюць сэнс праз яе асабовасць. Прапушчаныя праз полымя асабовасці агульначалавечыя запаветы не толькі самі набываюць сэнс адносна індывідуальнага існавання чалавека, але і напаўняюць ім само гэтае існаванне, заахвочваюць чалавека да “быцця-насуперак-смерці”. Абсалютныя і безумоўныя каштоўнасці Ісціны, Дабра і Прыгажосці – гэтыя найвышэйшыя агульначалавечыя максімы – толькі тады выяўляюць сваё існаванне, калі чалавек пажадае адкрыць іх для сябе, калі яго асоба адчувае патрэбу ў іх, калі яго воля імкнецца да сустрэчы з імі. Філасофія і заклікана дапамагчы чалавеку ў яго пошуку шляхоў да Праўды і Свабоды.